Школьная бібліятэка

# Янка Сіпакоў



# Вершы, балады, прытчы

*Школьная бібліятэка*

# Янка Сіпакоў

# *Вершы, балады, прытчы*

Мінск
«Мастацкая літаратура»
2010

УДК 821.161.3-93
ББК 84(4Беи)
С39

Серыя заснавана ў 1965 годзе

Укладанне *Зоі Падлiпскай* i *Вiктара Шнiпа*

Друкуецца паводле выданняў Янкi Сiпакова:

Выбраныя творы ў двух тамах. Т. 1.– Мiнск : Маст. лiт., 1995;
Веча славянскiх балад.– Мiнск : Маст. лiт., 1988;
Тыя, што iдуць.– Мiнск : Маст. лiт., 1993;
Падары нам дрэва.– Мiнск : Юнацтва, 1997.

Выпуск выдання ажыццёўлены па заказу
i пры фiнансавай падтрымцы
Мiнiстэрства iнфармацыi Рэспублiкi Беларусь

**ISBN 978-985-02-1212-2**

© Сiпакоў Я., 2010
© Афармленне. УП «Мастацкая лiтаратура», 2010

# **В***ершы*

* * *

Адгукніся
На стук у акно асцярожны;
Дай вады,
Калі просіць яе падарожны;
Абагрэй,
Калі той скарчанеў на марозе;
Накармі,
Калі доўга не еў у дарозе.
Ды не вер,
Калі вораг прыкінецца братам;
Не маўчы,
Калі смерць напаўняе гарматы;
Не чакай,
Каб цябе закавалі ў кайданы;
Не даруй
Ні за здзек,
ні за гвалт,
ні за раны!

## Ваўчыца ў звярынцы

Нялёгка з пушчай вольнай разлучыцца
І апынуцца ў цеснакутай клетцы...
Кідаецца ва ўсе бакі ваўчыца
І на свабоду вырвацца імкнецца.

Ды сталь крышыць – замала ў яе сілы.
Яна прылегла ціхенька ў знямозе.
Прылегла... І, тужлівая, завыла
Па ваўчанятах родных, па бярлозе.

Кранаў за сэрца голас яе слабы,
Хоць ён і з пашчы воўчае выходзіў.
Яна ж праз краты высунула лапы –
Хай хоць яны пабудуць на свабодзе.

## Недасланы ліст да маці

Пішуць хлопцы лісты дадому –
У студэнтаў ёсць радасць такая...
Я таксама пішу табе сёння.
А нашто? –
Сам сябе пытаю.
Успаміны ж прыйшлі нязвана,
Прыгадаўся мне зноўку час той –
Сустракаў я цябе пасля працы,
Бег на выган хлапчук віхрасты.
І прасіўся к табе на рукі,
Хіба ж ведаць я мог, бесклапотны,
Што гудзелі яны і нылі
Пасля цяжкай
Мужчынскай работы.
Шмат чаго я тады не ведаў,
У пакутныя тыя вёсны:
І каму ты вячэру насіла,
І чаму пакідала кросны;

Хто хаваецца ў нашым склепе,
І чаму ён не прыйдзе ў хату,
І чаго недзе вельмі далёка,
А не з намі жыве наш тата;
І чаго па грыбы ты хадзіла,
Хоць я рэдка еў бульбу з грыбамі;
І што́ ты ў гумно вазіла
На калёсах цяжкіх пад снапамі...
Як вялі цябе ў горад пад вартай,
Зразумець я не мог анічога:
Слёзы... Слёзы...
Сястрычкі галосяць...
А мяне суцяшаюць, малога.
Мне ж і цётка-суседка сказала,
Што дамоў цябе пусцяць уранні...
І хоць слёзы ёй засцілі вочы,
Я не мог не паверыць Ганне...
А калі ўжо слязой перад смерцю
Ты сіроцтва маё абмывала,
Я дзівіўся, чаму гэта цётка
Не сваіх,
А мяне забаўляла.
Пішуць хлопцы лісты дадому —
Радасць светла ля іх карагодзіць!
Я таксама пішу,
Хоць і знаю:
Пісьмы, мама, мае не даходзяць,
Пісьмы, мама, дарог не знаходзяць
Туды, да цябе...

## Сонечны дождж

Ён паліўся... Спорны, шчодры.
Церабнуў па промнях коса,
Зазваніў са стрэх у вёдры,
На двары абмыў калёсы.

Падстаўляюць чашкі кветкі –
Хочуць піць пасля спякоты,
А ільнам, бы нам, няўседкі –
Ліўнем мыюцца з ахвотай.

Веццем-прыгаршчамі клёны
Дажджавыя кроплі ловяць;
Як жаніх, стаіць зялёны,
Чыста вымыты ядловец.

А пасля дажджовай працы
Прыгажосць зямля прыдбала,
Нават сонца прыбірацца
У вясёлку спешна стала.

## Салаўіная бяссонніца

Месяц у поўныя росы глядзіцца,
Вецер ледзь чутна у лісці шапоча.
Сённяшняй ноччу нікому не спіцца,–
Каму ж пажадаеш добрае ночы?

Чутна, на возеры плёскаюць вёслы –
Дзяўчаты з хлапцамі наслухацца хочуць,
Аб чым салаўі спяваюць за вёскай;
Навошта яно тут – «добрае ночы!».

З кветкі упала расіна са звонам,
Кветка пялёсткамі выцерла вочы...
Ніхто ж салаўю,
яго песні бяссоннай,
Сказаць не асмеліцца: «Добрае ночы!»

## На бацькавых руках

Я сам зайздросціў гэтакім рукам
З мазольнымі, цяжкімі кулакамі:
Іх сталь пякла, студзіла іх рака,
Яны ў пясок крышылі цвёрды камень.

А трэба – дрэва з крэктам упадзе,
Яны гару ў далонях утрымаюць,
І гэтыя вось рукі да грудзей,
Глядзі, дзіцё малое прыціскаюць.

Шкада малога? Выручаць бяжы,
А то яно ў абдымках задыхнецца...
Дзіцё ж у бацькі на руках ляжыць,
Сваім ратком маленечкім смяецца.

## Слёзы маці

Сын прыехаў, хусціну прывёз –
Пасвятлела адразу ў хаце.
Дык чаму ж не ўтрымала слёз,
Дык чаго ж гэта плача маці?

Выглядала з відна да відна
І чакала, нібыта свята...
А цяпер?.. Ці ж не рада яна –
Сын жа ў госці прыехаў салдатам.

Не...
І радасна ёй, а калі б
Усё ішло сваім ладам ды следам,
Трое хлопцаў старэйшых маглі б
За сталом за бацькоўскім абедаць.

Не прыйшлі яе дзеці з вайны,
Не грымець тром чаканым вяселлям...
То ж па вас, дарагія сыны,
Ручнікі ўсё слязьмі яна беліць.

## Далёкія сенажаці

Калі туманы узбоч
Зноў папаўзуць з нізіны
І, прапацеўшы за ноч,
Росы вакол пакінуць,—
Спорна косіць каса.
    Калі адап'е прамень
    Квасу з касцовай кварты
    І ветрык за цэлы дзень
    З неба прагоніць хмаркі,—
    Добра сохне трава.
Калі і мянташкі ўсе
Ахрыпнуць зусім пад вечар,
Трава надакучыць касе,
А ў хлопцаў заныюць плечы,—
Копы ў лузе растуць.
    Калі нават месяца рог
    Прапахне мядункам, мятай,
    Нанач тады мурог
    Сцелюць падвялы, прымяты,—
    Спіцца добра касцам...

* * *

Не баюся я цяжкай, далёкай хады,—
Рупіць пешшу прайсціся па роднаму краю.
Ах, як пахне чабор, колькі сонца тады,
Калі восень сады абтрасае!

Хай і ногі гудуць, хай абколе асцё,
Я пайду, каб да скону запомніць дарогу...
Да крыніцы ж дайду – буду рад, як дзіцё,
Што дайшло ўпершыню да парога.

## Пачатак палёту

Зямля мая! Маліцца трэба
На твой вянок у ззянні рос...
А недзе там, за сёмым небам,
Рыпіць сузор'яў зорны воз.

Я распраўляю крылы шырай,
Як сын, кажу табе: «Бывай!»
Мяне сабрала ты у вырай
За свой напяты небакрай.

Руку, зазор'е, мне падай!

* * *

Ляжаць на далоні зерні...
Не верне зямля іх?.. Ці верне?..
Чысценькія такія,
Дагледжаныя і сухія;
Іх аддаваць страшліва
Нават зямлі ўрадлівай.

А што, калі сонца не знойдзе
І промень воддаль іх пройдзе?..
А што, як у цёмных нетрах
Не хопіць для іх паветра?..
І яны, нібы рыба на беразе,
Задыхнуцца ў раллі?..
Не верыце?

І не верце, бо нават у жменях,
Як жывыя, варушацца зерні
І ў пальцы дзяўбуць расткамі –
У руках прарастаюць самі...

Расшчапіце хутчэй далоні –
Не трымайце жыццё ў палоне!

## Танец соснаў

Каб сустрэць хутчэй аўтобус,
Сосны выбеглі на ўзлесак
І, як людзі з караваем,
З аблачынкамі на лапках
Запрасілі ў сваю хату
На агледзіны іх казкі.
Гэта казка – танец соснаў:
Мітусяцца яны злева,
Справа – робяць круг шырокі
І, як бы дзяўчаткі тыя,
Так і млеюць, так і хочуць
За спіну другіх схавацца.
А калі карэнне раптам
Пад аўтобус наш трапляе,–
Сосны ўпрысядкі ірвуцца,
Як вясковыя танцоры,
А пасля ў ручай спяшаюць,
Каб абдаць вадою станы,
Разамлелыя у танцы.
Гляньце, гляньце, як галінкі
Засрабрыліся ад пырскаў!..
Толькі позна... Вунь з ускрайку
Нам апошняя сасонка
Памахала сваёй лапкай.
Едзе полем наш аўтобус,

Не ўзнімае ні пылінкі:
Мусіць, хоча азірнуцца,
Каб яшчэ хоць раз убачыць
Танец казачны сасонак.

## Спёка

Духата... Цішыня захрасла.
Як мёд, яе рэж, цягучую...
Глыбока ў званочку краскі пчала ўздыхае сасмаглая,
Жаўранак песню ўпусціў, і тая аб поле разбілася,
Стомлены бусел падскоквае
на патэльні сухога балота,
Камбайны па жыце сноўдаюць –
шукаюць свайго вадапою,
А калі іх з вядра пояць людзі,
без страху сюды збіраюцца
Птушкі, звяры паручнелыя, і кожны глыток яны
лічаць.
А зямля, як гаршчок гліняны, патрэскалася на
кавалкі,
Сама берагамі, як вуснамі,
прыпала да рэк перасохлых
І з прагнасцю з дна высмоктвае
апошнія цёплыя кроплі...
А громаадводаў антэны
ў небакрай углядаюцца пільна –
Кожную хмарку гатовы затрымаць на сваіх
іголках.
І толькі чуваць, як стукае
чалавечае сэрца ўзрушана –
Бы кроплі
буйнога
дажджу.

## Мова

Бывае,
спатрэбіцца ўзімку
Промень, не злоўлены летам,
Бывае,
што мала пахаў
У моры травінак і красак,
Бывае,
не хопіць колераў
У вясновым квяцістым разліве,
Бывае,
так мала гукаў
Чуецца ў моры лесу,
Бывае,
не радуюць песні
Мора крылатага птушак –
Тады я іду да цябе,
Мой акіян вялікі,
У які ўсе моры ўпадаюць,–
Мая адзіная
мова!

* * *

Пакліч
да зімы ў адведзіны,
Мая маўклівая дзедзіна,
Пачастуй мяне свежынаю,
Пасядзі ля грубкі са мною –
Раскажы
свае даўнія былі ўсе,
Пра якія нашчадкі забыліся;
Каб акно,
ва ўзорах якое ўсё,
Мне здалося тваім слуцкім поясам,

А промні,
ва ўзоры праніклыя,–
Залатымі затканымі ніткамі...
А затым
давай, мая дзедзіна,
Ў талаку з табою паедзем мы –
Ты ж за век свой набралася вопыту
Талакой вырашаць свае клопаты.
Я з табой,
мая ціхая дзедзіна,
Раскрычуся на снежных агледзінах,
На тваіх зімовых гулянках,
Дзе запрэжаны вецер у санкі,
Дзе ляціш –
не па ўзгорку крутому,
А па Шару зямному!
Гэта радасць снегу –
адвечная,
Першабытная,
чалавечая;
Пэўна, так весяліліся прашчуры,
І зіму, як зямлю сваю, лашчылі...

Хоць на дзень зімовых агледзінаў
Пакліч
да сябе мяне,
дзедзіна.

## Пехатою ў вырай

Хмаркі лета блытаюцца ў просіні –
Чысцяць пер'е ў вырай і яны...
Колькі розных выраяў па восені
Пачынаюць пошукі вясны.

Нашы думкі ў вырай з імі просяцца...
Захініце, птушкі, іх крылом!

Чалавек – не птушка. Ёсць жа розніца –
Я спяшаю ў вырай пешаком.

Я спяшаю. Лезу па гушчарніку,
Атрасаю кроплі за каўнер,
Да мяне ідуць дубкі ў напарнікі,
Лес грыбамі корміць напавер.

Раптам – сінь тваіх вачэй бясхмарная,
Ласка ўсмешкі – рэху не дагнаць,
Ты ўжо тут? Баяўся, значыць, марна я,
Што ў самоце буду сумаваць!..

Абагрэцца трэба. Трошкі выспацца.
Ты збіраеш будучы агонь:
Па галінцы, промніку, па іскарцы
Ловіш у спагадную далонь.

І касцёр, нібыта з сонца высеян,
Асвятліў аголены прастор,
Ірвануўся ў неба, зліўся з высямі
І змяшаўся з сейвам зыркіх зор.

Над кастрамі полымнымі, шчырымі
Птушкі нават восенню пяюць...
А вясной яны дарогу з выраю
Па кастрах тваіх распазнаюць.

## Лінія гарызонту

Яе адкрываюць дзеці,
Гэтую вабную, як бабуліна казка, нітку,
Якая злучае зоркі з расою
І не злучыць зоркі з расою;
Якая мяшае паветра з вадою
І не змяшае паветра з вадою;

Якая звівае аблокі з раллёю
І не саўе аблокі з раллёю;
Якая сшывае неба з зямлёю
І не сшые неба з зямлёю.
У дзяцей пераймаюць дарослыя
Гэтую зманлівую, як матчына песня, нітку,
Каб адкрываць невядомае
Тое, што ёсць за домам;
Каб за ніткай ісці без стомы,
Некалі выйшаўшы з дому;
Каб не заседжвацца дома –
З падарожжаў вяртацца дадому.
І каб прыносіць дадому
Сабраныя зоркі за домам.
Ах, гэтая зменлівая нітка!
Вечна яна дражніцца новымі небасхіламі!

## Сінягорыя

Ёсць летуценні сінія –
Сіней ад аснежаных ранкаў,
Краіна ёсць – Сінягорыя,
Прывезеная на санках.

Над ёй галаруч завіхаюцца
Па вушы мокрыя дойліды,
Рукі ў кішэнях грэюць,
Калі пальцы ад снегу зойдуцца...

Мараць у снежных сценах,
Мараць у белых палацах,
Якія жывуць толькі ў казках,
Сівым архітэктарам сняцца.

Калі спаць прымушаюць дойлідаў –
У парках, нібы ў музеях,

Сумаваць без іх застаюцца
Напаўразбураныя калізеі.

Імі ўсю ноч любуюцца
Паклонніцы і паклоннікі –
Іх снежныя бабы вартуюць,
Як белага дойлідства помнікі.

Як летуценні светлыя –
Святлей ад аснежаных ранкаў –
Берагуць яе,
                Сінягорыю,
Прывезеную на санках.

* * *

З разамлелых пупышак
Выпырхнулі неяк раніцою
Мільярды зялёных птушанятак.
Абселі яны галінкі
І залопалі кволенькімі крыльцамі –
Мусіць, хацелі зляцець на зямлю.
Ды збаяліся...
Так і засталіся яны на дрэвах сядзець да восені
І спяваць сваю зялёную песню...

## Карэнне расы

І ў расы ёсць карэнне.
Я гэта сцвярджаю,
Бо глядзеў, як збірае яе салавей –
Па расіне,
Бы ягады, ён адрывае
І, упаўшы на хвост па-гусінаму,
П'е.

І ў расы ёсць карэнне...
Дзе ж тая сцябліна,
На якой даспяваюць ягады рос?
Павучынка, травінка?
А мо нават промень,
Што, як дзіда, ўдзябнуўся ў зямлю
І прарос.

## Блакітная геаграфія

Такія знаёмыя
Чыстыя воблакі —
Дзяцінству майму, маім верасням помнікі.
Дзяцінства...
Старэйшых званкі ў школу клікалі,
А я вывучаў тады кнігу блакітную.
Яблыкі рвеш,
А зірнеш толькі ўгору ты —
Неба ўбачыш кнігай разгорнутай;
Едзеш на конях —
Аблокі гартаюцца.
Чытаеш:
Вунь моры,
Вунь горы ўзнімаюцца...
Дзяцінства...
І зноў я застыў і не дыхаю
Перад вялікай блакітнаю кнігаю.
І сярод дзіўнай такой несусвеціцы,
Між воблак,
Указка географа свеціцца.
Боцікам,
Бачу,
Ніяк не нахваліцца
Модніца свету —
Паўвостраў з Італіяй;

За ёю спяшае
Такая галантная –
Белай ільдзінкай іскрыцца Грэнландыя;
А вунь ужо іншыя воблакі сцелюцца:
Пяскі узняліся,
Над Афрыкай сеюцца;
Шукаючы берага,
Коцяцца ціха так
Валы
З акіяна ўтрапёнага –
Ціхага...
Два воблакі – тыя ж паўвостравы шэрыя,
Бы іклы, тырчаць з цэлай хмары –
Амерыкі.
А воблакі рояцца,
Воблакі рояцца –
Новыя контуры мрояцца,
Мрояцца...
Раптам зрабілася ўказка пытальнікам.
Географ заблытаўся...
Гэта ж батаніка!
Паказвае грыб мне,
Што ўзняўся над горамі,
Грыб,
Пра які з адчаем гаворым мы...
Уцякайце хутчэй,
Мае мілыя воблакі –
Дзяцінству майму, маёй радасці помнікі!
Гэта ж забойства,–
Крычу вам са страхам я,–
Гэта ж замах на усю геаграфію!
Няўжо можа стацца,
Што будзе сасватана
Смерцю зямля наша з бомбаю атамнай?
Няўжо прарыпіць сваёй воссю надломленай
Глобус Зямля
І спыніцца стомлена,

Быццам гадзіннік,
людзі?
Людзі!
. . . . . . . . . . . . . . . . .
Не, такога не будзе!
Не будзе!

## Брацкая магіла

Здаецца, што дрэвы няўмела
Над ёй абдымаюцца ўпотай;
Здаецца, цалуюцца кветкі
Засмяглымі, прагнымі вуснамі;
Шэпчуцца, шэпчуцца травы,
Быццам вясною каханыя,
Бо травы,
і кветкі,
і дрэвы
З каханняў нявдзейсненых выраслі,
З маладых салдацкіх жаданняў,
Якімі праз дрэвы,
і кветкі,
і травы
Мёртвыя ў вечнасці трызняць.

* * *

Спяць у снарадах,
Спавітыя белаю, як сама смерць,
Сталлю,
Пакручастыя віхры,
Аглушальныя грамы,
Пажары, вулканы і землетрасенні...

Спяць чалавечыя крыкі,
Спяць адкрытыя вочы,
Спяць бяссонныя месяцы,
Спяць сусветныя жахі
Ва ўпакоўцы сталёвай...

Не будзіце іх, людзі!

* * *

Сэрца –
то спрасаваны стагоддзямі порах,
Міна незразумелай дакладнасці:
Бывае, не разрываецца ад вялікага гора,
А ўзрываецца ад маленькай радасці.

## Пейзаж з чалавекам

Гэткае дрэва!
Яно зямны шар захапіла карэннямі
І, нібы мяч у сетцы, здаўна яго трымае...

Макавіна якая!
Жылплошчы ў ёй хапае для ўсіх абяздоленых птушак,
І песням іхнім, і песням птушыных унукаў і праўнукаў.

Пад страху ягоную
Спяшаюць, ідуць адусюль суніцы, лісіцы, баравічкі,
Людзі, ночы, ваўкі, русалкі і нават сонцы.

Пад ім знаходзяць:
Сумныя – песню, галодныя – харч,
скалелыя – зацішак...
Шчодрае,
вельмі шчодрае гэта зялёнае дрэва-гасцініца.

Хто толькі яго пасадзіў: суніцы, грыбы, ваўкі?
Ці птушкі?..
Ці сонца?..
Ці чалавек?..

* * *

Заходзіць яблык –
Чырвоны і вялікі, быццам сонца ў садзе заходзіць.

Усё ніжэй і ніжэй
Згінае ён галіну, якая трымала яго ў самым зеніце.

Усё хутчэй і хутчэй
Коціцца ён па зялёным небасхіле дрэва.

Заходзіць яблык...
І трава – гарызонт ягоны – становіцца гэткаю
блізкай...

Падстаўце рукі!
І ў іх скоціцца, апёкшы далоні, гэтае спелае сонца.

Глядзіце не апячыцеся,
Калі пырскі, як промні ля сонца, навокал яблыка
ўспыхнуць.

Засмяглымі вуснамі
Прагна лавіце промні – гэты дарунак зямлі і неба.

А калі падужэеце,
Выпіўшы ўвесь круглабокі кубак, да краёў
напоўнены промнямі,

Закасвайце рукавы
І рабіце гняздо ўтульнае пад наступныя,
большыя сонцы.

Няхай узыходзяць новыя яблыкі!

* * *

Каб неба
цябе не загушкала,
Каб зямля
не калола
быльнікам,–
Верш! Ляці
раскальцованай птушкаю:
У цябе –
ўвесь сусвет пад крыллямі.

* * *

Пасля расставанняў з ёю,
абжытай,
Мы гэткай
нашу планету запомнім:
Зямля –
зялёнае сонца
З травою –
зялёнымі промнямі.

## Коні на праспекце

Па коўзкім праспекце коні непадкаваныя цокалі:
У вітрыны глядзеліся,
Вывучалі шэрыя цокалі,
Абнюхвалі зводдаль
Сталоўкі
І крамы парфумныя,
Дзівіліся – ведама, коні! – на тратуары тлумныя.
А каб яны не парушылі
Руху агульныя правілы –
Імі, нібыта машынамі,

Рэгуліроўшчыкі правілі.
Толькі ж буланых цягнула
Да зеляніны скверыка кожнага,
Дзе гэтак звыкла пахла
Лугам,
Расою
І пожняю.
І тады, канюхам насуперак, іржалі яны прарэзліва,
Паставы злаваўся і лаяў:
— Но, ідзі, ваўкарэзіна!
Коні тут — дзіва.
І дзеці спяшаюць гурбою звонкаю,
Як некалі ў вёсцы бегалі мы за старымі трохтонкамі.
Сам бы, здаецца, пабег пад музыку конскага цокату,
Але...
На галаве капялюш, жонка таксама пры боку тут.
А ў хату пад вечар зайшоў —
Якою здалася цеснаю
Яна,
На шпакоўню падобная, калыска мая трохмесная:
Лягла на ўсю хату тахта,
Крэслы расселіся грэбліва,
І нельга па хаце прайсці,
Нібы ў магазіне мэблевым...
А вось ужо мроіцца луг
Шырокай пахучаю краскаю.
Па сена я еду.
Вішчаць
Колы, што трызняць падмазкаю...
А вось тыя самыя коні,
Што па праспекце цокалі,
Бягуць па дарозе лясной —
Вязуць мяне ў вёску далёкую...
Мама...
Яна наліла крупніку місу вялікую,
І загарэлы
З-пад ручніка на мяне ўжо бохан

Зіркае,
Які мною зернеткам кінуты,
Рукою маёй дагледжаны,
Мною ў млыне змелены,
Маці маёю спечаны...

## Хвіліна сустрэчы

Жанчына дзяліла сонца –
Пароўну кожнаму коласу;
Яна стаяла сівая
У сваім у бабіным леце...
Я падышоў...
– Дзень добры!–
Яна мне ласкава сказала.

*Яе рукі*

Яны – нібыта мужчынскія:
Гэтак умеюць ціснуць,
Але ўмеюць і лашчыць,
Агрубелыя гэтыя рукі,
Высліжаныя аб цапільны,
Аб касільны ды тапарышчы,
Што ў іх, як у тое люстэрка,
Можна усім глядзецца!

*Яе вочы*

Гэтулькі, гэтулькі промняў
Плёскае ў іхнім блакіце.
Іх многа. Іх, можа, столькі,
Колькі ўсходаў і захадаў
Вочы страчалі ў полі...
Яны многае ведаюць,
Яны многае бачылі,
Гэтыя сведкі блакітныя,

Якія запамінаюць гісторыю
Зямлі, чалавека.

*Яе валасы*

З-пад паркалёвай хусткі
Выбіваюцца белыя промні –
Іх сонца бяліла з палотнамі,
Яно працавала над гэтым
Сотню чэрвеняў, ліпеняў, жніўняў –
Аж пакуль назаўжды не змяшаліся
Промні сонца з белымі промнямі...

*Уся постаць*

Свеціцца... Ласку праменіць...
Дык гэта ж сапраўднае сонца,
Што сабрала гэтулькі промняў
На руках,
                у вачах,
                          пад хусткай!

– Ну, дзень добры, сівое сонца –
Бабка Алеся!

## Вітаюцца кавалі

Ці бачылі вы,
                    сябры,
                              калі,
Як вітаюцца кавалі,
Як за рукі
                здароўкаюцца кавалі?
Падаю́ць яны у руках грамы́,
Ад якіх жахаемся мы:
Варочаюцца паміж далоняў яны,

Нібы
вялізныя валуны.
Імклівых маланак
сцішэлы рой
Нясуць тыя рукі з сабой.
Бярыце маланкі ў сваю далонь —
Ён ручны ўжо,
хаця і агонь!
Рукавіцы скідайце хутчэй,
Каб руку каваля ўзяць лаўчэй,
Якой прыручае каваль
І грамы,
і маланкі,
і сталь.
Кавалі вашы рукі ў свае бяруць,
Як кувалды
цяжкія
бяруць.
А калі вы малую руку падалі,—
Ушчэнт бянтэжацца кавалі...
Ці бачылі вы,
сябры,
калі,
Як вітаюцца кавалі,
Як за рукі
здароўкаюцца кавалі?

## Споведзь

Пасівелы мой лес,
Я твой вечны палоннік,
Я твой вечны даўжнік,
Прад табой на каленях стаю.
Я спяшаў да цябе,
Як спяшае стамлёны паломнік,
Каб паспець, каб данесці
Няхітрую споведзь сваю.

1

Я люблю цябе, лес,
За тваю чалавечую шчодрасць,
Калі ты накрываеш
Абрусам паляны-сталы,
А на іх высыпаеш
Зялёныя поўныя вёдры
І суніц, і чарніц,
І грыбкоў – карапузаў малых.

А калі на рабіну
Наніжаш пляцёнкі караляў,
Журавінныя лямпачкі
У імхах пазапальваеш ты –
Аглядае вавёрка арэхі,
Што ў цябе панакрала,
А барсук для пасцелі
Тралюе сухія лісты.

2

Не люблю цябе, лес,
Калі многа няшчасцяў прарочыць
Усім тваім жыхарам
Твая сонцам напятая ціш.
Ты ж зялёную шапку
Насунуў на самыя вочы,
Каб нічога не бачыць,
І гэтак зацята маўчыш.
Ты схаваў у галлі
Дзюбу ястраба злога,
Што цікуе за зайцам –
Нявіннай лясною душой.
Сук падставіў пад стрэльбу,
Каб зноў ад ласінага рога
Не бярозкаю пахла,
А порахам пахла ужо.

3

Мне шкада цябе, лес,
Пашчапаны вайною,
Тваіх ран, што на непагадзь
Шчэ і сёння гудуць...
Мне шкада тых бярозак,
Якіх раняць кожнай вясною,
А людзі іх слёзы
Збіраюць у жбан, бы ваду.

Мне шкада, калі сосны
Паміраюць заўчасна,
Расстраляныя вострай
Падсочнай стралой;
За цябе мне, мой лесе,
Неяк робіцца страшна,
Калі кожны твой пень
Выглядае магільнай плітой...

4

Я люблю цябе, лес,
Як зямлю перад кветам,
І злую на цябе,
Бы на восеньскі сум,
І шкада мне цябе,
Быццам зжатага лета,
Ты патрэбен мне, лес,
Як спачынак касцу.

## Зялёнае воблака на рынку

Бярыце, людзі,— я вам прывёз
Вятры, травінкамі закалыханыя.
Вось перад вамі паўнюткі воз
Салаўіных песень, што з лугу сабраныя.

Бярыце веснюю радасць маю –
Май, што водарам красак успоены.
Бярыце. Я з краскамі мёд аддаю –
Ён на гудзе пчаліным настоены.

Я прывёз у горад, дзівак,
Росных захадаў ціхія водбліскі.
Спрачацца не будзем – бярыце за так
Усё зялёнае летняе воблака –
Воз духмянага сена!

## Лірычны ўспамін

Пачужэлы прыехаў у госці,
А малым сюды бег – дадому,
І хукала старая хата
На мае азалелыя пальцы,
Расцірала збялелыя вушы
І, за стол мяне пасадзіўшы,
Усміхалася добрымі вокнамі.

Не, яшчэ не забыўся я, хата,
Як любіла ты лашчыцца печкай,
Дзе грэліся бабчыны казкі,
Дзе за комінам сны хаваліся
У валёнках калматых бацькавых,–
Яны пахлі апілкамі, лесам...
Тут жа грэлася маці з марозу
Перад тым, як мяне ўзяць на рукі.

Я вясёлыя дні твае помню,
Калі цяжка было загнету
Ад каструль, чыгункоў пузатых,
Калі радасна печка смяялася
Сваім шчырым старэчым ротам;

А калі яна хлеб ружавіла –
На пах адусюль зляталіся
Сарокі да нашага коміна.

А было ў цябе і такое,
Калі пахла ты бульбай гнілою,
Калі стравы былі з крапівы ўсе –
Не стрыкае пякучка ў голад!
Калі печ вінавата глядзела,
Халоднай закрыўшыся засланкай,
Калі міскі і лыжкі маўчалі,
Хоць чакалі мы іхняга звону.

Я цябе і заплаканай помню,
Калі бацька з табою на ростань
Падаваў нам звязаныя рукі,
Што, як крылы, ў вяроўках біліся...
Паніжэла вянцоў ты на пару,
Пастарэла гадоў на дзесятак
І, вуглы ў кулакі сашчапіўшы,
Пагражала вінтоўкам чужацкім.

Я цябе не сустрэў, мая хата,
А мяне прывітала тут новая,
Са страхою, заломленай горда,
Са сцяною – наўсцяж у вокнах,
Нават з люстрай замест газоўкі
І са столлю – свежым жаўточкам,
На якой не лічыў я дошак
І не знаю сучка ніводнага.

Тут схаваны пляменнікаў казкі,
Тут дурэюць іхнія гульні...
Не крыўдуй, мая родная хата,
Якая была маёй нянькаю,
Якая была мне калыскай,

Што сюды я прыйшоў, як дадому,
Хоць прыехаў толькі у госці...

Гэй, пасуньцеся, успаміны,–
Дай жа месца ў сваім застоллі,
Новая хата!

## Уваходзіны ў паэму

*Эпіталама*

*Верасню прысвячаецца*

Хвала яму, жоўтаму свату,–
Сягоння ў нас уваходзіны:
У новую, незвычайную хату
З табою нясмела ўваходзім мы.

Тут сцены – закрытыя вочы.
Страха ўся з лістоты сатканая.
І ложак – пінжак мой святочны
На кветкі пасланы, каханая.

Дык пойдзем хутчэй жа, мой голад,
Куды ты захочаш, харошая...
Рыпіць і пяро і голас:
«Са шлюбам законным! І грошы з вас...»

Ах, рэгістратар! Усмешкі хоць трошкі
Адпусціце без плана для радасці...
Але ён, нібы скнара грошы,
Усмешкі схаваў: ці не ўкрадуць іх?

І сябры з такой жа гаворкай:
«Ад імя, з даручэннямі вуснымі...»
Што ж, я сам сабе крыкну: «Горка!»,
Каб напіцца тваімі вуснамі!

Дык пойдзем хутчэй. Нас чакаюць
Невядомыя уваходзіны...
Я паэмай яго называю,
Гэты храм, куды ўваходзім мы.

У паэме будуць, няйначай,
Свае адступленні лірычныя:
Першы сын неўзабаве заплача,
Першы ўнук падасць голас зычны нам.

Цяпер жа глядзіць з-пад далоні
І чакае даўно нас Верасень...
Жоўты ліст,
жоўты лес,
жоўты промень
І радасць, як сонца, уперадзе.

Жоўта... Не любіш?.. А я дык рады,
Што промняў столькі намолата...
Кажуць: жоўтае – колер здрады.
Не вер! Гэта колер золата!

Па жоўтай дарозе ідзём мы
У залатое вяселле звонкае...
Смялей жа ступай у паэму
Маёю
вечнаю
жонкаю.

* * *

Мы стаім у зялёным маі –
Недалёка ад нашых студзеняў,
Так далёка ад жоўтых верасняў,
Шчэ далей ад сваіх лістападаў,

Адкуль ужо стануць нам бачны
Нашы сівыя
ціхія снежні.

Мы стаім па калені ў красках,
На якія вёсны так шчодрацца.
Мы глядзім,
як цвітуць нашы яблыні
І красуюцца першаю завяззю,
Якую спяліць нам да восені,
Покуль завязь
не выспее
яблыкам.
Мы смяёмся,
зялёныя дрэвы,
У сваіх макавінах не бачачы,
Аніводнага ліста пажоўклага,
Які б нам пра восень напомніў;
Мы смяёмся
і краскі раскідваем,
На якія не шчодрыцца восень.

Мы смяёмся.
За смехам не бачым,
Як махаюць дні крыллем над намі,
Над зялёнымі нашымі кронамі,
Над бурнымі нашымі маямі,
Покуль часу крыло не збівае
Першы ліст —
неспадзёўкаю першаю.

Вось тады мы і заўважаем,
Што не мы ўжо стаім у маі,
Што смяюцца пад нашымі кронамі
Маладыя
зялёныя дрэвы —
Нашы дзеці.

## Успомненая дарога

Дарогу забівае чыхаўка
Ад пылу,
Што ўзнімаюць босыя ногі бежанцаў:
Старэчыя – у пухлінах,
Жаночыя – у ранах,
Дзіцячыя – у крыві...
Яна з першых дзён аглухла
Ад гэткага ляскату колаў
І адчайнага лямантy
І чуе цяпер толькі адзін дзіцячы крык,
Адзін крык:
    – Хачу есці!
    – Хачу піць!
    – Хачу пасядзець!

Дарозе цяжка.
Яна выгінаецца, выкручваецца, уецца:
То так дапаўзе да рэчкі,
Што з берага можна ўхапіць кроплю вады жаданай,
То ўбачыць на небасхіле маленькую дажджавую хмарку –
    і да яе
    да яе,
    да яе...
То зверне ў лес,
У цянёк,
Пад вялікі зялёны парасон,
То здалёк убачыць крамяны баравічок –
    і да яго,
    да яго,
    да яго...
То ўпрэцца раптам у чырвоны куст маліннiку...

Ешце, дзеці... Ешце...
Дарога гэтак стараецца.
Для вашых шчаслівых сноў,
Перарваных вайною
На самым цікавым месцы...

* * *

Ужо аб вайне не могуць
расказаць маладзенькія таты –
Бянтэжацца перад сынамі...
А ў свеце з часоў яшчэ тых
Накрываюць пустое месца
на ложках спрасонку салдаткі,
Як інвалід па звычцы
сціскае рукаў пусты.

## Заканчэнне палёту

О, светлы боль сустрэчы шчырай!
Як сын, кажу я:
«Сустракай!»
Я зноў вяртаюся.
І вырай
Табе вяртаю, матчын край.

А недзе там, дзе неба мгліцца,
Рыпець застаўся зорны воз...
Зямля!
Вярнуўся я дзівіцца
На твой вянок у ззянні рос.

Дзе гэты вырай спеў і рос.

## Запрашэнне ў раніцу

Там
Да хрусту ў галінах
Пацягваюцца спрасоння бярозкі
І атрасаюцца ад імху і лісця
Баравікі.

Там,
Паколаты яловымі лапкамі,
Выходзіць з лесу густы туман,
Якім накрываліся зайчаняты
Ноччу.

Там
Спрабуюць галасы птушкі
І настройваюць на вясёлую песню
Свае адсырэлыя за ноч
Жалейкі.

Там,
Нібы тварык твайго смяшлівага сына –
Ружовага ад палётаў у сне,–
Выглядвае, як з-пад коўдры,
з-за лініі гарызонту
Сонца.

Спяшайце
У ціхую раніцу гэткую
Усе, хто хоча пачуць,
Як, слізгануўшы па расіне, звініць
Першы промень.

## Пачатак

Як страшна ўсё-ткі, мусіць, нараджацца
Нам з цемрыва ды ў акіян святла,
Дзе непазнаныя шчэ рукі мітусяцца
Па шырыні
бяскрайняга стала.

Над намі нагінаюцца, як поўні,
Усмешкі незнаёмых нам людзей.

І хаты –
неабжытыя шпакоўні –
Мы позіркам ніяк не абвядзем.

І штосьці невядомае
у горле
Качаецца,
як кропля,
як туга,
Пакуль яго мы ў слова не аформім:
– Куга!
– Куга!

## Малітва над калыскаю

Слухай, сыне мой,–
Здарыўся цуд:
Ты з'явіўся на гэты свет
Па волі сапраўднага Бога.
Не крыўдзі ж яго ніколі,
Любі яго,
Веруй у яго,
Маліся яму заўсёды –
Ласкавым яго рукам,
Шчырым яго вачам,
Поўным яго грудзям,
Бо гэты Бог –
Твая маці.

## Патоп

Скавышамі прапахлы,
Бацька прыехаў на полудзень.
І ў хаце – адразу патоп...
Першай адчула гэта кошка.

Яна замітусілася, замяўкала
І пачала да чагосьці падазрона прынюхвацца.
Потым,
Затопленыя па самыя макаўкі,
Зарадаваліся дзеці
І забегалі па хаце.
Затым, услухаўшыся,
Захвалявалася малое ў калысцы –
Да яго дайшло толькі цяпер.
Дабраўся патоп і да самога бацькі,
І той з асалодаю зафыркаў,
Нібы купаючыся...
А хату ўсё затапляла і затапляла.
Хутка патоп прасачыўся і затапіў сенцы.
І вось ужо праз шчыліны з хаты,
Як з дзіравай лодкі,
Цэдзіцца ён на вуліцу...
Затапляе дрэвы,
Сінічак на іх,
Падымаецца пад самыя воблакі
Гэты прыемны патоп –
Пах капусты, шкваркі, куляшу, каўбасы.
Аж свярбяць насы ад такога патопу,
На які раздобрылася сялянская печ...
А ў хаце –
Як збавенне,
Як выратавальны круг,
Бацькаў загад:
– Дзеці, за стол!

* * *

Пушчу турбуе клопат адзіны:
У пушчы радзіны.
На гэтай зялёнай птушынай планеце
У кожным гняздзе нараджаюцца дзеці.

Цесна ў шкарлупках –
Сціснуты плечы,
Быццам у цэлях, закутых навечна.
Чуеце,
Кволыя стукаюць дзюбы?..
Гэта упарта,
Бы камнярубы,
Працуюць нядаўнія эмбрыёны,
Акно прабіваючы ў свет зялёны.
І ўсё ж паддаецца бетон шкарлупіны –
У пушчы радзіны!
Малечы выходзяць на свет.
І са стомай
Падаюць на абломкі нядаўняга дома...
Вятры!
Іх калыскі пагушкаць варта –
Хай адпачне стамлёная ўпартасць.
А вунь зверанё сваю маці шукае –
Цёплаю пыскаю свет аглядае,
Пакуль яшчэ не адкрыліся вочы:
Малое знайсці сабе ежу хоча
І палохаецца,
Наткнуўшыся на травіну,–
У пушчы радзіны.
І аляняты,
І зубраняты
Пакуль на траве ляжаць вінавата,
У зямлю, што выслізгвае, кволыя ногі
Натужна ўпіраюць –
Да самай знямогі:
Зямлю адпіхнуць настойліва хочуць,
Каб самім на ногі ўскочыць...

І стрэльбы долу
Апускаюць рулі нявінна –
У пушчы радзіны!

* * *

Нібы бліскавіцы белыя,
Сок застукаўся ў голле з сілаю,
І, калісьці такія нясмелыя,
Чырванеюць дзявочыя сны...
Лопаецца
                недзе за небасхіламі
Сонца –
                пупышка вясны.

## Настраёвы эцюд

Быццам светлыя трубы аргана,
Ледзяшы звісаюць са стрэх.
І ліецца матыў вясняны
З аргана
Адразу ў снег.

Кап...
        кап...
                кап...

Капяжу застылыя гукі
У марознай аціхнуць цішы –
Можна браць тады ў цёплыя рукі
Гукі,
Злоўленыя ў ледзяшы...

## Санет кахання

Чаго саромецца,– ты ж у маім санеце,
Як у аазісе закінутым, адна,
Надзейна ахаваная штодня
Ад цынікаў, якіх нямала ў свеце.

Ты мне здалёк, каханая, відна
На беразе нясходжанага лета.
Адзенне ўсё тваё – вяночак з кветак
На галаве, нібыта цішыня.

О ява маіх вечных летуценняў,
Не трэба лепшага табе адзення!

І я заўсёды буду берагчы
Тваю цнатлівасць светлую аддана.
Ты не саромейся мяне. Бо ты адна, лічы,
Тут, у санеце, беражна схавана.

## Падарожжа вакол цябе

Дзень добры, невядомая краіна!
Яшчэ ў вачах тваіх начуе ноч,
І толькі недзе там,
                                    за небасхіламі,
Праменні ўсё спрачаюцца з зарніцамі –
Будзіць цябе ці не...
                                    Ты ж спіш,
І ўсмешка, быццам кропелька на яблыку,
Дрыжыць,
                    качаецца на вуснах разамлелых –
Не дай бог адарвецца, упадзе
І шпокнецца аб коўдру...
                                    Гэты выбух
Цябе разбудзіць...
                                    А цяпер ты мякка
Пад сны падклала цёплыя далоні
І слухаеш, як ціхенька ў падушцы
Дурэюць, нібы тыя кацяняты,
Запозненыя, ранішнія сны.
А бровы – матылі твае пужлівыя –

Прачнуліся і ўжо трапечуць крыльцамі –
На першым промні рады паіграць.
А хвалі валасоў –
схвалёванае мора –
Струменяцца па далікатнай шыі,
Як вадаспады,
коцяцца на плечы,
Ласкава затапляюць нават грудзі,
Пакінуўшы два ціхіх астраўкі.
Ды і сама ты ў акіяне белым,
У акіяне светлым, нібы востраў
Жадомай, пракавечнай прыгажосці,
Якую гэтак доўга я шукаў...
Вітанне,
мной адкрытая краіна!
Я, стомлены самотай падарожнік,
Тут затрымаюся урэшце назаўсёды,
Каб бачыць, як штораніцы праменні
Спрачаюцца,
будзіць цябе ці не?..

## Двое

– Бачыш, дожджык па лузе здалёку ідзе,
Дажджанятак за рукі з сабою вядзе.

– Дзе?
Дажджаняткі? То ж буйныя кроплі.
Уцякайма, пакуль не прамоклі!

– Глянь, вунь жыта паклоны б'е дожджыку ў пояс,
Што ён колас яго абмывае і поіць...

– Во як?
Ты паблытала ўсё на свеце:
Жыта проста гне вецер.

– Канапаціць шпакоўню спяшаецца шпак,
Памагаюць і дзеткі ў працы сяк-так...

– Як?
Ты не бачыш нічога, галуба,
Шпак жа чысціць – дый толькі! – дзюбу.

– Чуеш, нехта па дрогкім драўляным мосце
Так грукоча – спяшае ўцячы ад кагосьці...

– Штосьці
Я не бачу, не чую нічога,
Апроч грому – мокрага, злога.

– Ну й гарэза ж ён, дождж, цалавацца так хоча!
Вусны нашыя лашчыць, заглядвае ў вочы...

– Скончы!
Стой адна, на дажджы я стаяць не згодны,
Бо тут кожная кропля – як цвік халодны!

* * *

Хоць продкі здаўна мае хрышчоныя,
Ва мне язычнік не памірае,
Калі ўсе графікі я ламаю
І цягніком ці нават трамваем
Спяшаю ў храмы свае зялёныя.

Там станаўлюся я мнагабожцам –
Мне трэба многа чаму пакланіцца:
Лясной крыніцы – з яе напіцца,
Лісту, суніцы, грыбку, травінцы
І сонцу.

Як продак, я спавядаюся дрэвам,
Прашу ў сонца я ўраджаю,
Хоць сам не сею і не збіраю,
Апроч лірычнай,
нідзе не маю
Дзялянкі выкарчаванай пасеву.

Стаю, укленчаны.
Чую, мамант,
Той, што ў паганскае яшчэ ранне
На продка рынуў, скубе старанна
Траву.
Я чую яго дыханне –
Аж вецер ходзіць між валасамі...

## Вечны пацалунак

Яны і самі, пэўна, ўжо не помняць,
Як усё гэта адбылося.
Неяк
Выпадкам вусны вуснаў дакрануліся
Ў напружанай, напятай цішыні.

Калі гэта было?
Ў якім стагоддзі?
Які мастак у мамантавай шкуры
Злучыў на камні
Ў вечным пацалунку
Іх пажадлівасць, прагнасць пачуцця?

А мы знайшлі той камень.
І застылі –
Уразіла нас чысціня кахання,
Якую зберагглі праз годы
Двое
Далёкіх, невядомых нам людзей.

Яны ж, ахопленыя вечнай страсцю,
На нас ніякай не звярталі ўвагі,—
Бо не маглі
Ад вуснаў адарвацца,
Што і вякі ніяк не разнялі...

## Галерэя вокнаў

У горадзе, у вячаровых прыцемках,
Ёсць доўгія, як вечар, галерэі –
То галерэі вуліц.

Штодзень тут абнаўляюцца карціны,
Падсвечаныя хатнім асвятленнем
У рамках вокнаў.

Вунь, бачыце, эцюд «Каханне»:
Заціхлі ў шчырым пацалунку вусны –
Не спудзьце іх, ханжы!

А вось на ложку маці з немаўляткам:
Яна сябе даўно закалыхала ўжо;
Дзіцё ж яшчэ не спіць...

О, ўсплеск натхнення! Бачны толькі рукі,
Як хлеба чорнага два ўпечаныя боханы,
То праца на стале.

І раптам профіль мудрасці і думак...
Пра што задумаўся ты, неспакойны Фаўст,
Забыўшыся на чай?

Тут – сын даўно чакае бацьку з працы:
Ён прынясе маламу многа казак,
А з імі – сон.

Вось гэтую карціну я дапоўню
І ў яе, нібы ў гняздо птушынае,
Сам увайду:

Бо ў тым акне — мой сын.

* * *

Які чалавек вуглаваты!
За ўсё на зямлі чапляецца —
За лясы, за хаты,
 за сьвяты,
На цішыні і то спатыкаецца.

Чапляецца
 за моды, за густы,
За сынавы ручаняты,
Аб пах сусветны капусты
Спатыкаецца
 чалавек вуглаваты.

Спатыкаецца аб прасторы,
Аб гнёзды,
 дзе спяць птушаняты.
І нават за неба, за зоры
Чапляецца чалавек вуглаваты.

* * *

Хаця ў аснежаных залужжах
Агонь начлежніцкі ачах,
Ледзь толькі вочы прыймружыш —
Нясуцца коні ў лета дружна,
Імчацца на начлег праз сцюжы
На капытах, на капытах, на капытах...

## На выстаўцы дзіцячых малюнкаў

Неўтаймаванасць гулкая фантазіі,
Я па тваім хаджу сягоння свеце,
Як госць далёкі.
І баюся спудзіць
Сваёй разважнасцю і мудрасцю халоднай
Вось гэта свята неслухмяных ліній,
Яшчэ не зведзеных ні ў якія параграфы
Вучоных кніжак.
І плывуць па сценах,
Нібы пасля вялікіх крыгаломаў,
Трохкутнікі і паралелаграмы –
З фантазіі сабраныя дамы.
З усіх бакоў іх асвятляюць сонцы –
Калючыя, праменістыя кактусы:
Як транспарант,
бяры яго за промень,
Нясі па свяце вымраеных вуліц
І асвятляй расчыненыя вокны,
Тут з іх адных усе дамы сабраны –
Хляўчук і хорам,
дача і турма...

## Праліў сноў

Як калісьці ў дзяцінстве,
зноў
Я плыву па праліве сноў...
А за мной па абодва бакі
Узыходзяць мацерыкі.
І, прарэзаўшыся праз гады,
Атрасаюцца гарады
І спыніцца просяць мяне –
Пакланіцца сваёй даўніне.

Я ж мінаю іх маякі
І плыву глыбей у вякі.
Я прыбіўся да гону рыб
І крычу, як дэльфін,– аж ахрып;
Так прашу – зразумейце мяне,
Птушкі, стоеныя ў траве,
І фантаны марскія – кіты,
І ты,
        мой далёкі, далёкі дзед!
Да цябе твой нашчадак ідзе
Праз бухенвальды вайны,
Праз інквізіцый агні,
Праз бронзавы век
За каменны век
Ідзе чалавек.
Мінаючы патры- і матрыярхаты,
Нарэшце знаходжу я свой пачатак –
Ты на чацвярэньках ідзеш, як мядзведзь,
На свайго прапраўнука паглядзець.
Прывітанне! Здалёк я прыйшоў –
Аж з тваіх неакрэсленых сноў!..
Пасля доўгіх і цяжкіх мук
Навучыўся хадзіць ты на двух
І на ловы цяжкія пабег
Аж за каменны век,
Прама ў атамны век...
Я ж сяджу і дрыжу за агонь –
Ты глядзець даручыў мне яго...
А як вернешся зноў,
                                    я дамоў
Паплыву па праліве сноў...

## Пажар у старажытным Полацку

> В Полотске позвониша заутренюю у Светыя Софеи въ колоколы: а он въ Кыеве звонъ слыша.
>
> *«Слова аб палку Ігаравым»*

Полымем раскалыханыя званы,
У Полацку
Кідаюцца ў агні яны,
Нібы жывыя,—
Ім цесна ў цеснаце званіц
Званіць.
«Дапамажыце, людзі дарагія!
Хоць нечым...
Мы клічам вас на веча!»
А ў адказ, аглушаныя звонам
(Не адарвацца птушкам ад званіц!),
Крычаць, лятаючы ля іх, шалёна
І падаюць, як факелы, уніз...
У горадзе — адны званы.
А вораг тут, ля гарадской сцяны,
І чуцен звон ягоны:
Звіняць страмёны,
Мячы і дзіды звоняць...
Звіняць званы.
І плавяцца званы, бы воск.
І кропелькі — маленькія званочкі — у жар
Звіняць і падаюць,
І падаюць...
Бы скідвае на мёртвыя стагоддзі
Свой рэквіем пажар.
«Народзе, дзе ты, мой народзе!..»
Маўчаць, дымяцца ваяры.
Званы кідаюцца ўгары
І клічуць мёртвых зноў на веча...

Трымайцеся, званы! Пачуў вас...
Коней асядлаў...
Спяшае з Кіева дадому Усяслаў,–
Будзе сеча, будзе сеча...

Але пакуль
Ад агню паўсюль
Абараняюцца званы адны...

## Вечаровая песня лесаўчыка[1]

Абсыхае мой конь уночы –
Нялёгка было і каню...
А вочы, забітых вочы,
Да майго спяшаюць агню.
І, ціхія, сочаць самі
За буднем маіх клапот.
А сала тады, нібы камень,
Не лезе ў засмяглы мой рот.
Яшчэ не астыла руля,
Загады грымяць увушшу...
    Маці, мая ты кукуля,
    Прысніся свайму Тамашу!

Даўно ўжо блукае слава
Па пятах нашых пакут,
І просяць чужыя дзяржавы
Лесаўчыкоў хоць капу.

---

[1] Лесаўчыкі – беларуская вайсковая вольніца канца XVI – пачатку XVII стагоддзяў. Славіліся сваёй смеласцю. Абаранялі не толькі свае землі, але іх прасілі на дапамогу і іншыя краіны тагачаснай Еўропы. Прымалі ўдзел у Трыццацігадовай вайне, у барацьбе супраць туркаў, у войнах Запарожскай Сечы.

І мы распраўляем плечы,
Імчымся на злом галавы
І смела кідаемся ў сечу,
Нібы раззлаваныя львы...
Павісні над сумам, поўня,
І асвятлі мне душу...
Вазоўня, наша вазоўня,
Прысніся свайму Тамашу!

І вось, як паранены, гасне
Стомлены стогнамі дзень...
Хто, нібы толькі што пасвіў,
Гусака на вяроўцы вядзе;
Хто сала полаці выняў –
Наесціся толькі й ахвоч;
А хто ў падранай пярыне
Вязе паланянку на ноч.
Абіраецца тая ад пуху...
Каханая, штодзень прашу.
Рагнеда! Дзе ты? Паслухай –
Прысніся свайму Тамашу!

Прынясі хоць у сон мне дзетак,
Якіх яшчэ ў нас няма.
Усю ноч, хоць і стомлены гэтак,
Ім аддасць твой далёкі Тамаш.
Я ў сне б на радзіму паехаў,
Каб управіцца к самай касьбе,–
Так бы ляскалі рэхвы, што рэха
Даляцела б і ў сон да цябе.
Зноў вочы... Зноў вочы... Над імі
Рук, быццам крылаў, шум...
Валошка... Валошка з радзімы,
Прысніся хоць ты Тамашу...

## Пятля Кастуся Каліноўскага

Нялёгка быць вераўчанай пятлёю
І чакаць тваёй шыі, хлопча...
Лепей з табою я звозіла б сноп'е,–
Калёсы аж квокчуць, а мы на возе;
Снапы я, вяроўка, уціснула моцна,
Казыча калоссе – аж хочацца чыхнуць;
Я – лейцы таксама ў руках тваіх цёплых...
Нялёгка чакаць тваёй шыі, хлопча!

А магла б я радзіцца й абрусам,
Якія ткаў добра калісьці твой бацька.
Мяне б заслалі на стол святочны,
Пітвом і ядою мяне б пазаставілі,
І ўсе гулялі б да самае раніцы
Твае заручыны з чарнабровай Марысяй...
Страшна чакаць тваю шыю, хлопча!

Ці мала на што вам трэба вяроўка,–
Спачатку трымала б я вашу калыску,
А потым магла б зрабіцца і гушкалкай
Для вашых дзяцей. І яны б любілі
На мне гутатацца да самае столі,
А вы, іх калышучы, шчыра б смяяліся...
Жудасна абвіваць тваю шыю, хлопча...

А магла б я стаць і аборамі
Да лапцей тваіх. І з табой тады
Мы пайшлі б таптаць небасхілы
Гэтым вечным мужыцкім абуткам,
Гэтай вечнай мужыцкай праўдаю,–
І святло б мы выкралі ў ночы...

Скінь мяне з шыі, хлопча!
Памажыце хутчэй яму, выракі...
Памажыце хутчэй...
Памажыце...

Кляніце мяне, стагоддзі!
Кляніце,
Мяне кляніце!
Моц маю, людзі, кляніце!

## Тураўская элегія

Сёння вясна красуецца, ажыўляючы зімовую прыроду. Буйныя ветры, ціха павяваючы, песцяць і гадуюць плады. І зямля, жывячы насенне, родзіць зялёную траву...

*З малення Кірылы Тураўскага*

Прыгінае і самых высокіх
Да зямлі вечны цяжар гадоў.
І цішэюць, цішэюць крокі
І людзей і старых гарадоў.

Як прысеў ты, драўляны горад!
З крэктам з замкавай споўз гары.
І стагоддзі з табой не гавораць,
Як калісьці маглі гаварыць.

І за сценамі замка не радзяць,
Як прыняць з Егіпта гасцей.
А на колішнім княскім пасадзе
Бульба расце.

Покуль сала княгіня смажыць
(Пах яго заваёўвае дзень),
З камунальных харомаў княжыч
Па каня з аброццю ідзе.

Бы праз сон, праз гады сваю веліч
Слухае горад стары,

Як над ім,
над стольным,
звінелі,
Нібы песня, званы ўгары.

А таму,
калі сонца прагляне
І ўдзяўбнецца промнямі ў снег,
Як продкі, спавядаюцца тураўляне
Вясне.

Хоць і вёснаў мінула багата,
Толькі ў Тураве,
як і тады,
Зямля атуляе і корміць зярняты,
Каб радзіць,
як даўней,
плады.

* * *

Лягчэй вы памiралі, нашы прашчуры,
Бо верылі, што будзеце прыходзіць
Сюды, дамоў, на кожныя Дзяды –
Вясной і ўвосень. На сваім падворку,
Перш чым зайсці у сцішаную хату,
Усё агледзіце руплівым вокам,
За кожны зна́дабень зачэпіцеся вы:
Вясной – у баране паправіце кляцы,
Падмажаце рыпучыя калёсы,
Павесіце на месца скінутыя лейцы
І ў думках свайго сына паўшчуваеце,
Што гаспадарыць ён не так, як вы.
А восенню ў вас іншы клопат –
Прыкінуць намалочанае збожжа,
Зірнуць, ці добра выкапана бульба,

Аўса насыпаць коням поўны жолаб
І ўзважыць добра ўлежанае сена –
Ці хопіць на зіму? А потым
Вы прыйдзеце ў цяплынь начную хаты
І сядзеце у покуце на лаву,
Драўляную намацаеце лыжку
І саганок, закураны у печы;
І есці будзеце са смакам груцу,
Пакінутую на стале для вас,–
Так некалі вячэралі вы ў поцемках,
Вярнуўшыся запозна з дамалотак...
З якою ж прагай вы пасля вячэры
Нагбом з вядра вады крынічнай вып'еце,
Вусы спярша развёўшы даланёю!
А потым, зноў збіраючыся з хаты,
Вы пакалышаце ліповую калыску,
Дзе ваш унук, прачнуўшыся, заплача;
І доўга клямку будзеце шукаць,
Якую вашы рукі гэтак зналі,
Якую рукі сталі забываць.
Ад бразгату прахопіцца нявестка
І сонным голасам спытае: «Хто там?»
А сын спакойна гэтак ёй адкажа:
«Спі, гэта, мусіць, бацька...»
Адкажа так, нібыта, як калісьці,
На досвітку вы ўсталі малаціць...

Лягчэй вы паміралі, нашы прашчуры.

* * *

Маці!
Белыя, жоўтыя, чорныя маці!
Калі вашых сыноў
Вырвуць з вашых абдымкаў
І са звязанымі крыламі

Укінуць,
Як у калодзеж,
У чорнае прадонне турэмных дзвярэй
Нейкія новыя, ашалелыя фашысты;
І калі вы прынясеце вязням перадачу –
Букет ціхіх, нявінных кветак,–
Ведайце,
Вас могуць расстраляць
За падбухторванне да ўцёкаў.
Кветкі за кратамі пахнуць свабодаю!
Іх забараняецца прыносіць у турмы:
Там гэта ўжо зброя –
Белыя, жоўтыя, чорныя кветкі.

## Гарады, якіх няма

*Мінску – зруйнаванаму вайною*
*і адбудаванаму нанава*

Яшчэ і сёння
Рыпяць масніцы
У даваенных вашых дамах.
Яшчэ і сёння пад'ездам сніцца
Спакойных кветак спакойны пах.

Яшчэ і сёння –
Насцеж балконы:
Не зачыняліся з таго дня.
І грамафоны, і патэфоны
З даваеннага лета звіняць.

Там яшчэ й сёння
Гуляюць дзеці
У даваенную, тую вайну.
Набіты паркі. У мірным леце
Не заўважаюць шчэ цішыню.

Заходзіць сонца –
Чуеце, шорах?
Салдаты мірна кладуцца спаць.
Засынаюць за горадам горад,
Раніцою якім не ўстаць.

Мы нават чуем,
Як госці звоняць
У даваенных гэтых дамах;
І прачынаемся нават сёння
У гарадах, каторых няма.

## Па вайне

Быў цяжкі год,
Жаночы год.

Удовы ўпрагаліся ў параконныя плугі,
А мы, дзеці,
Ледзь паспявалі бегчы за гэтымі плугамі,
Якія валілі нас,
І мы, як галчаняты, губляліся ў баразне –
Мы, мужчыны...

Яны паднімалі нас,
Атрасалі ад зямлі
І цалавалі неяк вельмі ўжо нязвыкла –
У самыя губы...

Быў цяжкі год,
Жаночы пот –
Салёны, як удовін сум...

## Ціхая мелодыя

Блукаю, ўсхвалёваны нечым,
І чую прыглушаны шорах –
Штосьці рыхтуе вечар,
Збіраючы шэры морак.

Пераймаю вячэрнія цені,
Бы ягнят, што вяртаюцца з поля.
Лаўлю цішыні трымценне,
Хвалююся, як ніколі.

Не кідаю зялёнай вахты
І бачу: як продкі на веча,
Дрэвы – зялёныя яхты –
Сплываюцца ў ціхі вечар.

* * *

Я выплываю з адзіноты,
Нібы з халоднай глыбіні,
І бачу сонца ў вышыні –
Я выплываю з адзіноты!
Святлеюць сонечныя дні,
І рукі просяць зноў работы:
Я выплываю з адзіноты,
Нібы з халоднай глыбіні...

## Адзінец

Калі ў зубровым статку
яго мудрасці стане цесна,
Калі яму надакучыць
непатрэбная мітусня,
Ён ідзе ў лістападны шоргат –
у сваю пажоўклую песню,

Дзе дрэвы, нібы стагоддзі,
над кожнай казюркай звіняць.
Ён пакідае дзялянкі,
сагрэтыя матрыярхатам,
І матрыярхатам прапахлых
яшчэ маладых зубранят...
Ён будзе прыходзіць штовосень
сюды, бы ў вясельную хату,
Каб прагна кахаць і лашчыць
слухмяны матрыярхат.
Цяпер ён застацца хоча
толькі сам-насам з сабою,
Каб аднаму пераслухаць
невыразны ўспамінаў хор.
Можа, прымроіцца мамант,
з якім ледніковай парою
Побач яны выдзіралі
абледзянелы корм.
Ідзе ў свае ён стагоддзі,
дзе дрэвы, як вёрстаў цені,
Вядуць яго далей і далей —
у самы ціхі гушчар.
І яму саступаюць дарогу,
бы слугі, дзікі і алені.
Бачаць: ідзе, як філосаф,
іх непадробны цар.

* * *

Я ўночы прачнуўся...
Хто там?
Хто ходзіць, нязваны, па хаце
І лісцем апалым шуршыць,
Быццам цэлы сквер,
Над маім цішынёю аглушаным вухам...
Хто там?..

І што яму трэба, прыхадню,
Ноччу ў чужой кватэры?
Я чую: ён пахне дажджамі
І атрасаецца ля майго ложка,
Як мокры кот...
«Гэй, паслухай,
Чаго тут і хто шукае –
У мяне ж няма чаго красці!»
«Супакойся,
Я – восень,
Позняя восень...
Мне трэба забраць апошнія кветкі,
Што стаяць на тваім стале».

## Слова ў спрэчках

Навошта так гучна –
Размова з сэрцам,
Калі ў той размове
Сэрца не б'ецца.

Навошта душу
Раскрываць гэтак смела,
Калі ў той душы
Бяздушнасць засела.

Навошта мне кропля
Тваёго неспакою,
Калі ў гэтай кроплі
Мора спакою.

Навошта наогул
Вянок лаўровы,
Калі як хамут
Яго носяць галовы.

## Узнаўленне

Мы, нядаўнія лапы, робім складаныя рухі;
Мы, чалавечыя крылы,– звычайныя дужыя рукі,
Мы – нядаўнія лапы.

Мы так сёння песцім Зямлю, што абдзіраемся самі,
Да крыві абдзіраемся яе ільдамі, лясамі, гарамі –
Так любім Зямлю...

Мы грэем яе, Зямлю, як грэе яйцо квактуха,
Каб з Зямлі чалавек праклюнуўся
і ў неба рукой пастукаў –
Так грэем Зямлю.

Колькі работы тады мы каля немаўля свайго маем,
У бель аблачын загортваем, промнямі спавіваем –
Колькі работы!

Бо ў далёкім, глыбокім зазор'і
Чалавек апярэдзіць мару,
А там яму будзе патрэбна кожная новая пара
Чалавечых рук,
Чалавечых крыл...

* * *

Гады твае ў снег паўмярзалі,
Ссівеў ты, нібы Антарктыда,
Дзе людзі, нібы сталактыты,
Сябе ля завей сагравалі.
Хоць думкі твае адчувалі,
Што прыйдзе свабода, як выдых,–
Гады твае ў снег паўмярзалі,
Ссівеў ты, нібы Антарктыда.
Калі ж табе крылы прыслалі,

Ляжалі яны без патрэбы –
Далёкім здавалася неба,
Бо крылы ужо не ўзнімалі –
Гады твае ў снег паўмярзалі.

* * *

Ужо даўно на тым баку планеты
Сланечнік утрапёна круціць галавою –
Маленькі спадарожнік сонца
Спяшаецца за сонцам паспяваць
Па колцу цеснаму арбіты...
У нас жа ноч... І каля нас па кругу,
Як конь сляпы, што спрэжаны з прыводам,
Няўмольна ў цемры ходзіць цішыня –
Яна часамі горш, чым нават лямант,
Не дасць заснуць. Калі ж у нашу памяць,
Асветленую гэтай цішынёю,
Бултыхне атам дробненькі – адразу,
Нібы кругі ад камня па вадзе,
Расходзяцца кругі яго арбіт –
Маршчыны нашых роздумаў над лёсам.
Зноў цішыня... І ў ёй зусім выразна
Мы чуем, як усюды на планеце
Спяшаюцца пясочныя гадзіннікі –
Перасыпаецца бязлітасна пясок...
Ну дзе ты, сонца? Цішыню напоўні
Рабочым гулам і рабочым рытмам:
Няхай усё забегае, заходзіць
Па пракавечных нітачках арбіт.
Вось штосьці дзынкнула... Нарэшце!
Гэта промень
Завёў сланечнік – сонечны гадзіннік.

* * *

Вітанне, раніца!
Пасля бяссоннай ночы
На стол прыселі вершы адпачыць.
Так падаюць на бераг птушкі,
Памераўшы на крылы акіян.

І ловяць дзюбамі разяўленымі промні –
Правеславаць не жарты ж акіян...
І на стале маім,
як стомленыя крылы,
Лісты паперы доўга шчэ трымцяць.

* * *

Чысцінёй святліцца слова...
Новы год. Бялюткі снег.
Звонкі ранак, нібы смех,–
Пачынай усё нанова.

Першы дзень. І ты не жыў
На зямлі – ўяві! – ніколі,
Не араў, не жаў у полі
І па снезе не тужыў.

Першы ўздых. Глыток – да звону.
Гэты пругкі дар жыцця
Пі да самазабыцця –
Не спатоліш жад да скону.

Быў ты кепскі. Быў няшчыры.
Не аднеквайся – быў, быў!
І не светла часам жыў –
Пачынай жа новы вырай.

Новы год наўленне туліць.
У надзей – па палазу...
А снягурачкі-матулі
Снежанят дамоў вязуць.

Пад санямі рып, як змова.
Снежанятак чысты смех.
Новы год. Бялюткі снег.
Чысцінёй святліцца слова...

* * *

Здараецца, наплыне дабрыня
І так захопіць дзіўная чуллівасць,
Што ўсё на свеце хочацца абняць,
Да сэрца ўсё прылашчыць беражліва.

Зласлівец – быццам подлы не такі,
І дурань – разумнейшы можа здацца...
Ну, што ж, паганец,– не хавай рукі,
Хадзі бліжэй, не бойся парукацца.

Сп'янелы сонцам, збегшы ад хлусні,
Нібыта чмель, у леце я шчырую.
Усхваляваны ласкаю, усім,
Як волю, дабрыню сваю дарую.

Няслаўя многа меў я на вяку,
Яшчэ нямала ўперадзе такога.
Падай, давер, мне шчырую руку,
І хай пад ногі лашчыцца дарога.

Дарога лечыць, нібы чарадзей.
Дык дзякуй жа табе, зямля святая!
Расіне – «добры дзень!»
І промню – «добры дзень!»,
І звера ўсякага, як друга, я вітаю.

Насмелюся, як поўсць, пагладзіць рунь
І хатам, як бажніцам, пакланіцца;
Расчулены, з крыніцай гавару,
Ля дрэва кожнага, бы хмель, гатоў абвіцца.

Па красках, што сляды мае заткуць,
Я так спяшаюся, бо я павінен
Падняць галоўку кожнаму квятку
І ўзняцца кожнай памагчы травіне...

* * *

Як жа хораша ўваліцца
Пасля ўтомы ў лугакветкі,
Калі воддаль – камяніцы,
Калі поблізу – палеткі.

Перапоўнен ты гудою;
Вочы стомлены раллёю,
Ногі – доўгай баразною,
Рукі – плугам ці касою.

У цішы ляжыш адвечнай,
Распластаны, родны з ёю...
Нават чуеш – плечы ў плечы
Ты зрастаешся з зямлёю.

І нічога больш не трэба,
І мана – нібы не тая.
Над табой высока неба,
Пад табой – зямля крутая.

Ты між іх. І ў гэтым цудзе
Аж не верыцца ў такое,
Што ляжаць калісьці будзеш
Між зямлёю і зямлёю.

Цішыня – сама нявіннасць,
Ды спакой – не дужа глыбак.

Зварухнулася травіна,
А здалося – ўпала глыба!

* * *

Раніца. Сонца. Ралля.
Трава ўся ў расе – як плача.
Неба. І навісь галля...
Дзе я ўсё гэта бачыў?

Туман. Рачулка. Лугі.
У кожнай расіне – па промню.
Краскі – яшчэ без смугі...
Адкуль я ўсё гэта помню?

Спакой. Цішыня. Авадзень.
Птушкі ўгары крыляюць.
Звініць, нараджаецца дзень...
Адкуль я ўсё гэта знаю?

Бы продак, ляжу ля ракі.
Раса мне ногі халодзіць.
І чую – інстынкт праз вякі,–
Як рыба ў глыбінях ходзіць.

Банальна ўсё. Так, было –
І луг, і птушкі, і дрэвы.
І сонца было, і крыло было,
Былі і птушыныя спевы.

І я, магчыма, ўжо быў,
І я ляжаў, можа, гэтак.
І вось праз вякі не забыў,
Як прачынаецца лета.

Было ўсё, было... І ўсё ж –
Раніца. Неба. І промні.
І цёплы – праз сонца – дождж...
Чаму я ўсё гэта помню?

* * *

Чаго дамогся – не цікава,
Што збылося – драбната.
І слава, што была ласкавай,
Нібыта лашчыцца не так.

А мы праз славу, ды праз тую,
Зноў прагнем нейкіх новых дзіў –
Незадаволена прастуем
Шукаць, дзе шчасце нерастуе,
Дзе лёс нам радасць нарадзіў.

Бо нас хвалюе толькі тое,
Што недасяжнае якраз
І што, як промень, залатое,
На небасхіле дражніць нас.

А дасягнеш – і ўсё збудзённіць:
Бы попел сеў на вугалёк.
Паблякне ўсё, што яшчэ сёння
Святочна вабіла здалёк.

А мы ўсё роўна прагнем свята –
Аж да апошняе мяжы.
І дамагаемся упарта,
Бо дамагацца – значыць жыць!

* * *

Мой агонь пастарэў на год,
Маё вогнішча вечарэе.
Ачышчае мяне ад нягод
І звядае само, як лілея.

Гавары са мной, гавары,
Мой касцёр крутабокі, святлівы.
Аж да самай да цёмнай пары
Я з табой гаварыць шчаслівы.

Ачышчальная сіла агню,
Я люблю тваіх іскраў завею!
Можа, я тыя дні даганю,
Дзе гады яшчэ ў завязі спеюць...

Успаміны шуршаць і шуршаць,
Як апалае лісце пад восень...
Што ж мы будзем успамінаць?
І што высветліць памяць папросім?

Жыў, здаецца, без звад. Заўсягды,
Як дзяцей, гадаваў свае мары.
І дзівіўся – і дні, і гады
На касцёр ідуць, бы ахвяры.

Ну, ці быў жа шчаслівы, скажы?
Быў! – усім адкажу я натхнёна...
Той шчаслівы да скону, хто жыў
На зямлі на нашай зялёнай!

Нават той, каго лёс не грэў,
Высвятляе жыццё, нібы свята...
Не варушацца кроны дрэў –
Там, у гнёздах, спяць птушаняты.

* * *

Сядзім, смяёмся за сталом
І весялімся, нібы дзеці.
Тады для нас на цэлым свеце
Няма бяды, не тхае злом.

А недзе там, а недзе там
Віруе подласць хваляй бруднай,
І чалавеку дужа трудна –
Так, недзе там. Так, недзе там.

А мы частуемся. Спяваць
Спрабуем шчыра і бадзёра,
Нібы няма на свеце гора
І сіл няма куды дзяваць.

А недзе плач, а недзе мор.
Наш незнаёмы друг распяты,
Укленчыў хтосьці перад катам,
А той – шукае ўжо тапор.

Як птушанё, душа крычыць –
Ты ў свет уключан, бы ў разетку.
І боль чужы – калючы гэткі...
Як памагчы, чым памагчы?

І лекаў для душы няма:
Ці падзяліцца словам шчырым,
Са светам – падзяліцца мірам,
Ці песняй праўду падтрымаць?

Сядзім. Спяваем. Спеў – пад столь.
Мы весялімся, нібы дзеці...
А болю – цесна болю: ў свеце
Перанаселенасць на боль.

* * *

Я выходжу з раба пакрысе,
З-пад пачцівасці выбіраюся.
Выпрамляюся, выпраўляюся
І дзіўлюся: я ж як і ўсе.

Дык чаго ж я хадзіў па зямлі
Яе ўгнутым, нягодным сынам;
Мае вочы – дарогі мялі,
Мае рукі – у пыле, у гліне.

Як прыемна плечы размяць
І адчуць іх напятую сілу,
Песню тую на свет заспяваць,
Што даўно ўжо выйсця прасіла.

Ах, як хораша йсці ў повен рост,
Калі ўпэўненасць душу агорне:
Галаву – аж да самых нябёс,
Ногі – ў травы. Па самыя корні.

Як імя, сваю годнасць знаць,
Ад ліслівасці межавацца,
Сарамлівасць рабскую змяць
І не ўкленчвацца, не прыніжацца.

Бог з ім, з даўнім табою,– з рабом!
Рабалепства, бы скуру, скідаю,
Разагнуцца, узняцца жадаю,
Сонца, неба напіцца нагбом.

Шчырым быць не баяцца ў жыцці
І не думаць ніколі: «Што потым?»
Па зямлі – поўным ростам – ісці
І на свята, і на работу.

А калі давядзецца дагнаць
І калі дазволіць дарога,
Як бы добра раба вось такога,
Як сябе, з каленяў падняць.

* * *

Спатыкнешся аб чэрвень, бывае –
І зімою захочацца піць...
Быццам спёка, як смага, даймае,
Быццам сонца, як задуш, вісіць.

Разамлееш сярод завірухі,
І травою запахнуць снягі.
І сняжынкі, як лёткія мухі,
І сумёты, нібы мурагі.

І, здаецца, як летам – успомні!–
Ты пад сонцам на лузе ляжыш.
А цябе паказытваюць промні,
Бы нядократкі ці мурашы.

Спатыкнешся аб чэрвень зімою –
І забудзеш на ўсе халады...
Ты пабудзь, маё лета, са мною...
Ну, куды ж ты па гурбах, куды?

* * *

І прыйдзе смутак нечакана,
Падсядзе ціха да цябе;
І у абдымкі, госць нязваны,
Бы лепшы сябра твой, зграбе.

І ты сядзіш – не павярнуцца,
Клянеш даверлівасць сваю.

Не для цябе ўжо там смяюцца,
Не для цябе ўжо тут пяюць.

Затое – вырвешся на волю –
Зноў весялішся, як дзіця,
І ловіш, радасны да болю,
Малыя ўсцешынкі жыцця.

Ідзеш у свет – як на малебен,
І ўжо зусім не помніш зла...
Таму і смутак нам патрэбен,
Каб радасць большаю была.

* * *

Кожны дзень прачынаешся з прагаю цуду,
А яго ўсё няма – як будзёніцца ціш!
І дарэмна чакаеш нязвыклага гуду,
Пры якім, нібы ў космас, у свет паляціш.

Так, звычайна усё, як заўсёды – без свята.
І будзёняцца ў шэрані вочы твае,
І зашоргалі ў снежных сумётах лапаты,
І пад кранам вада, як пад лёдам, пяе.

Пад акном неразвіднелым сварыцца хтосьці,
І машыны спрабуюць па веі паўзці...
Ну, а цуд? Ну, а свята?.. Нячастыя госці! –
Ля цябе неяк збоку спяшаюць прайсці.

І сягоння зноў будзе усё, як і ўчора,
Будзе дзень, што на памяць, бы ўрок, завучыў.
І знаёмы аўтобус, і праца – да зморы,
І знаёмая крыўда – як стрэмка ў душы...

Ну, а можа, той цуд, як заўсёды, з табою,
Можа, лепшага свята на свеце няма –
Калі сонца, ўзыходзячы, ў гурбе прыстоіць,
Калі б'ецца, як мятлушка, ў шыбу зіма...

* * *

Пасівела душа, пасівела...
Дзе ж ты, коткая весняя радасць?
Зайздрасць нечая – зазімак белы
Атрасае лісты з майго саду.

І шукае завішна між лісця
Нечапаных пладоў пераспелых...
І дажджы мае быццам імглісцей,
І душа, як сады, пасівела.

Пасівела душа, пасівела
Ад балючай сяброўскай спагуды,
Што, здаецца, каб толькі прымела,–
За табой бы няславіла ўсюды.

А сняжынкі спяшаюцца збочыць,–
Мітусіцца завеіна злая,
Нібы сябра нядаўняга вочы,
Што цябе ў завуголлі аблаяў.

Ёсць такія – нічога святога,
Яны ўгразлі і ў плётках, і ў змане...
Не дай бог вам дажыць да такога,
Калі сябра ваш ворагам стане.

Пасівела душа, пасівела,
Але ёсць і ў сівой свая радасць:
Гэты чысты спакой заінелы,
Гэта ціша зімовага саду...

* * *

Абнаўлення, хлопцы, абнаўлення
Прагнем, нібы ліўня, мы ў цішы.
Абнаўленне – гэта ўжо наўленне
У дарозе стомленай душы.

Абнаўленне – гэта калі промень
Ловіш, як някемлівы хлапчук.
Абнаўленне – гэта калі ў громе
Прагнеш прыручэння гул пачуць.

На ўвесь свет павінен сам іначай
Паглядзець, рассунуўшы галлё...
І сябе самога збоку ўбачыць –
Як чужога, іншага – здалёк.

Абнаўленне вырашае многа
І змывае бруд, нібы рака...
Ці вярнуцца да сябе малога,
Ці сябе ў старым ужо шукаць?

Абнаўленне, хлопцы, абнаўленне,
Абнаўленне кожнае пары.
Нашых крыл здарожаных наўленне
Нам гады паможа прымірыць...

* * *

Зноў мяне прыручаюць дарогі,
Зноў спрабуюць да тлуму змушаць.
Не стамляйцеся ўражвацца, ногі,
Не стамляйся здзіўляцца, душа!

Прыручайце, любімыя, смела –
Я і сам вашай памяці рад.

Колькі шчыра – душою збалелай
Сумаваў я без вашых прысад.

Быў адрокся ад вас – як зняважыў.
Зараз зноў трэба сцежкам гадзіць.
Я выходжу на ростані вашы,
Як малое, вучуся хадзіць.

Цяжка бачыць дарогі праз вокны,
Што шукаюць круты небакрай.
Так і хочацца ў пыльныя скокнуць
І пайсці – толькі кій свой трымай!

Дык прымайце, шляхі, мае ногі
І адразу – у пыл іх, у грунт:
Хай пазнаюць смакоту знямогі,
Хай успомняць загоены гуд.

А дарогі – заўсёды сустрэчы,
«Добры дзень» незнаёмых людзей,
І усмешка, як радасны вечар,
І размова, што ўрунены дзень.

А дарогі – заўсёды трывогі,
Насцярожаны крыху пагляд.
Так, прыемна збірацца ў дарогі,
Ды прыемней вяртацца назад.

А вярнуўшыся з дальняе далі,
Пасадзіўшы ўспаміны на ўлонь,
Ты прыпомніш, як сам на прывале
Прыручаў, бы вавёрку, агонь.

## Там, у дзяцінстве

Там дарагое ўсё такое,
Там заўжды цёплая зямля,
Бо для дзяцей адно і тое ж –
Жыць і гуляць...

* * *

Калі з выраю птушка вяртаецца ў свой небасхіл –
У яе ўжо не два, а мільёны крыл.

Калі лань уцякае – далей ад няўвыклых трывог:
У яе не чатыры – мільярды ног.

А калі чалавек у свой вечар няблізкі ідзе,
Колькі ног ён вядзе, за сабою вядзе!

Іх пазнаць можа столькі стаптаных сцяжын і дарог,
Што хапіла б для ўсіх ненатомленых ног...

Маладых яшчэ ног.

## Пералёт дажджу

Калі дажджуеш у самоце
Пад шэпт суцішаны дажджын,
Здаецца, з імі ты ў палёце,
А не вось тут – адзін, адзін.

Здаецца, з імі – ёсць патрэба! –
Ляціш, вяртаешся здаля
З халоднае краіны Неба
Ў краіну цёплую – Зямля.

Вяртаешся дамоў, як птушкі,
Ляціш, як вырай, на сады;
І вольным лётам пазагушканы,
Вясеннім небам пахнеш ты.

Дажджыны шэпчуцца наўкола,
Паспешна крыллем шапацяць.
А з імі ты ляціш, вясёлы,
Да ніў – зялёнага жыцця.

* * *

Не вернуцца годы – мая радня,
Жыццё, нібы лета, міне...
Нашу настальгію па тых па днях,
Калі ўжо не будзе мяне.

А хто ў тым далёкім леце, чужым,
Як я, вось так прыйдзе на луг
І будзе ісці асцярожна – як жыць,
Каб не наступіць на пчалу.

І хто залюбуецца – гэтакі дзень! –
І ўсцешыцца святам маім:
Вось апляла травінка прамень
І лезе да сонца па ім...

* * *

Іду звычайнаю сцяжынай
Па лузе звыклым да ракі.
Звычайны ветрык лашчыць дрэвы,
Звычайны веташок вісіць.

Кусты срабрацца – як заўсёды,
Звычайна шэпчацца трава.

Нагою звыкла адчуваю
Тугія кропелькі расы.

Вось-вось узыдзе сонца звычна,
Птушыны грымне звыкла грай...
А я іду такі шчаслівы –
Нібы вяртаюся з вайны.

І думаю: о Божа мілы,
За што, звычайнага мяне,
Ты так адорваеш багата
Вось гэтай радасцю, зямля?!

## Уваходзячы ў мора

Ах ты, мора, бяскрайняе мора,
Столькі хваль – не злічыць на вяку.
Я ж пазнаць хачу ў хвалі каторай
Свае рэкі, што ў мора цякуць.

Можа, Свіслач мне тут адгукнецца,
Прыпяць плясне,– як рыба амаль...
А Аршыца да ног прыгарнецца –
Як заб'ецца ад радасці сэрца:
Я пазнаю яе паміж хваль.

## Вада

Вада – бясколерная, празрыстая
вадкасць без паху і смаку.

*З даведнікаў*

Хто сказаў – вада без паху?
Хто сказаў – вада без смаку?
Той, відаць, не смяг у спёку
І ад смагі ў суш не млеў.

Той, відаць, вадой не трызніў,
Не хапаў яе у жмені –
Калі боязна рассыпаць
Нават кропельку ў траву.

Той не мроіў ёй – да тлуму,
І не прагнуў – да трымцення,
Калі п'еш і ўсё, здаецца,
Не спатолішся ніяк.

Той, відаць, не поўз пустыняй,
Не ўсыхаў у акіяне,
Калі пахі ўсе і смакі –
У глытку пітной вады.

У глытку, што як дажджынка,
У глытку, што як расіна,
На лістку, бы на далоні,
Гэтак зманліва дрыжыць.

І ўжо ў гэтай нават кроплі –
Усе колеры вясёлкі.
Хто ж яе знаў бескалёрнай?
Божа мой, які дзівак?!

Хто ваду наспех пакрыўдзіў,
Хто ваду спрытна абразіў?
Хто сказаць мог так будзённа
Пра таемнасць – пра ваду?..

Веру я: і ён, сасмаглы,
Толькі ўбачыўшы расіну,
Закрычыць, бы звар'яцелы,
З дзікай радасці:
                    – Ва-да-а!

## Малітва прашчура

Бог ураджаю,
Я цябе шукаю,
Я цябе запрашаю,
Я цябе малю –
Сыдзі на зямлю.
Зірні на нівы,
Зірні на колас:
Хай хмары грывы
Распусцяць наўкола.
Зямля просіць дажджу,
Чым я яе напалашчу?..
Пашлі ты нам Лівуна,
Пашлі нам Церабуна,
Пашлі хоць Цурчана,
А нельга – дык хоць Каплюна,
А ў засушы нас не пакінь.
Амінь...

Каб коласу даць напіцца –
І я згодзен так маліцца.

## Ручай

Сачу празрыстыя струмені
Сярод сутоння серабра.
Санлівай сіні сум асенні
Спяшаю ў песні пасабраць.

Звініць званком звонкагалоса,
Задумна зойдзецца здаля.
Ад звону зумкага, здалося,
Загалубілася зямля.

Булькоча балаўнік без стомы —
Бы бесядзь будняя бабуль.
Булькоча, быццам будзіць бомы:
Буль-буль, буль-буль...

За ім скакаў я бесклапотна —
Куды ж, пястун, мяне завёў?..
Баюся здацца старамодным:
Няма ўжо гэткіх ручаёў!

## Мелодыя на званах

Прысніў-
ся мне
звон дзіў-
ны ў сне.

Прыйшоў
я ў гай —
мой жоў-
ты край.

Дзе звон
травы —
як брон-
завы.

І звон
лістоў —
да сон-
ца зноў.

Чубы
відны,

нібы
званы.

Паглядзь,
любы́ –
звіняць
чубы!

Ад сон-
ца звон
у грон-
цы крон.

Той звон
бяроз
праз сон
прарос.

Прачнуў-
ся... Сны...
Зіма...
Спакой...

Як хто
стрымаў
званы
рукой...

* * *

А мы з табой, бы ў рай, у гэткі
Луг абраскошаны зайшлі,
Дзе матылі – нібыта кветкі
І кветкі – быццам матылі.

Дзе ўсё злілося – неба, травы,
І сонца пах, і рук святло,

І дотык ветрыка ласкавы,
Як матылінае крыло.

Крыляюць мятлушкі і краскі –
І луг і неба ў матылях.
Здаецца, з добрай твае ласкі
У крылле ўбралася зямля.

Лятаюць мятлушкі – па пары,
Па пары – лашчацца кветы.
І мне з табой шчасліва марыць
Пра ўсё вось з гэтай ціхаты.

А цішыня – нібы цунамі,
Бы вецер, што наш луг садзьме...
І толькі мятлушкі над намі –
Усё па дзве...
Па дзве...
Па дзве...

## Чаканне цябе

Чакаю я цябе. А ты не звоніш:
Званок унурана маўчыць, бы хто наняў.
І нібы хрушч у стомленых далонях,
Шуршыць, як адзінота, цішыня.

Як холадна мне без цябе. Імглiста.
Пакой зімой і сіверам прапах.
Бы дзьмуць вятры з усіх бакоў са свістам,
А я стаю на гэтых скразняках.

Чамусьці толькі сэрца прадзімае,
І ля яго – ільдзінкай халадок.
Чакаю – як ільдзінку адганяю...
Чаго ж маўчыш, устуджаны званок?

Ах, холад! Што да сэрца прычапіўся?
Званок... Як спеў... Так звоніш ты адна...
Здалося, жаўранак з-пад купіны ўсхапіўся.
Павіс у небе... Ты – нібы вясна,
Мая каханая!

## Твае рукі

Твае рукі, твае рукі нада мною,–
Нібы лебедзі над белаю зімою.
Як ласкава яны кружаць
І са мной па леце тужаць,
Нібы лебедзі над белаю зімой.

Цяжка, рукі, расставацца з вамі дужа
І без вас мне аставацца паміж сцюжаў...
Не ляціце, рукі, ў вырай,
Нада мной кружыце шчыра –
Нібы лебедзі над белаю зімой.

Я люблю, як твае рукі нада мною –
Нібы лебедзі над белаю зімою,
Як яны садзяцца міла,
Склаўшы крылы, склаўшы крылы,–
Нібы лебедзі над белаю зімой.

Калі лашчаць валасы мне твае рукі –
Слухаю, бы песню, я іх рухі.
А яны пяюць шчымліва
І крыляюць палахліва,–
Нібы лебедзі над белаю зімой.

## Музыка для закаханых

Адкуль, адкуль ён, гэты лёгкі сум?
Яны ж кахаюць, бачыце,– кахаюць.
Кахання свайго чыстую красу,
Як немаўля, абачліва люляюць.
Адкуль, адкуль жа гэты лёгкі сум?

Шчаслівыя. Нашто ім сумаваць
У гэтым свеце ласкі і пяшчоты,
Калі ад шчасця кружыць галава
І светла так ад шчырасці і цноты –
Шчаслівыя. Нашто ім сумаваць?

Ды ўсё ж – як музыка шчымлівая, туга
Праз радасць прарастае непрыкметна.
І шчасце – як адчай, і ласка – бы смуга,
І боязь, боязь страціць усё гэта.
Таму – як музыка шчымлівая, туга.

А рукі спазнаюць пяшчоту рук.
І вочы – вочы. Вусны лашчаць вусны.
І страшна гаварыць. Здаецца, змовіш гук –
І знікне ўсё. Няўтульна стане. Пуста...
Маўкліва спазнаецца ласка рук!

А музыка тужліва так шчыміць,
І ў светлаце так хораша на сэрцы...
Трывожна-радасна ў такой харашыні,–
Нібыта зараз трэба ім памерці...
І музыка тужлівая шчыміць.

Напоўнены каханнем, як жыццём,
Як цішыня – жадлівыя абое.
Памруць яны – памрэ, здаецца, ўсё;
І цэлы свет патушаць за сабою,
Напоўнены, як ласкай, пачуццём.

Адкуль, адкуль ён, гэты лёгкі сум?
Яны ж кахаюць, бачыце,– кахаюць.
Кахання свайго чыстую красу,
Як немаўля, шчаслівыя, люляюць.
Адкуль, адкуль жа гэты лёгкі сум?

* * *

Было тады
Сяло Сады.
Цвілі гады,
Нібы сады.
Шумеў наш сад,
Не меўшы звад.
І ў полі спеў
Паволі спеў.
І ты была –
Кветы нясла.
І я ў вясне
Стаяў, бы ў сне:
Спакусны ўзлёт
І вуснаў злёт.
І ціш вачэй
Паміж начэй...
Сяло Сады,
Сяло Сады
Цвіло тады
Там, нібы дым,
Нам, маладым...
Сяло, сяло...
Было... было...
Сады, Сады...
Тады... тады...

* * *

Сумую я па лыжным следзе...
Спакусна лашчыцца лыжня,
А навокал, як вокам згледзець,–
Цнатлівы снег і цішыня.

Твой ціхі след пазнаю лёгка,
Бо ля яго суседзіць мой.
Да сварак, звад яшчэ далёка –
Адной мы дыхаем зімой.

І халадок зімы на вуснах,
Сняжынкі плавіць дабрыня.
І гэтак хораша, спакусна
Твой след, як вецер, даганяць.

Ці ведаў я лыжню такую?
Яе, магчыма, й не было...
Па гэтым проста я сумую,
Калі – па сэрца замяло.

А дзве лыжні я недзе бачыў,
А мо прыдумаў нават сам,
Як сімвал вернасці юначай
Тваім снягам, тваім лясам.

І я хацеў бы, каб заўсёды
Імчалі поруч дзве лыжні,
Абняўшыся, як тыя годы,
Вясёлыя, як тыя дні.

І ўспамінаюцца самотна
Зіма і снег – як даўні доўг.
А мы далёка ў незваротным
Ад той лыжні, ад тых слядоў.

Як час спяшаецца імкліва –
І толькі ляскаюць гады...
А я вяртаюся, бы ў дзіва,
І бачу тыя зноў сляды...

## Амаль буколіка

Я зноў, каханая, з табою.
Мы ў красках вязнем лугавых –
Не бачым неба над сабою,
Не чуем пад сабой травы.

Турбуе нас адзіны клопат,
Адзіны клопат нас вядзе.
І мы ідзём, прыроды вопыт,
Абняўшыся, як ноч і дзень.

Цяпер і мы – сама прырода.
Мы ў гэтым лузе прараслі,
І з нашых рук сасніла згода
Спляценне прагнае галін.

І мы – свае у гэтых раннях.
Хай бачаць дрэвы – хай сабе!–
Як я, стрыножаны каханнем,
Кружу слухмяна ля цябе.

## Чыстае слова

Не дакранайцеся да гэтай чысціні –
Навошта ўспамінаць яго будзённа!
Няхай яно, цнатлівае, звініць,
Бы свята ў нашай пошласці якдзённай.

Не мацайце здаволена яго,
Не паціра́йце рукі ў нецярпенні

І не гукайце ў сыты карагод,
Як дзеўку, не садзіце на калені.

Навошта прыручаць яго, цугляць –
Няхай яно, як вецер, будзе вольным
І неаб'езджаным, бы ў стэпе дзікім коні,
Яму, як птушцы, дайце пакрыляць.

Не забаўляйцеся ім, сцішаным, прашу,
Як ледунец той, не качайце ў роце,
Бо жывіць слова гэтае душу
І цепліць сэрца, што жыве ў згрызоце.

Не дакранайцеся да гэтай чысціні –
Яго ж у знемажэнні ўспамінаюць...
Няхай яно, нявіннае, звініць,
Як свята,– слова чыстае: «Кахаю!»

## Жанчына спявае

Плытчэюць крыўды і плёткі,
Глыбініць песня жывая.
А, чуеце, здорова ўсё-ткі,
Калі жанчына спявае.

Не плача і не смуткуе,
Не сварыцца і не рыдае...
Сама для сябе такую
Ціхую песню спявае!

Значыць, усё ідзе ладам
І ў хаце, і ў цэлым свеце:
Няма дзе прыткнуцца звадам,
Няма дзе бядзе прысесці.

Сям'ю мінаюць хваробы,
І родзіць, бы лес той, жыта.

Соладка спіць круталобы
Сынок, накормлены сыта.

Значыць, і дом іх дыхтоўны,
Абмінулі каханне марозы;
Значыць, і муж цудоўны,
Прыходзіць дамоў цвярозы.

І ў самой удаецца работа...
Ціхата навакола такая!
Злагада ў чалавечых сотах.
Мір. Ні ў кога ніхто не страляе.

Ад кахання – ну тая ж дзяўчынка:
Цесна ў сэрцы і бэзу, і маю.
А на вуснах – быццам пушынка:
Кахаю,
          кахаю,
                    кахаю...

Для песні трэба прычына,
Для песні трэба нямала...
Шануйма ж гэтак жанчыну,
Каб яна і ў будні спявала!

* * *

Калі, ад шчасця захмялелы,
Стаіш, як дурань, між дарог,–
Не ўспамінаеш, што балела,
І забываеш, што бярог.

Паволі развінаеш плечы,
А на душы – такі спакой.
Тады здаецца – будзе вечна
Імгненне радасці такой.

Няма тугі, няма напасці,
І не збалелы ты ані,
І задыхаешся ад шчасця,
Нібы ад стромай вышыні.

А навакол – смяюцца людзі,
Струменіць цёплае святло...
Спакойны да таго, што будзе,
І да таго, што ўжо было,

Стаіш. Трымціш ад прагі весняй.
Не бачыш, радасны, таму,
Як жаўранак з трывожнай песняй
У бездань неба патануў...

## У гасцях

І стаю я на вашай высокай вяршыні,
Я адбіўся ў рацэ вашай чыстай і сіняй,
Мне ваш вецер ласкава ўзлунаць памагае –
Запрашае ляцець над нязведаным краем:
Там, дзе песня віруе між скалаў глыбока,
Там, дзе мова – арлоў непрыручаны клёкат,
Там, дзе маці для кожнага ласку спяліла...
І ад шчасця ў мяне аж выростаюць крылы.
А не верыце, можа,– памацайце самі:
За спіною трапечуць яны ветругамі...

Я шчаслівы ад думкі: і ў мяне гэтаксама
Ёсць радзіма свая, свой народ, свая мама.

# Да біяграфіі майго народа. I

Паводле плана «Ост» фашысты планавалі знішчыць і выселіць на ўсход 75 % беларусаў, а 25 % – анямечыць.

*З БелСЭ*

І хадзіў бы Міколка Гансам,
І крычаў бы: «Цурук! Цурук!»
«Хайль!» – рычаў бы, нібыта ў трансе,
І ўскідаў бы кінжалы рук.

Боты, як капыты, падкавана
Яго б цяжка па свеце вялі.
І захопнікам звалі б паганым
На сваёй, на роднай зямлі.

І гарой – за радзіму чужую.
На сваю пакрыкваў бы: «Вэк!..»
Вось не знаеш імя, не чуеш –
І ты ўжо жудны чалавек.

Роў бы – фюрэру слава, слава;
Слава – жорсткасці, слава – вайне.
І не знаў бы: падчас аблавы
Нарадзіўся і сам пры сасне.

Яго мама – была партызанкай,
Партызанам – і тата быў.
Ля яго расстралялі іх ранкам,
Ён – радзіўся яшчэ да стральбы.

Сын айчыны і ціхай і смолкай,
Дзе пра волю – і хаты і лес...
Ну, няўжо б, скажыце, з Міколкі
Выйшаў некалі галаварэз?!

Не, не веру! Ў чужыне далёкай
Покліч роднай крыві б не зачах.
Ён пазнаў бы Радзіму лёгка
Па нянавісці ў добрых вачах.

І таму, калі нелюдзі зноўку
Будуць трызніць пра новы прымус,
Помніць трэба, што ты – Міколка.
З партызанскай зямлі.
Беларус.

## Паранены партызан

Я паўзу ўжо даўно па снезе,
І за мною – паўзе след даўгі.
Я ўлядзеў, абмарозіўся ў лесе...
Падпаліце снягі,
Падпаліце снягі!

Хай сняжынкі трашчаць, як ядловец,
Як лаўжы, хай сумёты гудуць.
За агнём –
чужаніцы не зловяць,
Што па следзе крывавым ідуць.

Ах, блакада – удаў валавокі!
Як твае нас сціскалі кругі.
Я адзін... Лес абмерзлы навокал –
Падпаліце снягі,
Падпаліце снягі.

Каля снежнага полымя сяду,
І сагрэўшыся каля агню,
І адзін я прарву блакаду,
І атрад свой адзін даганю!

За блакадай – сябры баявыя,
Партызанскія нашы сцягі...
А аўчаркі блізка так выюць...
Ну, паліце ж снягі,
Паліце... снягі...

* * *

Я люблю цябе да скону,
Я люблю цябе да звону,
Я люблю цябе з вагона,
З самалёта, з карабля,
Цёплы шарык мой зялёны,
Ціхі шарык мой зялёны,
Мікрашарык мой зялёны –
Несхадзімая зямля!

На табе – вясна віруе,
На табе – зіма снягуе,
На табе – і лета чуе:
Восень у лісці шуршыць.
Я цябе знайшоў такую,
Я цябе адкрыў такую,
Зберагу цябе такую,
Покуль буду сам я жыць.

Вось таму змаўчаць не можна,
Вось таму баіцца кожны:
Над табой, такой мурожнай,
У павевах вецярка,
Чуеш, як зусім трывожна,
Як нахабна і трывожна,
Дзесьці здружана трывожна
З мечам шэпчацца рука.

* * *

Гэта дрэва шукае свайго бусла,
Гэта лодка чакае свайго вясла.

Зачакаліся весніцы рыпу гасцей,
Комін – дыму са скваркай, ды найгусцей.

Кропля – ў лузе шукае найплодных мясцін,
Каб пасеяцца ў ім, хмаркай ціха ўзысці.

Неба птушак чакае, пупышкі – цяпла,
Сніць узятак зімою завейнай пчала.

Поле – прагне абуджаных сонцам зярнят,
Вёска – новых, прарослых ля вуліцы, хат...

Гэта ж песня гукае свой сціплы народ,
Каб у ім прарасці хоць на дзень, хоць на год.

## Роднае слова

У 1697 годзе сейм Рэчы Паспалітай забараніў складаць дзяржаўныя дакументы на беларускай мове.
У 1867 годзе царскі ўрад спецыяльным загадам забараніў беларускую мову.

Цябе забаранялі, як скрыжалі,
І адбіралі, быццам бы сцягі,
А крэслілі,–
здавалася, збівалі:
Як ад шпіцрутэнаў сінелі пісягі.

Цябе забаранялі, быццам свята,
Нібы злачынцу заціскалі рот.

А ты і з-за выкрэсленняў,
нібы з-за кратаў,
Глядзела на знямелы свой народ.

Бы ў цэлях, у архівах думкі вязлі...
А ўчуўшы покліч вольнае сурмы,
З-за кратаў словы,
нібы тыя вязні,
Сцягі жаданыя выносілі з турмы –
Да нас, пакуль нямых...

* * *

Зразумець, што ты – народ,
І ад радасці ўзвінуцца,
На любы яго зварот,
Як на імя, адгукнуцца.

Са сваёй Радзімай ты –
Назаўжды адно і тое ж;
І маленькай сваваты
Ад яе ты не прытоіш.

Зразумець, што ты – народ,
Які ў свеце часта хваляць.
Жыць за племя, жыць за род,
Што схавалі часу хвалі.

Памагчы араць і жаць
Нетаропкаму ратаю.
Яго ніву паважаць,
Бо яна ў яго – святая.

Нібы маці, берагчы
Працаўніцу нашу – мову,
Бо яна – жыцця зачын
І пачатак песні новай.

За народ ісці на бой,
Помніць, правячыся боем,
Што стагоддзі за табой
І стагоддзі – прад табою.

Твае раны ўсім баляць.
Нас ратуюць, як ад смагі,
І спрадвечная зямля,
І раскрыленыя сцягі.

Зразумееш, ты – народ,
Крык, як радасць, не стрымаеш,
І падыме, нібы ўзлёт:
Я народ свой, людзі, маю!

## Да біяграфіі майго народа. II

Хто мы такія і ці многа мы перажылі?
Спытайце пра гэта
Нават у нашых птушак.
Ды і мы самі можам расказаць,
Як нясмела пасля войнаў вяртаюцца
у спаленыя вёскі
Першыя ластаўкі;
І як потым –
Нечакана і нязвыкла –
Кідаюцца ў вочы іхнія гнёзды на папялішчах:
Светлыя –
На чорных, абгарэлых бёрнах-галавешках,
І чорныя –
На светлых,
Яшчэ не дарубленых вянцах
Новых хат...

## Да біяграфіі майго народа. III

Народзе мой, народзе!
І як ты толькі выжыў!
Ты ж мог звар'яцець.
Зайсціся ад плачу і гора.
Задыхнуцца ад крыку.
Памерці ад нянавісці
Пасярод звар'яцелага агню,
Які, з паразяўлянымі пашчамі,
Вартуюць аўчаркі, аўтаматы і...
Людзі.
Народзе мой, народзе!
Жудасна ўявіць нават,
Што рабілася ў тваіх спаленых вёсках,
У дымных хатах, хлявах і стадолах?
Што гаварылі дзеці,
Задыхаючыся полымем і дымам?
(Відаць, прасілі адпіхнуць ад іх агонь.)
Што рабілі дарослыя?
(Відаць, яны абгарэлымі рукамі
Трымалі палаючыя стрэхі –
Каб тыя не абваліліся
На дзіцячыя галоўкі,
І, мёртвыя, паміралі яшчэ раз –
У агні.)
Народзе мой, народзе!
Ты ж мог пасля гэтага
Зрабіцца чалавеканенавіснікам.
Здавалася б,
Хіба можна пасля такога смяяцца?
Жахліва!
Цалавацца?
Блюзнерства!
Сябраваць?
Немагчыма!
А ты застаўся дабрадушны,
Шчыры і ветлівы –

Такі, як і да вайны.
Ты зноў сябруеш з людзьмі,
Запрашаеш іх у госці.
І нават немцам гаворыш:
– Калі ласка, суседзі, паедзем у Хатынь...

* * *

Ты кінуў слова ў мяне.
Цяжкое, нібыта камень,
Сагрэты ў далонях
Ці, можа, нават запазухаю...
Вось яно ляціць –
Чуеце, як свішча, гэтае слова-камень?!
Твае зубы сціснутыя.
Вочы – аж узрываюцца ад нянавісці.
А твар задаволены...
Ты з асалодаю абтрасаеш рукі,
Як чалавек, што ўрэшце
Паспяхова здзейсніў штосьці даўно-даўно задуманае –
Няхай сабе і брыдкае.
Камень імкліва вырастае
І на вачах павялічваецца ў памерах –
Відаць, так
Імкліва набліжаецца і вырастае Зямля
Для птушкі,
Якая праз секунду разаб'ецца аб засохлую дарогу.
Можа, адхінуцца?
Навошта!
Можа, пераняць гэты, нагрэты злосцю, камень
І кінуць яго назад –
Табе пад ногі?
Не варта!
Шкада толькі,
Што я не паспею –
Часу ж адна секунда –
Нават рассмяяцца

У твой пыхлівы твар...
Нічога, ты ўсё роўна абараняйся:
Я рассмяюся пасля –
Калі друзам і пылам ападзе ля маіх ног
Тваё слова-камень...

* * *

Слухаю песню конікаў.
Слухаю толькі як музыку.
Я не хачу разумець іх мову
І не хачу дапытвацца,
Пра што яны
Так натхнёна размаўляюць...
Бо
Як жа мне будзе балюча,
Калі я, спазнаўшы іх мову,
Збянтэжаны і абражаны,
Зразумею раптам,
Што яны зусім не спяваюць,
А ўсяго толькі
Сварацца між сабою...

## Малюнак

Вазьміце шарготкае лісце,
Дадайце прыціхлае сонца,
Палі цішынёй ахініце,
З лесу павыганьце птушак,
Ваду ўхаладзіце у рэчках,
А ў неба, пабляклае неба,
Пусціце ключы жураўліныя –
Няхай невясёла курлыкаюць...

Цяпер адыдзіцеся крыху –
Здалёк на малюнак зірніце:
Так, атрымалася восень.

Але ж не стае ёй чагосьці,
Распранутай да сарамлівасці.
Магчыма, дажджу схаладалага
І смела-нахабнага ветру,
Што ліпне да кожнай пупышкі.

Ага, не хапае і дрэваў
З валасамі – галінамі мокрымі,
Дзе ад ветру хаваюцца кроплі –
Нібы слёзы стабуненых птушак;
Дзе, як сцюжа,– збялелыя, белыя –
Да малюнка, ужо ўхаладзелага,
Падкрадаюцца першыя зазімкі,
Без якіх яшчэ восень – не восень...

Што? Малюнак зімовіць вам рукі?
Вы на пальцы і пэндзаль падыхайце,
Каб закончыць хутчэй карціну
Да завей, што завязвае восень.
А то, крый бог, яшчэ памарозіць –
Бач, як холад гусцее з'інелы –
Тыя веснія, цёплыя кветкі,
Што ўзышлі на суседнім малюнку...

## Жанчына

*Вянок санетаў*

Ты – женщина, и этим ты права.

*Валеры Брусаў*

I

Ад рук, ад вуснаў, ад вачэй тваіх
Пачаўся свет – ласкавы і пакорны.
А што было, скажыце мне, да іх
У заінелай з нелюбі прасторы?

Як грэліся б ад позіркаў цяжкіх
Мужчыны у сваім мужчынскім горы,
Калі б цябе не выснілі вякі –
Цябе, што гэтак шчодра ўсіх адорыць.

Прыйшла ты – кветкі выраслі ля хат,
І гнёзды нараджалі птушанят,
І цёпла стала ўсюды, нібы ў леце.

Мужчына усміхнуўся сам сабе,
Бо зразумеў, самотны,– за цябе
Няма нічога ласкавей на свеце!

II

Няма нічога ласкавей на свеце,
Як чуць тваё святочнае імя,
Цябе, яшчэ нядократкаю, стрэціць
І позірк сарамлівы пераняць.

І са спакусаю змаганне весці,
І зразумець, што свет твой – чысціня,
І лаяць вусны – іх жа не адвесці,
Іх, нібы хваляванне, не суняць.

Шаптаць у радасці: «Кахаю» – як замову,
І цалаваць у лёце твае словы –
Мой дзень пагодзіцца ад іх, ад іх.

І, несучы святло тваё праз годы,
Да ісціны дайсці, што назаўсёды
З'яднала нас прырода удваіх.

III

З'яднала нас прырода удваіх,
Як два крылы – свайго палёту прыклад,
Як два вечназялёныя гаі,
Як хвалі дзве, што абняліся звыкла.

Я да цябе, сасмаглы ўвесь, прынік,
Ты да мяне, шчаслівая, прынікла,
І радасная тоеснасць, бы крык,
На ўсе вякі адна — адна! — узнікла.

І хто сказаў, што наш саюз — палон,
Што, нібы крыж, цяжкі і сумны ён?
Я ўсё жыццё яго гатовы несці!

З табою не цяжкі ніякі крыж:
На нас, сівых, ты строга паглядзіш —
І мы дабрэем пры табе, як дзеці.

IV

І мы дабрэем пры табе, як дзеці,
І галаву кладзём табе ў прыпол.
Мы, неслухі, даёмся нават песціць
І зла не заўважаем навакол.

І супакойваемся ў ціхай песні
Ад свету тлумнага, што меле нас на змол.
І нават чуем, як далёка дзесьці
Спадае ліст, бы мятлушка, на дол.

Калі ж ты і параніш нас, бывае,
Сама і лечыш — хутка зажывае,
Як ты душы кранешся, ран саміх.

І зноў ля нас засвецяць шчодра промні,
І мы тады з удзякаю успомнім:
Твае жыццё — як бліскавіцы міг.

V

Твае жыццё — як бліскавіцы міг.
Да войнаў — землятрусаў нечаканых —
Праводзіш ты мужоў, сыноў сваіх,
А сустракаеш — немасць пахаванак.

Свой чорны жаль на свята хоць здымі,
Ідзі на хрэсьбіны – у смех гулянак...
Хай крэматорыяў жахлівыя дымы
Мінаюць новых дзетак і каханых!

Ідзі, прымай жа новых немаўлят:
Паболей свят для новых трэба хат –
Застолле кожнае цябе прывеціць.

Твая прысутнасць нам спакой дае.
Як вочы добрыя і светлыя твае,
Твая усмешка век нам цёпла свеціць.

VI

Твая усмешка век нам цёпла свеціць,
І мы ідзём на гэтае святло.
Зімою ад яе, збудзіўшы веццe,
Давер'е – наша дрэва – скрозь цвіло.

І дзе б мы ні ўмярзалі на планеце –
Каханне ўсюды гнёзды ў нас віло.
Праз турмы, голад, холад, ліхалецце
Тваё святло дадому ўсіх вяло.

Вярталіся, адвыклыя, мы з войнаў
І слухалі, як у цішы спакойнай
Твой шэпт ля вуснаў радасна прыціх.

Усмешка плакала твая ад шчасця,
Што мы, мінаючы усе напасці,
Спяшаем да цябе з нягод усіх.

VII

Спяшаем да цябе з нягод усіх,
Каб бачыць, як твае світаюць вочы,
Каб груз нялёгкі радасна насіць –
З сабой насіць і дні твае і ночы.

Мы не баімся рук тваіх зусім,
Калі яны абвіць нас шчыра хочуць.
Мы ведаем, ты волю нам дасі
І ласку ў сарамлівасці дзявочай.

Каханне – клетка? Дык такой бяды –
Хутчэй туды, хутчэй хачу туды,
Абы з табой – хай і ў няволю, ўрэшце...

Любіць цябе – як усё роўна жыць,
Нібы да сонца ліст, мой век к табе спяшыць,
Як на кругі свая спяшае вецер.

VIII

Як на кругі свая спяшае вецер,
Так мы спяшаем на твае кругі.
Цябе шукаем, дзе сляды ў суквеццях,
Дзе ў сонцы і ў дажджынах спяць лугі.

Як хораша, пужлівую, прыкмеціць
Там, дзе няма ні сварак, ні тугі,
Дзе мы з табой дваіх. Ды яшчэ трэці –
Вялікі свет – нам шырыць берагі.

Табою, сарамлівай, любавацца
І разумець, што, каб табе прызнацца,
Не хопіць ва ўсім свеце, мусіць, слоў.

І ўчырванець у гэты міг шчаслівы,
Што сам – усё ж нячысты, памаўзлівы,
А ты – святая, як сама любоў.

IX

А ты – святая, як сама любоў,
Цішэеш ад абуджанай надзеі.
Адчула: за дваіх віруе кроў
І за дваіх душа ўжо ласкавее.

Цяжарная, нялоўкая ты зноў.
Пакорнасць светліць з-пад дрыготкіх веек.
Надзею носіш, ціхая, без слоў,
І сама з надзеяй маладзееш.

Хвалюешся і плачаш, можа, ўпотай –
Твае не за сябе, а за яго турботы,
Хто прыйдзе ў свет наступнікам бацькоў.

Даруй нам, што ў балеснасці вялікай –
Заўсёды з плачам і заўсёды з крыкам –
Раджала фараонаў і рабоў.

X

Раджала фараонаў і рабоў,
Герояў і нікчэмных палахліўцаў,
Сама ж ішла ты чыстай між вякоў
І толькі чысціні магла маліцца.

Мы ўсе, мы ўсе з тваіх надзей і сноў...
А ты трывожышся, табе не спіцца:
Хто ж б'ецца каля сэрца зноў –
Сусветны геній ці які п'яніца?

Малодзяць маці ўдалыя сыны,
І старацць – як няўдалыя яны,
Хоць і раслі аднолькава як быццам.

І ўсё ж раджай, жанчына, нас раджай,
Гадуй, спялі, наш вырай памнажай,
Каб жыццядайнасць не магла спыніцца.

XI

Каб жыццядайнасць не магла спыніцца,
Ты ў гэтым свеце хараства жывеш.

Пакуль ты ёсць – працяг наш будзе віцца
За далеч часу – без канца, без меж.

Ты неперасыхальная крыніца
І поўная заўжды – не перап'еш.
Табой ніколі нам не наталіцца.
А дзе ж шукаць ратунак смазе? Дзе ж?

Яно нярэдка гэтак вось бывае,
Што смага – смагу большую раджае,
Дабро – несупакоенасць дабра.

І мы, да слёз расчуленыя самі,
Вяселімся, што ты заўсёды з намі:
Ты – маці, жонка; ты – дачка, сястра.

### XII

Ты – маці, жонка; ты – дачка, сястра.
Ты маеш столькі за жыццё абліччаў!
Хоць ты – такі ж, як мы, мужчыны, прах,
А ўсе цябе аздобай свету лічаць.

Дачку мы не стамляемся гушкаць,
З сястрой – супольнасць шчырая за звычай,
Мілуем жонку, носім на руках,
І маму, калі цяжка дужа, клічам.

Былі дзяўчаткамі усе бабулі,
І ўсіх дзяўчатак старасць папрытуліць:
Там вочы ўжо не так, не так гарадь.

Але, жанчына, сумаваць не трэба:
На гэтым свеце і пад гэтым небам
Твая заўсёды гожая пара.

XIII

Твая заўсёды гожая пара –
Красуе і вясною і пад восень.
І павуцінкі – завязь серабра –
Цябе малодзяць, нібы маю просінь.

Ты не саромейся гадоў. Гадоў гара –
Нібы для нівы спелае калоссе.
Хто будзе за ўраджай сябе караць?
За тое, што жыццё, як сон, збылося?

І восенню суцішнай, і зімой
Нам хараша, журботная, з табой
З красы жыцця і ў старасці дзівіцца.

І маладую у табе спазнаць
Не перашкодзіць нават сівізна –
Дазволь, жанчына, ў ногі пакланіцца.

XIV

Дазволь, жанчына, ў ногі пакланіцца
За тое, што змагла мяне радзіць,
Што я трымаўся за тваю спадніцу,
Калі вучыўся, немаўля, хадзіць.

Што памагла каханню нарадзіцца,
Што навучыла ўсё вакол любіць,
Што свет адкрыла, ім дала здзівіцца,
Каб гэтым змог і ўнукаў я здзівіць;

Што, дзеўчанё, мяне пацалавала,
Што потым шчыра век мяне кахала –
І як нам хараша было ўдваіх!

Што засланяла ласкай ад няслаўя,
Што цеплыню заўсёды адчуваў я
Ад рук, ад вуснаў, ад вачэй тваіх.

МАГІСТРАЛЬ

Ад рук, ад вуснаў, ад вачэй тваіх
Няма нічога ласкавей на свеце.
З'яднала нас прырода удваіх,
І мы дабрэем пры табе, як дзеці.

Тваё жыццё – як бліскавіцы міг,
Твая усмешка век нам цёпла свеціць.
Спяшаем да цябе з нягод усіх,
Як на кругі свае спяшае вецер.

А ты – святая, як сама любоў –
Раджала фараонаў і рабоў,
Каб жыццядайнасць не магла спыніцца.

Ты – маці, жонка; ты – дачка, сястра,
Твая заўсёды гожая пара.
Дазволь, жанчына, ў ногі пакланіцца.

## Жыццё

Ціша над лугам такая,
Як птушка ў гняздзечку жыве.
Сонечны промень шукае
Штосьці ў зялёнай траве.

Краскі, бы гронкі салюта,
Святочна ўзлятаюць з зямлі.
Пахне і мята, і рута,
Гудуць клапатліва чмялі.

Вецер ласкавым павевам
Перабірае лісты.
Чутна, як дыхаюць дрэвы
І размаўляюць кусты.

Птушкі смяюцца і дзеці –
А смех іх шчаслівы такі!
Над імі – чысцейшы на свеце
Незамутнёны блакіт.

На лузе, нібыта на свяце,
Стаю ў неспатольнай любві...
Як боязна ўсё гэта страціць,
Як страшна ўсё гэта згубіць.

І быццам дзіця, гэтаксама
Ў здзіўленні гляджу на траву:
– Як рады, як рады я, мама,
Што проста на свеце жыву!

* * *

Варта ў крылы паверыць свае,
Трэба ў крылы свае паверыць,
А нам смеласці ўсё не стае,
Каб свой край на свой лёт перамераць.

Крылы нашы – для радасці, мар,
Крылы нашы – для працы і свята.
Крылы – лішнія, крылы – цяжар,
Калі ў іх не верыш зацята.

Крылы ціснуцца пудка к спіне –
І адкуль сарамлівасць такая?
Хто, як ветразі, іх развіне?
А Радзіма чакае, чакае...

Каб пад намі зямля паплыла,
Каб вятры захадзілі над намі,–
Трэба верыць у сілу крыла
І абняць Беларусь крыла́мі!

* * *

Як радасна, мой дружа, разумець,
Што наш народ не пагражаў нікому,
Не нападаў, не гнаў нікога з дому
І ў дом чужы не нёс ніколі смерць.

Ён ціха жыў і трудна працаваў,
Араў зямлю, навіў рупліва хаты,
Хоць сам ён жыў спрадвеку небагата,
Ды ўсім, хто прагнуў хлеба, хлеб даваў.

Зямля і воля мараю былі.
І на вайне ён спавядаўся полю,
Як птушку, грэў заўжды пад сэрцам волю,
Каб зноў араць і сеяць на зямлі.

* * *

З роду я хлебасеяў –
Сэрца ў ніве ўрасіў.
Я і сеяў, і веяў,
І араў, і касіў.

Сын нязводных ратаяў,
Унук жніва і сяўбы.
Пашанота святая
Стуль да ўсходаў любых.

Праўнук поля, што струніць
Рупна дзеда саха,
Я дажджу прасіў руні,
Сонца ніве благаў.

Спадкаемец зярнятам,
Пераемнік вазоў.

Для мяне было святам
Жыць паміж каласоў.

Там, дзе хлеб шанавалі,
Бы зямлю, я сталеў,
Дзе раллю цалавалі,
Быццам хлеб на стале.

Родзіч даўні палеткам,
І сярпам, і плугам.
За сяброў былі кветкі
Маім босым лугам.

Як дзіця – роднай хаце,
Жыту – крэўны сваяк.
І ў зярняці, бы ў маці,
Грэшны, верую я!

## Сялянскія рукі

Рукі, якія замешвалі сечку карове,
Рукі, якія рвалі, выполваючы, асот і
дзядоўнік,
Рукі, якія падцiралі попку дзіцяці,
Рукі, якія падмазвалі дзёгцем калёсы,
Рукі, якія растрасалі гной перад ворывам,
Рукі, у якія за стагоддзі ўелася столькі
зямлі,–
Самыя чыстыя рукі на свеце.

Твае рукі, мама.
Твае рукі, тата.

## Прамова ў Ляўках

Дзядзька Янка! Вы чуеце – свята гудзе,
Наша слаўнае свята – Купала.
Колькі вашых сяброў яно, колькі надзей
Каля вас, як ля сцяга, з'яднала.

Дзядзька Янка! Вы бачыце – луг, як букет,
І шчаслівыя ўсмешкі, і радасць Радзімы.
Беларускія песні гучаць на ўвесь свет,
Песні нашых сяброў паядналіся з імі.

Дзядзька Янка! Вы ўмелі прывеціць гасцей,
Паважалі сябрыну, любілі бяседу.
Хай жа з розных краёў і зямель найчасцей
К нам на святы сябры вашы едуць!

Дзядзька Янка! Мы выйшлі з бядот і нягод,
Ды нягоды ў стагоддзях нас не згубілі.
І жыве родны край, і жыве наш народ,
Які вы гэтак шчодра любілі.

Дзядзька Янка! У свеце між іншых краёў
Многа шчырых сяброў Беларусь наша мае,
Беларуская мова ў сям'і дружнай моў,
Як руплівая птушка, лунае.

Дзядзька Янка! Мы ўнукам раскажам, зямлі,
Каб нашчадкам яны перадалі:
Мы шчаслівыя, мы на Купаллі былі –
Мы былі на стагоддзі Купалы!

## Ялта, Максім, кіпарысы

Ён навучыў, здаецца, гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы,
Барвінак на магільніку гарыстым
Ён навучыў, здаецца, гаварыць.

Паўднёва сонца плавіцца ўгары,
Зямля гарачая, нібыта прысак...
Ён навучыў, здаецца, гаварыць
Па-беларуску нават кіпарысы.

## Дождж ля вёскі Шастакі

Нас сюды сабрала Цётка
На лугі і паплавы,
Дзе аж пеніўся салодкі
Пах накошанай травы.

Гаспадыняю гасціннай,
У вянку, нібы вясна,
Свае родныя мясціны
Нам паказвала яна.

І яе тут пазнавалі,
Перад ёй на луг-зямлі
Цёткі граблі папрымалі,
Дзядзькі косы адвялі.

Заспяшаліся на свята —
Свят нам гэткіх не стае!—
І як пчолы каля маткі,
Людзі сціхлі ля яе.

А яна між іх сядзела
І са сцэны лугавой
Так узрушана глядзела
На народ спрадвечны свой.

Раптам лівень гэткі хлынуў,
Гэткі лівень зашумеў!
Мы — са сцэны пад галіны,
Пад густыя шаты дрэў.

Абвалілася залева –
Не раскрыць, здаецца, рот.
Не хаваліся пад дрэвы
Толькі Цётка і народ.

Моклі чыстыя абновы,
Ды – адзін ля аднаго –
Людзі хлеба
Праглі слова
Найраднейшага, свайго.

Хоць ад ліўня луг прагнуўся –
Так ліло, нібы са стрэх,
Ды ніхто не варухнуўся
І дадому не пабег.

І тады з-пад дрэў выходзіць
Пачалі няёмка мы.
Зразумелі пры народзе:
Слова ліўнямі не змыць.

Вінавата зноў паселі
Пад залеву, між вады...
Як у Цёткі пасвяжэлі
На вянку яе кветы!

Дождж ідзе, а слову светла,
Гром грыміць, а ўсе стаяць.
Дзякуй вам за свята гэта,
Цёткі, дзядзькі, сенажаць!

## Вечар паэзіі

Чытаюць вершы ў Крошыне паэты,
А мне здаецца, што і ён, хлапчук,
Сядзіць між імі ў клубе гэтым светлым
І галавою туліцца ў плячук.

Зусім дзіця, пятнаццацігадовы,
Успамінае, мусіць, з болем ён,
Як выпускаў і сам на волю словы,
Што зганьбаваў бязлітасны прыгон.

Зайграй, зайграй, хлопча малы,
І ў скрыпачкі, і ў цымбалы.

Ён спавядаўся вершамі пры ўладзе –
Сам Навасільцаў слухаў тут яго:
Адной рукою па галоўцы гладзіў,
Бізун шукаў паспешліва другой.

А як стараўся ўсёй душою Паўлік,
Як спадабацца слухачу хацеў!
Не ведаў, што сенатар і падстаўлен,
Каб дабрыню ператварыць у гнеў.

У Крошыне пан сярдзіты,
Бацька кіямі забіты,
Маці тужыць, сястра плача.
Дзе ж ты пойдзеш, небарача?

Элегіі журботныя гучалі,
Шуршалі, нібы полымя ў страсе.
Парабак не знаў: ягоны талент
Яму адно няшчасце прынясе.

Забралі хлопца ў рэкруты за вершы –
Так адлучылі ад зямлі і мар.
І гэта быў ягоны самы першы,
Ды, мусіць, не апошні ганарар.

Каб я большы не падрос
Ды ад бацькавых калёс!

Чытаюць вершы ў Крошыне паэты,
А мне здаецца, што і ён, хлапчук,
Сядзіць між намі ў клубе гэтым светлым,
І радасць мгліцца, як сляза, ўваччу...

## Сон, быццам ява

Учапіліся за мае рукі
Звяры, дрэвы, птушкі,
Рэкі, травінкі, мурашы.
Учапіліся
І просяць выратаваць іх.

«Вядзі нас»,– просяць.

Куды ж мне весці вас,
Браты мае старэйшыя –
Зубры і дразды, дубы і мурашы?
Падкажыце, вы ж мудрыя,
Вы ж ужо былі на гэтай зямлі,
Калі я прыйшоў на яе...

Як жа мне выратаваць вас,
Сёстры мае старэйшыя –
Кветкі, рэкі, мятлушкі і крынічкі?
Я ж думаў, што вы вечныя,
Што вы застанецеся і пасля таго,
Як я пакіну зямлю.

«Ратуй нас»,– просяць.

І тады я ўбачыў,
Што стаю не адзін,
Што навокала многа людзей
І ўсе яны справай занятыя:
Хто выцірае ад сажы лісцё –

Каб лепей дыхалася дрэву,
Хто адмывае зліплае ад мазуту пер'е –
Каб чаіца зноў узляцела ў неба,
Хто абгароджвае мурашнік,
Хто памагае кітам,
Якія з бруднай вады
Выкінуліся на бераг
І не хочуць зноў вяртацца ў акіян...

Тады і я схапіў у рукі маленькае птушанятка,
Якое, задыхаючыся, бездапаможна
Білася аб дарогу крыльцамі,
Паспешна ўзяў яго дзюбачку ў рот
І, як у дзяцінстве,
Пачаў паіць сваёю слінюю.

І ўзрадаваўся,
Адчуўшы, як птушанятка
На вачах пачало наліваццa сілаю.
І – о дзіва! – гэтая ягоная сіла
Напаўняла і мяне.

І тады я пачуў голас:
«Аддаючы – набываеш.
Яны – гэта ты сам.
Ратуючы птушанятка,
Ты ратуеш самога сябе».

І прачнуўся.
І зразумеў,
Што гэта быў менавіта мой
Голас.

## Кветка

Яна ў супакаенні спала,
Пялёсткі склаўшы ў цнотным сне.
Нішто яе не хвалявала,
Нішто не вабіла яе.

І раптам – дзіўнае ўзбуджэнне,
Нібы палашчылі вятры,
Бы чмель бахматы ў дзень вясенні
Паказытаў яе знутры.

І нарадзіўшыся ў глыбінях,
Трымценне большала, расло,
Запаланіла мрояй сіняй
І, быццам промень, загуло.

Раскрыла у дрымоце клейкай
Пялёсткі. Нібы самацвет,
Зірнула зрэнкаю з-пад вейкі
На чымсьці ўсхваляваны свет.

І тут жа ўчула: па пялёстках
Прамень кунежліва правёў.
І узрушэнне, нібы лоскат,
Дайшло да самых каранёў.

Стаіўшы радасна дыханне,
Праменьчык лашчыла святла,
Трымцела ўся і хвалявання
Ніяк суцішыць не магла.

Яна дрыжэла, знемагала,
Непадуладная сабе,
І промень ласкава хавала
Усё глыбей, усё глыбей.

Ёй стала гэтак светла ў стоме
І ўцешна – сіл няма трываць.
І захацелася той промень
На ўсё жыццё ў сабе схаваць.

Яна звяла пялёсткі млява
У насалодным забыцці...
І стала прывіднаю ява,
І стала горача ў лісці.

І доўга стомлена трымцела,
Супакойваючы кроў,
Ахалоджваючы цела,
Заціхаючы наноў.

Жыла шчаслівым прадчуваннем,
Надзеяй, што як жар пячэ:
Каб заўтра гэта хваляванне
Паўтарылася яшчэ.

## Каханне

Ісці к табе трывожна і спакусна,
Нібыта набліжацца да агню,
І загарэцца ад тваіх спякотных вуснаў,
І спапяліць цнатлівую браню.

І увайсці ў агонь. Пламеннем задыхацца,
Лавіць яго і жыць і дыхаць ім.
Згарэць на попел. З попелу узняцца,
Каб зноў глытаць агню вярэдны дым.

І ачышчацца ў полымі упарта,
Згарэўшы зноў, вяртацца з небыцця,
Бо той, хто уцякае ад цябе,– не варты
І ні цябе, ні самаго жыцця.

Бо толькі так і можна жыць на свеце:
Згарэўшы ўшчэнт, застацца зноўку жыць,
Каб пры жывым табе твой попел стылы вецер
Зайздросна мог, як памяць, варушыць.

## З мінулага

Здаецца, бачу сам балючыя стагоддзі,
Задымлены і цьмяны небасхіл.
Здаецца, чую: ногі мне халодзіць
Астылы прысак селішчаў-магіл.

Стаю над продкамі, што чужакі стапталі,
Вачыма лашчу мёртвых ваяроў
І адчуваю, як ва мне праз далі
Пульсуе іхняя святая кроў.

Вакол — вясна. Пара араць і сеяць,
А цішыня такая, што аж мне
Здалося: разам з ёй і сам нямею —
Няма нідзе ні сейбітаў, ні жней.

І раптам на ўтравелым беларускім полі
Я згледзеў постаць дзіўную, як зман.
Яна ішла, няспешная, паволі,
Ступала на здзічэлы ўжо дзірван.

Быў гэта Час. Як земляроб, руплівa
Ён пазіраў на поле і на луг.
Ён у адной руцэ трымаў вязьмо для жніва,
Другою нецярпліва гладзіў плуг.

І ўбачыўшы, як уставалі людзі з мёртвых,
Як ураблялі за вярстой вярсту,
Я зразумеў: зноў на маёй зямлі гаротнай
І людзі, і зярняты прарастуць.

## Жыццяпісы

### *Воблака*

О як плысці нязвычна ўсё-ткі ў небе
Таму, хто нарадзіўся на зямлі,
Не адчуваючы нядаўняга цяжару,
Што аддзяліўся, быццам успамін.

Я разлучылася — па кропельцы — з зямлёю
І ў небе, невагомае, плыву.
Я — возера нядаўняе. І зараз
Жыву сваім даваблачным жыццём.

Успамінаю зарасні аеру,
Сваю сукенку лёгкую — туман.
А як шчыкотна мне было ад рыбы,
Якая аж вірылася ўва мне.

Лілеі помню, помню крыгі, лодкі
І губы коней, пацалунак іх,
І целы чалавечыя тугія,
Ад якіх аж вар'яцела я.

Хаця я кожнай кропелькаю помню
Да скону незабыўную зямлю,
Чамусьці мне настойліва здаецца:
І ў небе я калісьці ўжо было.

І вось лячу я, гнанае вятрамі,
Каторы раз над роднай старанай.
Ёсць у мяне ў запасе асалода —
Праліцца светла на зямлю дажджом.

Але ж пакуль магу, цярплю, трываю,
Бо асалода гэта — мой канец.
Нашто трываць?! Хутчэй уніз, на травы!
Няхай — канец! Абы — ізноў зямля!

## *Парастак*

Даўно і ўпарта выхаду шукаю,
Яго ж нялёгка ўпоцемку знайсці.
Я прабіваюся як быццам з таго свету
Да вольнага паветра і святла.

То галавою стукнуся ў камлыжку –
Яе, натужыўшыся, сам я раскрышу.
А то вось на шляху папаўся камень –
Яго ўсё-ткі лепей абысці.

А на мяне зямля, як глей, наліпла –
Мой пот вільготніць навакол падзол...
Нарэшце пройдзена апошняя камлыжка.
О радасць, радасць: добры дзень, святло!

Я ад зямлі абтросся.
Пот свой выцер.
Тады з далоняў выпусціў сцябло.
Няхай вышэй, вышэй, вышэй імчыцца,
Раскручвае зялёныя лісты.

Я ўсё зрабіў, хоць гэта было цяжка,
Я ўсё прайшоў – ад цемры да святла.
І гэты свет табе дарую, кветка,
Здабыты ўсім, што меў,– сваім жыццём.

Табе ж сабраць лісточак да лісточка,
Пялёстак да пялёстка далучыць.
Па колерах, па выгляду, па паху
Усю сябе, як дзіва, нарадзіць.

Жыві і ўспамінай, як я буруніў
Дзеля цябе зляжалую зямлю,
Каб ты магла сваёю прыгажосцю
Здзівіць усіх і ўсё зачараваць.

*Хата*

Калі я нарадзілася – не помню,
Здаецца мне: была заўсёды я,
Вось так стаяла між травы пад сонцам,
І сонца лашчыла мне кожнае акно.

З людзьмі сумленнымі спрадвеку сябравала,
А іх наслухацца за век свой не змагла:
Яны заўсёды рупіліся ў полі,
Я ж гадавала, няньчыла дзяцей.

Як я любіла іх дзіцячы шчэбет,
Іх смех, іх гульні, нават іхні плач!
Тады і я, здаецца, маладзела
І станавілася, нібы яны, дзіцём.

І ўсё-ткі ноччу, калі ўсё сціхала,
Мне сніліся загадкавыя сны:
Лес, мокры ад дажджу. Ігліца. Лапкі.
А навакол – грыбы, грыбы, грыбы.

І доўга пахла потым мне грыбамі,
Суніцамі, зайцамі, дзеразой!
І так хацелася мой лес хоць раз убачыць,
Ды не магла пакінуць я дзяцей.

Я шанавала, ў крыўду не давала
Ніколі ні дарослых, ні малых.
Віхуры крылле аб мяне ламалі,
На ганку паміралі маразы.

Паразляталіся, як птушкі, мае дзеці,
І прыжыліся ўнукі ў гарадах.
А я жыву адна. Як рот мне, дзверы
Замкнуў цяжкі, заржаўлены замок.

Мінулае жыццё успамінаю,
Перабіраю ласкава па днях.
Цяпер мне сняцца дзеці, дзеці, дзеці...
Як я хачу пачуць дзіцячы смех!

## На завяршэнне кнігі

Бывай жа, радаснае мліва,
Бывай, рукой нагрэты млён!
З табою нам было шчасліва
Сярод завейных, снежных дзён

І сярод весніх дзён спатолі
Нам не было аж да начы.
Сады цвілі – а мы у полі,
Лугі квітнелі – мы палолі,
Не мелі часу на спачын.

І лета з восенню мільгнулі,
Мы і не ўбачылі – калі.
Спявалі птушкі – мы не чулі,
Гулі камбайны – ў іхнім гуле
Мы як знячэўныя былі.

І вось закончылася праца,
Цяпер гуляй, блазнуй, жыві.
А нам з ёй шкода расставацца:
Без працы – быццам без крыві.

Бо з ёю нам было шчасліва
Сярод клапотна-звыклых дзён.
Дык дзякуй, радаснае мліва,
Да стрэч, душой сагрэты млён!

# *Балады*

## Сяўба

*Беларуская балада. XX стагоддзе*

На папялішчы, на пачарнелым
Яна сядзела – жанчына ў белым;
На чорнай пляме відна здалёку,
Нібы цяпельца ў халодным змроку,
Ля галавешак – былога ганка –
Сядзела ў одуме партызанка.
А навакола вясна буяла,
Трава пад попелам бушавала,
Трава рассоўвала ўбок вуголле –
Жыццё ірвалася зноў на волю.
І ўжо фашыстаў – нідзе, нікога,
Ідзе, вяселіцца перамога,
І ёю пахне усё на свеце:
Лісцё і неба, зямля і вецер,
І папялішча, дзе каля ганка
Сядзіць у одуме партызанка.
А на каленях – дзіцячай жменькай –
Ляжыць вузельчык, такі маленькі,
Дзе знемагае ўжо столькі летаў –
Сяўбы чакае насенне кветак:

У садку сваім семя тое
Яна сабрала перад вайною
І з таго часу з сабой заўсёды
Яго насіла ва ўсе нягоды,
Як талісман той блюла на радасць:
З ім прахадзіла яна блакады
І праз балоты яго, сухое,
Як порах, несла над галавою –
Збудзіць баялася ў ім, ціхмяным,
Бучную сілу жыцця зарана.
Бо калі зерне ды прарастае,
Хто ў вузялочку яго ўтрымае?!
Яна развязвала дужа рэдка
Вузельчык гэты, дзе млелі кветкі.
Упершыню яго развязала,
Калі мужа свайго хавала –
У маёвае тое ранне
Сябры прынеслі яго з задання...
Закрасаваліся на магіле
Зноў кветкі тыя, што так любілі
Іх даваенны гарод, каторы
Яны, звязаныя нават, снілі...
Тады ў вузельчык сыпнуўся порах
(Яна набоі рабіла мальцам,
І парашынкі прыліплі к пальцам).
А ў другі раз насенне брала,
Калі сына свайго хавала –
Яго прывезлі з цяжкога бою
З ацежалелаю галавою...
Зачырванелі над хлопцам макі...
А ў вузел трапіў панюх табакі
(Крышыла маці табаку мальцам,
І парашынкі прыліплі к пальцам).
А ў трэці раз яго развязала,
Калі дачушкі малой не стала,
Яе заняньчыў касцісты голад –
Яна памерла ў блакадны холад.

І засталося дзяўчо ў той выспе,
Над выспай кветак гародчык выспеў,
А ў вузялочку запахлі крошкі
(Дзяўчынка хлеба прасіла трошкі,
Збіралі крошкі ўсе па кішэнях,
Сабралі крошак цэлую жменю,
Ды толькі позна – дзяўчо згарэла...).
Таму сягоння на пачарнелым
На папялішчы вясновым ранкам
Сядзіць самотная партызанка...
А з вузялочка, што у прыполе,
Зярняты прагнуць упасці долу –
Як цягне, цягне іх да зямліцы,
Каб абудзіцца, праз дзёрн прабіцца!
Вось партызанка ўзнімае вочы,
Яна развязвае вузялочак,
Нібы пупышка – набухлы гэткі...
– Ўзыходзьце, кветкі, буяйце, кветкі!
Не асыпайцеся вы ніколі –
Перамажыце той чорны колер,
Які зялёным, вясновым ранкам
Сустрэў няветліва партызанку.
А калі можаце – хоць бы трошкі! –
І вы ўзыдзіце, хлебныя крошкі.
Як будзе голад – і ўдзень і ўночы
Хай лазяць дзеці у мой гародчык!
Яшчэ прашу я – ўзыходзь, табака!
Я зацягнуся табой са смакам,
Бо я прывыкла курыць задужа –
Куру за сына, куру за мужа...
І толькі порах – мой даўні вораг,
Не узыходзь, не дамешвай гора!
Звяжыце моцна яго, карэнні,–
Хай задыхнецца ў зямных скляпеннях...
На папялішчы на пачарнелым
Яна хадзіла – жанчына ў белым...

На чорнай пляме відна здалёку,
Нібы цяпельца ў халодным змроку.
Ля галавешак – былога ганка –
Кветкі сеяла партызанка.

## Мячык

*Польская балада. XX стагоддзе*

Скача мячык, скача мячык,–
Паспрабуй ты дагані!
За калючым дротам мячык
Скача весела ў гульні.

Ах, які харошы дзядзька,
Хоць і немец:
Пагуляць даў мяч-прысядзьку,
Мяч-шаленец.
Дзядзька ж доктар. Ну, а дзеці
Добра знаюць,
Доктароў благіх на свеце
Не бывае.
Дактары заўжды вясёлыя
Прыходзяць
І хваробы ўсе уколамі
Выводзяць...

Скача мячык, скача мячык,–
Паспрабуй тут дагані,
Калі ў роце, апроч плачу,
Ні халоднай, ні гарачай
Ежы не было ані.

Ах, які харошы доктар
Немец гэты –
Абяцае місу ў коптар
Бульбы грэтай...

Падагрэтай – пасля ўколаў
Абяцае.
Ну ці скора тыя ўколы?!
Бо іх голад, бо іх голад
Так чакае...
Ну, а доктар кіпяціць, напэўна,
Шпрыцы,
Каб пры ўколах ім, малым,
Не заразіцца...

Скача мячык, скача мячык,
Скача весела ў гульні.
Бульба ж варыцца – няйначай...
Пахне, мусіць, бульба смачна...
– Гэй, гані яго, гані!

Колькі радасці наўкола –
Як чакаюць дзеці ўколаў!
Бегаць вучацца нанова
На нагах – сцяблінках кволых,
І смяяцца (зноў – нанова),
Як у садзіках вясёлых
Ці на перапынку ў школах.

Ажывілі дзетак гульбы.
Скача мячык... Пахне бульба...
Мячык... бульба...
Бульба... мячык...
Скачуць...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . .

А ты, хлапчанятка,
Чаму не смяешся з усімі
І не спрабуеш дагнаць
Развяселены мячык?
Чаму ты глядзіш на гульню тужліва,

Вачыма такімі —
Як плачаш.
Ідзі,
Дзядзя доктар табе вунь махае рукою...
Усё ўжо гатова —
Ад лякарства ўгінаецца столік...
— Я ведаю, вы забойца.
Мяне вы заб'еце.
І толькі за тое,
Што я по́ляк.
Вы — фашыст.
Вы ніякі не доктар.
Я ведаю добра таксама,
Што не лякарства,
А смерць гэтак доўга вы нам рыхтавалі.
Мама!
Пракляні гэты мячык, мама,
Які нам фашысты далі!
І выгукнуў смела хлопчык,—
Адкуль ён сабраў столькі сілы! —
Верш, што калісьці ў школе
                    хорам вучылі:
«Хто ты естэсь?
Поляк малы!
Які знак твуй?
Ожэл бялы!..»

Скача мячык, скача мячык...
А дзяцей той крык спыніў.
За калючым дротам мячык
Скача сумна, не ў гульні,
Мячык, што гульні дзіцячай
Так бязлітасна зманіў...

## Базары

*Балгарская балада. XX стагоддзе*

А хто не ведае, якая гамана
Тут усчынаецца заўсёды ад відна!
Аслы, паабчапляныя кашамі,
Б'юць з крэктам, нецярпліва капытамі
І пазяхаюць – рана іх збудзілі...
Хутчэй бы іх, вушастых, разгрузілі!
Вы чулі, закракталі ўжо сталы –
На іх паўсклалі горы садавіны.
І весялеюць на вачах аслы –
Як павышэлі струджаныя спіны!
А на сталах – бялеюць кабачкі,
Грувасцяцца цяжкія баклажаны.
А гэта – брынза,
гэта – сыр жаданы,
А кветак пахкі акіян які!
Зеле́ – капуста, побач – дыні, мак –
Да гібелі ўсялякіх тут прысмак!
– Кісело млеко,
Чэсен лук!
Моля, другару,–
Купляй, сябрук!
Але такое даўніцай здаецца –
Ля гэткіх запрашэнняў не сагрэцца:
Маўчаць спусцела голыя базары,
Нібы паабтрасаныя сады,
І холадам няўмольнае бяды
Схуднелыя марозяць зімна твары.
І толькі вецер моўчкі – проста жах! –
Качаецца па голых па сталах,
І цішыня зацятая наўкола –
Голад...
А як грымяць у гэтай цішыні
Упэўненыя, радасныя крокі!

Хто б мог іх, смелыя, без боязі спыніць,
Хто б мог базар ад іх хоць зачыніць?..
Ніхто... Бо гэта госць высокі —
Сам задаволены балгарскі цар
Зайшоў парадавацца на пусты базар.
Як хораша, калі маўчаць прылаўкі,
Калі базар, здаецца, сам знямеў!
Цару тут пах заўжды здаваўся даўкім,
Цар на базарах радасці не меў.
А зараз — ціха. Тут маўчыць усё —
Ніхто цябе не схопіць за крыссё:
　　— Кісело млеко,
　　Чэсен лук!
　　Моля, другару,—
　　Купляй, сябрук! —
Ніхто не скажа...
　　　　　　Дзіўны, праўда ж, цар,
Што ненавідзіць люта ўсіх балгар!
Ён сам расказвае пра свой занятак:
«Пастух я і пасу балгарскі статак».
І так глядзіць, і так жа, чорт, пасе —
Стараецца, каб галадалі ўсе.
Балгары ж яго клічуць кавалём,
Бо цар занятку даўняму аддадзены —
Куе, куе ён цяжкія кайданы:
Маўляў, на ўсіх мы путаў накуём.
Звіняць нясцерпна путы на балгарах,
І на старых, і на малых звіняць...
Маўчаць сцішэла голыя базары,
Чакаюць таго радаснага дня,
Калі ім можна будзе крык узняць:
　　— Кісело млеко,
　　Чэсен лук!
　　Моля, другару,—
　　Купляй, сябрук!

## Урок

*Сербская балада. XX стагоддзе*

> «Пуцайте, я і сада држым час»[1],– словы Мілае Паўловіча, настаўніка з Крагуеваца, сказаныя фашыстам, калі яны расстрэльвалі 300 школьнікаў...

Дзеці, супакойцеся,
Мы правядзём сягоння з вамі
Апошні свой урок...
Па-першае, давайце мы паўторым
Мінулае.
Хто ведае, скажыце мне,
Што значыць радасць, воля, смех, Радзіма?
О, столькі рук –
Засвоілі вы добра урок мінулы.
А цяпер давайце запішам тэму новага урока...
Прабачце, не запішам, а запомнім.
Увага, Глішыч! Не глядзі спалохана
На аўтаматы...
Не круціся...
Значыць, тэма:
«Звяры дваццатага стагоддзя».
Мэта:
Вас навучыць хачу я ненавідзець
Такіх звяроў...

Страляйце ж, крывасмокі!

Чакаеце...
Ну што ж, тады прадоўжым
Урок наш, дзеці... Перад вамі экспанаты,
Не выкапнёвыя – жывыя экспанаты
І жорсткасці, і трусасці звярынай:
Яны ж баяцца нават вас, малечы,–

---

[1] «Страляйце, я і зараз вяду ўрок».

Безабаронных,
Вяснушчатых,
Кволых,
Хоць кулачкі адны – ўся ваша зброя...
Цішэй, не шморгай носам, Йовановіч!
Баяцца...
А таму, зірніце, абчапляўшыся
Гранатамі,
Нажамі,
Кулямётамі,
З дзяцьмі ваююць смела, неданоскі...
Не чысці, Крсціч, у фашыста боты –
На іх дыміцца кроў тваіх бацькоў...

Страляйце ж, ваўкаўё!

Марудзяць кулі...
Пойдзем тады далей,
Каб лепей разабрацца ў нашай тэме.
Звярніце ўвагу, дзеці:
У фашыстаў
Тупыя, абыякавыя твары,
А ў галаве пустой
(Хоць і такой вялікай!)
Не хопіць месца і маленькай думцы...
Не плач на ўроку, чуеш, Мілаевіч!..
Зірніце:
Вось – вышэйшай расы людзі,
Ніжэйшыя па думках за жывёлу,
Бо нават і ў сабачаняці вашага,
Вы помніце,
Якая мордачка разумная была...
Урок вы зразумелі, дзеці?
Можа,
Пытанні ў каго будуць? Задавайце.
Бо зараз зазвініць званок...

Званок той быў чаргою кулямётнай,–
Яго ўжо дзеці не змаглі пачуць...

## Еш!

*Славенская балада. XX стагоддзе*

Калі ў канцлагеры закончыцца вячэра,
Аціхне бразгатанне кацялкоў,
Яны спяшаюць у зацемненае месца,
І кожны нешта пад крысом нясе:
— Еш!

Адзін — баланду, злітую ў бутэльку:
Як бы самога ўсцешыла яна!..
Другі — акрайчык, што дзяўбе ў далоні...
Спакуса яго несці пад крысом!..
— Еш!

Знябытыя, зняможаныя вязні
Нясуць свае галодныя пайкі...
Як доўжыцца кароткая дарога —
Хутчэй, хутчэй бы ўсё яму аддаць!
— Еш!

А калі есць ён — прагна, хапатліва,
І чмякае (наглядчык бы не ўчуў!),
Як ласкавеюць земляныя твары:
Аж радасць загараецца ў вачах.
— Еш!

— Еш, дарагі наш. Ты — збавіцель,
Адзіная надзея на жыццё.
Ён чмякае... І мускулы мацнеюць...
Круглее твар... Ён чмякае гучней...
— Еш!

Як радасна — ужо рукі ягонай
Ніхто не зможа ў лагеры сагнуць!

Паспрабавалі ўдзесяцёх падужаць –
Параскідаў, нібы той бык снапы.
– Еш!

Як здорава, што гэтага абралі!
Як ён сыцее – проста на вачах.
Сыцее ён – бліжэй, бліжэй расплата,
А там і вызваленне, можа быць...
– Еш!

І вязні ўсе пайкі свае і сілу
З надзеяй аддаюць яму штодзень,
Каб ён стаў моцным, каб ён змог падужаць
Наглядчыка, што здзекуецца, кат.
– Еш!

Еш... Вязні не маглі нават падумаць,
Што той, хто пайкі іхнія жарэ,–
Не сябра ім. Ён здраднік, здраднік, здраднік,
Якога сам наглядчык падаслаў...
– Падавіся!

## Вязень

*Польская балада. XX стагоддзе*

Ад Варшавы далей і далей –
Камянее й жалезнае сэрца:
Уяздоўскіх пажоўклых алей
Больш ніколі не ўбачыш, здаецца.

Колы грукаюць, колы грымяць,
Як цяжкія фашысцкія боты.
А платформы рыпяць – не суняць! –
Ды на ўсіх, ды на ўсіх паваротах...

Як, Радзіма, суцешыць цябе
Паланёна-бязраднаму вязню?!

А ў асенняй блакітнай журбе
Позірк, смуткам натомлены, вязне.

Як запомніць вось гэты блакіт
Над Айчынай – засмучаным краем,
Што шчымліва-тужлівым такім
Толькі ў часе расстанняў бывае.

Гэтых коней, што ў ціхіх лугах
Топчуць звонкія, крохкія промні;
Гэты крык жураўлёў, бы туга,–
Трэба ўсё для чужыны запомніць.

Паланез гэтых жоўтых бяроз
Не забыцца. І ўспомніць калісьці,
Як на твар твой вятрыска атрос
Шапаткое, пажухлае лісце.

І ў няволі ўздыхні, спамяні
(Калі сум па радзіме агорне),
Як праводзілі людзі цягнік
І цябе – на адкрытай платформе.

Людзі шапкі скідалі далоў,
Толькі ўбачыўшы профіль знаёмы,
І схілялі галовы без слоў,–
Так праводзяцца родныя з дому.

А цягнік праз палі, паплавы
Цягне сілаю ў край нежаданы...
Партызаны, не баўцеся вы!
Гэй, ці чуеце вы, партызаны?

Раз'яднайце, як провад, мой пуць
Ці засаду зрабіце напэўнай...

У няволю фашысты вязуць
Вязня сумнага – помнік Шапэна.

## Пытанне

*Македонская балада. XX стагоддзе*

Ён звозіў даспелае жыта –
Адпрэглі каня чужакі.
Пытаюць са здзекам бандыты:
– Скажы нам, а хто ты такі?

– Я – Коча Маркоўскі. Мо чулі?
Я – македонец, мужык...

І пахне так порахам руля,
І сэрца ўжо б'ецца аб штык.

– Які македонец, хамула?
Тут – Грэцыя, мы на вякі!
І ты, мусібыць, Фамапулас
Альбо Пікіёніс які.
А ён бізуноў, хлопцы, хоча,
Дайце, каб помніў: ён – грэк...

На возе маленькі сын Кочы
Плача ад крыўды за здзек.

Пытанне ізноў сцебанула,
Нібыта бізун той цяжкі:
– Ну, дык ці ўспомніў, хамула,
Хто ты, урэшце, такі?

– Я – Коча Маркоўскі... Не чулі?
Я – македонец, мужык...

І зноў пахне порахам руля,
І зноў сэрца б'ецца аб штык.

– Відаць, было часу замала –
Не ўспомніў нічога, дзівак...

Нагайка ізноў заспяшала –
Ты – грэк... Толькі так... Толькі так...

– Ну, а цяпер, можа, ўспомніў,
Хто ты ўсё ж! Досыць маніць!

Маўчыць. І не дыхае. Промні
Над ранамі – як авадні...

– Шкада, што забілі... Слабы ўсё ж...
Што грэк ён,– цяпер нам не ўчуць...

І раптам рашуча ўсхапіўся
На возе маленькі хлапчук:

– Я – Ташка Маркоўскі, бандыты,
Я – македонец, мужык!

На воз верне руля сярдзіта...
Як сэрцайка б'ецца аб штык!..

## Кветкі

*Сербская балада. XX стагоддзе*

І пахнуць разамлела гэтак кветкі,
І кружыць галаву іх даўкі пах...
Трымае ён букет вялізны гэткі,
Цяжкі такі – аж млявасць у руках.

А колькі радасці ў вачах ягоных!
Так, падарыць букет ён будзе рад...
Вось-вось праедзе тут наследнік трону –
Сам найсвятлейшы герцаг Фердынанд.

Чакае... Побач войска маршыруе.
Пяюць салдаты – аж за вушы рот:
– Хвала краіне, дзе свінец красуе,–
На кулі, значыць, будзе умалот!

Зняважаная швабамі краіна,
Па вуліцах тваіх
на Відаў дзень
Пыхліваю, крыкліваю лавінай
Салдатчына чужацкая ідзе.

Якая урачыстасць! Барабаны
Салдатам
збіцца не даюць з нагі.
Закрыты школы.
Нават паздыманы
З усіх флагштокаў сербскія сцягі.

Яны спяваюць, што даўно залежа
Ад іх, ад іх і гэты мужны край...
— Хвала,— пяюць,—
што ў нас расце жалеза —
Гармат мы здымем новы ураджай!

А ён адзін на вуліцы з букетам...
І апусціўшы вочы злыя ўніз,
Яго абходзяць сербы за край свету:
— Вар'ят, напэўна.
Можа, блюдаліз.

Злуюць: — Нас швабы гэтак абражаюць —
На Відаў дзень зрабілі свой парад,
А ён, зірніце, кветачкі трымае...
Вар'ят! Вы ж самі бачыце — вар'ят!

А можа, робіць лёгкую кар'еру?
А мо яго адолеў здрады сверб?..
Стаіць з букетам, радасны праз меру,
На вуліцы вернападданы серб.

А вось і Фердынанд яго прыкмеціў,
Яму, яму памахвае рукой.

І ён, шчаслівейшы з усіх на свеце,
Да герцага ірвецца цераз строй.

Якая ўсмешка шчырая – як свята!
Так усміхацца можа толькі друг...
І ўражаныя ўсмешкаю салдаты
Пускаюць серба цераз свой ланцуг.

Нідзе ніякіх кветак не ўручалі,
А тут букет – і ўдвух не абхапіць...
«Падумаць трэба пра яго медалі,
А можа, нават ордэн пачапіць»,–

Так думаецца Фердынанду-Францу,
Які прымае швабаўскі парад.
А серб хвалюецца: «Шчырэй трэба ўсміхацца.
Ты ж рад...
ты ж рад...
ты дужа-дужа рад...

А у цябе ў руках бярэма кветак,
Нясеш ты кветкі...
кветкі...
квет...»
І раптам стрэл уздрыгвае з букета –
Страляць умеюць, чуеце, і кветкі,
Калі у іх схаваны пісталет!

Запахла порахам, нібы вайною,
Сарваны у Сараеве парад.
І вяжуць серба швабы ўсёй гурмою:
– Забіў наследніка! Ды хітрасцю якою...
Вар'ят! Вы ж самі бачыце – вар'ят...

## Зброя

*Балгарская балада. XIX стагоддзе*

Зялёным зацьменнем –
Турэцкі сцяг.
Шарсцяць па каменні,
Нібы па касцях.

Блішчаць ятаганы,
Дымяцца крукі.
Па ранах, па ранах
Ідуць чужакі.

Іх стрэлі без страху –
Ды нельга спыніць...
Паўмесяц на сцягу,
Як рана баліць.

І сонца не свеціць,
Сады – не відны.
Жанчыны і дзеці
Сумуюць адны.

Спыніце паганых
Хутчэй вы, сябры!
Ды – рана ля раны –
Маўчаць ваяры.

А башыбузукі
Ідуць і ідуць...
Жаночыя рукі
Перац труць.

Бо ў іхніх праклёнаў
Памочнік адзін:
Перац чырвоны –
Зброя жанчын.

Трыце ж, жанчыны,
Зброю хутчэй
Для гэткай лавіны,
Для столькіх вачэй!

У ручках маленькіх
Перац дрыжыць:
У жменях і жменьках
Зброя ляжыць...

Зялёным зацьменнем
Турэцкі сцяг:
Ідуць па цярпенню,
Нібы па касцях,—
Бліжэй...
            бліжэй...
                        бліжэй...

## Шахматы

*Руская балада. XIX стагоддзе*

«Палац князёў» — астрожная вязніца.
І ўдзень тут свечка хліпкая гарыць,
І полымя пудліва мітусіцца,
Як сполахі нявдзейсненай зары.

Прыціхла вёсачка малая пад гарою
З вялікай назвай навырост — Чыта.
Ад свету адгароджаная мроя
Завостранымі мачтамі плата.

— Ваш ход. Вы не забыліся, прабачце?
— Я? Што вы — помню. Ход і праўда мой...
— Хадзіць так нельга...
                        — Нельга? Хто там плача?

Што за дзіця ў турме?!
                                        Хутчэй адпраў дамой!

На яго месцы закруціўся б кожны,
Як трэска на узвіраным плыву,
Каб катаржнікаў шаць яснавяльможных
Звалілася вось так на галаву.

Хаця астрожнікі адзеты не па модзе,
Ды князь – ёсць князь:
                                        памылішся здаля.
І камендант, здараецца, заходзіць
У шахматы з князямі пагуляць.

– Ваш ход,– кажу.– Чакаю зноў, васпане.
Ратуйце караля хутчэй свайго...
Звініць зланцужаны астрожнік у кайданні,
І камендант сапе каля яго.

Князі, князі... Не вопраткай – абліччам.
Дый камендант – не прыстаў станавы:
Як катаржнікаў, ён на «ты» іх кліча,
А як князёў – з пашанаю, на «вы».

А што ты зробіш!
                                  Сувязі – то ж мара.
Уся сталіца ў іх руках амаль.
І родзічы шыкоўныя і зараз
З'язджаюцца хутчэй за ўсё на баль.

А што нам баль! І той вунь абадранец
На балях гэтакіх яшчэ нядаўна ззяў,
А зараз вуліцу мяце – таксама танец! –
І смецце носіць на падводу. Звяў.

Але ж, але ж... Нягледзячы на гэта,
Нягледзячы на снежаньскі зімовы гром,

Блішчаць на сваяках іх эпалеты,
А сем'і іх знаёмыя з царом.

Таму да дзекабрыстаў пасля працы
Заходзіць пагуляць, як да сяброў,
Хоць ведае: гідліва атрасацца
Ён будзе потым доўга ад клапоў.

Клапы, клапы... Як церпяць іх князёўны,
Што на спатканні ходзяць у астрог,
Стамлёныя абразаю вандроўнай,
Пасля такіх даўгіх, як лёс, дарог?!

Ужо і дзеці ў цэлях, бач, галосяць –
Ахвяры неабдуманай любві.
Яны – адрынутыя. І ніхто не ўпросіць
Вярнуць яснавяльможнасць іх крыві.

І ўсё ж ён астанецца ў іх даверы –
Нашто яму вяртацца на раллю...
– Хадзіце. Пагражаюць афіцэры
Вашаму, зірніце, каралю.

Што гэта – дзёрзкасць?
Ці якія змены?
Ён жа адказвае за кожны іхні крок...
Няма акон – у цэлях толькі сцены,
Няма святла – між сценаў толькі змрок.

Што, далажыць аб дзёрзкасці начальству?
– Вам шах! Не дапаможа пешак раць.
Не, лепей з князем,
мусіць, не змагацца,
Не, лепей князю ўсё-такі прайграць.

Здаецца камендант.
І мару, нібы промнік,
Хавае ад сібірскіх лютых бур:

А можа, і князі яго успомняць,
Як вернуцца – хто знае? – ў Пецярбург.

«Палац князёў» – астрожная вязніца.
І ўдзень тут свечка хліпае, гарыць,
І полымя пудліва мітусіцца,
Як водбліскі нязДзейсненай зары.

## Навальніца

*Славенская балада. XIX стагоддзе*

Хвала табе, прырода буркатлівая,
За перуны твае хвала, якія
Ламаюцца над стрэхамі, над дрэвамі,
З вяршыні на вяршыню пераскокваюць
І коцяцца, як гулы, па-над вёскаю...
Зірніце, як расшчэпленыя дрэвы,
Што перуны да каранёў абмацалі,
Гараць, нібыта свечкі, пад грымотамі,
Пужліва асвятляюць вёску полымем,
Што сцялася, тужлівая, у цёмначы.
Хвала вам, перуны, за ваша полымя!
Да дрэў, што так палаюць і пад ліўнямі,
Ідуць славенцы з конаўкамі, квартамі,
Ідуць дзяды і хлапчукі спяшаюцца –
Пазычыць перуновага агню.
Яны нясуць,
ад ветру захінаючы,
Яны нясуць,
ад ліўня зберагаючы,
Качаючы у далонях парэпаных
Ці вугалёк, ці скуматочак полымя,
Якое хаты іхнія асветліць,
Што так даўно не ведаюць святла:
Во разбягацца, мусіць, будуць цені,
Што покуль за сталом сядзяць на лавах,–

Ва ўсе куточкі цёмныя паўпішчуцца,
Калі на прыпечку зацепліцца агонь!
Хвала вам, перуны!

Славенцы

Нясуць аскепкі перуна дадому
І, радасныя-радыя, не ведаюць,
Што той пярун разбіў яшчэ і помнік
Стралкам альпійскім – італьянскі сімвал...
Як цяжка жыць пад нечаю уладай!
Назаўтра іх ва ўсім абвінавацяць –
Маўляў, яны той помнік зруйнавалі.
І запалаюць іхнія ўжо хаты
Без перуна, без навальніцы гулкай,
І ў воблаках нярадаснага пылу
Асядуць цяжка помнікі славенцаў,
А дзеці, што на ўрокі заўтра прыйдуць,
Заместа школ убачаць галавешкі...
Праклён табе, нядобрая прырода!
Праклён вам,
перуны!

## Ноч

*Украінская балада. XIX стагоддзе*

Пецярбургская, чужая,
Дзякуй табе, ноча,–
У прыгоннага Тараса
Ты як дзень святочны.

Дзякуй табе, Летні садзе:
Пры тваёй спагадзе,
Дзень адбегаўшы для іншых,
Ноччу сам прысядзе.

Дзень – для іншых,
ноч – свая ўжо,
І ніхто не ўбачыць.

Людзі спяць, а ён малюе –
Як па краі плача.

І тады не ў Пецярбурзе
Ён – ва успамінах.
Дык прылашчы ж свайго сына,
Ненька-Украіна!

Яму трэба з шэрай ночы,
Што завецца белай,
Усе колеры вясёлкі
Здабываці ўмела.

Сіні – каб загаманіла
З ім па-свойску неба,
І зялёны – для усходаў –
Зноў жа ўспомніць трэба.

Жоўты – каб, як на радзіме,
Тут зацвіў сланечнік,
І чырвоны – кірмашовы,
І белы, канечне.

Розных колераў набрацца
Для хаціны чыстай,
Для шырокіх шараварaў
І плахты квяцістай.

І для босых ног сялянскіх,
Для раллі, для пашы;
І для рук, што і ў прыгоне
Так зямельку лашчаць.

І для фартушка знайсці ён
Спадзяванне мусіць,
Што надзею прыкрывае,
Як бяду, ў Катрусі.

Як сляпы Сцяпан-нявольнік
Плача, краю мілы!
Быццам сонца яму вочы
Там запарушыла.

Як навобмацак шукае
Шлях дамоў з чужыны...
Для малюнка нават слёзы
Ён знайсці павінен.

Слёз шукаць не трэба – з імі
Днюе і начуе:
Свае слёзы дасць Сцяпану,
Боль свой намалюе.

Гледачы, зірні, знайшліся
У яго тым часам,
Абступілі ўкруг скульптуры
Парабка Тараса.

Мастаку ж спяшацца трэба:
Дзень ідзе пракляты,
І ўжо днее, днее, днее –
Скончылася свята.

Не, а ўсё-ткі тое свята
Перад ім, здаецца.
Ён яшчэ і намалюе,
Вольны нажывецца!

Людзі грошы ўжо збіраюць
Для волі ягонай –
Каб Шаўчэнку, каб Тараса
Выкупіць з прыгону.

## Пустэльнік

*Руская балада-легенда. XIX стагоддзе*

Хто я такі?
Пустэльнік, вязень тайгі сібірскае,
Які ахвяруе самохаць сябе гэтай белай цішы.
Вось мая келля самотная,
што ўночы акенцам бліскае,
А ля мяне навокал – апроч звяроў – ні душы.

Я толькі што снег расчысціў – бач,
як завея сцелецца! –
Дроў накалоў смалістых, у келлю бярэма ўнёс.
І доўга ў ёй пахла снегам,
марозам і пругкай мяцеліцай,
Пакуль аганёк, нарэшце,
паміж смалякоў не прарос.

Паліцца грубка весела...
Толькі падкідваю дровы я.
Снежань...
Як хораша думаць мне каля грубкі такой!
І ў мяне гасцюе мінулае – адолела далі кедровыя!
Божухна! Гэта ж сёння дзень нараджэння мой.

Там, у царскіх пакоях,
святочна рыпяць, мусіць, дзверы ўсе,
Там збіраюцца, пэўна, як свята,
мой дзень адзначаць,
А ў мяне тут ціха, спакойна...
І ўсё-ткі дзіўна, ці верыце,–
У сорак восем памёршы –
восьмы дзесятак страчаць.

Хто я такі?
Я старац, Фёдар Кузьміч... Пустэльнік,
Які сам сябе тут, на заімцы, у келлю-турму запёр...

А я ж – імператар, людзі.
Каб зналі – здзівіліся б вельмі,
Што я – Аляксандр Першы,
той, што раптоўна памёр.

Я нарадзіўся ў Зімнім.
І маё нараджэнне багатае
Адразу ж, з пялёнак,
зрабіла мяне як быццам святым.
Усе навакол несумленныя,
усе навакол вінаватыя,
І толькі адзін харошы,
сумленны і чысты – ты.

Што я ні скажу – як хораша!
Што я ні зраблю –
як правільна!
Згінаюцца, запабягаюць –
нібы перад імі Гасподзь.
Я знаю:
пад Аўстэрліцам бітва была правалена,
Таму што ніхто не асмеліўся
мне слова сказаць насупроць.

Людзі шукаюць святога,
я імі таксама быў створаны.
Я пахвалю – яны рады,
аблаю – ходзяць, як ноч.
І мае міністры, прыдворныя – чорныя,
чорныя вораны –
У рот мне глядзяць аддана,
не зводзяць з мяне сваіх воч.

Хто ж я такі,
каб пакідвацца вашымі лёсамі, бедамі,
Хто ж я такі,
урэшце, каб вашым сумленнем быць?!

Што я забойца бацькі, вы, падданыя, ведалі,
Але і нават на гэта усе спрабавалі забыць.

Вось тады і пачаў мне сніцца бацька мой – ціхі,
пакорлівы.
Прыйдзе, здаецца, сядзе побач са мною ён.
І яго журботныя вочы
гэтак жа сумна-дакорліва,
Тужліва і доўга ўглядаюцца ў свой
(у мой ужо!) трон.

І мне захацелася скінуць
цяжар мае святасці царскае,
І мне ўцячы заманулася ад усяго, ад усіх...
І тады ў Таганрозе памёр гасудар
з паставай гусарскаю,
А ў томскай тайзе з'явіўся
на цара так падобны мніх.

У дзікай тайзе акенца – як вока ваўчынае,
белае...
Ціха... Снег зарыпеў пад валёнкамі...
Хтосьці ідзе да агню...
«У імя айца і сына...» –
малітва гучыць скачанелая.
Хтосьці прыйшоў на параду.
Пайду я яму адчыню.

Ах, людзі! Якія ж вы дзіўныя.
Вы самі святых ствараеце.
Прагнеце,
каб хоць нехта быў над вамі уладаром.
Ідзяце да мяне па марозе.
І ў мяне развагі шукаеце –
У таго, хто не змог вас разважыць,
будучы нават царом.

## Валы

*Балгарская балада. XIX стагоддзе*

Хутчэй на бераг! Родная зямля,
Як па табе хайдукі сумавалі!
Не дачакаўшыся прычалу карабля,
Яны скакалі у траву здаля,
І падалі, і прагна цалавалі
Зямлю сваю.

Бывай, захоплены знячэўку параход,
Што высадзіў атрад ля Казладуя,–
Плыві далей... А змагары – ў паход:
Іх так чакае стомлены народ,
Якім турэцкі ятаган кіруе
Даўно ўжо так.

Дзве сотні іх... Хутчэй, туды хутчэй,
Дзе ў бойцы захлынаецца паўстанне,
Дзе так бракуе маладых плячэй,
Дзе гасне разам гэтулькі вачэй,–
Хадземце з намі, цеслі і сяляне!
Хадземце, людзі!

Вось плужыць на валах шматок зямлі
Надзіва супакоены араты...
– Там рэвалюцыя! Не чуў хіба? Пайшлі!
– Што! Рэвалюцыя? А мне няма калі –
Араць мне трэба: я ж не так багаты,
Каб траціць час...

– Тады хоць нам валоў сваіх прадай:
На іх мы пакладзём патроны, зброю...
– Што? Вам прадаць? – пытаецца ратай.
Ды колькі вы дасцё?! Вы ж голыя, бадай,
А туркі мне рукою – менш скупою –
Заплацяць больш...

— Тады валоў на час хоць зможаш даць?
Пад'едзем троху — забярэш, нябога...
— Вы ж пастраляеце,— ды вас і не відаць,
А туркі вернуцца і тых пачнуць страляць,
Хто вам валоў даваў на дапамогу...
Не, я не дам.

— О, бедная радзіма,— бачыць Бог! —
Як здзекуюцца туркі, чарбаджыі!
Для рэвалюцыі б я ўсё аддаў, што мог,
Паўстанню б я крывёю дапамог,
А ён шкадуе іваловай шыі...
Пайшлі хутчэй!

І Хрыста Боцеў, задушыўшы гнеў,
Павёў юна́каў пешых у Балканы —
Там падалі сябры, там бой грымеў...
Ён рэвалюцыі аддаў усё, што меў,—
Там з куляю ён стрэўся гэтак рана
На Вол-гары...

## Шыбеніца

*Беларуская балада. XIX стагоддзе*

— Каго любіш?
— Люблю Беларусь.
— Так узаемна!

*Пароль паўстанцаў*
*1863 года*

Як вецер над плошчай прагуў кірмашовай,
Аж снег ад дыхання, здаецца, растаў.
Спакойна прыйшоў пад нядрэмнай аховай
І горда сам-насам з пятлёю ён стаў.

Канечне ж, сябры па паўстанню ў народзе
Стаяць і спакояць бунтоўную кроў.

І сам ён на плошчы таксама прыходзіў,
Калі там каралі вось гэтак сяброў.

Стаяў між людзей, нібы смяг ачышчэннем,
Хоць бегчы ад жуду хацелася прэч,
Нібыта ў вачэй ён прасіў прабачэння,
З якімі ніколі не будзе сустрэч.

Цяпер і ў самога ўжо доля такая –
Ён пойдзе к сябрам, пакарыўшыся ёй...
А вісельня ў Вільні чакае, чакае,
Нявернікі-каты гуляюць з пятлёй.

Жывога хутчэй збыць у мёртвыя хочуць,
А можа, і ў іх страх знайшоўся на дне?
– Мне так замінаюць ягоныя вочы...
– Ты знаеш, яны замінаюць і мне...

Ах, каты! І вам ужо вусцішна стала.
Нялёгка і вам дастаюцца харчы.
Не толькі мы кормім вас хлебам і салам,
Мы ўмеем і праўдзе мужыцкай вучыць.

Вось так цэлы край узялі і забілі,
І вырвалі мову з глытніцы жывой,
І памяць забралі, каб казкі і былі
Навек зараслі бадылём, крапівой.

Са школаў павыгналі роднае слова,
У світцы мужыцкай не ўлезці туды.
На шчырых, сумленных наладзілі ловы,
Як воўчыя ямы – царовы суды.

Нянавісць, што доўга пад стрэхамі спее,
Рабам за жыццё нават стане важней.
Той жне, хто пасее, той жне, хто пасее,
Хто праўду пасее, той волю пажне.

Мне блізкая цемра выстуджвае грудзі,
А катам, здаецца, акропна ўдвайне...
— Мне так замінаюць сагнаныя людзі.
— Яны замінаюць, ты знаеш, і мне.

Бывай, мой народзе! Жыві ж ты, багаты!
Спакойна памру я, крывіна твая —
Зямлю атрымае, гавораць, араты,
А шляхты паменела як не ўдвая!

Яшчэ не прасохлі паўстання скрыжалі
Ад дымнай крыві і няскораных слёз.
Мяне ж, як асочніка, каты змушалі,
Каб я на сяброў па змаганню данёс.

Вось так маю чэсць і мой гонар караюць,
Ды к самапавазе і тут я прыйду.
Я быў пракуратарам цэлага краю,
Ці ж мне апускацца ў такую брыду?!

З дзяцінства прыстойнасці знаю прычыны
І сам ненавідзець прывучаны зло.
Звычайная шчырасць — заўжды
дабрачыннасць,
Шпіёнства — заўсёды агідным было.

Усё, што жывецьмець,— навечна мінае,
У вочы магільнае цемрыва тхне...
— Ты знаеш, а мне цішыня замінае.
— Яна замінае, ты чуеш, і мне.

Нялёгка і горка зямельку пакінуць,
Але ж, мой народзе, за праўду тваю
Дазволь тваййму шчыра-трывожнаму сыну
Памерці на вісельні, нібы ў баю.

А ты не чакай дабрадзеяў, народзе,
Ніхто табе волі не дасць самахоць.

Пасейся ў свабодзе, радзіся ў свабодзе
І здзейсні сваю векапомную хоць!

І нашых з табой намаганняў не сцерці.
Сказаць я хачу пасля столькіх нягод,
Што большага шчасця няма, як памерці
За вольную волю і вольны народ.

Марознае, ясна-халоднае ранне.
Абражаны вісельняй злюднелы пляц.
Вось-вось, касінеры, змаганца не стане.
Кастусь Каліноўскі...
Вяроўка...
Пятля...

А каты ізноў апусцілі галовы,
Як быццам нявідзежны нехта іх гне.
– Ты знаеш, мне чуюцца нейкія словы.
– Яны замінаюць, ты чуеш, і мне.

Над плошчаю – ціша.
На плошчы – маўчанне.
І ўсё ж, аж, здаецца, хістае зямлю,
Маўкліва грыміць,
Нібы кліч да паўстання:
– Люблю Беларусь!
– Узаемна люблю!

## Арыштант

*Украінская балада. XIX стагоддзе*

І зноў марозна доўгая дарога,
Наскрозь прамерзлі нават кайданы.
Ім да Табольска грукаць яшчэ многа,
І вёрсты будзяць, як званы, яны.

Мяне зноўку разлучылі
З роспачным Падоллем –
Мусіць, гэткая ў Кармеля
Гараватка-доля.

Шлях на катаргу пачаўся
Ад кузні вясковай,
Дзе мяне заланцужылі,
Закулі нанова.

Твар нанова стаўравалі,
Хоць таўро ўжо тое
Не было дзе нават ставіць
На чало крутое.

Не тужыце, дабралюдзі:
Я і тут вас бачу.
Як успомню гвалт над вамі,
Дык і сам заплачу.

Гэта ж трэба, каб у раны
Столькі ўцёрлі солі,
Каб для вас мачылі доўга
Розгі у расоле.

Каб прыгонныя красуні,
Быццам бы панятак,
Малаком, грудзьмі кармілі
Панскіх цуцанятак.

І ў дарозе чую – мною
Страшыце вампіраў:
«Пачакайце, Кармалюка
Вернецца з Сібіру.

Ён тады вам і пакажа,
Як загляне ў «госці».

Вы за ўсё, за ўсё плаціцьмець
Кроўю, ягамосьці!»

А вось і лета па Сібіру крочыць.
Нагрэліся, спацелі ланцугі.
Цяжкія стомадні і стоманочы
Матаюць кайданы ў клубок тугі.

І раней плаціў спаўна ім
Я за вашы болькі.
Як над дурнямі глуміўся,
Каб вы знали толькі!

Жабракам у торбы сыпаў
Панскія дукаты
І за беднага аднога
Лез на сто багатых.

Я круціў над галавою
І на пасавішча
Так кідаў, бывала, пана,–
Што аж вецер свішча.

Піў гарэлку ў корчмах з імі,
Піў і на вяселлі,–
Дазнаваліся назаўтра,
З кім яны сядзелі.

Пра мяне ў мяне пыталі,
Знаць, дзе я, хацелі.
І я сам ім – сам! – падказваў,
Як злавіць Кармеля.

Мне ж таксама давялося
Слёзамі давіцца,
Як з сынамі і Марыяй
Быў на вачавідцы.

Горнуцца сыны да бацькі
З радасцю дзіцячай.
Я ж піхаю ад сябе іх,
Хоць душою плачу.

А яны не разумеюць –
Зыраць вачаняты,
І спалоханыя вусны
Шэпчуць:
 – Тату!
 – Тату!

Я ж кажу:
 – І іх не знаю,
І іхняга енку!
Вы ўзялі за Кармалюка
Ваську Гаўрыленку.

На мяне глядзяць малечы,
Потым зноў на маці...
Не, няма цяжэй нічога
За слязу дзіцяці.

Дарога чвякае, пад ногі лезе,
І сам у твані тонеш да вушэй,
Набракла восенню і холадам жалеззе
І ад гразі зрабілася цяжэй.

Што ж, чакайце мяне, людзі,
З катаргі чакайце,
На свайго Кармалючэньку
Зноў надзею майце.

Бізуны, батогі, плёткі,
Канчукі, нагайкі...
На спіне не зажываюць
Іх шрамы і спайкі.

Колькі ў вежах насядзеўся,
Да слупоў прыкуты!
Ды ўсё роўна вырываўся
Я з жалезных путаў.

Пад канвоем быў я вольны,
Не баяўся гаўя,
І чым болей было варты,
Тым лягчэй збягаў я.

На сцяне ў турме як толькі
Лодку намалюю –
Мы з сябрамі ў яе сядзем
І з-за крат вяслуем.

Тройчы з катаргі ўцякаў я –
Дагані Кармаля!
Не, няма такіх кайданаў,
Каб мяне стрымалі!

Зноў дамоў вярнуся скора...
Дам я радасць глотцы –
Крыкну так, што цар пачуе:
– Ну, здаровы, хлопцы!

І ўжо свабода, блізкая такая,
Казыча твар, знабкі ад ледзяшоў.
І ў думках ён, шчаслівы, уцякае
Адтуль, куды пакуль што не прыйшоў.

## Клетка

*Руская балада. XVIII стагоддзе*

І гэта ўсё? Канец усім надзеям?
Твой шлях папаўся ў клетку, нібы воран,
І ў роспачы балюча ў ёй забіўся
Крыламі аб жалезныя пруты.

Дарога... Ноч...
Рыпяць пад клеткай колы.
І факелы гараць. І мітусіцца
Навокал зненавіднае святло,
Што болей, чым удзень, у змроку слепіць вочы...

Прэч, прэч, святло! Як бы хацеў астацца
Сам-насам ён з глухой чарнотай ночы
І з думай чорнаю – такою ж, як і ноч.
Згасіце факелы, задзьміце іх, вятры,
Заліце ліўнямі, асеннія дажджы,–
Ён хоча зліцца з цемраю начною!
Што – гэта ўжо не ноч?
Што – гэта дзень,
Асветлены, як промнямі, дажджамі?
І клетка, зробленая для цябе сумысна,
Выстаўлена напаказ, усім на вочы.
А ў клетцы – ты?
Яго вялікасць?
Цар, гасудар-надзёжа, прад каторым
Укленчвалі казакі і сяляне,
Раскольнікі і скітнікі-манахі,
Калоднікі, бадзягі, бурлакі...
Народ, якога ў царскіх маніфестах
Ты мілаваў і морамі, і рэкамі,
Зямлёй і хлебам, вераю і воляй,
Травою і малітвай. І яшчэ
Паднятымі набатнымі званамі. І яшчэ
Барадамі ты мілаваў дзяржаву
Расійскую, бо люд за іх каралі
Бязлітасна ранейшыя цары.

Дзе твой народ? Той, што, бязмоўны,
Зімой мяцеліц – босы! – натаптаўся,
За плугам летам – голы! – нахадзіўся,
Слязамі аж да п'яну панапіўся,
Кайданным звонам аглушыў дарогі;

Чыя спіна залашчана хлыстамі,
А душа аж садняе – бы рана...
Прэч, вочы, прэч!
А вы абселі клетку,
Куды ўпіхнулі здраднікі яго,
Разнюхаўшы, што іхні цар-надзёжа
Ані пісаць, ані чытаць не ўмее...
І вось прыкуты ланцугамі, як сабака,
І зацкаваны, нібы воўк, вачамі,
Глядзіць асатанела ён праз краты
На здзіўлена-спалоханых паноў,
Якіх мінулі шабля і вяроўка.
На тых паноў, што воўчыя капканы
Ставілі ў забаве на людзей,
Што разам з коньмі ў брычкі запрагалі
Жанчын і ўсіх сцябалі на ўвесь скач –
Каб паглядзець, хто з іх спрытней на ногі...
Глядзіць з нянавісцю.
Але што зробіш?
Калі на дзвюх руках – пятнаццаць фунтаў,
На дзвюх нагах – вісіць амаль паўсотні,
А на душы,– вядома ж, усе сто...
Калодкі, кайданы і ланцугі.
І клетка – і турма яго, і хата,
Што зрублена дыхтоўна для цара...
Народ, дзе ты, знявечаны народ?!

Судзіў тут граф Панін Пугачова:
«Скажы, скажы, Пугачанька, Аміллян Іванавіч,
Ці многа ты перавешаў князёў і баяраў?» –
«Перавешаў вашай брацii семсот сямі тысяч.
Дзякуй табе, Панін, што ты не папаўся,
Я б чыну табе прыбавіў, спіну б тваю выпраміў,
На тваю б на шыю – варовіны вожкі,
За тваю б за паслугу вышэй за ўсіх бы павесіў...»

А вочы ўсё глядзяць, нібы на звера,
Талопяцца, свідруюць – як палююць,

А ён праз іх, праз позіркаў зацьменне
Свабодны стэп — яшчэ свабодны! — бачыць,
Яік, умёты, дзе харугвы шыюць
Для барацьбы і новага цара.
Бярду ён бачыць —
Вёску і сталіцу,
Якую сам зваў Новаю Масквою.
І нават звон кайданны ў клетцы чуе,
Той, радасны, калі ён сам на волі
Збіваў ля кузні з вязняў кайданы.
І бачыць Пецярбург, дзе не бываў ніколі,
Царыцу бачыць, што не знаў ніколі,
І яе вочы, у якія не глядзеў ніколі,
Але ў якіх — ён адчуваў — усё яшчэ кусціцца
Самім жа і пасеяны ім страх...
Прэч, вочы, прэч!
Яны ж усё разглядваюць Ямельку,
І, што таіцца, многія ўжо бачаць
Ў руках чацвертаванца-ката
Ягоную цяжкую галаву,
За валасы паднятую над целам...

Аміллян ты наш, родны бацюхна!
На каго ж ты нас пакінуў?
Краснае сонейка закацілася...
Як асталіся мы, сіроты гаротныя,
Няма каму за нас заступіцца,
Крэпкую думачку за нас раздумаць...

Без слоў гучала песня. Яе чулі
Счарнелыя ад здзеку пугачоўцы,
Галодныя, раздзетыя, што ў жаху
Прайшлі праз рукі многіх кнутабойцаў,
Што, павязаныя канатамі ў пляцёнкі,
Плоймамі брылі, як здані,
У крэпасці, у турмы, у скляпенні.
Песню чулі забітыя насмерць паўстанцы

Адрэзанымі ў лютасці вушамі,
Галовы, што на коллі скрозь тырчэлі,
Ахвяры, што на вісельнях плывучых
Па Каме і па Волзе ўніз плылі –
І толькі вырваныя абцугамі ноздры
І ў мёртвых раздзімаліся ад крыўды...

Аміллян ты наш, родны бацюхна!
На каго ж ты нас пакінуў?
Мы ж думалі, што цароў не забіваюць гарматы
І самыя вострыя палашы
Адскокваюць, думалі, ад царскіх шыяў...

Маўчала, не рыпела болей клетка.
Спыніла песню катава сякера.

## Ёлка

*Чэшская балада. XVIII стагоддзе*

Гаспадар – барон аўстрыйскі
Да сваіх імчыць суседзяў,
Да сяброў багатых едзе
Гаспадар – барон аўстрыйскі.

– Хоць зірнуць на нашу ёлку
Запрашаю на Каляды.
О, з вас кожны будзе рады
Хоць зірнуць на нашу ёлку.

– Не прасі – мы не паедзем:
Там паўстанне – стрэляць раптам,
А страляюць ходы трапна,–
Не прасі – мы не паедзем.

– У мяне ёсць толькі ёлка,
У мяне няма паўстання,

Ходскіх стрэлаў – анізвання:
У мяне ёсць толькі ёлка.

Як убрана гэта ёлка!
А якія на ёй цацкі!
Я і сам люблю, прызнацца,
Як убрана гэта ёлка...

Запрасіўшы ўсіх суседзяў,
Ён вяртаецца дахаты,
Накрывае стол багаты,
Запрасіўшы ўсіх суседзяў.

Вунь, зірніце, едуць госці –
Снег капыцяць гулка коні,
Нецярпліва бомы звоняць –
Вунь, зірніце, едуць госці.

Бачаць госці – перад замкам
Ёлка калядная ззяе,
Ёлка іх, гасцей, страчае,
Бачаць госці перад замкам.

Гляньце, што гэта за дзіва?
Заміж цацак карагода
Там вісяць паўстанцы-ходы.
Гляньце, што гэта за дзіва...

Ай, барон! Ай, малайчына!
Ведаў, чым сяброў усцешыць:
Гэтых ходаў толькі й вешаць –
Ай, барон! Ай, малайчына!

І пры радасці ляклівай
За сталы садзяцца госці.
Толькі муляе ўсё ж штосьці
І пры радасці ляклівай.

Весяляцца і не бачаць,
Што на ёлцы цесна стала,
Што жывых на ёй нямала,–
Весяляцца і не бачаць.

Дзе, сп'янелым, ім убачыць,
Што за імі сочаць рулі
І штуршка чакаюць кулі,
Дзе, сп'янелым, ім убачыць!

А на ёлцы помста вісне –
Ходы з мёртвымі ў абдымку.
Зараз стрэляць... Шчэ хвілінку...
Вунь, на ёлцы помста вісне...

Загрымелі стрэлы раптам,
Нібы хлопаўкі між голля,–
Парадзела ўраз застолле...
Так, страляюць ходы трапна!

## Яношык

*Славацкая балада. XVIII стагоддзе*

– Вось і ты папаўся,
Галубок харошы –
Сам прыйшоў у рукі
Валандзей Яношык.

– Гайдукí-гайдýкі,
Смеласці ў вас многа:
Усямёх ідзеце
На мяне аднога.

Я ж крыху счакаю.
Як вас будзе дваццаць,

Вось тады і мушу
За валашку ўзяцца.

За валашку тую,
Дзе на сотню сілы,
Тую, што дала мне
Чарадзейка – віла.

– Ты дарэмна, хлопча,
Нас сякеркай страшыш –
Бач, твая валашка
У руках у нашых.

– Нават без валашкі
Я вас супакою.
І пачаў шукаць ён
Загаворны пояс.

– Не шукай яго ты,
Янічак харобры –
Пояс бабка ўкрала
І схавала добра.

– Мне б абняць старую:
Ёй аддзячыць мушу...
– Не дазволім, Янік,–
Ты ж яе задушыш.

Ён тады – наўцёкі.
Паслізнуўся, грохнуў...
Пандуры сыпнулі
Перад ім гароху.

– Не мудры, Яношык,
Ты ўжо мёртвы, Янча,
Па табе вяроўка
Даўнавата плача.

— Што ж, бывай, мой лесе,
Родны, нібы хата.
Кожнае там дрэва
Мне было за брата.

І сябры, бывайце —
Сам сцярплю ўсе кары.
Не, я вас не выдам,
У смале хай варацъ.

— Бач ты, валацужка,
А гаворыць брава,
Бы на ўсё забыўся,
Рабаўнік крывавы.

— Не, я не разбойнік,
Не па мне няслаўе:
Браў я у багатых,
Бедным аддаваў я.

Памагаў свабодай,
Тым, хто век без волі,
І плаціў панам я
За сялян мазолі.

І плаціў за здзекі,
Сплаканыя вочы.
Стражнічкі, за розгі
Доўг свой я вам сплочваў.

Я загадваў строга
Гіцалям багатым:
«Душу аддай Богу,
Нам аддай дукаты».

Грайце ж зноў, фуярэ!
Гнеў мой незагойны.

Я змаганец чэсны,
Я вам не разбойнік.

Дык бывайце ж, людзі,
Я, відаць, вярнуся,
Як з Дуная сонца
Высушыць ваду ўсю.

Мне вяселле ладзяць –
Доля ўжо такая,
Там мяне нявеста
Страшная чакае.

А ў той маладухі
Ані рук, ні ножак.
Петлямі, крукамі
Яна ўсіх трывожыць.

З ёю ажанюся
На гары Кралёвай:
За рабро падчэпяць
Крукам металёвым.

Я разбойнік чэсны,–
Адпусціце стражу!
Вісельня нягрэшных
Не прымае, кажуць...

На гары Кралёвай
Раптам ціха стала...
«Жаніха» прывезлі,
А «нявеста» ўпала.

Будзеш жыць, Яношык,
Між сваіх славакаў
Сто вякоў, а можа,
Нават з добрым гакам!

## Крылы

*Руская балада. XVIII стагоддзе*

Крылаў няма ў чалавека,
Каб падмінаць імі неба,
А яно гэтак звабліва вісне
Над табою – куды ні глянь.
Топча раллю ён лапцямі –
Аж пыліць перасохлая глеба...
Бывай жа, такая ласкавая
І такая злая Разань.

Прабач, не паспеў ён у спеху
З табою як след развітацца:
Бег колькі сіл па гародах,
Бег уцалік, па карчах.
Той шарадром ужо ззаду,
Скуль хацеў ён у неба узняцца,
Дзе агонь, што шар дымам напоўніў,
Мусіць, яшчэ не ачах.

За небакрай ужо дрэвы
Заходзяць, як жоўтыя сонцы,
Высозныя дрэвы-званіцы,
Да якіх ён нарэшце дарос...
А як ён ляцеў, усеўшыся
У пятлю забрытанага шара,
Над макавінамі самымі
Дужа высокіх бяроз!

Зайшлі ўжо бярозы... І толькі
Ледзь-ледзь залаціцца званіца,
Аб якую вецер вярховы
Разбіў яго ўскрылены шар...
Калі за званы, за вяроўкі
Чапляўся ён, каб не зваліцца,

О, як званы зазванілі –
Нібыта на мор ці пажар.

Выбеглі людзі з хатак,
У неба рукамі загрукалі:
– Ды ён, ірад, д'яблу служыць,
Ды ён – сын нячыстых сіл.
Як на яго цюгакалі,
Бы на ваўка, агатукалі
За тое, што лётаць уздумаў,
Не маючы з роду крыл...

Кідалі каменнем, білі
Яго і ягоную мару,
А потым з горада гналі –
Ідзі, куды хочаш, цмок...
Крылаў няма ў чалавека,
Каб падмінаць імі хмары,
Добра, што ёсць хоць ногі –
Як бы без іх ён уцёк?!

Крылаў няма ў чалавека,
Каб падмінаць імі неба,
А яно гэтак зваблiва вісне
Над табою, куды ні глянь.
Топча ён сцежку лапцямі –
Аж пыліць перасохлая глеба...
Бывай жа, такая ласкавая
І такая злая Разань...

## Кмет

*Харвацкая балада. XVIII стагоддзе*

Расспявалася жалеза
Пад рукою каваля.
І які жалезу клопат,
Што ў мяне баліць душа!

Як урбарыі сцвярджаюць,
Кмет павінен паважаць
Феадалаў сваіх родных,
Бо яны зямлю даюць.

А без іх, яно і праўда,
Што б той бедны кмет рабіў?!
Дзе б, бязніўны, жаў і сеяў,
Дзе б, бязлужны сам, касіў?

А таму на ўсю пражытку
Застаецца радасць нам:
Нашым шчодрым феадалам
Рукі-ногі цалаваць.

Не выслужвайся, жалеза,
Перад панам, не звіні.
Пашкадуй, жалеза, кмета –
Весялосць сваю прыцiш.

За рупню панам мы ўдзячны:
Нам памерці не даюць –
Працу цяжкую знаходзяць
За счарсцвелы хлеба кус.

Вінаграднік гаспадарскі
Даглядаем за яду,
Глебу ўгнойваем, лагодзім,
Садзім новую лазу.

А які мы гонар маем,
Калі наш шаноўны пан
Непамысных нас уважыць –
На жаніцьбу дасць дазвол.

І на кухню пана ў замак
Мы, удзячныя, штодня,

Колькі трэба, столькі й возім
Куранят, гусей, зайцоў.

Змоўкні, подлае жалеза,
Хопіць душу разрываць!
Ты ўжо рукі адабрала,
Зараз цягнешся да ног.

Праўда, часам і карае
Нас любімы феадал.
Як нам радасна, дурніцам,
Калі розгі пан бярэ!

Не, насмерць не забіваюць –
Кмета ўсё-ткі берагуць:
Ён пасля лупцоўкі добрай
Мусіць добра працаваць.

Нават вісельні сабе мы
Самі любім будаваць.
Выгаблёўваем, штукуем,
Каб трывалымі былі.

Шчыра лесвіцу трымаем,
Каб бліжэла да пятлі.
Так адзін аднога сілім:
Ты – мяне, а я – цябе.

Як вясёлае жалеза
Мне набрыдзела за дзень!
Сваю брудную работу
Ты хутчэй канчай, каваль!

Я ж, як бачыш, пакараны,
Бо задумаўся, дзівак:
А навошта можным рукі,
Нават ногі цалаваць?

А яшчэ сабе на гора
Усумніўся з-пад ярма:
А чаму зямля ўся ў пана,
А, напрыклад, не ў мяне?

Мы ж у свет прыйшлі, як роўня,
Па адной дарозе з ім.
Дык чаму ж яму – пашана,
А мне – розгі і турма.

Вось за гэта і зланцужаць,
І пасадзяць малайца
На дно вежы ў падзямелле,
На ваду і сухары.

Ну, дык што, ужо гатова?
За дарунак дзякуй вам!
Хоць я ведаю: за «дзякуй»
Не працуюць кавалі.

Па урбарыю старому
Мала вязня закаваць –
Ён яшчэ плаціць павінен
Кавалю за кайданы.

Чым плаціць – не маю зараз,
Заплачу пасля турмы:
Каваля я разам з панам
І без грошай закую!

## Лазня

*Балгарская балада. XVIII стагоддзе*

Мы – аркестр рабоў.
Мы цягнем мелодыю гэту,
Даўгую – быццам дарога дадому,
Цяжкую – нібы бурлакам карабель на мелі,

Сумную – што нашы вочы.
А хіба вочы вясёлымі будуць,
Калі людзі эміра (якія там людзі!)
Адабралі ў іх колеры,
А ім толькі чорны пакінулі –
Колер зацьмення:
Чорныя кветкі,
Чорнае неба
І чорнае сонца
На чорнай чужыне...
Іх палохалі нашы вочы –
І яны іх выпеклі, вылюдкі.
(Маўляў, вочы, што бачаць колеры,
Замінаць толькі будуць аркестру.)

Мы – аркестр рабоў,
У мармуравай лазні эміра іграем.
Ён толькі што выкупаўся ў басейне
І цяпер абсыхае, выстарак.
А ў басейне яго
Паланянкі-балгаркі купаюцца,
Перад ім,
Перад намі купаюцца...
Мы іх ведаем добра,
Хоць ніводную ў твар не бачылі,
Толькі ж кожную мы пазнаём
Па дыханню,
Па кроках,
І па тым, як рука ваду паслухмяную чэрпае
І, ўзняўшы, на плечы крутыя ліе,
І па тым, як вада па целе
Сцякае –
Пазнаём.

Мы – аркестр рабоў.
Нас трынаццаць.
Іх таксама, здаецца, трынаццаць.
О, як мы іх да болю кахаем!

Вылка – тую, што вельмі ласкава ступае,
Асен – тую, што, нібы крылом,
рукою ледзь чутна махае,
Я – тую, што дужа часта ўздыхае.
І як мы пакутуем,
Калі эмір выклікае на ложа каго з іх,
Каб сваю старэчую прагнасць спатоліць!
Сціхніце...
Зноў кагосьці пальцам паклікаў...
Анямейце, птушкі ў залочаных клетках!
Дзівакі,
Навошта вы гэтак стараецеся?
Як і нам, вам жа выпеклі вочы,
Каб вы лепей спявалі,
Каб толькі спявалі...
Сціхніце,
Дайце паслухаць,
Хто ж ідзе на эмірава ложа клятае,–
Ці тая, што дужа ласкава ступае,
Ці тая, што, быццам крылом, рукою махае,
Ці тая, што цяжка ўздыхае?..

Мы – аркестр рабоў.
О Божа!
Яна, зноў яна, ідучы, уздыхае...
Вось яе абціраюць вялыя еўнухі,
Успамінаючы нешта далёкае,
Дакрануўшыся да грудзей знячэўку...
Вось кладуць яе ля эміра –
Перасохлага, нібы мошчы, турка...
Божа!
Аглушы мяне, Божа,–
Як я знябыўся слухаць
Такія любоўныя пакуты
Маладога і старага цела...
Застагнала струна мая...
І адразу шчаку запякло ад далоні хормайстра.

О, яны ўмеюць да нас, сляпых, падкрадацца
Ціха, нячутна – як кошкі;
Біць,
Каб зноў выпрамляць мелодыю:
Мы ж – аркестр рабоў...

Хто тут?..
Хто ля мяне?..
– Ангел! Абдымі мяне, Ангел...
– Гэта ты?!
І адкуль ты ведаеш,
Што з цябе я вачэй не спускаю?
– Абдымі... Пацалуй...
Я...
Яго...
Задушыла...

## Кукіш

*Руская балада. XVIII стагоддзе*

І ён са мною у палоне,
Віноўнік арышту майго,
Нявінна сцяўся на далоні,
Аж шкода, беднага, яго:
Як кацяня, заплюшчыў вочы –
Здаецца, зараз завуркоча.
Маленькі і несамавіты...
І напалохаў ён чаму
Хлусоў вучоных цэлу світу,
Што нас заперлі у турму?

Не, тут не кукіш вінаваты,
А я – чарнасашонца сын:
Бо ў іх вучоныя палаты
Зайшоў, зірніце, селянін.

Навуцы – гора, гора, гора:
Сярод вучоных – сын памора.
Таму не могуць прымірыцца,
Даносы пішуць кожны дзень,
Сварыцца любяць і бажыцца,
Што не вучыўся я нідзе.

А я ж вучыўся у народа –
Мне гэты вопыт дарагі...
Настаўнік першы мой – прырода,
І праца шчырая – другі,
А трэці мой настаўнік будзе
Заўсёды – людзі, людзі, людзі...
Таму я веру, што Неўтонаў
Патрэбна дома нам шукаць,
Што можа і сваіх Платонаў
Расійская зямля раджаць.

Але пыхлівасць чужаземцаў
Спяшае Русію скарыць.
І з мовы рускае смяецца,
Бо ёй не ўмее гаварыць.
І ў акадэміях лапоча
Па-свойму кожны – як хто хоча.
Яны сцвярджаюць, што ў Расіі
Карысных выкапняў няма,
Сцвярджаюць, быццам бы ў Расіі
Адзін ёсць выкапень – чума.

О што вы, што вы, прайдзісветы!
Не можа беднай быць зямля,
Дзе так буяе ў красках лета,
Дзе пахне цёпла так ралля,
Дзе вышай воблакаў – вяршыні,
Дзе ў рэчках нашых столькі сіні,
Дзе сонца стоміцца, няйначай,
Пакуль завершыць свой абход,

Дзе людзі адначасна бачаць
І захад сонца, і усход.

Багацце нашы горы лучыць –
Нам трэба выхад даць яму.
А нас ці збэсцяць, ці адлучаць,
Ці так во ўкінуць у турму,
Каб мы далелі ад навукі,
А ўсё ішло праз іхні рукі,
Якія зноў пасля даносаў
Навуцы чэшуць аглаблю.
А я, Міхайла Ламаносаў,
Ілюмінацый план раблю...

Мне шкода сіл, якіх не вернеш,
Бо ўсё ж уведаць трэба мне,
Калі зямлі даверыць зерне,
Калі спачын даць баразне.
З начальствам часта я сваруся,
Ды так, бывае, і сарвуся,
Як гэты раз, калі пры сведках
Я лаяў невукаў-шышоў,
Калі пад нос, пыхлівы гэткі,
Мой кукіш дужа ж падышоў.

Цяпер са мною у палоне
Віноўнік арышту майго,
Нявінна сцяўся на далоні,
Аж шкода, беднага, яго:
Як кацяня, заплюшчыў вочы –
Здаецца, зараз завуркоча...
Такі вялікі, самавіты.
І напалохаў ён таму
Хлусоў вучоных цэлу світу...
Дык слава кукішу майму!

## Песні

*Кашубская балада. XVIII стагоддзе*

– Не, не ўмеюць весяліцца
Ну зусім кашубы.
Сумна нудзяцца ў святліцы,
Быццам перад згубай.

Я ж ніколі і не бачыў,
Каб яны спявалі,–
Так жандар-чужак зазначыў
І паехаў далей.

– Што, паехаў? Дзякуй богу!
Варту, варту на дарогу –
Шчыра, ва ўсе вочы
Хай за пылам сочыць.

Мы – кашубы, люд рабочы,
І да скокаў мы ахвочы.
Вецер вее, плынуць хвалі,–
Просяць нас, каб паспявалі.

Дайце, дайце топнуць!
Зачыніце вокны –
Хай ніхто не бачыць,
Як кашубы скачуць.

Плыне вода з агароду
Да самага Гданца.
Чорны боты – да работы,
Чырвоны – да танца.

Дзверы, дзверы зачыніце,
Зашчапіце дзверы,
І кружыце, і кружыце
Дзевак, кавалеры.

А бадай цябе, гультаю,
Трасца неяк міне:
Столькі споўдаўся па гаю,
Ды не стрэў дзяўчыны.

— Едзе, едзе! Зноўку едзе! —
Варта закрычала.—
Пыл! Вяртаецца, суседзі,
Зноў жандар-навала.

Хоць не хочацца спыняцца,
Ды спыніцца мусім...
Супакойваюцца плацці,
Замаўкаюць гуслі.

Зноў расчыненыя дзверы,
Адсланёны вокны.
І скакухі — дайце веры! —
Нібы ў суме мокнуць.

«Мы — кашубы, люд рабочы...»
Тут маркота чахне.
Хоць патухлі зноўку вочы,
Але ж танцам пахне.

Не, нічога не заўважыў
І жандар, паверце.
— Я ж кажу, што ў вёсках вашых
Можна з суму ўмерці.

Не ў кашубскай то натуры
Пець і весяліцца —
Век без песень вы, як куры,
Седзіцё ў святліцы...

Толькі позіркі цяжкія
У яго ўвап'юцца:
Вочы сумныя такія,
А сэрцы — смяюцца!

## Рэха

*Македонская балада. XVIII стагоддзе*

Цёплы ранак, светлы ранак,
звонкі ранак між ажын,
Разбудзілі нечакана,
нечакана вы мяне.
Я ж схаваўся так далёка,
так далёка ад сцяжын,
Што маё лагво і вецер,
нават вецер абміне.
А над краем ціхі ранак,
ціхі ранак, нібы звон,
Паўтарае, што ні скажаш,
што ні скажаш сам сабе.
Уздыхнеш ты – і ўздыхае,
уздыхае цяжка ён,
Засапеш – і наваколле,
наваколле засапе.
Ты шапнеш – і горы ўсюды,
горы ўсюды задрыжаць
І пакоцяць шэпт твой гулкі,
шэпт твой гулкі па зямлі.
Людзі здзівяцца: нікога –
бач, нікога не відаць,
Толькі шэпча нехта побач,
хтосьці побач між далін.
Я ж крычу, ды так, што лісце,
нават лісце ніжа з дрэў,
Чуеш, клічу цябе ў горы,
клічу ў горы дзень пры дні.
Гэта я, твой сумны Слаўка,
сумны Слаўка, што гарэў,
Не згарэў – жывы астаўся,
жыў астаўся і ў агні.
Слаўка – гнаны твой паўстанец,
твой паўстанец хоча зноў,

Хоча грэцца тваёй ласкай,
тваёй ласкай хоча жыць...
Што ж маўчыш ты,
не прыходзіш,
не прыходзіш з маіх сноў,
Нават голас твой у горы,
ка мне ў горы не бяжыць?
Кліч: «Кахаю!»,
кліч: «Кахаю!»
ўсе пачулі навакол,
Горы, птушкі і дарогі,
і дарогі і кусты.
Дрэвы, камні адказалі –
рэха грымнула на дол,
Толькі ціха,
толькі ціша там, дзе сцішылася ты.
Можа, момкі падказалі,
падказалі, каб самім
Дараванне так пагана,
так пагана атрымаць,
Падказалі, што калісьці,
што калісьці (ганьба ім!),
Што калісьці
ў жаўталісці мог цябе я цалаваць.
Мо схапілі сахібеі,
сахібеі, ад якіх
Я уцёк недакараны,
нескараны да канца,
Што за мною будуць гнацца,
будуць гнацца праз вякі,
Будуць прагнуць,
будуць прагнуць,
каб дасмажыць малайца.
Не, я пожага не буду,
не, не буду я чакаць!
Я пайду сягоння ноччу,
сёння ноччу саграшу:

Сахібея нечакана,
нечакана – будзе ж спаць! –
Я сваімі, я сваімі,
я рукамі задушу...
Што ж ты, рэха, нарабіла,
што зрабіла ты, скажы?
Слаўка толькі так падумаў,
так падумаў, а ужо
Сахібеі ўсё пачулі –
вунь засада на мяжы...
І ўглядаецца ў дарогу,
углядаецца ў дарогу,
Углядаецца ў дарогу
самаўпэўнена ружжо...
Чуеш, Слаўка,
чуеш, Слаўка,– ты каханай бараніць
Не спяшайся.
Як убачыш – пацямнее уваччу:
Дзеўка лашчыць сахібея –
не саромецца ані,
І цалуе так аддана,
і аддана прагне ўцех,
І смяецца,
і смяецца...
Душыць, гадаўка, свой смех,
Каб ты, Слаўка,
каб ты, Слаўка,
каб ты, Слаўка, не пачуў...

## Кузня

*Руская балада. XVIII стагоддзе*

Ля крывабокай кузні – коні,
Цароў адпрэжаны вазок.
А ў кузні гром, жалеза звоніць,
Цяжкі гагоча малаток.

Каваль паказвае малойцу,
Дзе трэба па кавадлу біць,
І лае, на чым свет стаіць,
Няўмелага малатабойца.

– Куды ты б'еш, куды ты плешчаш?
Хіба не бачыш, слепанда?
Даў Бог табе такія плечы,
А галавы, відаць, не даў.

Ах ты, убоіна, ах, неслух,
Бач, заманулася кавацьǃ..
Ах, растакую тваю таць,
Чаго цябе сюды прынесла!

Лепш грэў бы свой высокі трон
(Цішэй! Кавадла зараз хрусне...)
Дык не, у Тулу едзе ён –
Цара мая цікавіць кузня.

Куды, куды, куды ты б'еш?!
Які ж ты, дурань, крывалапы!
З табой нічога не скуеш,
З табой жалеза папсуеш,–
Ідзі ты лепей дзевак лапаць.

Што за цары ў нас, Бог святы!
На вочы слеп і глух на вушы...
Балбеса гэткага, як ты,
Каваль ніякі не навучыць.

А той рагоча, як лясун,
Вясёла молат-волат ходзіць...
– На сёння, можа, Пётра, годзе,
Бо вунь вячэру нам нясуць...

Сядзяць. Вячэраюць. Адкрыта
Глядзяць адзін другому ў твар

Каваль Дзямідка, сын Мікітаў,
І Пётра Першы – гасудар.

– Прабач, калі табе дадзеў,
І на мае не гневай словы,–
Кавацъ ты будзеш адмыслова,
Не збрэша молат твой нідзе.

Цябе аблаяў я пад зло,–
Прабач. Скажу табе я прама,
Што любіць наша рамясло
І крык, і лаянку таксама.

Без мацюка я – што без рук,
А з ім, бы воск, жалеза стане:
Хоць прыкладай яго ты к ране
Ці выкуй волас, нібы гук.

І ты, Пятруша, куй і куй,
Бо сам жа знаеш,– не загана,
Калі і цараву руку
Мазоль пазнае нечакана.

Я навучу цябе, павер мне,
Кавацъ ты будзеш – часу дай.
Тады з табой мы горы звернем...
Давай, Ляксеіч, прыязджай...

Кафтан цара, халопа світа...
Развітваюцца ля двара
Каваль Дзямідка, сын Мікітаў,
І Пётра Першы, што ў царах.

Той Пётра, жорсткасць што ўзгадуе
І страх нагоніць на людзей;
Той Пётра, які флот збудуе
І ўздыбіць Русь – аблог надзей.

Ды гэта будзе потым, потым –
Калі яго цяжкія боты
Зашаргацяць па коткіх днях...
Пакуль жа цар, прапахлы потам,
Куе з Дзямідкам, як раўня.

## Званні

*Харвацкая балада. XVIII стагоддзе*

Мы ўдзячны, капітан Мікашыновіч,
Што вы не гэткі, як усе харваты,
Што разумееце нас, немцаў, лепш за іншых
І, калі свой народ не тое робіць,
Вы смеласць маеце яго не падтрымаць.
А то, вы бачыце, паўсталі гранічары –
Не даспадобы ім усім прыйшлося,
Што імператрыца Тэрэзія Марыя
У Банскую Харвацію прыслала
Для плугароў дзве тысячы мундзіраў
Нямецкіх, новых. Вы ж вось зразумелі,
Што нельга без мундзіраў абысціся,
Калі ствараеш новыя палкі –
Для вашай жа, вядома, абароны.
Чаму ж яны ўсе скардзіцца ўзяліся,
Што няма чым плаціць ім за мундзіры?!
А калі ў тых, хто не агараў грошай,
Пачалі браць і прадаваць жывёлу,
Каб было ўсё ж за што купіць мундзіры,
То і загаласілі – іх, бач, зневажаюць!
Ім абясконьванне здалося страшным здзекам,
Маўляў, хто ведае, той разумее добра,
Што не бывае селяніна без каня.
Абраза, ганьба!
                    Бач, для афіцэраў
Найлепшыя ў іх адбіраюць землі,
Дзе яны самі ўласнымі рукамі

Павінны ставіць новыя дамы
Для тых,
каго спрадвеку ненавідзяць.
Няўдзячныя, няўдзячныя сяляне!
Замест таго каб багавець прад намі
І дзякаваць за ласку і за клопат,
Яны клянуць злашчасныя мундзіры
І супраць іх паўстанне паднялі.
Правадыры свае, зірні, знайшліся,
Да зброі клікнулі.
І гэты
Былы кнез Тодар Кіук, самазванец
(Дарэчы, ён жа, знаю, ваш пляменнік),
Прызнаўся сам правадыром народа,
Такую ўладу ўпэўнена прысаміў,
Нібы наноў укняжыўся, нягоднік,
Абтупаў усе вёскі Банавіны,
Рыхтуючы да бунту гранічар.
Ну і пляменнічка ж вы мелі!
І як добра,
Што вы злавіць яго дапамаглі нам,
Зазваўшы да сябе дадому,–
Нібыта для сакрэтных перамоў.
Таксама імператар мне знайшоўся!
Няхай, няхай, зламыснік, зразумее,
Што за мянушку «правадыр» заўсёды
Плаціць даводзіцца высокаю цаною –
Хутчэй за ўсё жыццём.
Пляменніка,
Як і папа яго Піліпа Трбуховіча,
Як іншых пералоўленых паўстанцаў,
Чакае вісельня.
Дарэчы,
Я шчыра дзякую як немец вам за помач.
Не ён, а вы харват, харват сапраўдны,
І я віншую вас з чарговым званнем,
Маёр Мікашыновіч!
А палкоўнік

Мікашыновіч, кажуць, яшчэ болей,
Яшчэ люцей сваё ўсё ненавідзеў,
Як ваўкалак, накідваўся на край свой
І, вырачнік, адрынуты народам,
Зацята ваяваў супроць яго.

## Чубы

*Беларуская балада. XVII стагоддзе*

Заманулася і нам, беларусам,
Паказакаваць, пагуляць без прымусу.
Сотнікі і есаулы з ахвотай
Запісалі ў рэестры галоту.
Пагадавалі мы ўсе чубы –
І ўжо кожны казак нібы.
Былі сяляне ніўныя, былі сяляне рольныя,
А цяпер мы – казакі вольныя.
Чым хочам, тым і займаемся:
Хочам, у карчме забаўляемся,
Калі хочам, жнём, калі хочам, косім –
Словам, работы не просім.
А было ж, што не ўгадуем – з'есць панская з'едзь,
А ты хоць па смерць на голадзе едзь.
Ды вось зноў хочуць зрабіць з нас цягло.
Але не тут-то было,
Бо вольны казак з нас любы –
У нас жа чубы!
А нас б'юць, як і ўсіх, бізунамі,
Здзекуюцца ваяводы над намі!
І з нас, нібы з мужыкоў барадатых,
Патрабуюць падатак.
Тады кожны казак (навошта таіць!)
Крычыць на чым свет стаіць:
– Ты ўважлівей зірні на мяне, душагуб,–
У мяне ж чуб!
А калі прымушаюць ісці на працу –

Казакі ведаюць, як адмаўляцца:
— Не хочам вашае ласкі,
У нас свой парадак — наскі.
Мала, што я вам не люб —
У мяне ж чуб!
Зрываецца з губ:
— У мяне чуб!
Хваліцца любы:
— А ў нас чубы!
І тады ваяводы ўсім чыста
Пазразалі чубы ўрачыста.
Думалі, што мы без чубоў
Будзем араць паслухмяна зноў;
Думалі, што мы, лысыя, як раней, будзем сеяць —
Казакі ж без чубоў, маўляў, казакаваць не ўмеюць.
Але мы дакладна і пэўна,
Самі бясчубыя, падпускалі чырвоных чубатых пеўняў
Пад стрэхі панскія вечныя...

Бачыце, і без чубоў казакі небяспечныя!

## Булава

*Украінская балада. XVII стагоддзе*

Як не расчыняцца крыкам вароты —
Рада гудзе у цяснюткім двары.
Там булава зіхаціць пазалотай —
Кожны, хто прагне улады,— бяры...

Колькі вачэй яе лашчыць дарэмна,
Колькі вунь цягнецца рук да яе...
А гэты дзівак — малады і някемны —
Бачыце, сам булаву аддае.

А як бы схапілі ўчэпіста рукі,
Як бы схавалі яе пад крыссё!

Як бы ўцякалі з ёю ў правулкі,
Як бы крычалі: – Мы ўладу нясём!..

О прага ўлады – цяжкое жаданне!
Круцяць казакі задумна вусы...
– Хай будзе так, як было пры Багдане!
Юрка хай правіць, гетманаў сын!

– Я яшчэ ў суме вялікім па бацьку,
Я не магу сум развеяць нічым,–
Юрка адказвае радзе знянацку:
Так, як Выгоўскі яго навучыў.

А булава, як надзея, як вера,
Аж зіхаціць на стале серабром...
Ломяцца тыя казакі у дзверы,
Што засталіся па-за дваром.

Трэба спяшацца... Двор-то замкнёны,
Ды могуць паддацца сіле замкі.
– Хай будзе новы гетман хвалёны –
Юрка Хмяльніцкі,– крычаць казакі.

Трэба спяшацца... І ад спакусы
Не можа Выгоўскі ўтрымацца ніяк...
– Сорамна будзе вам, сівавусым,
Каб вамі хлапчук кіраваў абы-як.

Ён жа і пораху нават не нюхаў...
Сеч аддаеце, людзі, каму?
Юрку ж пакрыўдзіць можа і муха,
І булава не па росту яму.

А тут яшчэ цар забірае свабоды.
Ён хоча, ён прагне, а ён – не дзіця!
Каб мы не насілі чырвоныя боты,
А, як мужыкі, шаравалі ў лапцях.

Выгоўскі глядзіць у казачае мора —
Хоча кагосьці ў тым моры знайсці.
Калі ж, ну калі ж ужо той загаворыць,
Каму ён даўно і спаўна заплаціў!

Нарэшце пачуўся чаканы той голас:
— Выгоўскі хай будзе у нас атаман!
— А што,— зашумелі казакі наўкола,—
Няхай будзе ў гетманах пісар Іван.

Так... Вось цяпер пааднеквайся крыху...
Ды не цягні — на сваю ж галаву.
А то вунь зласліўцы, няхай на іх ліха,
Могуць з-пад носа сцягнуць булаву.

Выхапяць з рук, адарвуць і ад сэрца,
Гледзячы гэтак нявінна у твар.
Зірніце, як Грышка Лясніцкі злуецца,
Той, што хадзіў ужо з ёй на татар.

Ён ужо грэў булаву у далонях,
Ён наказным ужо гетманам быў.
Верыць: бліжэй ён да ўлады і сёння,
Чымся, прабачце,— пісар любы.

Бачыць Выгоўскі — аднеквацца годзе.
Аберуч бярэ булаву са стала...
Нарэшце улада рукі халодзіць!
Нарэшце ў ягоных руках булава!

## Пагоня

*Славацкая балада. XVII стагоддзе*

Аж задыхаліся двое —
Так улукаткі бягуць,
Не віжуючы дарогі,
Не шукаючы сцягу.

Людзі дзівяцца – не знаюць,
Каму трэба памагчы:
Ці таму, хто уцякае,
Ці таму, хто ўслед імчыць.

І рашаецца каторы:
Што тут доўга мудраваць,
Чалавек жа уцякае –
Памажы яму ўцякаць!

Даганялу дай падножку.
Але той, што ўслед бяжыць,
Плача:
– Ён жа ў маіх дзетак
Хлеб з рук вырве.
Памажы!

Значыць, іншаму падножку –
Хай зазнае сам багна!
Чалавек жа даганяе,
Памажы яму дагнаць.

Але й той пачаў прасіцца:
– Уцяку – і я жыву.
Калі ж ён мяне дагоніць –
Адсячэ мне галаву.

Паспрабуй тут разабрацца,
Што жыццё уткне яшчэ...
Памажы таму – дагоніць,
А другому – уцячэ.

І давалі людзі сцежку,
Саступалі ўсе на край.
– Уцякай жа хутка, хутка!
– Ты ж, як можаш, даганяй!

І не ведалі пакуль што,
Ачмурэлыя ад звад:

Хто ўцякае – той ахвяра,
Хто ўслед гоніцца – той кат.

А па даўняй завядзёнцы
Хто з-пад віселыні збяжыць,
Хто ад ката адаб'ецца,
Будзе век свабодны жыць.

Бег і клопат іх супольны.
Дай бог вязню сілы шмат:
Уцячэ ён – стане вольны,
Але страціць працу кат.

Не ўцячэ – і ў ката зноўку
Праца з'явіцца ў руках,
Будзе зноў ён сеч галовы,
Задушыўшы свой жа страх.

І бягуць, бядой з'яднаны,
Ва ўвесь дух, у дых увесь
Той, хто хоча жыць астацца
І хто хоча проста есць.

Напрамкі яны спяшаюць,
Нават плот для іх не плот...
Дай жа вязню ногі, Божа!
Спатыкніся, жываглот!

Бег слабее. Лес бліжэе –
Насалода для вачэй.
Вязень: скора, скора, скора...
Кат: хутчэй, хутчэй, хутчэй...

Першы ў лес, як зай, ускочыў –
Паспрабуй яго знайдзі!
Кат жа ў полі спатыкнуўся...
Божа мой – ужо адзін!

І упаў ён, і заплакаў,
На ўвесь свет, як воўк, завыў,
Бо чакалі хлеба дзеці,
Што апухлі ад травы!

Але ўсё ж такі і ў ката
Радасць тлелася: «Жыві!» –
Хоць і будзе ён без хлеба,
Але ж будзе й без крыві.

Мой шаноўны свет, віншую
Ад сягоння і навек:
Нарадзіўся у другі раз
Сын твой, свеце,– Чалавек!

А папраўдзе, дык абодва
Нарадзіліся ў бядзе:
Той, хто мусіў быў памерці,
Ды і той, хто жыць хацеў.

## Будоўля

*Беларуская балада. XVII стагоддзе*

Што ж, цесляры, невясёлыя –
Сякера аж падае з рук?
Што апусцілі вы галавы,
Сумна глядзіце на зруб?

Бёрны усцягвайце новыя
І заразайце вуглы...
Хораша пахне будоваю,
Стружкамі ў кроплях смалы!

Дзе ж ваша радасць з уцехаю?
Вунь як святлее вакол!

Над магілёўскімі стрэхамі
Ў неба ірвецца касцёл.

Сцены вышэюць касцельныя,
Кладзецца вянец на вянец
Бёрнамі жоўтымі, смольнымі
З вашых жа хат і з сянец.

Касцёл узнімаецца нанава –
Хаты ніжэй і ніжэй:
Кузьмова, Пятрова, Раманава
Раскрыты да самых дзвярэй.

Бёрны, што млелі пад кроквамі,–
Аж у падмурак ляглі,
А што рыпелі пад крокамі –
На завянчэнне пайшлі.

Што ж, цесляры, невясёлыя?
Паўстання не здзейсніўся план...
Што апусцілі вы голавы,
Пётра, Кузьма і Раман?

Кроквы вяжыце і лаціны,
Ладзьце вянок пад страхой.
Ды спаласніце улазіны
Конаўкай брагі якой...

Нельга. За кожнай саломінай
Сочаць ахоўнікаў шмат:
Рубяць паўстанцы харомiну
З родных разбураных хат.

І ўсё ж, напачатку нясмела так,
Ціхенька – божа баронь! –
У стружках, як мятлушка белая,
Закапашыўся агонь.

Вось яна, радасць з уцехаю,–
Гляньце, як светла вакол:
Над магілёўскімі стрэхамі
У неба шугае касцёл,
Новы палае касцёл...

## Саранча

*Украінская балада. XVII стагоддзе*

Засланіла неба хмара,
Стала цёмна, што ўначы.
Змоўклі нівы, бы ахвяры,
Пад крыламі саранчы.

Каб прабіцца праз мярзоту,
Нават сонцу мала сіл.
Толькі чуеш шум палёту,
Толькі чуцен шорах крыл.

І садзілася імкліва
Цьма – крыло каля крыла.
Стала шэраю ўміг ніва,
Што зялёнаю была.

Ваяваць дарма з той сілай –
Што палохаць і крычаць!
Усё вакол запаланіла
Саранча.

З саранчы адной – паветра,
Саранчой усланы дол,
Саранчаць вада і ветры,
З саранчы ўсё навакол.

Лезе ўсюды, як зараза,
Ва ўсе дзіркі лезе зброд.

Слова мовіш – і адразу
Саранчою поўны рот.

І садзілася на вусны,
Бы пладзілася ў вачах,
Набівалася ў нос гнюсам
Саранча.

Свечкі ўдзень палілі ў Сечы,
Без іх кожны – як сляпы.
Курані забіла нечысць,
І канюшні, і скляпы.

І дарогі ўкрыла. Коні
Не адважацца ступіць,
А як іх усё ж падгоняць,
Бруду – ажно да ступіц.

Толькі шум – ратоў мільёны
Усё зялёнае жаруць:
Лес зялёны, луг зялёны,
Лан зялёны не ў пару.

Аж рушніцы затрашчалі –
Зброю так змаглі абсесць,
Бы марціры і пішчалі
Заманулася паесць.

Што рабіць, як з'едзь такую
Перамогчы, Бог святы?
Толькі сківіцы працуюць,
Толькі шамкаюць раты.

А ўзняліся, паляцелі –
Аж дыханне заняло:
Стала чорным, бо паелі,
Усё, што зелена было.

І пасля такога роя
На аголенай зямлі
Засталася толькі зброя –
Зброю з'есці не змаглі.

У людзей было багата
Зброі – нават не злічыць.
Ды мушкетам і арматай
Не адпомсціш саранчы!

## Збуйніца

*Чэшская балада. XVII стагоддзе*

Мусіць, там,
У халодным лесе,
Баючыся вогнішча распаліць,
Грэюць збуйнікі мокрыя плечы
Аб настылыя ўзімку
Камлі.

Мусіць, там,
У галодным лесе,
Разаслаўшы лайно пад сасну,
Хлопцы
Моўчкі трызняць аб хлебе –
І не могуць ніяк паснуць.

А вось тут во –
Гаршчочак цёплы,
З хлебам разам
Звязаны ў хатуль...
Можа б, гэта вячэра хлопцам
Памагла ўберагчыся ад куль?

А ісці да збуйнікаў смелых
Не дае, не пушчае стары.

Балабоняць жа ўлады:
— Злачынцы!
А сяляне кажуць:
— Сябры!

І варочаецца,
І ўздыхае:
Ну, калі ж ён засне,
Калі?..
Хіба ж гэта злачынцы —
Сяляне,
Што ад крыўды ў лес уцяклі.

Яно збуйнікам мог бы зрабіцца
Нават іхні сынок Яраслаў,
Калі пан
Дазвол на жаніцьбу,
На жаніцьбу дазвол не даў.

Мог і дзедка
Тады ўзбунтавацца,
Калі іх сагналі з зямлі,
А дзяцей —
Іржы, Любаміра —
Ім з сабою не аддалі.

Пан пакінуў іх, нібы быдла,
За сабою,
За панствам сваім...
Як ім зараз крывавіцца,
Бедным,
Як жывецца сягоння ім?

Ні да кога са скаргай не пойдзеш
І нікому журбы не пашлеш,
Гэта ж сам імператар

Параіў
Не пісаць яму скаргаў
Лепш.

Дзед заснуў ужо...
Дыхае роўна –
Нібы ў хаце цвыркун пяе...
Каб не рыпнуць масніцамі,
Бабка
Асцярожненька так устае.

Хатулёк – такі цёпленькі! – ў рукі
І да лесу –
Паспець бы да дня...
Ды на ўзлессі
Яе з гаршчочкам
Злосны панскі кардон пераняў.

І з нянавісцю бабка глядзела
На гаршчок,
Які ўмее варыць,–
Дужа ж смачна
Хлябталі злачынцы
Цёплы суп,
Што не з'елі сябры...

Калі бабку,
Празваную збуйніцай,
Пан
Па снезе цягнуў за рукаў,–
Дзедка ўсё яшчэ дужа соладка,
Дзедка ў цёплай хацінцы
Спаў...

## Вырадак

*Балада Запарожскай Сечы. XVII стагоддзе*

– Увага, сябры-атаманы,–
Гукнуў кашавы атаман,–
І мы дажылі да заганы –
Найгоршай са страшных заган.

Такое злачынства бывае
На сто год адзін, можа, раз.
Дык як мы юрца пакараем
За здзек, бессаромнасць абраз?

Злачынец, здаецца мне, воўкам
Між нас жыць не можа і дня,–
І ён булаву-трыснягоўку,
Каб бачна была ўсім, падняў.

Што ж маем, панове-малойцы,
Мы з вырадкам гэтым рабіць?
Былі ў нас зладзеі, забойцы,
А гэты надумаў любіць.

Хоць войска у нас і не слаба –
Бы ў лузе зялёнай травы,
Ды толькі пакуль што з-за бабы
Не страціў ніхто галавы.

Бо лёс беражэ беражоных –
За слодыч плаціцьмецъ крывёй.
Усе ў нас у Сечы без жонак,
А ён, бачыш, бабу прывёў.

А баба як прыварожыла –
Бяжы, Сеч любога жане.
І колькі так патаку шылам
Хадзіла ўжо есці раней!

– Ды што ты ў нас, бацька, пытаеш,
Павінен і сам разумець –
Абраза мужчынам такая
Адно заслугоўвае: – Смерць!

А бацька павінен пытацца –
І слухаць пачціва гатоў,
Бо «бацьку» – ўсяго толькі дваццаць,
А «сыну» – паўсотні гадоў.

– За смерць! – загудзела наўкола.
– За смерць! – заскакала наўпрост.
Крычалі Сярдун, Згубікола
І Зноўзадзярыўгорухвост.

Яны ўсе жанчын пакідалі,
А ён, бач, разумны які!
Каменне, бы ў звера, кідалі
І хлопцы-маладзікі.

Ён грэшны, і ён вінаваты –
Ды з ім жа жанчына была!
Жанчыны ж, малодкі, дзяўчаты –
Пакоўні спакусы і зла.

Спаднічнік – і ў гэтым бяда ўся! –
Каханне задумаў займець...
Ды ён жа жанчыне прадаўся –
Смерць!

Казак сам быў дужа спакойны.
Ён знаў: ганьбаванне – мана.
Ён ведаў: паміж усіх войнаў
І гэта таксама вайна.

Ён ведаў: пачуцці ніколі
Нікому віной не былі,

А страсць руйнавала юдолі
На нашай на грэшнай зямлі.

Ён толькі ціхмяна ўсміхаўся:
Каханне – хіба ж то віна?!
І ўрэшце ледзь чутна спытаўся:
– Са мною памрэ і яна?

І тут казакі закрычалі
Раз'ятрана, нібы звяры:
– Бяры ты з сабой сваю кралю!
На той свет, як маеш, бяры!

І потым жахнуліся самі –
Ой, жуд нарабілі які!
А ён страсянуў валасамі:
– Я дзякую вам, казакі.

Хто ласкі не зведаў да п'яну,
Хай той над жыццём век дрыжыць.
Памерці адразу з каханай –
То значыць для нас з ёю жыць!

...Ён – вырадак. Ды не за тое,
Што аж да вар'яцтва кахаў.
Ён вырадак: жыцце другое,
Прыгожае і маладое,
З сабою ў магілу забраў.

## Акадэмія

*Беларуская балада. XVII стагоддзе*

Ох, нялёгкая работа,
Гэта лёгкая навука!
Атрасаешся ад пота,
Бубен бухае на вуха.

Душна, быццам канец света
У жалезнай гэтай клетцы,
А падлога разагрэта
Аж да чырвані, здаецца.

Бо пад бронзаваю ёю
Аж трашчыць галлё-ламачча,
А між бронзай і зямлёю
Агніво спякотна скача.

Па-за клеткай студзіш вочы,
Ды ратунак гэта слабы.
І ты хочаш ці не хочаш,–
На адны ўзвінешся лапы.

Дужа горача пярэднім –
Не стрымаць такой пакуты.
Заднім меней увярэдна –
На іх лапці наабуты.

Ды ўсё роўна грэе пяты –
Беражэ абутак скупа.
На патэльні той праклятай
І ў лапцях ты мусіш тупаць.

Хоць з вачэй і слёзы льюцца –
Муку ён прыняў такую! –
Людзі ўбачаць, засмяюцца,
Скажуць: бач, дзівак, танкуе.

Стане ён, нібы анучa,
І забудзецца на волю...
Танкаваць мядзведзя вучаць
У мядзведжай гэтай школе.

Людзі ў ельніку злавілі
Земляка, ляснога брата.

Быў ён вольны. З гэтай хвілі
Есці просіць вінавата.

Вось падвучыцца на рухі,
Акадэмію завершыць
І хадзебшчыку у рукі
Пападзе – ужо не першы.

Кіпці і клыкі падпіляць,
Адбяруць у смелых вочы,
На губу кальцо засіляць,
Павядуць такім на плошчы.

І калі праз гулкі гоман
Плошча зойдзецца ад смеху,
Шкода стане, што яго мы
Аддалі ёй на пацеху.

Але й ён смяяцца будзе,
Дабрадушлівы няўмека,–
З нас смяяцца будзе, людзі,
З недахопаў чалавека.

Ён пакажа нам, як хціўцы
Абрастаюць поўсцю кражы,
Як зацятыя зласліўцы
Найсумленных граззю мажуць.

Як мяняюць прайдзісветы
Свае думкі, нібы скуру.
Як прадажныя паэты
Фіміям падонкам кураць.

Танцаваць ён будзе чынна
На вялікіх самых пляцах –
Будзе і ў людзей прычына
Ім, мядзведзем, захапляцца.

І яго жыццё падхопіць,
Слава гучная дагоніць...
Ён пакажа ўсёй Еўропе,
Што навучыўся у Смаргоні.

## Вадзянік

*Лужыцкая балада. XVI стагоддзе*

На дыбкі ўстае рака
Ля жытла вадзяніка:
Во віруе, во бушуе –
Сам сябе, відаць, не чуе.
Жонку гоніць з хаты ён –
Жонка вінаватая.
З ёй, русалкай, лаецца,
К дзецям прыглядаецца.
І абнюхае усіх,
І абмацае усіх:
Пяць, як ёсць, вадзянікі,
Ну а гэты – не з ракі:
Пахне хлопчык горкаю,
Дымнаю махоркаю...
– Хто ж русалку цалаваў,
Хто на Мінку дым пускаў? –
Вадзянік наш прагне буры,
Вадзянік жа сам не курыць:
У вадзе набухне
Папяроска – стухне...
Спамінае грозна:
Жонка дужа позна
У раку вярталася,
Весела смяялася:
Мо тады, дарэчы,
Мінка йшла са стрэчы?
Зноў абнюхае сыноў

І усіх агледзіць зноў...
Пяць, як ёсць, вадзянікі,
Ну а шосты — не такі:
Пахне хатай новаю,
Стружкаю смаловаю...
А хай яно спрахне —
Чалавекам пахне!
Папрыціхлі ў рэчцы ўсе —
Вадзянік раку трасе
Барадой зялёнаю,
Нібы злосць ягоная.
— Разбуру я ўсё датла!..
Дзе ж, русалка, ты была
І куды хадзіла?
Мінка, з кім блудзіла?..
Мінка ціхенька глядзіць,
Мінка плача цененька
І спалохана сядзіць,
Нібы мыш пад венікам!
Вінавата — праз карчы
Мінка бегала ўначы,
Калі слаўся морак,
Вунь на той пагорак.
Кіта дом там будаваў,
Кіта Мінку цалаваў.
Хлопец ведаў яе змалку —
І дзяўчынай, не русалкай.
Кіта — нават піва гнаў,
На вяселле ўсіх склікаў,
Ды... раптоўная замінка —
Вадзянік сасватаў Мінку...
А цяпер вось вадзянік
Аж шалее... Чуеш, крык:
— Пакараю я цябе,
Праганю я ад сябе —
Да сваіх жа — марш! — людзей,
Пажыві там у бядзе:

Я цябе караю –
Людзям зноў вяртаю.
Хай цябе абсушыць неба...
Ну а Мінцы гэта й трэба!
Мінка к Кіту з рэчкі йдзе,
За руку сынка вядзе.
Сын глядзіць адкрыта –
Выліты ўвесь Кіта...
Ад варот рыпучых –
Кіта ім насустрач.
Пахне ён махоркаю –
Дымнаю і горкаю...

## Каханне

*Кашубская балада. XVI стагоддзе*

«А мора – дыбкі, а вецер – валіць,
І я не бачу, куды плысці...
Гэй, хваля, хваля, мая ты хваля,
Мяне дадому ты адпусці».

«Ты што, мой любы, ты што, рыбача,–
Цяпер вяселле нас не міне.
Ты ж столькі ў моры, хіба не бачыш,
Што спадабаўся даўно ты мне».

«Вяселле, кажаш? Ці ж гэтак можна –
Я ж да жывога ўсяго жадзён.
Я любаваўся табой, прыгожай,
Пакуль мой бераг мне быў відзён».

«І ўсё ж са мною хадзем, рыбача,
Ты – прытуліся, я – абдыму».
«А дзеці? Сын мой, ці чуеш, плача,
Хто слёзы вытра з вачэй яму?»

«А сыну цацку анёл змайструе,
Ён і заціхне ў кутку пустым».
«А жонка?»
«Жонка? Ну, пагаруе,
Паплача крыху, ды і на тым.

А потым выйдзе другі раз замуж
І будзе з новым спяваць і жыць.
З ім будзе ў рыбу хадзіць таксама,
Цябе забудзе – не ўсё ж тужыць».

А вецер енчыць, а мора вые,
Кульгае лодка на два вяслы.
Ах, сілы цемры, ах, сілы злыя,
Ваш чуцен холад глыбінны, злы.

«Мяне не пусціш, тады на бераг
Вярні хоць лодку сям'і маёй».
«Мне й лодка трэба. Я лодцы веру –
З табой паплаваць хачу на ёй».

«Тады хоць песню вярні на волю,
Дамоўкі, к людзям яе пусці».
«І песню возьмем з сабой. Спатолю
Урэшце мару ў сваім жыцці.

Як я зайздросціла, вар'яцела,
Калі вы ў лодцы плылі дваіх.
Як ты спяваў ёй – о як хацела
Я прыгарнуцца да слоў тваіх!

Дык паспявай жа і мне, каханы,
Я, як умею, так падцягну.
Я ў пырскі, нібы ў вянок, прыбрана,
Не пакідай жа мяне адну».

Накрыла хваля сабою лодку –
Ад нецярпення сама дрыжыць.

Далее неба, і дно шарготка
Усё бліжэе праз цень імжы.

І той жа момант рыбачка мужна
Нырнула ў мора – назло штармам.
«Аддай мне, хваля, вярні мне мужа –
Я не напелася з ім сама!»

Зламаўшы хвалі крыло цяжкое,
Дагнала лодку на дне сваю.
Забрала мужа. Там, пад вадою,
Яны і зараз дваіх пяюць.

## Розгі

*Польская балада. XVI стагоддзе*

Я нічога ўжо не бачу –
Б'ю па войкату,
                    па плачу...
Розгі скачуць у вачах –
Б'ю за печкай
                    паніча...

А настаўнік грозна ходзіць.
Ну, калі ён скажа:
                    – Годзе!
Хутка сам я закрычу –
Мне ж баліць,
                    як панічу...
Ах, паніч,–
                    ты вінен, вінен!..
Розгі свішчуць і ў пуку –
Я ж сцябаць цябе павінен
З усіх сіл, на ўсю руку.

За цябе у школу тата
Плоціць.
Ён жа – бач, багаты!
Я – бядняк
і сам плачу
За навуку,
панічу:
Кнігі вам нашу,
паперы,
Адчыняю ў класе дзверы,
Світкі вашы падаю.
І пры розгах –
дайце веры! –
Вашым катам я стаю.
Розгі ўсыпаць вінаватым –
Вось мая за школу плата.

А калі вас не караю –
Парушальнікаў нямаш! –
Сам прысесць магу я з краю,
Каб урок паслухаць ваш.

Так вучуся.
А праз словы
Вухам чуйненька лаўлю,
Ці гарацць у печы дровы –
Зноў жа ў печы я палю.

А бывае –
недарэчы
Тлеюць дымна дровы ў печы;
Вы тады
мяне за печ
Вядзеце.
І світку – з плеч...

Вы б'яце са злосцю, бачу,
І па крыку,
і па плачу.
Весялеюць на вачах
Розгі ў ручках паніча...

І настаўнік рады ходзіць,
Не гаворыць, філін:
— Годзе!
А саб'е паніч аскому —
Ледзь вядуць мяне дадому...

Ды калі й не вінаваты
Перад печчу я ні ў чым,
Жорстка сплоцяць мне паняты
Доўг...
Са школы ідучы...

## Кароль

*Харвацкая балада. XVI стагоддзе*

Нарэшце, Мація Губец,
Цябе карануюць сёння.
Бачыш, колькі сабралася
Тваіх засмучоных сяброў...
Што ж зробіш — гэта падзея,
Хоць сумная, ды падзея,—
Калі селянін на троне
Вянчаецца на караля.

А табе ж гэты трон ці трэба —
Колькі было ў цябе тронаў!
На лузе — купіна мяккая,
У лесе — цёплы пянёк!
Там, умакрэлы ад працы,
Сядзеш, бывала, паважна,

З полуднем клунак развяжаш –
Ясі, як сапраўдны кароль.

А калі ты з угрэтага поплаву
Ехаў на возе сена,
Тваёй вышыні зайздросцілі,
Здавалася, каралі:
Галава – высока-высока,
За яе аж хмурынкі чапляюцца,–
Гэтак, як сена ахапкі
Чапляюцца за платы...

Сёння дадуць табе ў рукі
Цяжкі каралеўскі скіпетр,
Але да яго не прывыкла
Твая з мазалямі далонь.
Дайце ёй лепш тапарышча,
Цапільна ці нават грабільна!
А як яна, Божа, пазнае
Выслізанае кассё!

І як абудзяцца рукі,
Што так сумуюць па працы,
Будуць касіць і грэбці,
Грэбці і зноў касіць...
Забярыце свой д'яблаў скіпетр –
Селяніну ён не патрэбен:
Гэтай парожняй бразготкай
Забаўляцца сорам яму!

А табе яшчэ, Мація Губец,
І карону на голаў уздзенуць.
А навошта? Хіба ў ёй за плугам
Босы пойдзеш па баразне?
Як жа гэтай дзіраваю шапкай
Галаву ад сонца заслоніш,
Ад асцюкоў уратуешся,
Звозячы з поля снапы?..

Не, ні скіпетр, ні трон, ні карона
Не былі табе, Губец, патрэбны,
Не з-за іх ты сяброў на паўстанне
Ад касьбы, ад жніва адрываў.
Ты хацеў свабоды сялянам,
Ты хацеў справядлівасці толькі –
Каб селянін на полі
Вольна араў, як кароль.

Вось за гэта цябе й каранююць –
Каралеўствам гарачым караюць.
Бачыш, вораг як распраўляецца
З сялянскім сваім каралём:
Вунь твой трон стаіць ясны,
Разагрэты, нагрэты дачырвана,
І карона, і скіпетр
Зырка ззяюць, нібы вугалі.

Моцна сціснуўшы скіпетр распалены
І карону рукою паправіўшы,
Ты спакойна ўзышоў
На жалезны палаючы трон...

І сягоння яшчэ
Твой народ не забыўся,– ён помніць,
Як на троне адзін селянін
Паміраў каралём.

## Падатак

*Балгарская балада. XVI стагоддзе*

Галашэнне бабак, галашэнне матак –
Зборня панаехала адбіраць падатак.

Па ўсмешцы роднай – ад кожнага плачу,
Ад кожнае хаты – па гульні дзіцячай.

Па маленькай ручцы – ад кожнае міскі,
Па адной надзеі – ад кожнай калыскі.

Ад зямлі пакутнай – ды па хлебасею
Абыяка, звыкла беруць ліхадзеі...

Забірае зборня жудасны падатак,
Адбірае зборня ў матак немаўлятак.

Павязуць малых іх у зямлю чужую,
Дзе не так гавораць, дзе не так сумуюць.

Там дадуць адразу ім чужое імя:
Так прымусяць здрадзіць – без віны! – Радзіме.

А яшчэ навучаць ненавідзець люта
Бацькаўшчыну, дом свой, што даўно ў пакутах.

І яны прыедуць у свой край са зборняй,
І ад іх таксама сёлы жах агорне.

Можа, з іх каторы нат у свайго брата
Адбярэ падатак – кволых немаўлятак.

## Кантрабанда

*Беларуская балада. XVI стагоддзе*

Стаміліся белыя коні і цёмнымі сталі ад поту,
Стаміліся бомы звінець пад дугою –
Матляліся ўжо неахвотна,
Ахрыпла іх песня – яна наглыталася пылу
І ўжо задыхалася ўся,
Калі варта рыплівую брычку спыніла,
Дзе кожнае кола візгліва жаданага дзёгцю прасіла...
– Гэй, што ты вязеш праз граніцу? –

Чужая злавалася мова,
Пыталася варта сурова,
Шукала упарта ахова,
Шукала яна кантрабанду
У брычцы, як позняя восень, парожняй,–
Не верыла,
Што праз граніцу парожнімі ездзіць можна.
– Дык што ты вязеш?
– Вы ж бачыце самі – нічога.
– А можа, схаваў што?
– Навошта? Пабойцеся Бога –
Вы бачыце ўсё, што са мною...
– Ясна адно – галадранцы!
Ездзяць тут розныя швэнды,–
ахова ўжо стала злавацца.–
А можа, ты кнігі вязеш? Бо з Прагі тут нейкі Скарына
Кнігі злаўчыўся вазіць на радзіму,
Якую чамусьці пакінуў.
– Кнігі?
Ад іх толькі зло...
Бэсцяць кнігі наш люд паспаліты...
– І ты супраць кніг, падарожны?!
Які малайчына, глядзі ты!
А ведаеш, думаю я, што прыйдзе часіна такая:
Нам скажуць Скарыну таго затрымаць,
І мы, будзь ты пэвен, яго затрымаем!
І кнігі тады мы яго
Папалім усюды ў краіне...
– Чакайце, а кнігі ж святыя, пра Бога...
Дык як жа паліць іх?..
– Павінен
Сказаць я табе, чалавеча,
Што ты – кацянятка сляпое:
Можна паліць і святое, калі нам загад ёсць на тое.
Ты знаеш, і Бога самога
Мы можам паслаць на спаленне,
Калі непрыдатным ён стане

Для нашага раптам малення...
Я веру, Скарыну таксама,
Касцёр наш падсобіць на неба –
Асудзяць яго на спаленне нашчадкі...
– Так яму, неслуху, й трэба!
– Ну, едзь, падарожны...
Чакай, а хто там сядзіць у фурманцы?
– Гэта ж фурман мой.
– Бач, з форсам катаюцца нават такія,
як ты,– галадранцы!
Ну, едзь – не мазоль нам вачэй...

Весялей заціліммкалі бомы,
Яны адпачылі крыху –
Дзе падзелася пыльная стома!
Спяшаўся дадому Скарына (а гэта быў ён – вы
пазналі?).
Коней сцябалі абое –
І «пан», і «фурман» коней гналі.
Глядзеў на «фурмана» з усмешкай Скарына –
Усё-ткі правёз кантрабанду ён з богам!
Бо гэты «фурман» – быў найлепшы друкар,
Украдзены ў караля самога.
Ехаў Скарына Францыск друкаваць свае кнігі дома.
Цілімкалі
Весела
Бомы...

## Трызненне

*Польская балада. XVI стагоддзе*

Людзі, сажджыце!
То ж я
Супыніў крутабокае сонца
І нашу зямлю падштурхнуў,
Ды так,
Што яна закружылася жэўжыкам...

Бачыце, людзі,–
Сонца вярцежнае стала
Як укапанае, у небе аціхла,
А зямля раскружылася гэтак,
Што аж вецер у дрэвах заблытаўся,–
Чуеце,
Шастае, шастае...

Рот забівае той вецер –
Цяжка ад ветру мне дыхаць.

Людзі, зірніце,
Вунь інквізітары папскія
І святары, нават грэшнікі
Зноў падштурхнуць хочуць сонца:
Натужна, нібыта баграмі,
Крыжамі ў свяціла ўпіраюцца,
Замотваюць рукі ў сутаны,
Каб не пяклося яно так...

І на зямлі вунь таўпежацца
Тыя ж усё інквізітары,
Не хочуць прызнаць,
Што пуп свету –
Зямля! – вакол сонца ўсё ж бегае.
Як яны хочуць спыніць
Яе назаўжды,
                    неслухмяную:
Яны за траву чапляюцца –
Трава вырываецца з коранем,
За дрэвы аберуч хапаюцца –
Дрэвы ламаюцца з трэскам,
За горы ўчапіцца спрабуюць –
Горы крывавяць ім рукі:
Вунь як, абдзёртыя, сунуцца;
І кіпцюры, як бароны,
Плужаць дарогі, аблог...

А зямля, як заўсёды, круціцца –
Хіба спыніш зямлю рукамі,
Як казаў мой дзядзька Лукаш.

Стойце, людзі!
Куды вы?
Сажджыце!
І зірніце, кастроў колькі ўсюды,
Бессаромных кастроў інквізіцыі,
Дзе паліць будуць праўду адкрыта,–
Усіх тых,
Хто па-іншаму думае,
Чым яны, інквізітары...
Там і мой вунь касцёр – навырост! –
Загадзя распалілі яны
Без мяне.
Як ён шчыра, злавесны, гарыць!
Захліпаюся я
Ад ягонага дыму...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

У трызненні Капернік памёр.
А сонца стаяла,
Як ён пры жыцці супыніў яго;
А зямля ўсё кружылася,
Як ён пры жыцці раскружыў яе...

## Літаўры

*Украінская балада. XVI стагоддзе*

Якія цяжкія павекі!
Зліпаюцца – не саўладаць.
І лекі, адзіныя лекі –
Спаць,
спаць,
спаць...

І ўжо расплываюцца краты,
Знікаюць у ціхай смузе:
Ідзі па траве непрымятай,
Скачы,
          як хлапчук,
                    па расе...

Раптоўна ўзрываецца цэля,
І вуха, як выбух, звініць:
Ізноў нейкі дурань пацэліў,
Пацэліў па цішыні.

Што гэта? Страляюць гарматы
Па іхняму табару зноў?
І з рук выбіваюць у матак
Маленькіх смяшлівых сыноў.

Як лёгка наводзіць па дзецях –
Страляйце ў іх радасны смех...
Не цэлячыся пападзеце
У сотні наіўных уцех.

І слёзы, як ядры, па тварах
Коцяцца ў казакоў:
Расстрэльваюць гэтак пачвары
Харобрасць паўстанцаў-бацькоў...

Літаўры,
          літаўры,
                    літаўры,
А не гарматы грымяць.
Б'юць у літаўры два маўры,
Калі ён пачне засынаць.

Прыдумалі кару псяюхі –
Сон аднялі, каб скарыць.
Таму і літаўры над вухам
Грымяць ад зары да зары.

Павекі ж – цяжкія, як горы...
Зліпаюцца – не саўладаць...
І думка адна, нібы змора,–
Спаць,
        спаць,
                спаць...

Ды зноў узарвецца надзея,
І гулка зламаецца сон.
«Што гэта? Хто тут? І дзе я?»
Звон...

Няўжо гэта сеча зноў звоніць
Ці хто на паход затрубіў?..
А мо гэта тупат тых коней,
Што ён у татараў адбіў?

Ці то аглушальна, як здрада,
Па табары коціцца крык:
«На раду!
            На раду!
                    На раду! –
Хто к смерці яшчэ не прывык...»

Табе ж, Налівайка, не трэба,
Не варта на радзе той быць,
Бо вырашыць рада ганебна
Табой сабе волю купіць.

І з жалем адстрэльвацца будзеш
Ад шчырых паплечнікаў ты:
– Сябры, што вы робіце?! Людзі!
Страляеце вы не туды...

І зловяць, і звяжуць, і скруцяць,
Засопшыся ў той барацьбе;
І ворагу ў цэпкія рукі
Сябры твае кінуць цябе.

І звязаны моцна, ў адчаі
Будзеш ты бачыць праз кроў,
Як зноўку паны разбіраюць
Прыгонных – былых казакоў.

Потым турма, катаванне...
Павекі – не саўладаць.
Адно толькі ў свеце жаданне –
Спаць,
        спаць,
                спаць...

Літаўры,
        літаўры,
                літаўры –
Запоўнена громам турма.
Ад гэтай праклятае гаўры
Нідзе паратунку няма.

А гром гэты вочы ўжо слепіць...
У роце – гром... Гром – у руках...
Відаць, Севярын, гэта клепяць
З медзі чырвонай быка.

У ім цябе моцна зачыняць,
На вогнішча ляжа той бык,
І потым літаўры супыняць,
Заглушаць апошні твой крык:
– Воля!
        Украйна!
                Сябры!..

## Просьба

*Польская балада-плач. XVI стагоддзе*

О мой ласкавы кароль!
Як шчыра ты плачаш – я чую...
Як бы я ўстала з труны,
каб толькі суцешыць цябе.
Як бы я рада была
смутак твой чорны спалохаць,
Радасць збудзіць, як раней,
у раненым сэрцы тваім...
О незабыўны мой муж!
Памятаць буду і тут я,
Як ты у вочы мае гэтак шчасліва глядзеў,
Як не паслухаўся тых,
што разлучыць нас хацелі,
Як спатыкнулася зло аб добрую ўсмешку тваю...
А колькі зласліўцаў прыдворных
хацела разняць нашы рукі –
Табе, каралю, ўжо шукалі новую жонку яны.
Маці твая, каралева,
мяне не прымела нявесткай,
Бо я ды з сям'і Радзівілаў –
роду, нялюбага ёй.
Гэта я помню...
Таксама як помню, што ты не паддаўся:
Той бруд, на мяне што лілі ўсе,
скідваўся чыстай вадой.
Помню, як потым – о дзіва! – тыя,
што глоткі ўсё дралі,
Што апаганіць,
спагудзіць толькі і праглі мяне,–
Як яны потым лісліва ў твар
вінавата глядзелі,
І хто крычаў як найболей,–
гнуліся сама ніжэй...

О мой магутны кароль!
Ты апошнюю выканай просьбу
І адгані ад мяне процьму нягоднікаў тых,
Што на каленях паўзуць –
пацалаваць маё плацце –
І потым пазвесяць няшчыра
над маёй галавою насы.
Яны, як сляпні, пааблепяць
мой белы,
халодны мой саван
І будуць: «Святая!», «Святая!»
бруднымі вуснамі млець.
Бачыш, ім зараз няцяжка
назваць мяне нават святою,
Каго пры жыцці, каб прымелі,
маглі б утапіць і ў слязах.
Чуеш, ласкавы кароль мой?
Хутчэй іх, хутчэй адгані ты –
Я не хачу быць святой!

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Кажуць, кароль Сігізмунд плакаў і многа,
і шчыра,
Сплаканы, просьбу Варвары, кажуць,
не змог ён пачуць...

## Чаканне

*Славенская балада. XV стагоддзе*

Селянін віно ў Карушку
Вёз няпэўнаю парой.
Пад'язджае пад гарушку –
Тая робіцца гарой.

Пад гарою хатанятка
Па страху ў зямлю ўрасла,

А з акенца – як зярнятка
Промень дзіўнага святла.

Каля той жабрацкай хаты,
Каля ўбогага двара
Нейкі хлопец зухаваты
Сустракае віняра.

Шабля пругкая пры боку
Невыказнае красы.
І надзея ў кожным воку,
Смех падкручвае вусы.

– Горцы горы свае славяць.
Ты, праезджы, мне скажы:
Яшчэ ўзлазяць на Трыглавец
Людзі, чэрві, мурашы?

– А ты ведаеш, юнача,
Сцежкі ў горы – на вузлах:
Яшчэ людзі многа плачуць,
Яшчэ ў свеце горы зла.

І навокала як глянеш –
Раскашуецца бяда:
Як славенцы – ўсе сяляне,
Што ні немец – феадал.

І узлазяць, як і людзі,
На вяршыні чарвякі...
Ну, а хто ж ты, хлопча, будзеш?
Клопат твой, скажы, які?

– Што?! Не ведаеш мяне ты?
Я ж паратаванец ваш,
Вашай песняю напеты –
Я кароль сам, Маціяш!

То ж было нібыта ўчора...
Калі нас перамаглі,
Расступілася пячора
І мы ўсе ў яе ўвайшлі.

Бачыш коні, бачыш людзі –
Усе чакаюць толькі кліч.
Перамога будзе, будзе,
І я ведаю калі.

– То скажы. Праз год? Сягоння?
Ваша ж сіла не відна...
– Як?! А ты зірні у промень,
Што прастуецца з акна.

Паглядзеў віняр – і праўда
За спіною ў малайца
Не гара ўжо, а як наўда
Луг без краю, без канца.

А на лузе – войска многа,
Ў сёдлах коннікі сядзяць,
Ды маўчыць пакуль дарога –
Коні спяць, і людзі спяць.

Коні, кутыя да бою,
Аж прыпалі да падкоў.
Ваяры трымаюць зброю,
І заснуўшы, наўзгатоў.

Кліч дасі – і ўжо, здаецца,
Войска ўсё наўскапыта
Згаладала панясецца
Шчасця ў бітве паспытаць.

– Як жа кліч падаць ім можна?
– Войска я збуджу ад сну.

Ён узяў у рукі ножны,
Шаблю злёгку ў іх крануў.

Пачалося тут такое –
Ажывіліся палі:
Паднялі галовы воі,
Коні вушы паднялі.

Пацягнуў ён шаблю з сілай –
Сну як быццам не было:
Усё вакол загаманіла,
Заіржала, загуло.

– Не, хай спяць. Яшчэ зарана,–
Шаблю зноў у ножны ўклаў,–
Я прыйду, як перастануць
Лезці чэрві на Трыглаў.

«Я прыйду»,– пабегла ўперад,
«Я прыйду»,– па камянях
Заскакала, нібы вера,
Нібы сум па вольных днях.

«Я прыйду»,– і толькі лёскат,
«Я прыйду»,– нібы гара
Бегла, абагнаўшы лёгка
Воз рыпучы вінара.

Колы літасці прасілі...
Набліжаючы пару,
Колы чарвякоў давілі,
Што ўсё лезлі на гару.

## Вяселле

*Беларуская балада. XV стагоддзе*

Што ж ты, дзень мой, канчаешся хутка,—
Дай хоць промні твае расчасаць.
Затрымайся яшчэ на мінутку,
Пасвяці мне яшчэ хоць мінутку,—
Не хачу я цябе адпускаць...

Зелле-гарэліца
Коціцца ў рот,
Вяселле вяселіцца,
Як карагод.

І куды ж ты спяшаешся, вечар,
Бы імчышся на чорным кані?
Захіні мае белыя плечы,
Сваім чорным крылом мае плечы
Захіні, захіні, захіні...

Гасцюйце часцей,
Частуйце гасцей!
Топні, лапаць, топні, бот,—
Хай жывецца без клапот.

Што ж ты, ноч, нібы чорная знічка,
Прамільгнула ў вясёлай гульбе?
І ўжо раніца — мыш-невялічка,
Нібы шэрая мыш-невялічка —
Спрытна точыць і точыць цябе.

Сп'янела застолле,
І хмель — нібы дым...
Дайце ж вы ўволю
Паспаць маладым
Адным!

Што ж ты, раніца, цэдзішся рана?
Ці ў цябе спачування няма?
Бачыш, замуж іду я за Яна –
За раба я выходжу, за Яна,
І рабою раблюся сама.

Песня застольная,
Гульба, як жальба:
Увечары – вольная,
Раннем – раба.

І ўжо сонейка ля небакраю
Зашыпела... А што я зраблю?!
Я сама сябе гэтак караю,
І каханнем, і раем караю,
Бо я ж Яна больш волі люблю!

Госцейкі п'яныя,
Бачыце, вунь
Па мяне ад пана,
Па рабу так рана
Бяжыць цівун,–

Бо ўжо сонца ўзышло-о-о...

## Свае

*Славацкая балада. XV стагоддзе*

Стаміліся... Доўгай... Дарогай...
Вечар... Як коршак... Напаў...
Хто б ім, успомніўшы Бога,
Хоць нейкай саломы паслаў,
На лаве паслаў?

Хто б адчыніў ім вароты,
У хату пусціў да сябе?

Восень... І холад... І слота...
Дождж... Нібы коршак... Дзяўбе...
Балюча дзяўбе.

А лахманы іх не грэюць –
Пазношваў апранне палон.
Ногі... Стамлёныя... Млеюць...
Ля зманлівых... Светлых... Акон...
Ля цёплых акон.

Пад вокнамі грэецца вечар...
Гэткіх акон не мінеш!
Просяцца, згорбіўшы плечы...
– Дзе ж вас, чужых, я прывечу –
Госцейкі ў хаце ў мяне,
Весяляцца ў мяне.

– Можа, хаця б вы ў каморы
Саломы змаглі нам паслаць...
– Што ты, дзіцятка, гаворыш! –
Грошы там, грошы ляжаць,
У каморы ляжаць.

– Мы на дварэ, пад паветкай,
Каб толькі дождж не дзяўбаў...
– Ідзіце з двара, мае дзеткі!
Двор не для вашых забаў,
Дзіцячых забаў...

Клямкнулі гулка вароты,
Песня падмяла іх звон...
Грэюцца дзеці употай
З ветрам ля светлых акон,
Ля цёплых акон.

Не ведалі дзеці, што гэта
Матчына хата пяе,

Куды яны йшлі усё лета,
Неслі ўсе крылы свае –
Сны ўсе свае.

Не ведала маці: прагнала
Таго, па кім плача душа...
Дзяцей дарагіх не спазнала –
Ні Евічку, ні Тамаша,
Евічку і Тамаша.

Ля матчыных грэюцца вокан,
Стаптаўшы чужацкі палон.
Восень... І вецер... Навокал...
Свішча... Ля цёплых... Акон...
Ля гэткіх халодных акон!

## Змаганне

*Чарнагорская балада. XV стагоддзе*

Асінае гняздо – для ворагаў,
Любая радзіма – для нас саміх.
Заціснутыя мы з усіх бакоў гарамі,
А разам з нашымі гарамі
Абложаныя ненавіснымі туркамі.
Венецыя адрэзала нас ад мора,
А туркі – ад урадлівых далін.

Тут – горы,
Там – раўніны.
Там – хлеб,
Тут – камень.
Тут – цесна,
Там – прасторна,
Але там вораг!

Асінае гняздо для ворагаў,
Жаданая радзіма — для нас саміх.

Дзень мы ваюем з чужынцамі,
Год ваюем,
Сто гадоў ваюем,
Усё жыццё ваюем з няверНікамі
За кожную пядзю
Сваёй жа роднай зямлі.

Мы не паміраем сваёю смерцю —
Вораг не дае нам састарыцца:
Адна палова памірае ў баю,
Другая пасля бою —
Ад ран.
І ўсё ж мы жывём,
І ніхто нас не зможа скарыць.

Асінае гняздо — для ворагаў,
Нязводная радзіма — для нас саміх.

Галодныя, мы марым пра хлеб і волю,
Сытыя — усё пра тыя ж волю і хлеб.
І кожная новая,
Адваяваная ў ворага
Пядзя нашай стаптанай зямлі
Бывае напачатку чырвоная, чырвоная —
Ад нашай чарнагорскай крыві.
Затым яна, засеяная,
Робіцца зялёнаю —
Ад кусцістых, забуяных усходаў.
Пасля палавее
І робіцца залаціста-белаю —
Ад даспелых каласоў.

Мы і сеем, і жнём,
Не выпускаючы з рук зброю.
Таму ўсё жыццё

У нас абедзве рукі
Занятыя.

Асінае гняздо – для ворагаў,
Настойлівая радзіма – для нас саміх.

А як толькі пажнём,
Адразу ж засяваем гэтую пядзю зноў,
Бо дзеці чакаюць хлеба,
Горы чакаюць хлеба,
Стрэльбы чакаюць хлеба,
Воля чакае хлеба...

Пайшлі ж сеяць! –
Так гаварыў да жанчын і дзяцей
Змаганец,
Які адзін – толькі адзін! –
Вярнуўся з чарговага,
Звычайнага бою.

## Сакалар

*Басняцкая балада. XV стагоддзе*

А неба – высока, высока,
Зямля – цішынёй спадмане...
Ляці, мой асуджаны сокал,
Ляці да мяне, да мяне.

Даруй, што цябе абражаю,
Табе не хачу наманіць:
Я працу ганебную маю –
Цябе, твае крылы лавіць.

Ах, выбіцца, выбіцца з райі
Марым мы ўсе як адзін,

Бо туркі зласліва караюць
За тое, што ты славянін.

Абрыдлі абразы і здзекі,
І ўжо, каб зусім патурчэць,
Угрунь патурчэнцы-калекі
Па модлы, нібыта па лекі,
Бягуць не ў царкву, а ў мячэць.

І ўжо феадалы сядзібы
Ратуюць – на ўцеху аслам
Бяруць, як жабрацкую скібу,
Чужы, ненавісны іслам...

Ляці ад мяне, мой ты сокал,
Ляці ад мяне, ад мяне.
Няхай жа пятля майго вока
Цябе, твае крылы міне.

Служыць не бяруць нас у войска,
Даніну ж за гэта – плаці.
Няма месца радасці свойскай,
А радасць чужая – гасціць.

Свой дом на высокі падмурак
Не ставіць ніхто са славян:
Ніжэй яму быць, чым у турак,
Нязграбней, чым у мусульман.

Мы лепш апранацца не можам
За турак ва ўборы свае.
І зброя іх наша трывожыць –
Насіць не даюць нам яе.

Ах, выбіцца, выбіцца б з райі...
Аднак – нецярпенне прыцііш.
А як ты крыламі іграеш,
А як ты прыгожа ляціш!

Даніна, даніна, даніна –
Пажорца няспраўджаных мар.
Калісьці быў я селянінам –
Султанскі цяпер сакалар.

Дэрбенджам – сачыць горнасцежкі,
Вайнукам – ля коней днявіць.
А я, мой ты дружа няўцешны,
Цябе маю гора лавіць.

І ўсё ж да мяне, мой саколе,
Ляці – на спакусны іслам:
Тваю забіраючы волю,
Раблюся свабодным я сам.

Ды вольніца, бач, для абодвух –
Як крылля звязанага ўзмах:
Мая, мой саколе, свабода
У турка таксама ў руках.

Стаміўся ад гэткага хлеба,
Браць грэх на душу не хачу...
Злаўлю і зноў выпушчу ў неба
І сам я з табой палячу!

## Касцёр

*Чэшская балада. XV стагоддзе*

Летні дзень спякотаю дыміўся
І давіўся смагай, як смалою.
А ля Рэйна баўна так, спаволі
Разгараўся прывідам касцёр.

У задушным сонечным засціле
Полымя кастра было не бачна,

Толькі чулі людзі, як трывожна
Ля зямлі патрэсквае агонь...

Да плячэй накладзеныя дровы
Муляюць рагатымі сукамі,
І вяроўкі мокрыя, як змеі,
Да слупа прыціснулі яго.

Што вяроўкі! З імі вязень звыкся
У халоднай цэлі падзямелля,
Дзе ляжаў, прывязаны да бёрнаў:
Днём – за ногі і за рукі – ўноч.

А вось людзі... Хоць сабе і гэты –
Кормны, як свінчо тое, вяльможа,
Што спакусна гэтак адрачыся
Прапануе у апошні раз...

Ён яшчэ касцёр можа раскідаць,
Полымя заліць, што ў суччы б'ецца...
І – жывы! – ты ўрадуешся цішы,
Неспатольна ўгледзішся ў палі...

Праз чужыя гоні, можа, згледзіш
Гусінец – мястэчка на пагорку,
Што цябе праводзіла у Прагу,
Матчыным замглёнае акном.

Помніш – маці, што вяла да лесу,
Несла гусака табе пад пахаю:
«Вось, сынок, хоць гусаком аддзячыш
Тых, хто цябе возьмецца вучыць...»

Помніш, ён залопаў раптам крыллем,
Вырваўся гусак той нечакана.
Колькі ні лавілі – не злавілі:
Не схацеў у Прагу гагатун.

Ну, а ты і без яго дамогся
Знанасці вялікае і славы:
Ты ў шыкоўнай вопратцы магістра
Нават каралеву спавядаў!

А як ехаў на сабор канстанцкі,
На сабор, які касцёр падпаліць,–
Людзі выбягалі аж за горад,
Каб цябе убачыць хоць здаля.

Нават папа – нехта дваццаць трэці –
На саборы збэсціў адлучэнне,
Далучыў ізноў цябе да Бога –
Ненадоўга, праўда, далучыў...

Грамату ахоўную ўрачыста
Уручыў, як сябру, імператар:
Ты, Ян Гус, маўляў, недатыкальны
І дадому вернешся жывы.

І – касцёр... Каля агню ўжо скачуць
Радасныя, подлыя сугнеі,
Хто на словах – быццам бы святыя,
А на справе – ўсе ерэтыкі.

Скачуць, скачуць... Можа, нават з імі
Скача поп з царквы Святога Яна,
Той, што, ў косці ўсё папрагуляўшы,
Бег ад прастытуткі галышом.

З імі, пэўна, поп таксама Тынскі,
Што ў алтар прывёў аднойчы дзеўку
І яе залашчыў на прастоле –
Давялося храм наноў свянціць.

Тут і ён, архіепіскап Збынек,
Што паліць умее добра кнігі,

А чытаць, дурнота, навучыўся,
Залучыўшы толькі гэты чын.

Тут, відаць, і тыя прайдзісветы,
Што зракліся мовы сваёй, звычак,
Што мяняюць чэшскія імёны –
Толькі б іх за немцаў прынялі...

Адрачыся? І народу здрадзіць?
Скінуць душны плашч, з агню пашыты?
Прадаваць панесці індульгенцыі
Тым, каго вучыў любіць свой край?

Не, ніколі!
                    Полымя шугае...
Што ж маўчыш, магутны імператар,–
Грамата ахоўная затлелася,
Грамата твая, зірні, гарыць?!

Што ж прыціхлі, прагныя святошы?
Можа, вы міжволі зразумелі:
За касцёр сягонняшні трывожны
Будзе век апраўдвацца царква.

Змоўклі ўсе... А нейкая бабуля,
Дужа ўжо набожная, глухая,
Трэскі папраўляе утрапёна –
Мусіць, каб лаўчэй трашчаў касцёр...

## Казакі

*Украінская балада. XV стагоддзе*

Там трава – нібы лес такая:
Без касы ў яе не ўвайсці,
А валоў і з рагамі схавае –
Не знойдзеш ніколі ў жыцці.

Там рыбы ў рэчках і ставах
Столькі, што нават калі
Пугаўё паміж хваляў паставіш,
Будзе стаяць, бы ў зямлі.

Там мёду – бяры, колькі ўлезе,
А пчол нічыіх – табуны.
Ім мала ўжо дуплаў у лесе –
У ямы мёд носяць яны.

Залілі пахкім мёдам канавы,
Запячаталі іх найшчыльней.
Не паспееш агледзецца нават,
Як правалішся ў гэткі вулей.

Там... Расказваць гадамі можна,
Што вы ўбачыце ў краі такім...
Ды ўваходзяць у стэп асцярожна,
Бы ў халодны ручай, казакі,

Бо гуляе па стэпе гэтым
Асмялелая татарва.
Таму трэба хадзіць з мушкетам
Нават свінцы травы адарваць.

Ды казак тут сяліўся ўсё роўна,
Вырастаў куранёк, бы грыбок.
Над страхой выпястоўваў любоўна
Ціхі гэткі, жытловы дымок.

Ён з мушкетам не расставаўся
І заўсёды з сабой яго браў:
І касіў з ім, і цалаваўся,
І зямлю з мушкетам араў.

А калі без мушкета неяк
На валах ён ехаў араць,

Заарканілі, як зладзея,
Каб у рабства затым прадаць.

І ляжыць ён на дне галеры –
Раб, прададзены – хоць памірай!
Спамінае з болем і верай
Стэп шырокі – свой казачны край,

Дзе трава – нібы лес такая:
Без касы ў яе не ўвайсці,
А валоў і з рагамі схавае –
Не знойдзеш ніколі ў жыцці;

Дзе рыбы ў рэчках і ставах
Столькі, што нават калі
Пугаўё паміж хваляў паставіш,
Будзе стаяць, бы ў зямлі;

Дзе мёду – бяры, колькі ўлезе,
А пчол нічыіх – табуны,
Ім мала ўжо дуплаў у лесе –
У ямы мёд носяць яны...

І стогне галера адчайна,
І воляю трызніць – аж жах...

Нячутна казачыя «чайкі»
Чакаюць начы ў чаратах.

Надзейна сябры іх схавалі –
Лодкі ў Дняпро заплылі.
А ноччу дняпроўскія хвалі
Іх хвалям марскім аддалі.

Нарэшце! Ну дзе тая Кафа?!
Галеры, што чыняць разбой?..
І «чайкі» адчайна, без страха
Ляцяць у задымлены бой.

Жадаючы ворагу згубы,
Прыкутыя вязні галер
Слухаюць бой, сцяўшы зубы:
Хто ж возьме, хто возьме тут верх?

Калі казакі перамогуць,–
Пабачыць свой край вязні змогуць.
Адолее ж вораг – сяброў
Зланцужаць, як новых рабоў.

Хвала перамозе! Нарэшце:
– Будзь ласка, скідай кайданы!
Піце, сябры нашы, ешце –
Больш не скуюць вас яны...

Вяртаюцца разам дадому.
І песні – аж за небакрай!
Бліжэе да болю знаёмы
Стэп шырокі – той казачны край,

Дзе трава – нібы лес такая:
Без касы ў яе не ўвайсці,
А валоў і з рагамі схавае –
Не знойдзеш ніколі ў жыцці;

Дзе рыбы ў рэчках і ставах
Столькі, што нават калі
Пугаўё паміж хваляў паставіш,
Будзе стаяць, бы ў зямлі;

Дзе мёду – бяры колькі ўлезе,
А пчол нічыіх – табуны.
Ім мала ўжо дуплаў у лесе –
У ямы мёд носяць яны...

І, напэўна, усеўшыся лепей,
Кожны думае, ўнурыўшы нос:
«Ці знайшоў хто валоў яго ў стэпе
І нарог, што травою зарос?..»

# Грунвальд

*Балада ўсіх славян. XV стагоддзе*

Ссекліся аддана
З ворагам славяне.
Раніца – як рана,
Поле – бы ў тумане.

Ноч была няўлежнай –
Ветранай, дажджлівай.
Рыцарам жалезным
Слізка асабліва.

Нібы ў кузні, звоняць
Коп'і і сякеры.
І сцягі з пагоняй
Зацкавалі звера.

Клінам войска гордым
На багной паляне
Расшчапляюць ордэн
Рыцарскі славяне.

Каб было вядома,
Дзе свае яскрава,–
Па пучку саломы
Пачапілі славы.

Ордэн ціха вяне,
Тонуць воі ў твані...
І куды ні глянеш –
Скрозь адны славяне.

Горача ў жалезе –
Гэтак смажыць ліпень!
У балота ўлезеш –
І яно як кіпень.

А славянам лёгка
Без жалезнай стомы...
І як зглядзець вокам –
Скрозь пучкі саломы.

Рыцары цяжкія
Тонуць – не узняцца.
Як сабакі кія,
Помсты так баяцца.

Сталі на калені
(А ішлі пыхліва!),
Літасці – не меней –
Просяць палахліва.

І ўсё – далей, далей
Ад вазоў сваіх жа,
Што ў палон забралі
Разам з іхнім крыжам.

Ведалі і самі
Той закон спрадвечны –
Побач з ланцугамі
Здавацца небяспечна.

А ў вазах схавана
Ланцугі звінелі:
Іх «дарыць» славянам
Крыжакі хацелі...

## Званы

*Беларуская балада. XIV стагоддзе*

– Што, званы, вы захадзілі,
Так трывожна зазванілі?
Хіба можна
Так пужаць

Ноччу соннай
Гараджан?

— Мы пачулі:
Недалёка
Свішчуць кулі —
Чулі клёкат?
То няйначай
Вораг гоніць:
Коні ў звоне...
Скачуць
Коні...

— Што, званы, вы застагналі?
Штосьці, дурні, мы праспалі...
І куды
У цемры йсці?
Дзе нам ворага
Знайсці?

— Вораг вас увёў у зман:
Ён жа тут
Ля нашых ран
І ля пакут...
Вы ідзіце
На наш звон
І убачыце,
Дзе ён.
Нас здымаюць
Са званіц,
Нас кідаюць доле
Ніц —
Мы ў няволі...

— Што замоўклі вы, званы?
Вашы стогны не чутны.
А без вас

Уночы
Не, не бачаць
Вочы.

— О, які цяжкі ў нас
Лёс!
Нас вязуць
Праз рэкі слёз
І наўскач
Праз лямант,
І праз плач
Таксама...
Каб маўчалі,
Не званілі,—
Языкі нам
Прышчамілі.
А ў такім палоне
Як жа мы зазвонім?!

Горад змоўк...
Счарнеў ад дум...
На званіцах
Дрэмле сум...
Калі вывезлі званы —
Значыць,
Здаўся горад без вайны.
Плача...

## Свабода

*Славацкая балада. XIV стагоддзе*

Смутак у сонечны дзень
Заўсёды баліць асабліва.
Промень вясёла гудзе,
А сэрцу дажджліва, дажджліва.

Тужліва ў сонца глядзець,
Калі табе дужа балюча.
Дзе ж яго, смутак свой, дзець,
Якім бы прымкнуць яго ключам?

Заўжды развітанне баліць
І сэрца – ільдзінкаю стыне...
Як плодна бучнеюць палі,
Калі ты ім здрадзіць павінен!

Хоць на зямлі не сваёй
Нічога цябе не трымае:
Хатка, што дрэмле на ёй,–
Усё, што, бядача, тут маеш.

Што ж табе ўзяць на ўспамін
Аб гэтай няласкавай працы,
Калі ты ўрабляў чужы клін,
А есці – прасіў у палацы?

Мо ўзяць гэты сонечны зай,
Што ў хаце прыгорбленай звоніць?
Ды толькі – хавай не хавай –
Ён будзе пячыся ў далоні.

А можа, узяць з сабой
Кветку, што вунь на паляне?
Не рві лепей кветку, ізгой,–
Кветка ж сёння завяне.

Можа, зямлі з-пад мажар
Усыпаць у торбу хоць троху?
Ды навошта лішні цяжар
Браць у такую дарогу.

Што ж тады ўсё-ткі ўзяць
З сабою – без лішняй дакукі?

Рукі не будуць нідзе замінаць —
Бяры адны толькі рукі.

Ты пойдзеш, зноў пойдзеш туды,
Дзе вольна, як птушкам у лёце.
І некалькі сутак хады
Ты збудзеш, раб, на свабодзе.

Аблашчаны сонцам наўздзіў,
З вятрамі, што звацъ гайданамі,
Ты ўжо у свабоду хадзіў,
Вярнуўся назад — з кайданамі.

І гэты раз будзе, як той,—
Цябе выдасць хата любая:
Караецца кожны карай цяжкой,
Хто вас, беглякоў, хавае.

Што ж, зловяць напэўна. Гайня
Пагоніцца з брэхам галодным...
Ды толькі хоць дзень, хоць паўдня
Пабудзеш ты зноў свабодным.

Хай сыплецца долу ячмень,
Цячэ пераспелае жыта.
Ён хоча ўцячы хоць на дзень
Ад гэтае крыўды абжытай.

Смутак у сонечны дзень
Заўсёды баліць асабліва...
Па сонцу, па сонцу ідзеш,
А сэрцу дажджліва, дажджліва.

Балюча ягонай хадзе...
Ды што ж зробіш, ласкавы Божа,
Калі ён за крыўду, за здзек
Адпомсціць вось так толькі й можа —
Уцячы...

## З’яўленне

*Балада ўсходніх славян. XIII стагоддзе*

Над намі толькі неба
палоскамі ўгары:
Пад дошкамі, пад дошкамі
ляжым мы, ваяры.
На дошках кубкі, місы,
цяжкія саганы –
Над ротам згаладалым
саўгаюцца яны.
І ежа праліваецца
праз шчыліны на нас,
Чужынай пахне ежа,
чужынай пахне квас.
Гучыць чужая мова
над намі навакол –
На нас, сваіх палонных,
зрабілі, д’яблы, стол...
Дык вось яны, чужынцы,–
нязнаны той народ,
Які раптоўна гэтак
з’явіўся ля варот.
Аб ім спачатку полаўцы
прынеслі вестку нам.
Казалі: – Цесна ў стэпе
ягоным табунам...
Казалі: – Незлічоны
народ гэты наўздзіў...
Казалі: – Войска іхняе
той прыхадзень разбіў...
Прасілі заступіцца,
прасілі памагчы,
Хоць самі не давалі
раней нам адпачыць.
Князі ўсе палавецкія
павезлі нам дары,

Хто ваяваў нас жорстка,
як з быдлам, гаварыў.
Шмат буйвалаў, вярблюдаў
прыгнаў і сам Кацян,
Які прасторам нашым
век не даваў жыцця.
Вярталі нам паспешна
астаткі крадзяжу –
Дачок нашых і жонак
у статках скацяжу.
Казалі: – Нас пасіліла
сягоння татарва,
А заўтра датабуніць,
дапыліць і да вас.
І наш народ успомніў
спалохана тады
Прыкмет і знакаў жудасць –
прадвеснікаў бяды:
Як неба чорна тлела –
чарней за наш адчай,
Сачыўся як з харомаў,
крывавы цёк ручай;
І як лясы гарэлі,
дымілі балаты,
Як птушкі з дыму падалі
на мёртвыя кусты...
Тады князі рашылі ў Кіеве:
– Калі
Страчаць гасцей, дык лепей
не на сваёй зямлі.
Хаця той невядомы
народ і слаў паслоў,
І мір нам прапаноўваў,
шукаў цяплейшых слоў;
Хаця паслы казалі:
– Ідзём мы не на вас,
Ідзём на вашых ворагаў –
на полаўцаў якраз:

Прынеслі ж столькі гора
вам гэтыя аслы...
І звалі канюхамі
ўсіх полаўцаў паслы.
Ды нас князі сабралі – ад плуга, ад раллі,
І сілаю вялікаю
мы за Дняпро пайшлі...
І вось над намі неба –
далёкае ўгары:
Пад дошкамі, пад дошкамі
ляжым мы, ваяры.
На нас паклалі дошкі,
на нас зрабілі стол;
Абселіся, аб'еліся
чужынцы навакол.
Паўсперліся на дошкі
і дыхаюць у твар...
Як пахне з рота мяса,
як чадзіць перагар!
І твары незнаёмыя
так блізка – вывучай
Народ той невядомы,
што прэ, як саранча.
І ўспамінай са злосцю
(а злосць усё баліць!),
Як полаўцы паздрадзілі
і з сечы уцяклі...
Пад дошкамі, пад дошкамі
ўжо смела спее бунт,
Але яго растопча
бязлітасны табун.
Не ведаюць харобрыя
шчэ ісціну адну,
Што спець завельмі доўга –
аж сотні год! – яму.
І стогнуць, і зайздросцяць
пад дошкамі яны

Тым воям, што намёртва
стапталі табуны,–
Над імі ж толькі неба –
без дошак! – угары:
Ляжаць на полі бітвы
свабодныя сябры...

## Пыл

*Балада Кіеўскай Русі. XIII стагоддзе*

Яшчэ
Не асеў на дарогах пыл,
Табунамі чужацкага войска ўзняты.
Усё яшчэ сеецца ён
На голыя дрэвы,
Для якіх восень прыйшла вельмі зарана –
Улетку:
Іх зялёнае лісце
Скарміла сваім коням
Батыева саранча...
Яшчэ падае ён, гэты пыл,
На крывыя шаблі захопнікаў,
І там, дзе не высахла покуль кроў,
На блішчастых палосах
Бярэцца шэры налёт земляны,
Як на тварах смяртэльна параненых ваяў.
Яшчэ на бадыгах крукастых,
Якімі прыхадні сцягвалі з сёдлаў
Белагаловых воінаў,
Матляюцца шматкі іх запыленых доспехаў.
Яшчэ не дагарэлі
Вогненныя дзіды,
Якімі Батый спаліў Кіеў,
І пыл яшчэ асядае на пажарышча,
Як гарачы попел...

А ўжо знайшоўся баян,
Які, пырхаючы ад пылу, спявае:
— Слава, слава, слава Батыю!
І дзякуе, дзякуе «вызваліцелям»
За нагрэты ў запыленых бурдзюках
Ханскі кумыс...
А можа,
Пырхаецца яму не толькі ад пылу?
Бо чаму ж тады
Ён так баязліва,
Як вінаватае сабачанё на гаспадара,
Пазірае на харобрых ваяроў,
Што паўтыканыя чужацкімі стрэламі,
Як вожыкі,
Ляжаць навокал.
Не бойся, палахлівец!
На тваё шчасце,
Яны не змогуць расказаць пра тваю здраду,
Нават не змогуць перадаць наступнікам,
Якім імем звалі цябе сябры, маці,—
Яны ж мёртвыя...

## Птушка

*Беларуская балада. XIII стагоддзе*

Ой, суме, суме,
Мне свет нямілы —
Дачку татары
Схапілі сілай.

Забралі сілай,
Звязлі з сабою.
Дачушка стала
Жонкай-рабою.

І я ўжо знаю,
Што аніколі

Ёй не вярнуцца
Адтуль, з няволі.

Скінуся птушкай,
Стану зязюлькай
І пакрыляю
Я за Настулькай.

І палячу я
У свет далёкі,
У край нязнаны,
Не гэткавокі.

Той сад пазнаю,
Знайду сама я,
Што, нібы клетка,
Дачку трымае.

Са мною разам
І сум мой сядзе
У тым прыгожым
Татарскім садзе.

Мы ўсё чужое
Вакол пабачым
І закукуем,
Нібы заплачам.

Дзе ж ты, дачушка,
Дзе татарчушка?
І ўнучанятка –
Татарчанятка?

А вунь ля саду,
Зірні, ў загоне,
Куюць татары
К паходу коней.

Слязой дачушка
Падкоўкі росіць,
А мой унучак
Цвічкі падносіць.

Дачка ў зязюлі
Прызнала матку
І паказала
Татарчанятку.

Як яны сталі
Куванне слухаць,
Захвалявалася
І свякруха.

Чаго ты, сваццяʔ
Сама ж ты матка –
Аддай дачку мне
З татарчаняткам.

Свякроў злуецца
І раіць сыну:
– Прагонь зязюлю,
Яна – з чужыны.

Яна кукуе
Зусім нязвычна,
Нібы рабыню
Кудысьці кліча.

Калі зязюля
На сад злятае,–
Нявестка ў скрусе,
Ад смутку тае.

І зяць – за стрэльбу,
Дачка – за ножык...

Дачка – не трэба...
Дачка – няможна...

Віхор, здалося,
Завыў над садам...
І ўскрык – як гора,
І смерць – як радасць.

Мяне падстрэліць
Не стрэльба зяця,
А крык дачушкі –
Вось гэты, сваццця.

І я, старая,
Як птушанятка,
Звалюся ў ручкі
Татарчанятку.

Схавай, унучак,
Калі пасіліш,
Мяне з дачкою
Ў адной магіле.

Схавай высока,
Каб было бачна,
Як нашы вербы
Па нас заплачуць.

Дамоўкі сцежка
Хай вочы студзіць –
Па ёй і ўмёршы
Сумуюць людзі.

Табе ж на памяць
Мы пакідаем
Сум па радзіме,
Па любым краі.

Вунь на галінцы
Ён захістаўся.
Табе ўспамінам
Пра нас астаўся.

Калі ж сарвецца,–
Парой любою
Зноў прарасце ён
Тугой-журбою.

## Івайла

*Балгарская балада. XIII стагоддзе*

– Я цар, скажыце, ці не цар,
Ваш нечаканы валадар?
А можа, ўсё яшчэ для вас
Я з-пад Радопаў свінапас?

Я ці не я такое змог –
Нагая орды перамог
І візантыйцам – ім! – наўздзіў
Царова войска разгваздзіў.

А калі цар сапраўдны Ціх,
У бітве ссечаны, заціх,
Я ці не я Тырнова ўзяў –
Сталіцу, дзе і сам заззяў?

Мяне ці, можа, не мяне
У гэтай радаснай вайне
Кожны горад,
кожны дом
Спяшаўся абвясціць царом?

А калі цар я,– нібы ў сне,
Усё царова,
значыць,– мне:

Яго раскоша і закон,
Яго палац,
ягоны трон.

Царова жонка – ўжо мая:
З царыцай ажаніўся я.
Рыззё пастушкі, гавару,
Завельмі простае цару.

Хто вас, сялян, на бунт падняў?
Цяпер і вы –
цару радня.
Што ж ад мяне вы пакрысе
Паадварочваліся ўсе?

Няма,
няма ў мяне сяброў
Сярод прыдворных ліхвяроў.
А можа, абражае й вас,
Што вамі царыць свінапас?

– Не, што ты, наш сялянскі цар,–
На трон ты ўсеўся з нашых мар.
Ад валабершчын і дымнін
Стагнаў заўсёды селянін.

Плаці за выган і за брод,
Плаці за мост,
за калаўрот,
А як падаткі аддасі,–
Сам ужо есці не прасі.

Павінен люд араць і жаць
І вінаград не свой капаць
І будаваць яшчэ турму,
Дзе бедаваць якраз яму.

І ўсё,
і ўсё былое зло
Засталося, як было.
Сялянам продыху нямаш,
Хоць цар цяпер, здаецца, наш.

А мы так верылі табе,
Як вадару, у барацьбе.
Не даспадобы ж нам якраз,
Што ты забыў,
што свінапас!

Здзівіла ісціна сама –
Цара
харошага
няма!
І ўсе згадзіліся таму:
Лепш свінапасам быць яму.

Пад улюлюканне двара
Баляры скінулі цара,
Пад рогат трутняў і паноў
Пагналі ў свінапасы зноў.

Радопы.
Краю залаты,
Дзе з гліны хаты і платы,
І цар былы,
як і раней,
Пасе нявольнікам свіней.

Народ?
Успамінаў яго,
Ды не цара,
хлапца таго,
З якім паверыў у баю
У сілу ратную сваю.

## Руяне

*Балада палабскіх славян. XII стагоддзе*

Сцягі – ўперад, славу – ўперад:
Мы прывыклі да яе!
Наша смеласць, нібы верад,
Нам спакою не дае.

Хто наш сябра, хто нам вораг,–
Разбіраць няма калі.
Толькі зброяй мы гаворым,
Грэем бітвамі палі.

Мы – руяне, мы – славяне...
Ну, каму падаць руку?
Супраць брата нават станем,
Калі ён на тым баку.

Немцы моляць дапамогі,
Каб змагчы, сагнаць славян?
Калі ласка,– нашы ногі,
Нашы рукі просяць ран.

Сцягі – ўперад, славу – ўперад:
Мы прывыклі да яе!
Наша смеласць, нібы верад,
Нам спакою не дае.

Б'ёмся мужна. Будзьце пэўны,
Кожны ўбачыць нашу злосць...
Што нам роднасць, што нам крэўнасць,
Калі з немцам змова ёсць!

Зваявалі... Не ўваскрэсне...
Ціха, жудасна ў палёх!
Немата... Шукае песня
Схову ў гулкай цемры лёх.

Нас жа вораг не дастане
За гарою хваль і льдзін:
Мы – славяне, мы – руяне,
Мы на востраве сядзім.

Сцягі – ўперад, славу – ўперад:
Мы прывыклі да яе!
Наша смеласць, нібы верад,
Нам спакою не дае.

Толькі штосьці ўсё ж трывожыць
(Халадае нават кроў!),
Што не ворагаў, а можа,
Зваявалі мы сяброў?

А «сябры» – наш Божа мілы! –
Шыюць нам хамут – прымус...
Супраць нас збіраюць сілу,
Ладзяць іншы ўжо хаўрус.

Відаць, знайшлі новых дурняў...

## Пір

*Балада Кіеўскай Русі. XII стагоддзе*

Гэтак шчыра, гэтак міла
Сам залётнік і кумір
Зазывае ўсіх Чурыла
На нядзельны княскі пір.
Зазывае дужа хвацка
Жонак соцкіх і дзесяцкіх.

А каб сонца не свяціла
На бел-твар – яго красу,
Над Плянковічам Чурылам

Круг сланечніку нясуць:
Беражэ, кунега, твар –
Старыць молайца загар.

Уздыхаюць жонкі ўпотай
Па Чурылу... Князь працей
Не знайшоў яму работы,
Як на пір склікаць гасцей:
Ён спяшае з хаты ў хату –
Сам нядзельны, нібы свята.

На мядуху, як на лекі
(Трэба ж гора спаласнуць!),–
Жабракі ўсе і калекі
На усколенцах паўзуць.
Што ім слота, што ім гразь:
Трэба ўважыць – просіць князь!

Хто ж прыйсці у двор не зможа,
Хай не плача ў бараду:
Княжа беднаму паможа –
Ежу ў хату пададуць.
Хай жа кожны з іх адчуе:
Сёння шчодры князь піруе!

У двары шумяць яліны,
А ў грыдніцы, бы ў вуллі,
Мёдам пахне гуд чмяліны –
То баяры загулі.
– Піце мёд! Хоць сто правар! –
Просіць хмельна гаспадар.

Мёду менее ў мядушах –
Болей гуду за сталом...
А чаму ж дружына вушы
Апусціла, як назло?
– Што ж дружына не пяе?
Можа, мёду не стае?

– Не, наліты нашы чашы,
Толькі мы іх не бяром...
Княжа, зло галовам нашым –
Хочам есці серабром.
Ты ж нас крыўдзіш: нечакана
Лыжак даў адных драўляных.

– Так, дружыну залатую
Не дабуду серабром.
А дружынаю знайду я
Серабро – сваё дабро...
Гэй, вы чулі, кавалі?
Лыжкі зараз каб былі!

Покуль лыжкі для дружыны
Кавалі куюць наспех,
Хто расказвае навіны,
Хто ўзнімае іх на смех.
Жонкі гэткае гародзяць –
У мужчын аж хмель праходзіць:

– І хоць верце, хоць не верце,
А у Полацку – хто чуў? –
Раз'язджаюць смела чэрці
І крадуць па крывічу.
Іх саміх ніхто не бачыць,
Толькі коні скачуць, скачуць...

Там вунь нехта печанега
Дурыць п'янага, як хмель,
Што у студнях (і без смеху!)
Не вада ў нас – спрэс кісель.
– А не верыш, то прабач...
Хочаш – сам ідзі пабач.

Цягне той вядро старанна...
Так, кісель – любы зірні.
Ён не ведае: схавана

Кадзь у чорнай глыбіні.
У славян жа дужа модна,
Каб напітак быў халодны...

Барукаюцца баяры –
Навакол мядзведжы роў.
Жонкі ж хочуць, жонкі мараць,
Каб Чурыла ўсіх збароў.
Ах, як добра было б дужа,
Каб ён змог мужоў падужаць!

А дзе грыдзі стрэлы слалі,
Жонкі праглі, як адна,
Каб мужы не пападалі,
А Чурыла пападаў
У пярсцёнак з іхніх рук...
Не дрыжы, Чурылаў лук!

– Гуслі, гуслі не чапайце!
Грэх іграць нам для душы...
– Ну, давайце, ну, зайграйце,
Ах, давайце саграшым!
Заўтра зноўку мы паверым:
Гуслі – грэшныя, халера...

Бач, дружына звесялела –
Лыжкі з кузні падалі.
І за стол паселі смела,
Як баяры, кавалі...
А Чурыла – свет-кумір –
На наступны кліча пір.

## Веча

*Баладь-прамовы. XI–XIII стагоддзі*

### СЛЁЗЫ (1015 год)

— Ты просіш размір'е забыць,
Слязам тваім, княжа, паверыць?
Мы бачым, што шчыра ты плачаш
І слёзы сапраўдныя льеш...
А тады, наш князь Яраславе,
Ці плакаў ты гэтак, скажы нам,
Калі, як зладзей, наўгародцаў
Спадманам рашыўся пабіць?
Яны, бач, цябе не ўважылі,
Яны, бач, цябе не паслухалі
І пакаралі варагаў —
Тых, што служылі табе...
Ты помсціў братам-наўгародцам,
Ты помсціў цэламу вечу.
Дык што ж ты ад веча хочаш
Зараз, наш жорсткі князь?
Цяпер ты вярнуўся да веча,
А ўчора ты, княжа, не думаў,
Што наша табе дапамога
Спатрэбіцца сёння якраз?
Бо сёння ты ўведаў, што брат твой,
Забіўшы Барыса і Глеба,
І па цябе, па трэцяга брата,
Збірае ў дарогу ўжо смерць.
Пра гэта цябе папярэдзіла
Прадслава, сястра твая з Кіева,
І вельмі шчыра прасіла
Берагчыся брата свайго...
Ты моліш ісці нас да Кіева
І зваяваць Святаполка?
Ты плачаш... Ну што ж — мусіць, пойдзем,

Але не таму, Яраславе,
Што мы цябе дужа любім,
А таму, што мы ненавідзім
Святаполка, брата твайго...

ЗАМЕНА (1067 год)

– Княжа Ізяславе!
Збірай нас у другі раз
На печанегаў.
А калі веча рашыла такое,
Значыць,
Усё веча – тваё войска.
Усе пойдзем,
Хто толькі можа ўзяць у рукі хлуд.
А калі хто не пойдзе –
Дай таго нам,
Мы самі яго біць будзем...
Толькі не мірыся з печанегамі!
А калі нават ты ім мір дасі,
То мы не дадзім;
А калі ты не пойдзеш з намі,
Веча паспрабуе «памірыць»
Цябе і Усяслава Полацкага,
Твайго палоннага:
Мы вызвалім Усяслава з палону
І пасадзім на твой стол,
А цябе –
На Усяславава халоднае месца, княжа.

Так веча рашыла.
І неўзабаве палонны Усяслаў
Сядзеў князём на Кіеўскім стале,
А двор і дружыну Ізяслава
Рабавалі тыя,
Хто нядаўна яшчэ
Так аддана, так шчыра
Усміхаўся князю.

ЧОРНЫ БРАТ (1097 год)

— Мы веча паклікалі,
І вось ты нарэшце стаіш перад намі,
братамі, спакойна,
Глядзіш нам у вочы, і мы ў твае, бачыш, глядзім.
А ён ужо глянуць вось гэтак, наш браце, не зможа,
Каб добра разгледзець,
як шчыра будзеш ты зараз маніць...
Княжа, нашто ты зрабіў гэта зло,
Якое ўвайшло, нібы нож,
глыбока ў зямлю нашу родную?
Віна за Васількам была?
Чаму ж тады нас не паклікаў на рад?
Мы раццю б усталі — табе б спамаглі
Яго зваяваць, вінаватага...
Віны не было?
Ты проста яго не любіў?
Але ж, Святаполк, хіба гэта для князя прычына,
Каб страшнае зло ўзгадаваць!
Мы знаем, яго гадаваў не сваімі ты, нелюб, рукамі,
Давыд, уладзімірскі князь, як родны, табе памагаў
Знайсці тыя рукі халодныя,
што ў Лазара і ў Турака...
Скажы, Святаполк, перад вечам,
Скажы нам, братам сваім кроўным,
Навошта ж ты роднага брата,
Васільку, нашто асляпіў?
Маўчаў Святаполк...
І праўда,
Што ж ён сказаць яшчэ мог бы,
Калі сваё слова чорнае
Сказаў ужо, злыдзень, сказаў.
А Васілька ў светлых харомах
Натыкаўся на цёмныя сцены
І гаварыў, не змаўкаючы:
— Чорны мой,
Чорны мой брат...

## УСМЕШКА ЗА БАРАДОЙ (1103 год)

— Я ж старэйшы за цябе, Валадар.
Бачыш, які барадаты я!
А калі ўжо ты хочаш
На маю старасць наехаць,—
Едзь, бог з табою.
Толькі перад гэтым наездам на маю бараду
Скажы тым,
Хто застанецца ў тваім горадзе,
Каб, крый бог,
Не зачынялі моцна вароты,
Бо як жа ты, уцякаючы,
Пераскочыш іх, такія высозныя?
За мяне не турбуйся —
Я не буду глядзець нават
У твой бок...
І каб не бачыць твайго сораму,
Я, ці чуеш, схаваю свае вочы за бараду.
Хвала Богу,
Што ў мяне хоць барада ёсць!

## ЗА АДЗІН МУЖ (1150 год)

— Сыну Ізяславе!
Цябе паклікала на княства Кіеўскае
Веча,
А ты паклікаў мяне,
Дзядзьку свайго.
І цяпер ужо ты, князь,
Мне нібы бацька родны,
Хоць па гадах — мой сын:
У цябе бацькі няма,
А ў мяне сына нямашака —
Будзь жа ты маім сынам!
І я не ўздумаю разлучацца з табою
Ані ў дабры, ані ў зле.
А хто будзе табе сябра,

Той будзе і мне не вораг;
А хто будзе табе вораг,
Той будзе і мне не сябра.
І будзем мы з табою правіць Кіевам –
За адзін муж.
І яны цалавалі паміж сабою крыж.
І яны ўселіся на Кіеўскі стол – двое.
Дзядзька Вячаслаў не ведаў,
Што пляменнік
Хітра пацясніўся на стале,
Каб лаўчэй збавіцца ад новага бацькі –
Усё ж лепей за ўсё на стале быць
Круглым сіратою!

ВЫПРАЎЛЕННЕ (1183 год)

А калі ты вернешся
Да мітрапаліта Нікіфара,
Скажы яму,
Што я, Усевалад Юр'евіч,
Князь Вялікае Гняздо,
Не прыняў цябе епіскапам
На Суздальскую зямлю,
Бо мае жытнія людзі
Не выбіралі цябе, Мікалая Грэка,
На сваім вечы –
Мала што цябе
Паставіў да нас сам мітрапаліт!
Падумай толькі –
Як ты, людзьмі не абраны,
Будзеш стаяць у Суздалі,–
Нібы сорам.
Ды і як жа я, князь,
Які любіць усіх людзей,
Як сваіх міласнікаў,
Магу прыняць на сябе такі сорам!
Мы, веча, паказваем табе пуць –
Ідзі дадому.

## ВЕЧА НА ПОЛІ (1185 год)

— Княжа!
Мы сатварылі гэтае веча
На полі, у паходзе,
Каб сказаць табе:
«Калі б вораг яшчэ сустрэўся сам —
Мы б біліся,
Але шукаць яго
Мы не хочам.
Таму войска вяртаецца дадому,
А ты — як маеш:
Не падабаецца —
Шукай новае веча
(Мы даём табе на гэта дазвол
Адзінымі вуснамі);
А мы тады пашукаем
Свайму вечу новага князя».
— Воі!
Я хачу лепле
Ваша веча
Весці дадому,
Бо я ж цалаваў да вас крыж!

## АПОШНЯЯ ПРОСЬБА КНЯЗЯ (1216 год)

— Браты ўладзімірцы!
За мною звініць ад Ліпіц раць вялікая.
Зачынімся ў горадзе?
— Княжа Юры!
Сам разваж —
З кім жа нам зачыняцца?
Браты нашы ці пабіты,
Ці ў палон пабраны.
А каторыя дадому прыбеглі —
Тыя без зброі...
З кім жа мы за цябе станем?
Бачыш, колькі вояў у твайго брата?

Нам іх не здужаць.
— Усё гэта ведаю.
Але што ж мне рабіць,— парайце.
— Твары мір з братам сваім,
Мірыся, княжа, бо мы не ідзём.
Мірыся або дбай сам пра сябе —
Цябе мы не абаронім...
— Тады хоць не выдавайце мяне
Ні брату майму
Канстанціну,
Ні Уладзіміру, ні Мсціславу ў рукі.
Дайце мне выйсці сваёю воляю
З нашага горада...
І веча паказала яму пуць —
Таму,
Хто сядзеў у іх за мужа.

## ПЕРАМОГА (1220 год)

Цэлы тыдзень
Тлумна на
Яраслававым двары.
Сышліся наўгародцы на веча,
Узброеныя, як на раць.
Сталі адзін перад адным суседзі
І глядзяць, як ворагі,
Бо Славянскі і Плотніцкі канцы
Супраць пасадніка Цвярдзіслава,
А Людзін канец
Адзін змагаецца за яго.

Людзінцы ведаюць,
Што, падтрымліваючы пасадніка,
Яны змагаюцца супраць князя Усевалада,
Які па сваёй прыхамаці
незадаволены Цвярдзіславам
І хоча замяніць яго,
Хоць ніякай віны за чалавекам і няма.

Але ўбачыў князь,
Што Людзін канец
Шчыра стаіць за пасадніка,
І здаўся.
І цалаваў з Цвярдзіславам
Паміж сабою крыж.
І ўладыка Мітрафан
Памаліўся нават:
«Мірам крыж узвялічаны быў,
А д'ябал па патрэбе зняважаны...»

Так адзін Людзін канец,
На якім стаяла Справядлівасць,
Перамог два канцы,
На якіх стаяў сам князь.

## Ахвяраванні

*Балада хрышчэння. IX стагоддзе*

*Яны зрубілі крыж і на гару*
*Прынеслі і надвечар укапалі...*

О як халодзіць дзіўная вада —
Звычайная, а ўжо, лічы, святая,
Якою акрапляе іх святар,
Пакліканы аж з самай Візантыі.
О як трывожаць словы-звадышы
Пакуль што незнаёмае малітвы,
Трызненні і пра пекла, і пра рай,
Пра новага, чужога яшчэ, бога,
Які павінен сёння стаць сваім...

*Яны да крыжа двух быкоў прыгналі,*
*Зарэзалі і іхняю крывёю*
*Крыж навабоскі шчодра акрапілі...*

Калі ж закончыўся абрад хрышчэння,
Заціхлі словы, змоўкнулі малітвы
І сцішылася ў посудзе святая
Вада, што ад краплення асталася,
Яны, яшчэ язычнікі душою,
А целам ужо быццам хрысціяне,
Спыталіся – наіўна і разгублена:
– А што далей рабіць?
– Жыць, як жылі,– святар ім адказаў.–
Жыць на зямлі сумленна і праўдзіва,
Не крыўдзіць анікога, паважаць
Усіх людзей – і блізкіх, і далёкіх.
– А бог? Пры чым жа новы бог?
– Бог вас любіць за ўсё за гэта будзе,
Бо самы лепшы для яго дарунак –
Сумленнае і шчырае жыццё...

*Яны ж пад крыж двух чалавек самлелых,*
*Палонных двух звязаных прывялі:*
*Адзін стары быў – нібы сама мудрасць,*
*Другі быў юны – быццам чысціня...*

І ўжо, зірні, блішчыць лязо сякеры,
Якою замахнуўся звычна кат –
Учорашні язычнік. Як глядзяць
Асуджана, ды з годнасцю ахвяры –
Нібы яны вось гэтак паміраюць
Дзеля багоў ужо не ўпершыню.
І раптам, нібы боская, рука
Узнікла перад самаю сякерай.
– Што робіце? – спытаў святар.
– Як гэта – што? – здзівіліся хрышчоныя.–
Мы хочам бога новага аддзячыць,
Што хрысціянамі ён сёння нас зрабіў.
А гэта нашыя яму дарункі –
Быкі найлепшыя, найрупнейшыя слугі
Не лішнія, здаецца, і багам.

*Ахвяры ціснуцца бліжэй да крыжа,*
*Нібыта ў ім шукаюць абароны.*
*Сякера, усё ўзнятая, блішчыць...*

– Я вас хрысціў, хачу вам растлумачыць,
Што новы бог ваш – гэта ўжо не ідал,
І ён ахвяраванняў не прымае.
Сякеру пакладзіце. Развяжыце
Ахвяр і іх на волю адпусціце –
Найлепшы падарунак будзе богу!
Яны зрабілі ўсё, як і казаў
Святар. Але ішлі дадому
Расчараваныя – які ж тады ён бог,
Калі ахвяраванняў не прымае,
Дарункаў не бярэ?!
Казалі, мусіць, праўду,
Што самі хрысціяне – жабракі,
І іхні бог – жабрак, галыш таксама,
І ўжо, магчыма, ў думках дакаралі
Сябе, што гэтак неабачліва
Даверыліся богу-незнаёмцу.
І толькі двое – хлопчык і стары –
Усё – і развязаныя! – сядзелі
І радавацца не маглі ад шчасця.
Ахвяры дзве – і старац, і юнчо –
На крыж, як звар'яцелыя, глядзелі
І богу, што ахвяраў не прымае,
Маліліся у сто ратоў, здаецца,
Двума ратамі, шчодра, хапатліва,
За ўратаванне гэта.
А над імі
Стаяў, нібы распяты кімсьці, крыж
І абыякава глядзеў кудысьці ўдалеч...

## Здзек

*Балада дулебаў. VII стагоддзе*

Ну хто, скажыце, іх дагоніць –
Аж вецер звейвае слязу.
Ах, што за коні, што за коні
І як вязуць, і як вязуць!

Іх паганяць зусім не трэба:
Без пугі скача небасхіл,
Бо коні хуткія дулебаў
Імчаць з усіх няконскіх сіл.

Імчаць да самае знямогі,
Нагамі кормячы сцягу...
Ах, што за ногі, што за ногі
І як бягуць, і як бягуць!

Рыпяць прапылена калёсы,
Дарогі – быццам бы растуць.
І тупат, тупат коней босых
Чуваць, здаецца, за вярсту.

Абрын сядзіць, такі пыхлівы,
Вакол лятуць лугі, лясы.
Ах, што за грывы, што за грывы –
Жанчын-красуняў валасы.

А вочы ў кожнай – як слязіны,
Вачам не выплакаць свой сум,
Бо то ж не коні, а жанчыны
Авара гнюснага нясуць.

Сам для сябе, не для кагана
І па чатыры, і па пяць
Надумаў прыхадзень паганы
Жанчын, як коней, запрагаць.

Сваіх стаеннікаў шкадуюць,
Дулебскіх жонак без шкады
Авары ўблытваюць у збрую –
Прыгожых самых, маладых.

А правязуць абрына-клячу,
Як развярэджваецца боль!
Душой, без слёз жанчыны плачуць:
«За што нас сілуеш, юдоль?!»

Пасля дарогі свет нямілы –
О колькі крыўды у жыцці!
І ўсё ж яны знаходзяць сілы
За здзек крыўдзіцелю сплаціць.

Так паглядзяць – заб'юць нібыта.
Ды зразумей жа, суччын сын:
Хоць ты й жывы, а ўжо забіты
Вось гэтым позіркам жанчын!

## Вайна

*Балада антаў. VI стагоддзе*

Падкраўшыся,
Яго пусцілі ў збажыну,
І ён,
        пушысты, коткі і калматы,
Пакаціўся,
Як спушчаны сабака
Пабег між каласоў,
Таропка выганяючы ўсё жывое
З нераспелай нівы.
Матылі ўзляталі з бронзавых каласоў
І, хапатліва махаючы крыллем,
Спяшаліся хутчэй адляцецца ад яго.

Земляныя мурашы хапалі ў нячывіллі
Белыя свае лічынкі
І спрабавалі таксама ўцячы.
Жаўранкі рупіліся
Вынесці з нівы свае гнёзды
Разам з жаўранятамі,
Але ім рук не хапала,
Крыл –
не хапала таксама.
І каласам карцела пабегчы
Ад гэтага рыжага сабакі,
Які дыхаў гарачынёю,
Але карэнне не пускала,
Зямля не пускала...
Ды і тыя, што ўцякалі,
Не ўцяклі.
Хіба з мурашыным крокам
Абгоніш гэтага ганчака?
І мурашы заціхалі, падмятыя ім,
А іхнія белыя лічынкі
Увачавідкі рабіліся чорнымі.
Хіба матыліныя крылы
Дапамогуць уратавацца
Ад гэтага хуткабежнага звера?
І рознакаляровыя матыліныя крылы
Успыхвалі
І той жа час рабіліся чорнымі.
А хіба каласы,
Якія не ўмеюць ні хадзіць,
ні лятаць,
Могуць уратаваць сябе?
І яны моўчкі падалі на чорны дол
І таксама рабіліся чорнымі.
Толькі жаўранкі
З абсмаленымі сэрцамі
Узвіваліся
Ўсё вышэй і вышэй у блакіт,–

Мусіць, каб не чуць,
Як крычаць жаўраняты –
Ужо таксама чорныя.
А ён,
гэты задушлівы, як сквар, ганчак,
Усё бег і бег па ніве –
Адно трэск стаяў пад ім,
Нібы ламалася крохкае ламачча
Пад нагамі статка зуброў,
Ды гуло, як вецер, полымя.
І там, дзе ён прабягаў,
Поле рабілася чорным:
Дзе канчалася ніва,
Там канчаўся і чорны колер.
Там і стаялі конныя авары,
Якія знарок пусцілі ў збажыну
Гэтага спапяляльнага ганчака –
Агонь.
Стаялі
І задаволена смяяліся:
Гэта таксама была вайна,
Гэта таксама была стратэгія,
Гэта таксама была выйграная бітва:
Перамогшы хлеб,
ты перамог і ворага.
Пераможцы смяяліся,
Коні пад імі трывожна іржалі,
А з другога боку нівы
Плакалі пераможаныя –
Плужнікі і аратыя плакалі,
Бо разам з ніваю
Гінула іхняя воля.
І чорныя слёзы
Сеяліся ў чорную зямлю славян
І тут жа прараслі
Крыкам...
Таксама чорным.

## Чараты

*Балада антаў. V стагоддзе*

Як прадаўжаючы раты,
Растуць з балота чараты.

На чаратах і на губах
Трывожнай небяспекі пах.

Пачуўшы: «Ворагі ідуць!» –
Нырнулі хатнікі ў ваду.

І зараз сцішана на дне
Чакаюць, калі жуд міне.

А вецер дзьме па чаратах –
Здаецца, ходзіць па ратах.

Па людзях быццам ходзіць ён,
Хто не паспеў пайсці ў заслон;

Хто не паспеў узяць мячы,
Не змог з малымі уцячы,

Якія тут жа, сцяўшы страх,
Чарот мыляюць у губах.

Ляжаць пад зябкаю вадой,
У глей загнаныя бядой.

Гудуць трывожна чараты,
Нібы раскрытыя раты...

А вораг, што крыві так млеў,
Здаецца, штосьці зразумеў.

Вачніцамі вачэй пустых
Глядзіць у зле на чараты,

З якіх дыміцца яд надзей –
Дыханне стоеных людзей.

І ўжо ў балота лезе раць...
Як лёгка хітрасць ваяваць,

Калі, раскрытая спаўна,
Яна не хітрасць, зло яна.

Ты чарацінку вырвеш з губ –
І ўжо любуйся, душагуб,

Як захлынаецца дзіця,
Табой забранае ў жыцця.

А можаш і наадварот –
Прабіць наскрозь чаротам рот.

Тады, працятая да дна,
Душа не ўстане ні адна...

Ты пераможца, вораг-змей,
Бо ты хітрэй, падлей і злей.

Дзьме цішынёю з балатоў –
Ні чаратоў там, ні ратоў.

І ўсё ж над страшнаю вадой
Цікуе вока за табой.

Яно запомніць назаўжды,
Куды пайшлі твае сляды.

## Сунільда

*Балада расаманаў. IV стагоддзе*

А ці чуеш ты, наша сястрыца,
Як храпуць побач дзікія коні,
А ці бачыш, сястрыца Сунільда,
Як бліжэй гэтых коней падводзяць,
Да цябе гэтых хуткіх падводзяць,
Як стрыгуць яны чуйна вушамі,
Як у іх раздзімаюцца ноздры,
Як дзяруць яны дол капытамі,
Як дагнаць ім не церпіцца вецер,
Ім, хто самі на вецер падобны?
Век, здаецца, любіла ты коней,
Іхні бег, іхні вецер любіла,
Што ж цяпер ты ў маркоце, сястрыца?
Значыць, ведаеш, бачыш і чуеш,
Што табе прынявольваюць готы,
Непакорнай сястры расаманаў.
Гэтых коней у стэпе лавілі,
Гэтых дзікіх у вольным лавілі,
Для цябе для адной іх лавілі,
Нават сам Германарых, цар готаў,
Цябе звязвае з гэтымі коньмі,
І для коней рыхтуе, для дзікіх
Дужа ёмкую пугу, сястрыца,
Хоць найлепшая пуга ім — воля
І паслаблены збольшага повад.
Германарых так хоча адпомсціць
Твайму мужу, што з'ехаў да гунаў,
Ён табой хоча люта адпомсціць,
Невіноўнаю хоча адпомсціць
І твайму чалавеку, і гунам.
А ўжо коні ўзбуджана дыхаюць
І нацягваюць струнка вяроўкі...
Яны зараз, сястрыца, разлучаць,

Бесспагадна, няўмольна разлучаць
Твае ногі, што лета любілі,
Што любілі і травы, і росы,
Што, як сёстры, любілі сцяжынкі,
На якіх яны ведалі-зналі
Кожны нават маленькі каменьчык...
Коні зараз, Сунільда, разлучаць
І твае працавітыя рукі.
Як ты ніву – аберуч! – галубіла,
Як ты дзетак – аберуч! – люляла,
Як ты лашчыла мужа – аберуч!
Твае вусны таксама разлучаць,
Што маглі цалаваць толькі разам,
Твае вушы, што ў згодзе ласкавай
Чырванелі ад слова «кахаю»,
Твае вочы, што й зараз з надзеяй
Неразлучна пасуць небасхілы,
За якія паехаў каханы...
Не чакай, дарагая сястрыца,
Не ўратуюць цябе небасхілы,
І ніхто не абрэжа вяровак,
Што да коней цябе прывязалі.
Панясуць тыя коні Сунільду,
На усход панясуць і на захад,
Панясуць і на поўнач, на поўдзень,
Даганяючы дзікі свой вецер...
Пуга стрэліла, коні ўзвіліся,
Паімчалі ва ўсе канцы свету
Пад усцешаны смех Германарыха...
Мусіць, зноў гэтых коней успомніць
І свой смех жудавата-вар'яцкі
Германарых спалохана ўспомніць
Перад тым, калі сам звар'яцее.

## Ідуць

*Балада венедаў. III стагоддзе*

Іх мала хто і ведаў
Да гэтае пары.
Ідуць шыхты венедаў –
На Рым ідуць,
на Рым.

Ідуць, як для падмогі
Уздыбленым рабам.
На пыл таўкуць дарогі –
Аж козытна губам.

Нясе надзею кожны –
Стаміліся насіць!
І пыл,
як сцяг трывожны,
Над воямі вісіць.

І сонца, нібы яблык,
У пыле на мяжы.
І Рым,
гігант аслаблы,
Напуджана дрыжыць.

І дроцікі –
наперад,
І дроцікі –
назад,
Нібы палююць звера
Ля рымскіх ля прысад.

Народ не ваяўнічы,
Ды колькасцю вялік.
Зірніце, хто іх зліча?
Які ім сёння лік?

Яны ў дружынах готаў,
Яны і ў гунскай цьме.
Ім вецер сам з ахвотай,
Здаецца, ў плечы дзьме.

Ідуць на Рым, дзе, чулі,
Багаццяў —
                    што галля;
Дзе ў жыццядайным гуле
Раджае ўсё зямля;

Дзе храмы і палацы,
Як казка — гарады;
Дзе плодна весяляцца
Шыкоўныя сады.

Ды не адны багацці
Іх звабілі ў паход
І нагукалі раці
З лясоў, лугоў, балот.

Як марылі часамі
Сплаціць за здзек любы!
Яны ж былі і самі
Патомныя рабы.

Бо пры любой нагодзе
Ад рымлян край стагнаў:
З вайною Рым прыходзіў,
Як быдла,
                ў рабства гнаў.

І вось, зірні,
                    пад Рымам —
Рабы, рабы яго.
І ўжо гаворыць з дымам
Расхрыстаны агонь.

Спусціўшы ўсе праклёны,
Скарыўшыся бядзе,
Сам-Рым, гігант стамлёны,
Да ног іх упадзе.

Той Рым, што славу зведаў,
Зачэпіць і бяда.
І будуць Рым венеды,
Як сон свой, разглядаць.

Амаль пры кожнай браме,
Хоць горад і гарыць,
Нібы сябры з сябрамі,
Рабы будуць з рабамі
Гасцінна гаварыць.

## Навіна

*Балада ўсходніх славян. II стагоддзе*

Не спяшайся ты, малеча,
І не лезь пакуль пад рукі,
Паляжы сабе ў спакоі,
Пачакай сваю пару.
Бачыш, колькі важданіны,
Колькі клопатаў, дакукі —
Працы хопіць і сякеры,
І нажышчу-касару.

Мы спачатку лес павалім,
Лес высокі, лес дрымучы,—
Хай, аблушчаны праменнем,
Сохне ён на ўсіх вятрах.
А затым агню наловім,
Дзіва-полымя прыручым —
Хай віруе, хай шчыруе
Над руплівасцю кастра.

А пасля агню такога,
Калі што і застанецца,
Дапаможа нам матыга,
Сукаватка-барана.
Бачыш, як зусім нялёгка,
Як нялёгка нам даецца
Поле новае між лесу –
Агнявая навіна.

Ну, дык дзе ты, немаўлятка?
Вунь як пушча парадзела,
Стала попелам, вуголлем,
Што агонь пасіліць змог.
Ты не бойся гэтай чорнай
Шчырыны перагарэлай:
Мякка там, пакуль не ўзяўся
Дзікай лядзінай аблог.

На далонь цяпер прасіся,
Я ў руках цябе сагрэю,
Ты патрыся аб мазолі
Сваёй ласкавай шчакой.
А пасля цябе ў зямліцу
Адпушчу – як аджалею.
Так разлучымся навекі,
Мой карміцель, мы з табой.

Дык прадзёўбвайся ж, малеча,
І расці, расці, зярнятка,
Берагчы, люляць цябе я
Буду, нібы немаўля,
Каб хутчэй ты стала хлебам,
Падарыла жніва-свята...
Будзьце ж век вы блаславёны,
Зерне,
　　　сонца
　　　　　　і зямля!

## Вадаспад

*Балада кахання. І стагоддзе*

Яны падышлі к вадаспаду,
Што пругка струменіў з гары.
– Я рады, я рады, я рады
Табою,– ён ёй гаварыў.

– Я рада, я рада, я рада,–
Яна гаварыла яму.–
Я рада усмешцы, пагляду,
Я рада дыханню твайму.

Не месца папрокам, абразам –
У пырсках вяснуе святло.
Як весела ім было разам,
Як ім ненасытна было!

О Божа, няўжо так бывае?!
Сярод прыпадунных дуброў
Свяцілася іх незямная,
Такая зямная любоў.

– Я рады, я рады, я рады,–
Нібыта хто ўслед ім казаў.
Мізэрнымі сталі ўсе звады,
Шчасліваю стала сляза.

Ён быў самы ўцешны на ўлонні,
Найсветлай была і яна.
Лавілі ласкава ў далоні
Празрысты крышталь падуна.

Яны цалаваліся ўп'яна
Між пырскаў, прамення, раслін,
І пырскі навокал каханых,
Нібы дыяменты, раслі.

Смяялася ім так ласкава
Наводдаль ад гора і зла.
Вада ім была як забава,
Вада ім за вэлюм была.

І ўсё маладое такое,
Змяшаны стагоддзі, гады.
О пырскі, вясёлкі і мроі,
О чыстае свята вады!

І думаць ніхто не жадае,
Што пырскі – ўсяго толькі зман;
То ж слёзы, якімі рыдае
Над імі гара-велікан.

І ў гэтае нават імгненне
Яны пад яго галавой
Сядзяць у яго на каленях,
Парослых імхом і травой.

Ён тоіць вякамі спакусу,
Чакае, як свята, бяды –
Чакае даўно землятрусу,
Каб разварушыцца тады.

О як бы той час абдымаўся
З любою суседняй гарой,
І як бы ён нацалаваўся
Такой землятруснай парой!

А зараз, чакаючы зменаў,
Ён толькі няўцешна ўздыхаў
І плакаў, жывы і каменны,
Што звеку вось так не кахаў.

## Пачатак

*Праславянская балада. І стагоддзе*

Схіліліся адна да адной травінкі – сцішыліся і чакаюць.

Схіліліся рознакаляровымі галоўкамі краскі – замоўклі, затаілі дыханне і чакаюць.

А над імі перапляліся кронамі дрэвы, лапкамі і галінкамі перапляліся, адагналі вятры, шумець перасталі і таксама чакаюць.

Елкі і дубы, сосны і акацыі, грабы, букі і таполі чакаюць;

Ружы і лілеі, гарлачыкі і рамонкі, васількі і званочкі чакаюць;

Траўка-мураўка і мята, віка і мацярдушка, барвенак і медуніца чакаюць:

– Ну што там?

Ляцелі непадалёку птушкі, убачылі гэтае хваляванне, падкрылялі яшчэ бліжэй, самі зацікавіліся.

Ластаўкі і жаўранкі, шпакі і сарокі, каршуны, зязюлі і вераб'і зацікавіліся.

І таксама спыталіся:

– Ну што там?

– Пакуль – нічога,– ціха адказалі ім дрэвы і зноў замоўклі.

Беглі паблізу рэчкі, вялікія і малыя беглі, хацелі паглядзець, што там робіцца, але не змаглі – берагі не пусцілі.

Таму і яны спыталіся – Дунай і Дняпро, Волга і Прыпяць, Лаба і Вісла, Влтава, Сава, Драва і Марава спыталіся:

– Ну што там?

– Пакуль – нічога,– адказалі краскі.

Побач тупацелі ў розныя бакі дарогі.

Пыльныя і камяністыя, лугавыя і горныя, лясныя, гацевыя і стэпавыя спяшаліся.

І яны хацелі зазірнуць між красак, але не змаглі – ніхто не пратаптаў і сцежачкі да таго таямнічага месца, а чакаць, пакуль пратопчуць, у іх не было часу і не хапала цярпення.

Таму і яны спыталіся:

– Ну што там?

– Пакуль – нічога,– адказалі травінкі і яшчэ шчыльней прыхінуліся адна да адной.

Беглі непаводдаль коні і каровы, алені і зайцы, казулі і ласі, мядзведзі і ваўкі.

Захацелася і ім паглядзець, чаго гэта ўсе так чакаюць.

Зрабіць такое ім прасцей, бо ў іх няма берагоў, якія не пускаюць падысці бліжэй, ім не трэба пратоптваць сцяжынкі, бо дзе яны толькі пройдуць – гэта ўжо і ёсць іх сцяжынка.

Селі яны наўкруга, усміхаюцца, быццам нешта нейкае ведаюць, падміргваюць адно аднаму, пытаюцца:

– Ну што там?

І тады расступіліся дрэвы, расхінулі свае калючыя лапкі і мяккалістыя галінкі.

І ўсе ўбачылі краскі.

І тады расхінуліся краскі – чырвоныя і блакітныя, жоўтыя і аранжавыя, белыя і ружовыя расхінуліся.

І ўсе ўбачылі траву.

І тады расхінулася трава, зялёна-зялёная, смарагдавая расхінулася, а ў ёй усе ўбачылі таго, каго так чакалі.

Звяры і жывёлы, якія сядзелі наўкруга, убачылі. Дарогі таксама ўбачылі.

Рэчкі зноў жа ўбачылі.

Птушкі, якія вярнуліся, убачылі.

Тады зямля ўздыхнула стомлена-радасна і сказала:

– Вось вам брат і таварыш, дзеці мае. Дружыце з ім і яго змушайце дружыць з вамі.

А ён, яшчэ немаўля, навародны чалавек, стаяў, як у калысцы, у зялёным гняздзечку травы, у вяночку духмяных кветак, у аздобе зялёналістых дрэў.

І да ўсіх славянскіх краёў было яму яшчэ блізка.

Працягнеш руку ў адзін бок – там ужо Расія, у другі – Югаславія, у трэці – Украіна, у чацвёрты – Балгарыя, у пяты – Беларусь, у шосты – Польшча, у сёмы – Чэхія і Славакія.

І колькі бакоў, столькі ў яго і краін было, у гэтага дзіцяняці.

Ён стаяў і гуляў з сонцам – цягаў яго, нібы за вусы, за доўгія і жоўтыя, як усё роўна залатыя, промні.

А на небасхіле ўжо збіраліся хмары.

І чуўся грукат – як водгалас барабанаў, якія аднолькава грымяць і ў часіны вялікіх радасцяў, і ў часіны яшчэ больших няшчасцяў.

Наперадзе ў яго пакуль было ўсё: радасць і нягоды, войны і вяселлі, выпрабаванні і насалода.

І яшчэ ўсё тое, пра што расказана ў гэтай кнізе...

## Развітанне

*Заключная балада*

Прабачце, даўнія стагоддзі,
Што патрывожыў я ваш пыл,
Што, абмінуўшы змрок магіл,
На веча вашае прыводзіў
Сваіх сяброў – з той далячыні,
Што светла мроілася вам,
Што вашым снілася сынам,
Як сніцца лета ў зімняй стыні.
Мы пасядзелі,
як схацелі,
Пагаварылі,
як змаглі.
Раздзьмуўшы нанава вуглі,
Ля вашых вогнішчаў папелі.
Ваш боль,
ваш сум не абміналі
І вашу радасць перайшлі...
І дні – стагоддзямі міналі,
Стагоддзі – нібы дні, прайшлі.
І вось яна,
часіна тая,
Калі развітвацца пара:
Камяк у горле – як гара,
Сляза – шчымлівая такая.
Бывайце ж, даўнія стагоддзі,
Мы зноў вяртаемся ў свой час,
Дзе над галовамі у нас,
Як радасць, сонца светла ходзіць...

# *Прытчы*

## Клетка

Кожнай сваёй клетачкаю ён адчуваў, якая цесная вязніца. У ёй нельга было павярнуцца – заржавелыя вярыгі, моцныя жалезныя пруты, быццам яны толькі і чакалі самага нязначнага руху, балюча ўпіваліся ў голае цела, круцілі, рэзалі цягліцы, сціскалі рукі – здавалася, што клетка тады яшчэ болей меншала. Хацелася закрычаць ад безвыходнасці, завыць ад бездапаможнасці, але ён разумеў, што гэта не выратуе – Той, Хто Усё Бачыць, ніколі не даруе яму і адно толькі будзе радавацца, што вінаватаму так балюча, кепска і адчайна.

Што ж, парушыў законы свайго роду – цярпі. Ці не цябе гэта папярэджвалі: «Каханне ў нас забаронена»? Ці не цябе гэта перасцерагалі: «Не пажадай жонкі бліжняга»? Ці не табе цярпліва тлумачылі: «Нам не трэба дзяцей»? А ты, не слухаючы ірадаў, адмахваўся ад іхніх перасцярог і думаў, што ўсё абыдзецца, што цябе міне тое, што не мінала іншых.

І вось – клетка...

Гэта ж добра яшчэ, што яе паставілі вось тут, на гары, а маглі б, як іншыя, скінуць у прадонне ці затапіць у вадзе – колькі такіх, парожніх ужо, клетак валяецца зараз у прадоннях ці ржавее на дне азёр: чарвякі, драпежныя рыбы павыядалі лантухі, галодныя звяры лапамі нецярпліва падаставалі па

кавалку тое, што было ў клетках, а косці, якія заставаліся пасля рыб і чарвякоў, пакрысе павымывалі хвалі, павыдзьмувалі вятры.

Дзіўна, такія пакуты трывае чалавек з-за гэтага кахання, а клетак у прадоннях і на дне азёр не меншае. Ён і сам бы, мусіць, каб давялося паўтараць жыццё, паўтарыў бы ўсё зноў, хоць ужо і ведаў бы, якія невыносна цяжкія для здаровага мужчыны вось гэтыя бездапаможнасць і цесната клеткі.

А дзе ж, на якой гары стаіць яе вязніца, бо ён не сумняваўся, быў перакананы, што каханую пакаралі таксама — Той, Хто Усё Бачыць, жанчын ненавідзіць яшчэ больш, чым мужчын. А каго, што ён любіць? Відаць, толькі сваю ўладу над усімі людзьмі іхняга роду, ад якой сам аж п'янее.

Ён не ведаў, дзе паставілі клетку з яго любаю, але інстынкт падказваў яму, што яна недзе вунь у тым баку — там, дзе ўзыходзіць сонца: за дрымучымі лясамі, за багністымі балотамі, за глыбокімі цяснінамі. Дайсці туды не дойдзеш, туды можна толькі даляцець.

Дзе ўзяць яму крылы?!

І ён з журбою ўгледзеўся ў той бок, дзе была, як яму здавалася, Любча.

Дзьмуў халодны вецер — на вяршынях яны заўсёды халодныя і пранізлівыя; гэта ў лагчынах вятры бываюць цёплыя і ласкавыя, і як радасна там, калі яны дакранаюцца пяшчотнаю хваляю да разгарачанага твару.

Ён адчуваў, што пачынае стыць і сінець на гэтым сіберным ветры. І раптам вецер здаўся яму зусім цёплым, нават пяшчотным — ён дзьмуў, падалося, якраз з таго боку, дзе стаяла клетка з каханаю, і яму прымроілася, што наяве чуе панадны, неадольны, як мускус ці амбра, пах яе валасоў — такі забыты і такі жаданы. Ноздры яго па-звярынаму расшырыліся, ён прагна хапаў імі гэты вяршынны вецер і радаваўся яму.

Нібыта і напраўду ўбачыў Каханую: яе замутнелыя ад ласкі вочы, яе вільготныя, пульхныя, растуленыя для пацалунка вусны, яе найпрыгажэйшыя ў свеце грудочкі, якія так даверліва, так ласкава, як птушаняткі, торкаліся сваімі дзюбачкамі насустрач яго далоням...

Ён і зараз хацеў да яе.

Як выйсці з гэтай ненавіснай клеткі, каб увесь той цуд, які дакрануўся яго толькі аднойчы, паўтарыўся зноў?! Ён згодзен потым вярнуцца сюды, у гэтую клетку, назаўсёды, адно толькі б яшчэ раз адчуць, як знікае свет, а сам ты правальваешся некуды, перастаеш існаваць, і ад цябе застаецца толькі нейкае невыразнае ружовае воблака шчасця і насалоды, воблака забыцця. Цікава, куды, знікшы, дзяваецца на тую хвілю чалавек?

Зразумеўшы, што пазнаны цуд для яго ніколі ўжо не паўторыцца, што з клеткі яму не выйсці, ён і напраўду завыў паваўчынаму і ўсім сваім целам абсунуўся на жалезныя пруты — наколькі яны дазвалялі абсунуцца.

І раптам аж падскочыў ад нейкай яшчэ неўсвядомленай радасці: нага яго намацала нешта халоднае і круглае — пад падэшваю была гайка!

Канечне, радасць была дачаснай — што там значыць адна звычайная гайка ў гэтай рупліва выштукаванай вязніцы, але ўсё ж яна давала хоць нейкую невялікую надзею. Гэта ж як у тым красвордзе — часам бывае дастаткова адгадаць адно слова, каб лёгка затым разблытаць увесь красворд. Лёгкасці ў яго, ён разумеў, не будзе, але ўсё ж учапіўся і за такую надзею. Самае галоўнае зараз парушыць моц, стабільнасць клеткі, расхістаць яе ўстойлівасць. А пасля яна і сама пачне развальвацца: хутчэй за ўсё гэтаю гайкаю клетка якраз прыкручана да скалы.

Ён паспрабаваў яшчэ ніжэй, чым толькі што, абсунуцца ў клетцы, каб дастаць да гайкі рукамі, але не змог — клетка, нібы сарочка, была скляпаная якраз на яго цела, на яго памер, ад рухаў яна, здавалася, стала яшчэ цяснейшай, сціскала яшчэ мацней. Абдзіраючы аб пруты рукі, ён спрабаваў усё ж дацягнуцца да гайкі, але, калі ўбачыў, што гэта не атрымаецца, бездапаможна апусціў галаву і сцішыўся.

Нага ўсё яшчэ трымала пад сабою гайку, нібыта баялася, што згубіць яе і тады не знойдзе наноў, ці то, накрываючы, хавала ад іншых — каб ніхто не змог адабраць.

Ад хвалявання пальцы спацелі, гайка нагрэлася, і яна ўжо зараз не так халадзіла нагу.

І раптам вялікі палец на назе міжволі, сам па сабе, намацаўшы рубежык на гайцы, пачаў тоўхаць у яго – спачатку паволі, а потым усё мацней і мацней. Але гайка не паддавалася, не адкручвалася,– скрануць яе з месца было немагчыма.

Тады ён абхапіў мутэрка двума вялікімі пальцамі на нагах, заціснуў між імі жалеза як наймацней і паспрабаваў круціць наноў. Рабіць гэта яму было нязручна, але не вельмі цяжка, бо ён, удыхнуўшы напоўніцу паветра, мог павіснуць на рэбрах клеткі, зусім вызваліўшы для працы ногі.

Аднак гайка ўсё роўна не паддавалася.

Жалеза моцнае, але цярпенне і настойлівасць чалавечыя яшчэ мацнейшыя.

Зараз і час і прастора зніклі для яго. Вецер знік. Холад знік. Душа знікла. А можа, яна перакінулася ў гайку, бо менавіта ў гайцы зараз засяродзілася для яго ўсё – і час, і прастора, і душа.

Ніхто не ведае, колькі ён працаваў – некалькі дзён ці некалькі стагоддзяў,– а хто ж будзе ведаць, калі ён сам гэтага не разумеў і не помніў.

І нарэшце не вытрымала жалеза – гайка скранулася з месца. Ад радасці ён, не выпускаючы гайку з пальцаў, пачаў круціцца з ёю ў клетцы, не адчуваючы, не звяртаючы ўвагі на тое, як да крыві раздзіраюць яго цела жалезныя пруты.

Працаваў ён, як кажуць, знімагі, але праца пасоўвалася вельмі марудна.

І ўжо, калі амаль адкруціў гайку, калі ўжо заставалася зусім мала, каб яна саскочыла са шруба і пакацілася па падлозе клеткі, ён раптам адчуў, што пальцы чамусьці саслізгваюць з гайкі. Угнуўшы галаву – наколькі дазволіла цесната,– зірнуў на свае ногі і жахнуўся: увачавідкі яго пальцы пакрываліся рагавіцаю, ператвараліся ў шурпатыя, нязграбныя кіпцюры, а ногі ўсё танелі і танелі, спадабляючыся птушыным.

О, вар'ят, ты і напраўду паверыў, што Той, Хто Усё Бачыць, дазволіць табе вызваліцца з клеткі?!

Кіпцюры слізгалі па гайцы, і зараз ужо і думаць было недарэчна, што імі нешта можна адкруціць.

Але ж у яго ёсць рукі! Ён паспрабаваў падняць іх угору, аднак гэта яму не ўдалося. Тады Пакараны, выкручваючы далоні, ухапіўся абедзвюма рукамі за пруты вязніцы, сціснуў іх, ды так моцна, што аж пабялелі пальцы, і пачаў расхістваць клетку ў бакі. Але яна стаяла моцна – нават і не думала скранацца з месца.

І зноў жа прайшло невядома колькі часу – можа, гады, а можа, стагоддзі.

Устойлівасць і напраўду моцная, але настойлівасць, канечне ж, мацнейшая за яе: клетка нарэшце захісталася – спачатку ціха, паволі, ледзь заўважна, а пасля ўсё шырэй і шырэй. Неўзабаве яна ўжо была ў такой вібрацыі, што, здавалася, нават ён сам, каб і захацеў, не змог бы нічога змяніць. Гайку, аказваецца, ён адкруціў да канца, і толькі не хапіла маленькага руху, каб яна скацілася са шруба. Зараз мутэрка звалілася доле, выкацілася з клеткі, заскакала па камянях і паляцела ў прадонне.

Ён апантана, нібы мядзведзь у звярынцы, трос і хістаў клетку. Яна рыпела, скрыгатала, вібрыравала, пакуль нарэшце не грымнулася вобземлю – на другі бок ад прадоння – рэха, здаецца, пакацілася па ўсім наваколлі, пераскокваючы з вяршыні на вяршыню.

Ён быў упэўнены, што гэтае рэха пачула і Яна.

Клетка ляжала на баку. І ў ёй нязручна ляжаў ён сам – так яму было яшчэ горай, чым стаяць.

Пакараны паспрабаваў вызваліць рукі, каб лаўчэй узяцца за пруты, паспрабаваў паварушыць імі і не змог – замест рук у яго бездапаможна матляліся ля плячэй маленькія, як кульцяпкі, крылы – голенькія і неапераныя, нібы ў птушаняткa, якое толькі што вылупілася з яйка.

Той, Хто Усё Бачыць, адабраў у яго і рукі.

Але крылы раслі. Яны ўсё большалі і большалі, запаўняючы сабою ўсю прастору, якая яшчэ аставалася каля яго. У клетцы зрабілася зусім цесна – немагчыма было нават дыхаць, нібыта крылы якраз і раслі для таго, каб толькі задушыць яго.

Ён ляжаў на баку, і адно крыло было якраз пад ім: яно расло, нібы знарок сцелючыся пад яго, каб яму не было мулка ляжаць на жалезных прутах. Другое нібы накрывала зверху.

Паступова ён пачаў выпростваць верхняе крыло. Гэта было цяжка – пер'е чаплялася за пруты, тапырылася, камячылася, але ўсё ж удалося прасунуць кончык крыла паміж прутамі. Хоць яму і балела каля пляча, там, адкуль расло гэтае новае дзіва, ён усё ж не спяшаючыся, патроху высоўваў крыло за клетку – усё далей і далей. Пер'е трашчала, выскубалася, падала на скалы і, падхопленае ветрам, кружыла над цяснінамі. Але ён не звяртаў на гэта аніякай увагі: ёсць такая магчымасць, няхай хоць адно крыло пабудзе на волі!

Калі ён высунуў усё крыло за клетку і сам, каб нішто не замінала яму, аж прыціснуўся плячом да прутоў, здзівіўся, убачыўшы, якое яно вялікае. Паспрабаваў узмахнуць ім і ўзрадаваўся: крыло было тугое і моцнае, кожны яго ўзмах аж падымаў клетку. Тады ён пачаў ім, як веерам, махаць часцей, падграбаючы пад пер'е больш паветра. Ён памагаў крылу ўсім целам, і нарэшце яго намаганні падаравалі радасць – клетка, пагрукаўшы прутамі аб каменне, усё-такі ўзнялася і стала на сваю ж аснову – як і стаяла да гэтага.

Дык чаму радавацца? Ён усяго толькі вярнуўся да таго, з чаго пачынаў: на скале стаіць моцная клетка, а ў гэтай клетцы закратаваны ён.

Але ж зараз ён ужо мае крылы!

Другое крыло вызваліў і прасунуў між прутамі клеткі хутчэй і прасцей – вопыт, хоць і горкі, быў зараз яго памочнікам і дарадцаю.

Узмахнуў абодвума крыламі – якой цацачнаю здалася між імі клетка! – і адчуў, што вось зараз паляціць. І нават паверыў у гэта, і ўзрадаваўся гэтаму – нейкая пяшчотная-пяшчотная хваля нібы пагладзіла сэрца,– але тут жа засмуціўся, успомніўшы Таго, Хто Усё Бачыць: наіўны, хіба ён дазволіць табе паляцець?!

Хоць і сам Пакараны не з тых, хто баіцца ківу, аднак усё ж разумеў, што з могучамі змагацца марна. Тым больш чакаць ад іх спагады.

Валадар жа, здавалася, быў абыякавы да яго – нібыта і не сачыў за ім, нібыта ўжо даў вінаватаму волю: рабі што хочаш.

І ўсё ж закуты, глыбока ўдыхнуўшы паветра, вольна і шырока ўзмахнуў крыламі. Клетка заскрыгатала, але не адарвалася пакуль што ад камення: з другога боку яна была моцна прыкута да скалы. Пакараны сабраў усе свае астатнія сілы — верхнія пруты ўрэзаліся яму ў плечы,— замахаў крыламі мацней, настойлівей.

Паветра спрасаваў тонкі, трывожны і жудаваты гук — так звычайна звініць напятая струна перад тым, як парвацца.

Унізе нешта зарыпела, затрашчала, загрымела, і ён сам не заўважыў, як апынуўся ў небе.

Клетка адарвалася разам з кавалкам скалы, і з яе зараз сыпаліся, атрасаліся ў прадонне каменне, цвікі, выдраны з жывым цэмент, ашчэпкі дошак, гайкі і шрубы.

Ён ляцеў над непраходнымі лясамі, ён спяшаўся над непралазнымі балотамі, ён лунаў над змрочнымі цяснінамі, і яму здавалася, што сэрца разарвецца ад гэтай радасці, ад гэтай волі, ад гэтага палёту: неўзабаве ён убачыць Яе.

Ну і што, што яна ў клетцы таксама, ну і што, што яны не змогуць быць разам — хіба можна аб'яднаць у адну дзве асобныя клеткі?! Затое ён будзе неўзабаве бачыць яе, чуць яе голас, дакранацца да яе...

Злітасцівіўся над ім усё ж Той, Хто Усё Бачыць, зразумеў, мусіць, што ніякай яго віны няма: якая ж, ці чуеце, віна — кахаць? Гэта ж тое самае, што і проста дыхаць паветрам, проста жыць.

Ляцець доўга, але калі ляціш з радасцю і надзеяй, гэта заўсёды коратка.

Кахаць у клетцы, магчыма, насалода, калі сустрэча толькі мроіцца, але яшчэ большая насалода, калі яна ўжо, як ява, зусім блізка.

Колькі ён ляцеў, ніхто не ведае — можа, дзень, а можа, зноў жа стагоддзе.

Але нарэшце ён убачыў такую ж, як і яго, скалу, а на ёй цёмную кропку. І душою адчуў, што гэта яна, яго каханая. Стомленыя крылы зноў падужэлі, замахалі мацней, нецярплівей, настойліва махалі ад таго часу, пакуль нарэшце не паставілі сваю клетку побач з клеткаю каханай.

Яна спалохалася. Адхінулася, наколькі можна было, ад пярэдніх прутоў і вачыма, поўнымі жаху, глядзела на яго.

– Любча, не пазнаеш? То ж я, Сінявок,– спрабаваў ён сказаць каханай, але яна як усё роўна не чула яго і тымі ж спалоханымі вачыма пазірала ў клетку.

Яму здалося, што Каханая штосьці спрабуе засланіць нагамі. Прыгледзеўся і ўбачыў, што засланяе яна дзіця, якое поўзае па падлозе клеткі.

– Любча! Гэта ж мой сын! – забулькатала ў яго ў горле, і ён прасунуў крыло ў іхнюю клетку, каб пагладзіць малое,– колькі пяшчоты было зараз у Сінявока да іх абаіх. Але Каханая ў жаху ўціскалася ў пруты, каб гэтае крыло не дастала яе і сына.

– Дай лапушухны, сынок,– папрасіў ён.

Але яго і зараз ці то не пачулі, ці то не зразумелі.

Дзіця ж, мусіць, інстынктыўна працягнула ў яго бок ручаняты. І той жа час маці спалохана закрычала:

– Сынок, асцерагайся! Гэтая вялізная драпежная птушка задзярэ нас з табою!

Яна не пазнала яго.

– Я не птушка. Я Сінявок, твой каханы,– зноў, спрабуючы ўсё растлумачыць, што ёсць сілы закрычаў ён, але Любча яшчэ ў большым жаху адхіснулася ад яго другога крыла, якім Сінявок хацеў пагладзіць яе.

Ён зірнуў на свае кіпці, зірнуў на свае крылы, убачыў сваю дзюбу і тады ўсё зразумеў: не, ён для яе проста птушка. Вялізная, невядомая і страшная птушка. І тое, што ён гаворыць да іх, яны таксама не разумеюць: птушынай мовы людзі не ведаюць, а чалавечая не атрымліваецца ў яго.

Дзіцячыя ручкі цягнуліся да травіны за клеткаю. Дык вось куды малое цягнулася! Не да яго, а да травы!

Дзіця дастала травіну, сарвала яе і панесла ў рот...

Сэрца сціснулася ад болю і жалю. Яго сын есць траву! О Божа! О Той, Хто Усё Бачыць! Не нада мною злітуйся, над бедным дзіцём злітуйся! За што яно пакутуе, дзіця, народжанае па каханні, ад кахання і для кахання?!

У расчуленні і замілаванасці ён крылом прыгнуў некалькі травінак да клеткі, але малое спалохана ўбрала ручку за пруты і само схавалася за матчыны ногі.

Ён адчуў, як знібее, трымціць і плача ад жалю сэрца. Божа мой! Яго баіцца роднае дзіця! Ён не можа памагчы роднаму сыну!

Яму захацелася тут жа паляцець, нарваць самай сакавітай травы, назбіраць самых спелых ягад, натрэсці дзікіх яблык і ўсё гэта прынесці малому і пакласці ў клетку. Але чым нарвеш? Чым назбіраеш? Крыламі? Кіпцямі? Як чым? Дзюбаю! Але навошта? Сыну нельга расці – удваіх у адной цеснай клетцы яны не памесяцца.

Яго вынослівасць скінецца бядою.

Яго юнацтва знішчыць яго сталасць.

Яго здароўе задушыць і самога сябе, і маці таксама...

Ён спяшаўся ад вялікіх пакут, а прыляцеў на яшчэ большыя пакуты.

Зразумеў, што лепей было б стаяць там, на сваёй скале, і нічога не ведаць пра сына – проста марыць удалечыні пра Каханую, успамінаць пра яе цнатлівыя драбніцы,– чым вось так мучыцца, перажываць, бачачы яе спалох, і злавацца на сваю бездапаможнасць.

Пакуты, пакуты... Вечныя пакуты... Жыве чалавек у пакутах і памірае з імі ж.

І тут зусім побач нехта зарагатаў.

І тады Сінявок зразумеў, што гэта Той, Хто Усё Бачыць, асудзіў яго вось на такія, яшчэ большыя, садысцкія пакуты. Ці не ён гэта ўсё прыдумаў, бо навошта ж тады яшчэ, калі не для гэтых пакут, Валадар так лёгка дазволіў яму ўзляцець і пакінуць сваю зненавідную скалу, якая адсюль ужо бачыцца як паратунак: толькі б стаяць на ёй у клетцы і нікуды не ляцець.

Зараз ён яшчэ больш ненавідзеў Таго, Хто Усё Бачыць.

Закапаў дождж. Ён імкліва, туга, як парасон, з шумам і лопатам раскрыў адно крыло і беражна накрыў ім клетку з жонкаю і сынам – няхай прывыкаюць і да крыла, і да яго самога.

А сам задумаўся.

Калі ёсць пакуты, трэба, каб было і выйсце з іх.

Калі ёсць тупік, трэба, каб і сцежка ад яго нарадзілася.

Птушка задумалася. Не зважаючы на дождж, які ліў як з вядра, мокрая і нашатыраная, бездапаможная і рашучая, яна думала... Не будзем і мы замінаць ёй – няхай думае...

## Як спакайней?

Яго паклікалі першы раз. З-за стала падняўся высокі, малады яшчэ і, здаецца, зычлівы чалавек у строгай форме, падаў сваю надзіва цёплую руку і сказаў:

– Слухайце, у нас тут неспакойна, страляюць. Вазьміце, калі ласка, зброю.

І паказаў вачыма на наган, які ляжаў на паперыне,– відаць, гэта была загадзя падрыхтаваная распіска, дзе трэба было толькі паставіць свой подпіс.

– Навошта мне зброя? – спытаўся запрошаны.

– Ведаеце, з ёю вам будзе спакайней. Наган – сябра чалавека. Большы нават сябра, чым сабака. Абароніць ад любога. Усяго толькі націсніце курок, і вы яшчэ не паспееце пачуць стрэлу, вораг ужо забіты. А бандытаў, ворагаў у нас, самі ведаеце, многа.

Той, каго запрасілі, быў доктар. І для яго людзі дзяліліся не на сяброў і ворагаў, бандытаў і небандытаў, а на хворых і здаровых. Ды і асноўным сэнсам яго працы было лячыць, ратаваць ад смерці чалавека, а не забіваць яго. Якая розніца, хто хворы – вораг альбо не вораг?! Хворага, параненага трэба спачатку вылечыць, а потым ужо, калі ён вінаваты, судзіць. Ён яшчэ ў інстытуце кляўся быць верным гэтаму прынцыпу. І парушыць сваю клятву доктар не мог.

– Не, наган мне не трэба. Ён не паможа ў маёй працы,– рашуча адмовіўся доктар.

– Як гэта не паможа? – шчыра здзівіўся той, хто запрасіў.– Усім дапамагае, а вам не паможа?

– Мае ворагі – мікробы, бацылы, вірусы. Як я па іх буду страляць? І колькі патронаў трэба, каб іх усіх зжыць са свету?

Іх жа мільярды. І куды, скажыце, цэліцца, каб забіць сухоты? Каб забіць язву страўніка? Каб хоць параніць самага страшнага бандыта – рак? Можа, вы мне падкажаце?

Чалавек у форме быў не дурны, разумеў, што з яго здзекуюцца, але стрымаў сябе – бачыце, і на раённым узроўні сярод пазначаных уладаю ёсць дастойныя людзі! – і гаварыў да доктара вельмі спакойна, нават сяброўскім тонам:

– Але ж вы да хворых ездзіце і ходзіце ў самыя далёкія вёскі. Ходзіце адзін. Гэта ж добра, калі па вас фурманку прышлюць ды вазак добрай сілы пападзецца. А край жа наш пушчанскі. Навакол – пушча: і там, і там, і там. Лясы несхадзімыя. Перастрэнуць бандыты, заб'юць, дык і канцоў ніхто ніякіх нідзе не знойдзе.

– А навошта ім забіваць доктара? Яны ж разумеюць, што, забіўшы доктара, забіваюць і тых хворых, якіх ён лечыць.

– Глядзіце, глядзіце самі, але ж...

Шчыра кажучы, ён і сам баяўся хадзіць па цёмных пушчанскіх дарогах і сцежках у гэты неспакойны час. Аднак і браць наган у энергічнага маладога чалавека яму чамусьці вельмі не хацелася. Ды і дзе яго насіць? Хіба ў дыпламаце, дзе ляжаць усе медыцынскія прылады?

– Не, наган мне не патрэбны. Мая зброя заўсёды са мною,– і доктар раскрыў дыпламат, у якім былі акуратна складзены стэтаскопы, шпрыцы, прыбор для вымярэння ціску крыві і іншыя патрэбныя доктару рэчы.

– Глядзіце самі, але я раіў бы вам усё ж добра падумаць,– незадаволена развітаўся чалавек у строгай форме і падаў, як здалося доктару, ужо зусім халодную руку.

Вяртаўся ён у вёску, дзе знаходзіўся яго фельчарска-акушэрскі пункт, і ўсё думаў, чаму з такою настойлівасцю соваў яму ў рукі наган чалавек у строгай форме?

Дарога зноў жа ішла праз густы і цёмны лес, але ён, як заўсёды, супакойваў сябе, стараўся не думаць пра небяспеку.

Аднак у самай глыбіні пушчы яго перастрэлі трое ўзброеных бандытаў.

– Зброя ёсць? – строга спытаўся адзін з іх, мусіць, старшы.

— Нічога ў мяне няма.

Старшы падазрона зірнуў на яго і загадаў хаўруснікам:

— Абшукаць!

Шукалі яны вельмі ўважліва, перамацваючы кожны рубчык адзення, быццам у рубчыку можна схаваць тую зброю, а ён радаваўся, дзякаваў Богу і сабе за тое, што адмовіўся, што не ўзяў у раёне наган — усё роўна б во зараз знайшлі, ды і як бы ён страляў з таго нагана ў трох адразу? Яны вырвалі з яго рук дыпламат, вывернулі ўсё, што было ў ім, на дарогу, у пыл.

— Няма,— расчаравана сказалі хаўруснікі.

— Не можа гэтага быць,— раззлаваўся старшы.— Няма, значыць, дрэнна шукалі. Абшукаць зноў!

Але і пасля другога вобыску яны нічога не знайшлі — як можна знайсці тое, чаго няма?

— Вось што,— са злосцю сказаў старшы,— матай адсюль. Ты нас не бачыў, і мы цябе таксама. Але калі толькі недзе вякнеш, раскажаш пра нашу сустрэчу, крыўдзіся на самога сябе... Зразумеў?

І хутка зніклі за дрэвамі. Ён пасабраў з дарогі прылады — падумаў, што трэба будзе, як толькі вернецца дамоў, іх перакіпяціць нанова,— выграб з пылу ампулы з лякарствам, каробачкі з таблеткамі, усыпаў усё гэта, зноў склаў у дыпламат і паціху, не баючыся нічога, пайшоў пушчанскаю дарогаю — а чаго яму яшчэ баяцца цяпер, калі тое, што ўсіх палохае, ужо адбылося: ён сустрэўся з бандытамі...

Праз нейкі час яго і другі раз выклікалі ў раён. Той жа малады чалавек у строгай форме гэтак жа прыветліва ўстаў з-за стала і зычліва паціснуў яму руку. Яго далонь і на гэты раз была надзіва гарачаю — здавалася нават, што ў чалавека высокая тэмпература.

Але сёння ўжо малады чалавек у строгай форме гаварыў з ім неяк паблажліва, і тон яго размовы быў павучальны, нават бацькоўскі — нібыта ён быў стары, мудры і вопытны, а ўвесь белы ад сівіны доктар — усяго толькі някемлівы хлапчук, які нічога не разумее і якога трэба выхоўваць ды выхоўваць, ставіць абедзвюма нагамі на правільны шлях.

— Вось вы ўсё ўпарцiцеся i ўпарцiцеся, не хочаце браць наган. Ды зразумейце ж вы ўрэшце, што гэта для вашай жа карысці. Я хачу, каб вам было спакойна.

— А мне спакайней без нагана,— супраціўляўся доктар.— Зброя — гэта заўсёды як громаадвод: яна прыцягвае да сябе зброю. Разумееце, куля шукае кулю...

Ён бачыў, што чалавек у форме нічога не слухае і не разумее — яго турбуе толькі адзін клопат: як усучыць яму гэты злашчасны наган. Па вачах было відаць, што адна гэтая думка свідруе яго мозг, шукае нейкае выйсце.

— Але ж куля і абароніць ад кулі. Я чуў, што вас ужо пераймалі ў пушчы бандыты. А каб у вас быў наган...

Яго ўразілі, скаланулі гэтыя словы.

— Чулі, кажаце? — перапытаў ён.

Пра тое здарэнне ў пушчы ён нікому не расказваў. Да таго ж ніхто не бачыў, як яго на дарозе перастрэлі бандыты...

Хто ж расказаў пра сустрэчу і вобыск?!

Не маглі ж прыйсці ў раён самі бандыты і прызнацца чалавеку ў строгай форме: «Мы злавілі ў пушчы доктара і абшукалі яго!»

— Чулі? — паўтарыў ён.— Скажыце, калі ласка, адкуль вы ведаеце, што мяне пераймалі ў пушчы?

Малады чалавек схамянуўся, зразумеў, што сказаў нешта лішняе, але тут жа ўзяў сябе ў рукі і неяк загадкава, намякаючы на тое, што не пра ўсё ён можа гаварыць з доктарам, адказаў:

— Мы ўсё ведаем. Але справа не ў гэтым. Мы проста рупімся пра вашу бяспеку. А з наганам — вы як у бога за пазухай. Зразумелі? Дык вось распішыцеся во тут і забірайце наган,— і пальцам падсунуў яму распіску.

Але наган і на гэты раз ён не ўзяў — здагадваўся, падсвядома адчуваў, што бандыты пяроймуць яго ў пушчы і сёння.

Так яно і было.

Яшчэ здалёку заўважыў, што на тым жа самым месцы ў пушчы стаяць трое ўзброеных людзей і, канечне ж, чакаюць яго.

— А, стары знаёмы,— яшчэ не даўшы яму падысці, сказаў старшы.— А сёння ты ўзброіўся?

— Не,— падышоўшы да бандытаў бліжэй, спакойна адказаў доктар.— Я ж вам ужо казаў, што зброя доктару не патрэбна: ён лечыць людзей, а не забівае іх.

— Абшукаць! — загадаў старшы.

Зараз ужо чалавек быў зусім спакойны — прывык да рабаўнікоў, ці што?! Ціха стаяў, паслухмяна падымаў рукі, пакуль яго абшуквалі, спакойна глядзеў, як вытрасаюць у пыл усё з дыпламата, толькі злаваўся, што будзе яму лішняя работа — кіпяціць шпрыцы зноў.

— Няма,— разгублена паведамілі старшаму хаўруснікі, усё яшчэ гледзячы сабе пад ногі, у пыл, быццам спадзеючыся ўбачыць у апошні момант тое, чаго шукалі і да гэтага часу не знайшлі.

— Упарты, аднак, ядрона вош! — нібы сам сабе, зазначыў старшы і, крыху падумаўшы, загадаў: — Плыві адсюль і помні нашы словы, што сказалі табе першы раз. Ведай, язык твой, калі будзе доўгі, можа пацалавацца з куляю.

Доктар прамаўчаў. Зноў згроб усё вытрасенае ў дыпламат і паволі пайшоў па дарозе далей.

Па ім стрэлілі — пэўна, каб папалохаць. Стралялі, мусіць, вышэй галавы, бо ён толькі ўбачыў, як наперадзе зашамацелі, зашасталі, нібы ад дажджу ці ад граду, кусты, як пасыпалася адсечанае кулямі лісце.

Ён не азірнуўся. Ішоў спакойна і чамусьці без страху — заб'юць дык заб'юць.

Але болей бандыты па ім не стралялі.

Яго паклікалі ў раён і трэці раз.

Малады чалавек у строгай форме быў ужо не такі прыветлівы, але затое яшчэ больш настойлівы.

— Ніяк не зразумею вас, доктар. Мы тут так клапоцімся пра ваша жыццё, думаем, каб вам было спакойна, а вы ўпарціцеся. Ды зразумейце ж вы, што з наганам вы кум каралю. Ніякая пушча вам не страшная!

— Ну добра, вось вазьму я ваш наган. А калі я яго згублю. Што мне за гэта будзе?

— Не магу вас нічым суцешыць,— шчыра прызнаўся чалавек у строгай форме.— Самі ведаеце, што...

І паклаў перад ім крыж-накрыж свае пальцы, а каб доктару было яшчэ болей зразумела, дадаў:

— Турма.

— А калі ў мяне яго адбяруць?

Малады чалавек разрагатаўся:

— Не смяшыце мяне! Як гэта можна ва ўзброенага чалавека адабраць наган? Ён жа зараджаны і страляе. Той, хто ўздумае такое зрабіць, рызыкуе жыццём. Аддаваць жыццё за наган? Які дурань пойдзе на такое?! Мёртваму ж наган ужо не спатрэбіцца...

— Але ўсё ж, калі адбяруць, што мне будзе?

— Таксама турма,— не задумваючыся, адказаў малады чалавек.

— Дык а навошта мне тады здаўся гэты ваш наган, калі за яго мяне ўсё роўна пасадзяць?! — узлаваўся доктар і рашуча змахнуў рукою зброю — наган з грукатам бразнуўся на падлогу.— Сам бяры і насі, смаркач! Дзе хочаш і куды хочаш!

І, грукнуўшы дзвярыма, выйшаў з кабінета. Думаў, будуць лавіць, вязаць, але даганяць яго ніхто не стаў — мусіць, малады чалавек на нешта яшчэ спадзяваўся.

У пушчы доктара сустрэлі ўсё тыя ж узброеныя бандыты.

— Абшукаць! — без лішніх слоў загадаў старшы.

Калі хаўруснікі, якія абмацвалі яго, разгублена развялі рукамі, старшы не на жарт раззлаваўся:

— І на гэты раз не ўзяў, сволач!

Падумаўшы, старшы спытаўся ў іншых:

— Што будзем з ім рабіць?

— У расход,— у адзін голас адказалі двое.

— Ага, расстраляем, але з выдумкай. Вось у мяне зброя, якую ты не хочаш браць, а ў цябе — твая зброя, у якую ты верыш,— і старшы паказаў наганам на яго дыпламат.— Значыць, страляемся мы з табою на роўных, на дуэлі — твая зброя, мая зброя. У мяне ў нагане адзін патрон. Пераможаш гэты патрон — жыві, памрэш — туды табе і дарога. Абараняйся, доктар! — крыкнуў ён і стрэліў амаль ва ўпор.

Але ўсё ж доктар паспеў засланіцца дыпламатам. Куля, прабіўшы вечка, ударылася ў штосьці жалезнае, можа, у стэтаскоп, зрыкашэціла і толькі чыркнула яму па плячы.

— Значыць, твая зброя мацнейшая,— разгублена сказаў старшы і, нібыта і яму самому не хацелася забіваць доктара, загадаў падначаленым: — Няхай жыве. Пайшлі!

І бандыты зніклі за дрэвамі.

Доктар ішоў дадому, і да яго свядомасці, прастрэленай, здаецца, навылёт, зараз выразна даходзіла, што малады чалавек у строгай форме, які так настойліва соваў яму ў рукі наган, канечне ж, быў заадно з бандытамі і вось такім чынам хацеў памагчы ім зброяю.

І яшчэ нібыта абуджаны стрэлам — да сёння яму здавалася, што ўсё гэта адбываецца не з ім, а з кімсьці іншым,— зразумеў, што не было б у яго ні другога, ні трэцяга разу, калі б у той свой першы прыход у раён згадзіўся ўзяць наган.

## Дарога

Ён стаяў, глядзеў на ўсе вочы і шчыра зайздросціў людзям, што ехалі па шашы.

Каля яго з шумам і форсам, фанабэрліва пафыркваючы, праносіліся перапоўненыя грузавікі і аўтобусы, лімузіны і матацыклы, легкавыя аўтамашыны і трактары з прычэпамі. Нават ваенныя «студэбекеры» — і адкуль яны толькі ўзяліся сёння! — і нашы пасляваенныя трохтонкі, як новыя, паспешліва, жвава газавалі між усімі. Нават іхняя ўжо крыху абшалушаная фарба і несамавіты выгляд на фоне бліскучых, новенькіх «вольваў», «мерседэсаў» і «таёт» ніколькі не заміналі святочнаму настрою, а, наадварот, падкрэслівалі масавасць свята — туды едуць усе.

Людзі, якія ехалі на прыбраных машынах, умаеных і абвітых дзеразою, таксама былі святочныя, радасныя і ўзбуджаныя. Развяваліся на ветры шматкалёрныя жаночыя сукенкі, у кузавах і прычэпах між сцягоў сядзелі ўрачыстыя, як у прэзідыуме, мужчыны ў чорных строгіх пінжаках з шырокімі латамі ордэнскіх планак, дурэлі дзеці — дзецям што, ім абы куды-небудзь ехаць...

І ў аўтобусах было шумна і весела, тамігралі гармонікі, бухалі бубны, пілікалі скрыпкі, спявалі шчаслівыя людзі. Некаторыя нават спрабавалі скакаць – у кузавах машын і ў трактарных прычэпах.

Там стаялі на нагах, ні за што не трымаючыся, задаволеныя, нібы на падпітку, музыкі і над галовамі тых, хто сядзеў, шырока расцягвалі мяхі гармонікаў – было нават дзіўна, як яны, калі машыны прытарможвалі, не падалі і не перапынялі мелодыі.

Людзі былі шчаслівыя, што нарэшце яны едуць, і ў нецярплівасці, нават у нейкай эйфарыі прыспешвалі машыны – мы едзем, едзем, едзем, хутчэй, хутчэй, хутчэй...

Машыны, нібы дражнячыся, прытарможвалі каля яго, але тут жа, уключыўшы большую хуткасць, зрываліся з месца і весела кацілі далей, пакідаючы яму толькі воблака дыму, пылу, чаду і смуроду.

Людзі, таксама, мусіць, дражнячыся, махалі яму галовамі, вабілі пальцамі, запрашалі ў кузавы, падавалі нават рукі.

– Чапляйся! Паехалі з намі!

Але ён стаяў і толькі пацiскаў плячыма – навошта? куды?

Хоць яму і самому ўжо было цікава: куды ж гэта ўсе, такія шчаслівыя і радасныя, узнёслыя і святочныя, едуць і што там урэшце за рай такі, што адтуль ніхто не вяртаецца назад? Дарога гэтая і рух на ёй быў толькі ў адзін бок, а паколькі нікому – ніводнаму чалавеку і ніводнай машыне – не захацелася вярнуцца назад, там і напраўду, мусіць, не жыццё, а суцэльнае свята.

Зараз ён ужо асмялеў і пытаўся ў людзей сам:

– А куды ж вы едзеце?

– На кірмаш! – крычалі яму з адных машын.

– У светлую будучыню! – дадавалі з другіх.

Цікава, раней мы будавалі светлую будучыню толькі для нашчадкаў, а зараз, аказваецца, туды ўжо можна ехаць і самім?

Гэта яго, шчыра кажучы, трохі здзіўляла і насцярожвала. Хіба можна ў светлую будучыню ехаць вось так улегцы – без рэчаў, без багажу, лёгка апранутым: ускінуў на плечы пінжак –

і паехаў? У тую ж будучыню едзеш не на дзень ці два, а назаўсёды. Як жа можна так абыякава, безадказна адносіцца да паездкі?

А з машын яму тлумачылі:

— Нам сказалі з сабою нічога не браць. Усё там будзе! Там жа рай для ўсіх!

Ну, добра, у светлай будучыні ўсё будзе. Але ж і на кірмаш з голымі рукамі не едуць. Там жа трэба нешта прадаваць. Няўжо ўсе збіраюцца толькі купляць?

І ўсё ж, не зважаючы на сумненні, яму і самому закарцела ехаць разам з гэтымі людзьмі, разам з імі радавацца, весяліцца і спяваць. Аднак калі раней, дражнячыся, незнаёмаму чалавеку падавалі рукі, то цяпер, убачыўшы, што ён усур'ёз збіраецца залезці да іх у кузаў, людзі адварочваліся, круцілі ля скроняў пальцамі: ты што, маўляў, вар'ят — мы столькі напакутаваліся, столькі нахадзіліся, столькі напрасіліся, столькі ў чэргах настаяліся, пакуль нас узялі ў гэтую дарогу, пусцілі на машыны, а ты ўсё хочаш зрабіць вельмі хутка, без аніякіх клопатаў.

Зразумеўшы, што ніхто зараз яму рукі не падасць, ён сам, калі машыны прытарможвалі блізка, спрабаваў ускочыць на падножку, хапаўся за барты, але шчаслівчыкі, што ўжо ехалі, білі яму па руках, паслаблялі, расшчэплівалі яго пальцы, спіхвалі назад — яны не хацелі пацясніцца, не хацелі, каб ён, звычайны чалавек, зраўняўся з імі, вылучанымі, ужо амаль багамі, і так лёгка трапіў туды, куды яны даўно і доўга збіраліся.

Цяпер ужо і шафёры, нібы адчуваючы яго сур'ёзныя намеры, знарок, не тармозячы, аб'язджалі тое месца, дзе ён стаяў.

Але сам рай, куды ўсе едуць, куды спяшаюцца і машыны, і людзі, стаў ужо назойліваю ягонаю ідэяю — ён абавязкова мусіць туды трапіць, як бы цяжка і складана гэта ні было.

Чалавек адышоўся ад дарогі і прыкінуўся, што працуе ў полі — ці то капае бульбу, ці то садзіць што. Зараз ужо ні машыны, ні людзі не зважалі на земляроба — займаецца чалавек сваёю працаю, то хай і займаецца. А калі дарога супакоілася, прывыкла да яго, ён зноў выйшаў на шасэйку.

Там, як і да гэтага, у абвітых дзеразою машынах, смяяліся шчаслівыя людзі, ігралі гармонікі, бухалі бубны. Зараз ужо ён рабіў выгляд, што глядзіць на ўсё спакойна, не выдаючы сваіх сапраўдных намераў. Але калі побач з ім параўняўся невялікі аўтобусік з шырокім бамперам, што тырчаў ззаду, ён не задумваючыся ўскочыў на яго.

І ўжо ўскочыўшы, зразумеў, што ехаць будзе вельмі цяжка і небяспечна: ззаду не аказалася ніводнага выступу, ніводнай зачэпкі, за якую б можна было трымацца рукамі. Павадзіўшы далонямі па абшыўцы і не знайшоўшы ніякай скабы, ён прыціснуўся да аўтобуса і шырока раскрыленымі рукамі абняў яго, як свайго самага лепшага сябра. На ўсіх выбоінах, калі аўтобус падкідвала, ён мог, канечне ж, зляцець, аднак заўсёды ўтрымліваўся і радаваўся: хоць і кепска, але ўсё ж едзе!

Машыны, што імчалі ззаду, сігналілі шафёру — маўляў, паглядзі, што ў цябе ззаду робіцца, каго ты вязеш у светлае будучае, але ён ці то не чуў, ці то не разумеў, што сігналяць менавіта яму.

Вось так, абдымаючы аўтобус, прытуліўшыся да яго шчакою, чалавек з вялікаю рызыкаю ехаў сам не ведае куды.

Праз нейкі час яго ўбачылі ў задняе акно пасажыры аўтобуса, узбуджана тыцкалі праз шкло пальцамі, паказвалі іншым, нешта спалохана гаварылі, ківалі галовамі, абураліся, быццам здарылася штосьці вельмі і вельмі страшнае. Затым адсунулі бакавое шкло на абодвух вокнах і, высунуўшы як надалей рукі, спалохана білі чалавека па пальцах, але ён цярпеў і трымаўся.

І ўсё ж яго ссадзілі. Калі яны праехалі пост дзяржаўнай аўтаінспекцыі, ён, скасіўшы вока, убачыў, як замітусіліся міліцыянеры, як пачалі паказваць гумавымі палкамі ў яго бок, як, спяшаючыся, пачалі заводзіць матацыклы. Неўзабаве яны дагналі аўтобус і спынілі яго. Цікаўны злез з бампера сам — убачыў, што тут ужо нікуды не дзенешся, ніяк не ўцячэш.

Дапытвалі яго сур'ёзна — усё высвятлялі, ці не шпіён ён які? Чалавек зацёкшымі, здранцвелымі ад доўгага напружання рукамі паказваў ім усе свае дакументы, але яму не верылі.

Міліцыянеры доўга і даходліва тлумачылі, што туды, куды едуць усе разадзетыя, як на кірмаш, як на свята, людзі, яму пакуль яшчэ рана:

— Ваша чарга не дайшла. А дойдзе — вас знойдуць, вам скажуць, вас запросяць. І нават на машыну ўзлезці дапамогуць. А вы што — без чаргі хочаце? Майце ж цярпенне...

Але, відаць, і яны не хацелі з ім важдацца, афармляць справу — узялі і адпусцілі. Паставілі тварам у другі бок — не ў той, куды ехаў,— далі каленам пад седаўку і адпусцілі.

І Цікаўны пайшоў назад. Насустрач яму, як і да гэтага, ехалі святочныя машыны, але ён не звяртаў ужо на іх увагі. З машын зноў махалі рукамі, нешта крычалі, грымаснічалі, крыўляліся, прыстаўлялі пальцы да носа, але ён не зважаў і на людзей.

Ён думаў пра тое, што пачуў на пасту аўтаінспекцыі. Адзін міліцыянер, нібы выпадкова, сказаў другому:

— Глядзі ты, аж да самага кантрольна-прапускнога пункта дабраўся.

Абодва міліцыянеры — і той, што гаварыў, і той, што слухаў, не звярнулі на гэта ніякай увагі, а ён задумаўся: калі КПП зусім побач, значыць, ён недалёкі ад мэты, значыць, недзе блізка вароты таго зманлівага раю, які спакусіў столькі людзей і машын.

Зараз ён ужо цвёрда ведаў, што будзе рабіць далей. І таму, як толькі за паваротам знікла будка паста, ён збочыў з дарогі, адышоўся глыбей у лес і па кустах і падлеску, па ажынніку і малінніку пачаў прабірацца наперад — туды, дзе за недалёкім КПП пачынаўся, на яго думку, рай. Што можа заблудзіцца ў лесе, ён не думаў — зусім жа побач гула шаша, там смяяліся і спявалі, і таму лепшага компаса яму і не трэба было: ідзі побач з гулам і ніколі не саб'ешся з тропу.

Ішоў ён спакойна, не спяшаючыся,— не ведаў, што з першага паста пазванілі ўжо на другі, сказалі, што Цікаўны ідзе ў іхні бок, і папярэдзілі: калі не прыйдзе — яго трэба шукаць па трывозе.

Існі было цяжка: наўзбоч дарогі цямнеў несхадзімы гушчар, і яму даводзілася з сілаю праламвацца праз яго. Чэпкія

ажыннікі і маліннікі ў шматкі падралі пінжак, штаны, сарочку, і каб вось зараз хто ўбачыў чалавека, падумаў бы і напраўду, што гэта шпіён ці дыверсант які.

Неўзабаве спераду пачалі даносіцца невыразныя, прыглушаныя лесам чалавечыя галасы і сабачы брэх – відаць, гэта была ахова,– і ён прыслухоўваўся, затойваўся і ішоў далей толькі тады, калі ўжо нідзе нічога не было чуваць.

Хутка Цікаўны ўпёрся ў высокую, метры на тры, бетонную сцяну, якая, на першы погляд, недарэчна падзяляла гушчар. Пакруціўшыся, пахадзіўшы вакол, знайшоў зламаную (відаць, бураю) сукаватую лясіну, прыставіў яе да сцяны і па ёй узлез наверх. Хацеў спачатку скінуць лясіну нагою, а пасля перадумаў, перацягнуў на другі бок – ён жа, мусіць, адзін з усіх, хто ідзе і едзе ў рай, думае вяртацца назад – паглядзіць, як там і што, ды вернецца,– а лясіна тады, на зваротным шляху, ой як будзе яму патрэбна.

Ён, мусіць, спачатку думаў, што сцяна – адзіная тут перашкода, але, выйшаўшы да высокай, як у вальерах, жалезнай сеткі, зразумеў, што памыліўся. Пачаў быў адгінаць дрот рукамі, але спахапіўся – навошта? З таго боку сеткі не было ніякіх кустоў, а тут, у гушчары, лягчэй было падысці незаўважаным бліжэй да дарогі. І ён паміж сцяною і сеткаю, не выходзячы на чыстае, пайшоў да шашы.

Праз нейкі час ён ужо зноў выразна пачуў, як наверсе каля кантрольна-прапускнога пункта смяяліся і спявалі людзі, як igралі гармонікі, бухалі бубны. Яму было чуваць, як лопалі на ветры шматлікія сцягі, і Цікаўны нават бачыў іх – рознакаляровыя, урачыстыя.

Бачыў і сам прапускны пункт – шырокія вароты, гасцінна расчыненыя на абедзве палавінкі.

Але ў гэтую радасць, гасціннасць і весялосць дамешвалася нешта іншае, толькі вось што – ён ніяк не мог пакуль зразумець.

Знайшоў зламаную драціну і, разгінаючы адна за адною петлі, пачаў расплятаць дзірку ў сетцы. Дрот быў спружыністы, дрэнна разгінаўся, але ўсё ж праз нейкі час Цікаўны зрабіў невялікі пралаз, праз які можна было пералезці на другі бок.

Пералезшы, чалавек стаў і нейкі час стаяў нерухома, баючыся адысціся ад сеткі — амаль каля яе, пакідаючы толькі невялікую стужку зямлі, пачынаўся глыбокі, як прадонне, абрыў.

Ён, усё яшчэ не адыходзячыся ад сеткі, падняў галаву ўгору, зірнуў на прапускны пункт з гэтага боку. І адразу ж, жахнуўшыся, заплюшчыў вочы. Думаў, гэта яму здалося, і варта толькі перачакаць з заплюшчанымі вачыма якую хвіліну, як міраж знікне. Але і ў другі раз адплюшчыўшы вочы, ён убачыў тое ж самае.

Адразу за варотамі кантрольна-прапускнога пункта дарога абрывалася, і з яе, нібы з ленты транспарцёра, сыпаліся ў прадонне людзі, машыны, гармонікі...

Людзі, якія напачатку не маглі ўцяміць, што з імі здарылася, падалі ў цясніну яшчэ з песнямі, са шчаслівымі ўсмешкамі на твары. Потым ужо, крыху праляцеўшы і ўсё зразумеўшы, у адчаі махалі рукамі, нібы спрабуючы зноў падняцца ўгору, узляцець да варот. Твары іх перакошвалі грымасы жаху і жуду, а шчаслівыя песні засядалі ў горле і выдыхаліся адно нечалавечым перадсмяротным крыкам — о-о-о-о-о!

Трымаючыся за сетку, ён асцярожна падышоў на самы край прадоння і зірнуў уніз: там, глыбока-глыбока, на самым дне цясніны ляжала вялізная куча металалому — грузавікі і аўтобусы, лімузіны і матацыклы: акурат так выглядаюць — ён сам гэта бачыў на здымках — звалкі, могільнікі аўтамашын у капіталістычных гарадах.

Людзей у прадонні ўжо не было відаць — такую яно мела глыбіню, што вока не вылучала з лому чалавека.

Ад жуду яго аж скаланула, і ён адчуў, як і пад ім абсоўваецца зямля. Цікаўны яшчэ мацней учапіўся за сетку і паспешліва, бачачы, як з-пад ног у цясніну скочваюцца, ляцяць камлыжкі, пабег да дзіркі, у якой было яго выратаванне.

Пералезшы назад і зноў пачуўшы бадзёрыя песні і шчаслівы смех па другі бок ад прапускнога пункта, ён разгублена думаў, што не заўсёды там рай, дзе нам здаецца, куды мы прагнем і хочам, куды з радасцю спяшаемся. І яшчэ думаў, як бы даходлівей сказаць вунь тым зарадаваным дурням, што наверсе, пра ўсё гэта, як папярэдзіць іх.

І разумеў, што такое немагчыма: нават калі б ён і знайшоў спосаб зрабіць гэта, яму б не паверылі. Маглі б абразіцца, падумаўшы, што іх падманваюць, маглі б раззлавацца на няпрошанага заступніка, а ў злосці, самі ведаеце, кожны чалавек небяспечны...

На сцяну зараз ужо ён узлез прасцей – па той самай лясіне, якую сам перацягнуў на гэты бок.

Перацягваючы яшчэ раз лясіну, ён раптам зірнуў уніз і як усё роўна спатыкнуўся, зрабіўся ўвесь нібы ватны: там, дзе, здавалася, была воля, стаяла міліцэйская машына і некалькі міліцыянераў, чакаючы яго,ківалі Цікаўнаму пальцамі:

– Ну, злязай, злязай да нас, галубок...

Дзе воля і дзе няволя наша? Дзе радасць, а дзе засмучэнне? Дзе мы будзем шчаслівыя, а дзе – гаротныя? Дзе нас чакае смерць, а дзе жыццё?

Хто, смертныя, загадзя ведае гэта?

Скажыце!

Скажыце і нам, пакуль бессмяротным...

## Пластылінавыя людзі

Было мулка спіне, хацелася паварушыцца, павярнуцца на бок, але зрабіць гэта ён не мог. Знямелі, зацяклі рукі, іх таксама хацелася выпрастаць, выцягнуць, размяць, каб аж затрашчалі ў суставах, але і такое было яму не па сіле. Нейкі дзівакаваты, блазенскі картуз, які сілаю надзелі яму на галаву – здаецца, іх знарок рабілі нехлямяжымі,– насунуўся на самыя вочы, аднак паправіць яго таксама было немагчыма.

Скасіў позірк, агледзеўся з-пад картуза.

Навакол, як заўсёды, былі такія ж, як і ён, людзі. Толькі зараз чамусьці звярнуў увагу, што тут усе ляжаць і ніхто не сядзіць, тым больш не стаіць – быццам нехта баіцца: а што, калі раптам усе яны пастануць на ногі, нешта ўбачаць і зразумеюць,– іх жа тады ніхто ўжо не здолее ўтрымаць у пакоры і ціхамірнасці.

Побач хадзілі іншыя, жывыя, рухомыя, незразумелыя ім людзі, яны гучна гаварылі, яшчэ гучней смяяліся, але ўсё гэта абмінала тых, хто ляжаў: яны нічога не чулі, бо былі занятыя толькі сваёй, таксама незнаёмай жывым людзям сістэмаю зносін.

Яны былі чужыя між сабою – жывыя людзі і нежывыя, як усе пра іх думалі, істоты. Іхнія светы, здавалася, нідзе не сустракаліся, нідзе не перасякаліся, не перакрыжоўваліся.

Але ж нерухомыя поўнасцю залежалі ад рухомых.

Менавіта рухомыя стварылі іх.

Нерухомыя не хацелі гэтага і, як маглі, пратэставалі – яны не жадалі, каб іх рабілі людзі па сваіх капрызах і выдварах.

Яны не хацелі нараджацца вось так! А ўжо нарадзіўшыся, многія праглі быць іншымі і нецярпліва чакалі, калі іх пераробяць.

Часам Рухомыя – толькі так называлі жывых людзей асуджаныя на нерухомасць – падыходзілі да іх, доўга разглядалі, нешта гаварылі – тыя ж, што ляжалі, толькі бачылі, як у іх адкрываецца рот, варушацца вусны, ды і ўсё,– часам бралі ў рукі, часам нешта папраўлялі – палец, нагу, нос – і клалі зноў на ранейшае месца.

О, як яны, нягледзячы на свой пратэст, чакалі таго моманту, калі іх возьмуць у рукі! І якімі жаданымі, якімі мяккімі і ласкавымі тады здаваліся ім жорсткія, бязлітасныя пальцы! Яны з нецярпеннем праглі іх, чакалі іх і ў той жа час ненавідзелі.

Якое гэта было цяжкае насілле – чакаць. Здзек для ўсяго жывога. Ляжы і чакай, калі нехта падыдзе, паправіць табе галаву, пераробіць нагу, выцягне замлелую руку. А сам ты нічога гэтага зрабіць не можаш.

Словам, чакай, калі цябе пераробяць.

А перарабляць, як ім здавалася, у іх было што.

Рухомыя, нібы знарок, ляпілі Нерухомых заўсёды нейкімі нязграбнымі, нават страшэннымі, пачварнымі, апраналі ў самыя непрывабныя сярмягі ці лахманы, абувалі ў лапці, твары рабілі грубымі, непрыгожымі, а на галовы абавязкова насоўвалі брыдкія шапкі, быццам бы знятыя з пудзілаў. А ім жа

хацелася выглядаць прыгожа і самавіта,– як і самім Рухомым. Асабліва былі незадаволеныя жанчыны: яны саромеліся і свайго вобліку, і свайго адзення. А якая жанчына не хоча быць чароўнаю?!

Асуджаныя на вечную нерухомасць, не маючы магчымасці хадзіць і сустракацца між сабою, на адзіноце дужа многа думалі – як кажуць, не было б шчасця, ды няшчасце памагло. Яны неймавернаю сілаю волі змусілі мёртвы, нежыццёвы і непрыдатны для роздуму пластылін мысліць.

Вось і зараз ён, злеплены кімсьці наспех, ляжаў нерухома, побач, таксама нерухома, ляжалі іншыя, а каля яго скроні, ён адчуваў, пульсавала нейчая настойлівая думка. І ён нават ведаў, чыя яна, ведаў, што гэта абменьваецца інфармацыяй з суродзічамі вунь той пластылінавы чалавек, злеплены пад блазна ці прыдурка, што ляжыць далёка-далёка ад яго – на самым краі стала.

«Трэба нам нешта рабіць,– спакойна, не спяшаючыся, расшыфроўваў мозг сігналы.– З нас здзекуюцца, намі пагарджаюць, нас не лічаць нават за людзей. Нам не даюць думаць, вырашаць свой лёс – якімі, маўляў, мы злепім вас, такімі і жывіце».

Тут жа ў размову ўмешваўся другі голас, і гэта было падобна на перамовы розных радыёстанцый у эфіры. І новы голас быў таксама яму знаёмы – ён належаў пластылінаваму чалавеку, злепленаму пад хлебароба: магутныя кулачышчы, шырокія плечы, моцныя, мускулістыя босыя ногі. Яго зляпілі амаль што голым – знізу толькі крыху прыкрылі нейкім шарачковым рыззём. Чалавек і напраўду атрымаўся моцны і загартаваны – нягледзячы на тое, што тут і апранутым было зімна, ён ніколі не скардзіўся, што яму холадна, ніколі не прастуджваўся, не хварэў. Не замінаў яму і вузкі лоб, які знарок, для пацехі зляпілі яму Рухомыя, каб пасмяяцца і паздзекавацца з яго: пад гэтым вузкім ілбом віравалі такія мудрыя і натхнёныя думкі, што амаль усё племя Нерухомых міжволі прызнала яго сваім вадаром. Ён ведаў, што ім трэба рабіць вось зараз, сёння, але таксама разумеў, што іх чакае заўтра і што там ім спатрэбіцца ў першую чаргу. Яго думкі

былі простыя і звычайныя, як сама зямля, хоць у іх і была такая глыбіня, якая часцей за ўсё прыхарошвае і робіць высакароднаю кожную мудрую прастату. Хлебароб не даваў нікому ніякіх загадаў ці парад – ён проста нібы разважаў сам з сабою, але яго хвалю лавіў кожны пластылінавы чалавек.

«Дык што ж нам трэба рабіць, каб вярнуць свой гонар, славу і самапавагу? Мусіць, трэба найперш стаць на ногі, утрымацца на іх, а затым навучыцца хадзіць».

А звычайны, шэранькі чалавечак, якога Рухомыя вылепілі царом, быў дужа прымітыўны, вёў сябе вельмі несамавіта і непрыстойна, выглядаў блазнам. Яго шыкоўнае царскае адзенне і карона на галаве неяк не стасаваліся з тым, што ён гаварыў і рабіў: крычаў на ўсіх, выдаваў дурныя загады, з якіх усе смяяліся, лаяўся, а пасля, пакрыўдзіўшы, абразіўшы ўсіх, чамусьці плакаў сам.

Ён жа, Хлебароб, адчуваў у сабе нейкую нерэалізаваную звышчалавечую сіламоц. Воляю і думкаю мог напоўніць свае пластылінавыя вены жывою сапраўднаю крывёю, а рукі і ногі – такою энергіяй, што яны, як яму здавалася, рабіліся жывымі і пачыналі рухацца. Не, для ўсіх іншых рукі-ногі нерухома ляжалі, як і да гэтага, на месцы, і толькі ён сам ведаў і адчуваў, што яны рухаюцца.

Сілаю волі прымусіў падысці да сябе аднаго з Рухомых – менавіта таго, хто, ён ведаў, паддаецца яго біялагічнаму полю, яго намаўленню, гіпнозу. Прысіліў узяць сябе ў рукі і ягонымі пальцамі пачаў рабіць самога сябе.

Найперш зняў з галавы блазенскі картуз. Потым пачаў папраўляць твар, надаючы яму годнасць і ўзнёсласць, рашучасць і ўпэўненасць.

Пальцы былі жорсткія, няласкавыя, але яму здаваліся прыемнымі і жаданымі: яны рабілі якраз тое, чаго ён і хацеў, чаго дамагаўся – ляпілі яго, ляпілі без насмешкі і здзеку.

Усё племя гэта зразумела, насцярожана сцішылася, і зараз пластылінавыя людзі ляжалі моўчкі, не перагаворваючыся. Маўчаў нават цар-блазан – не выкрыкваў глупстваў, не плакаў і не смяяўся. Усе, напружыўшыся, чакалі, што ж будзе далей.

А пальцы Рухомага ўсё яшчэ з натхненнем і асалодаю, з нейкай дуркаватай зацятасцюціскалі, мясілі пластылін і радаваліся, калі атрымліваўся прыгожы нос, шчырыя вочы, высокі лоб. Рухомы, сам таго не ведаючы і не хочучы, вось зараз сабе насуперак рабіў Вадара, вартага ўсяго абражанага і зняважанага племя.

А сам Вадар адчуваў, як напаўняецца сілаю і жыццём кожная клетка пластыліну, як векавечная мара столькіх пакаленняў вось зараз уваходзіць у яго аднаго.

Ад радасці ён, нечакана нават для самога сябе, міжволі скалануўся.

І адразу ж заціхлі, перасталі працаваць пальцы Рухомага. Яны, здаецца, таксама адчулі нейкую невядомую да гэтага сілу ў пластыліне, адчулі яе радасць і супраціўленне адначасова, і спалохаліся: у гэтай сіле і радасці нібыта была нейкая пагроза ім, Рухомым,– пластылінавыя людзі зараз ужо, зраўняўшыся з імі па руху, станавіліся нібыта раўнёю ім.

Рухомы хацеў пачаць разбураць з натхненнем створанага ім чалавека, паспеў ужо нават змяць яму правую руку і скамячыць вуха, але Вадар зноў напружыў усю сваю волю і, узбудзіўшы біялагічнае поле, прымусіў яго спыніцца.

Рухомы трымаў зараз чалавека ў руцэ і не ведаў, што з ім рабіць далей. Ужо хацеў быў кінуць туды, на стол, дзе ляжалі астатнія, асуджаныя на нерухомасць, пластылінавыя людзі, але Вадар зноў сабраў сваю сілу волі і загадаў Рухомаму: «Не кладзі. Пастаў... Пастаў на ногі... Пастаў...»

Рухомы ўсё больш і больш трывожыўся, відаць, адчуў, што нехта кіруе ім і ўсё гэта ён робіць не па сваёй волі – як у сне.

Зразумеўшы, што ў яго руках ужо не мёртвы пластылін, а жывая плоць, ён зусім спалохаўся і кінуў Вадара да суродзічаў – нават невядома было, ці то ён кідаў яго так, ці то ставіў. Можа, і ставіў, ды ў спудзе гэта атрымалася ў яго дужа рэзка, і Вадар ледзь не паваліўся, але ўсё роўна ўтрымаўся на нагах, устояў.

Вадар стаяў, пагойдваўся,ківаўся, ды так моцна, што здавалася, вось-вось перакуліцца, упадзе. Ніхто не ведаў, што яго пластылінавыя ногі сталі жывымі і ў руках ужо торгае, нібы

дабраякасны, чужародны пластыліну, нарыў — нармальная чалавечая кроў. Ніхто не бачыў, як трымцяць ад нецярпення ногі, прагнучы найхутчэй зрабіць першы крок. Ніхто не чуў, як чалавек голасна, на ўсю планету сказаў: «Мы паспрачаемся яшчэ з вамі, жорсткія чалавечыя пальцы».

Пластылінавы чалавек — першы сярод суродзічаў — вучыўся хадзіць.

## Выгнанне дэманаў

— Чалавек грэшны, нават калі яго ніхто і не вучыць граху. Вы асляпілі вочы свае, а сэрцы ператварылі ў каменне — не бачыце вачыма, не разумееце сэрцам. Хіба можна рабіць нешта добрае, калі самі злыя? Хіба можна быць святым, калі думкі нашы далёкія ад святасці? Дык выкіньце ж толькі па адной парушынцы са сваіх вачэй, і вы ўбачыце горы гнілога смецця, якое будзе куродыміць за вамі.

Яны ціха стаялі перад ім — яшчэ спакойныя і, здавалася, ні ў чым не вінаватыя. Стаялі моўчкі — ніхто ні з кім не перагаворваўся, ніхто ні на кога не глядзеў.

Бездакорны накінуў на галовы ім нейкую шырокую, невыразна шэрую посцілку — усе галовы аказаліся пад ёю — і казаў далей:

— Хіба можа благое дрэва выспеліць добры плод? А добрае — дрэнны? І вы, хто ў граху і спакусе, плачце і галасіце над злыбедамі вашымі, што ідуць на вас... Багацце ваша згніло, вопраткі вашы з'едзены моллю... Золата ваша паржавела, іржа іх сведчыць супраць вас і з'есць цела вашае, як агонь...

Пад посцілкаю было ціха — ніхто не варушыўся і ніхто, здавалася, нават не дыхаў — так уважліва, пільна і насцярожліва ўсе слухалі Бездакорнага.

— Цяжка нехта з вас мучыцца? Няхай моліцца. Весела каму? Няхай псалмы спявае. Прызнавайцеся адзін перад адным у сваіх правіннасцях і маліцеся адзін за аднаго, каб паздаравець. Многае зможа настойлівая праўдзівая малітва.

Пад посцілкаю, там, дзе былі галовы, выпукляліся, як купіны, грудкі. Яны ўжо заварушыліся, сёй-той нават пачаў шморгаць носам.

— Хрыстос мучыўся за нас сваім целам, то і вы спавядайцеся гэтай жа думцы, бо той, хто мучыцца целам, перастае мучыцца душою, перастае грашыць. Каб рэшту часу пажыць ужо не паводле чалавечых слабасцей, а паводле божае волі. Бо хопіць і таго, што ў мінулым жыцці вы паступалі па падказцы паганаў, ходзячы ў нячыстасці, пажадлівасці, п'янстве, банкетаванні, піцці і легкадумным служэнні нячысціку.

Прасцірадла паступова спаўзала з галоў — пад ім ужо некаторыя вернікі пачалі сутаргава торгацца, курчыцца ў канвульсіях.

Голас Бездакорнага быў усё яшчэ спакойны і абыякавы:

— Усе людзі грэшныя. У кожнага чалавека ўсяліўся нячысцік. Яны жывуць з ім да пары да часу і не адчуваюць гэтага. Паколькі для дэманаў не існуюць прастора і час, яны пранікаюць у душу і сэрца чалавека і ўнушаюць яму свае д'ябальскія думкі. Эпідэмія душэўных хвароб запаланіла зямлю. Асабліва страшны загадкавы від вар'яцтва — апантанасць. Хворыя адчуваюць, што яны — гэта не яны, што ў іх усяліўся нехта чужы і варожы. Яны крычаць і гавораць ад імя дэманаў, а па начах здаровыя ў жаху чуюць іх скавытанне і рогат.

Бездакорны на хвіліну змоўк, нібыта задумаўся. Паправіў накідку, усцягнуў яе зноў на галовы, з якіх яна з'ехала. Казаў далей:

— Сутнасць кожнага нячысціка — мана. У нежыцяў няма свайго твару, свайго аблічча, яны заўсёды пазычаюць іншыя. Бывае, што нават воблік анёла прымаюць. Дык яны ж, нячысцікі, і напраўду некалі былі анёламі, але не змаглі захаваць сваёй годнасці і сталі анёламі бездані. Усе свае анёльскія якасці — звышчалавечыя веды і магутнасць — яны паставілі на службу злу. Памятаеце, нават да святога Францыска Асізскага нячысцік з'явіўся ў выглядзе Хрыста. І толькі калі той, насуперак сваёй высакароднасці, пачаў папросту лаяцца, мацюкаць паганага, ілжэ-Хрыстос у жаху кінуўся наўцёкі, пакінуўшы пасля сябе чужы, нікчэмны дух і брыдкі пах серы. Дык вы-

ганяйце ж з сябе нячысцікаў, выганяйце д'яблаў, выганяйце спакуснікаў і ліхаў! Выганяйце, выганяйце, выганяйце!

Людзі перад Бездакорным, скідаючы з сябе пасцілку, заторгаліся яшчэ мацней, і гэтыя іх рухі былі самі па сабе падобны на нейкі д'ябальскі танец – усе рабілі нешта рознае, але рабілі гэта аднолькава, быццам на сеансе экстрасенса.

– Ой, ой,– завойкаў пад самаю рукою Бездакорнага малады яшчэ чалавек з худым і цёмным тварам.– Мне блага.

– Вінаваты? – як не ў самае яго вуха крыкнуў Бездакорны.

– Здаецца, не... Здаецца, не...

– А д'ябальскае зелле курыў?

– Ну, курыў, ну, курыў!

– А д'ябальскае малако піў?

– Ну, піў, ну, піў!

– Нячысцік табе віно падносіў, таму і рукі твае трасуцца.

Апантаны здзіўлена глядзеў на свае рукі і крыўляўся яшчэ болей.

– Прызнавайся, у чыім выглядзе д'ябал прыходзіў да цябе?

– Ну, з сябрам я піў. Ну, з сябра-а-ам!

– Нячысцік у абліччы сябра спойваў цябе... Чуеш, нячысцік! – яшчэ прарэзлівей закрычаў Бездакорны.– Ачышчайся! Ачышчайся хутчэй!

Малады чалавек раптам упаў на калені, пачаў поўзаць вакол Бездакорнага, пачаў рохкаць па-свінячы і брахаць па-сабачы.

– Бачыш, колькі ты, грэшны, д'яблаў у сабе насіў? Свіннямі і сабакамі выходзяць яны з цябе!

У гэты час ужо амаль усе торгаліся ў сутаргах.

Чалавек сярэдняга веку – сівы, тактоўны, прыстойна апрануты – хацеў быў непрыкметна падацца да дзвярэй, але ўладны голас Бездакорнага вярнуў яго зноў да апантаных людзей, якія яшчэ ў большым шале нідзе не маглі знайсці сабе месца.

– Д'ябальскае рабро ў табе іграе. Кажуць жа і людзі, і багі – на сівізну чорт ласы... Як венікамі, трасуць вамі, людзі,

нячысцікі. Страсайце ж іх з сябе, страсайце! – ужо як не лямантаваў Бездакорны.

І раптам гэты сівы, прыстойны чалавек пачаў страсаць з сябе нешта нябачнае, што нібыта замінала яму, а затым упаў на брудную падлогу і ўзяўся качацца па ёй, робячы дужа непрыгожыя рухі, выкрыкваючы нецэнзурныя словы. Але ніхто не звяртаў на яго ніякай увагі – усе былі заняты сваімі нячысцікамі.

І тут Бездакорны заўважыў маладую, прыгожую жанчыну, якая стаяла крыху збоку, пасміхалася з усяго, што бачыла, і неяк не зусім упэўнена паўтарала:

– А я ні ў чым не вінаватая. А я чыстая.

Ён рукою паклікаў яе бліжэй і загаварыў спакойным голасам:

– Чалавек грэшны, калі нават яму і здаецца, што ён бязгрэшны. І ты грашыла. І ты зналася з нячысцікам. Прызнавайся!

– Не, я чыстая, не, я не вінаватая.

– Усе крычаць, што яны не вінаватыя. Усе енчаць: не я, не я... А хто ж тады так засмеціў зямлю?!

– Не я, не я...

– Бачыш, не ты. А нячысціка хто цешыў?

– Нікога я не цешыла.

– А ў кампаніях многа смяялася?

– Ну, смяялася,– ужо няўпэўнена, нібы раздумваючы над нейкаю незразумелаю віною, адказвала жанчына.

– А на вечарынках з асалодаю танцавала?

– Ну, танцавала...

– Дык гэта ж нячысцік рагатаў у табе, гэта ж д'ябал змушаў цябе скакаць і весяліцца,– вініў жанчыну Бездакорны.

Тая зараз ужо маўчала. Дзе і падзелася яе ўпэўненасць – яна толькі плюскала вачыма і нервова азіралася па баках.

– А смутак безвыходны ў цябе бывае? Весялосць нестрыманая? Скажы – бывае?

– Ну, бывае... Ну, бывае...

– З нячысцікам ты спазналася, і ён змушае цябе і сумаваць, і цешыцца...

— Ой, я не вінаватая...

— Прызнайся, ён прыходзіў да цябе? — ужо ў самае яе вуха крычаў Бездакорны.— Прыходзіў, я пытаюся? Пад выглядам мужчыны прыходзіў? Ці, можа, у абліччы сатыра? Рагаты такі, хвастаты, з капытцамі... Прыходзіў ці не?

— Ну, прыходзіў... Ну, прыходзіў... Ой, пры-хо-дзіў...— загаласіла жанчына.

— І ён лашчыў цябе? Прызнавайся! — Бездакорны ўжо крычаў так голасна, нібыта ён гаварыў гэта не толькі да яе аднае, але і да ўсіх тых, хто прыйшоў на гэтую споведзь.— Адказвай, лашчыў ці не?

— Ну, лашчыў... Ой, ла-шчыў...

Твар жанчыны раптам скрывіўся, яна пачала грымасьнічаць і закалацілася ў потарзе — яшчэ мацней і раз'юшаней, чым тыя, што ўжо тузаліся даўно.

— Ой, гару... Ой, га-ру...— толькі і паўтарала яна.

А Бездакорны ўзмахнуў рукамі, і накідка зноў затрымцела над галовамі.

— Ачышчайцеся! — крычаў ён да ўсіх.— Выганяйце з сябе нячысцікаў! Выганяйце спакушальнікаў і ліхаў, вераломнікаў і ненашаў, хітруноў і злоснікаў, перакрутаў і спрытнюг! Вызваляйцеся ад д'ябальскіх выкрутасаў! Вызваляйцеся!

На людзей, якія ў шале, цяжка было глядзець. Яны крыўляліся, сутаргава, нібы эпілептыкі, калаціліся і перасмыкаліся, качаліся па падлозе, хадзілі на чацвярэньках, поўзалі, стагналі, крычалі, плакалі, лаяліся, брахалі па-сабачы, вішчэлі па-свінячы, бляялі па-авечы — так цяжка выходзілі з іх нячысцікі.

А над усім гэтым чуўся цяпер ужо спакойны голас Бездакорнага — ён церушыўся, спадаў на тых, хто пакутаваў, здымаючы, паслабляючы іхні боль:

— Ачышчайцеся! І паможа вам Бог! Памятаеце ў Евангеллі? Калі Ісус выйшаў з чоўна, зараз жа пераняў яго чалавек з могільніку, апанаваны нячыстым. Ён меў жыллё ў магілах; і ніхто не мог яго звязаць нават ланцугамі, бо многа разоў скоўвалі яго путамі ды ланцугамі, але ён разрываў ланцугі і разбіваў путы, і ніхто не меў сілы супакоіць яго; заўсёды

ўначы і ўдзень ён быў у горах ды ў магілах, крычучы і б'ючы сябе каменнем. Угледзеўшы ж Ісуса здалёку, прыбег ды пакланіўся яму і, закрычаўшы моцным голасам, сказаў: што Табе да мяне, Ісус, Сын Бога Усявышняга? Заклінаю Цябе Богам, не муч мяне! Бо Ісус казаў яму: выйдзі, дух нячысты, з гэтага чалавека. І спытаўся ў яго: як імя тваё? І ён сказаў у адказ: легіён імя маё, бо нас многа. І дужа прасіў яго, каб не высылаў іх вон з стараны тае. Пасвіўся ж там ля гары вялікі гурт свіней. І прасілі яго ўсе дэманы: пашлі нас у свіней, каб нам увайсці ў іх. Ісус ураз жа дазволіў ім. І нячыстыя духі, выйшаўшы, увайшлі ў свіней, і кінуўся статак з кручы ў мора; было ж іх каля дзвюх тысяч; і патанулі ў моры. Хай і з вас выходзіць нячыстая сіла. Хай і яна ўсяляецца ў сабак і кошак, у коз і свіней...

Праходзіў час, і людзі паступова супакойваліся. Ужо не так яны біліся і курчыліся, не так вылі і крычалі. Сёй-той цяжка ўздыхаў, пацепваўся, сёй-той, стомлены, ледзь стаяў на нагах і, заплюшчыўшы вочы, хістаўся, як п'яны.

— Вы сталі здаровымі. Ідзіце туды, хто адкуль прыйшоў, і не грашыце болей. Вам няма чаго баяцца цяпер, трэба толькі верыць. Бо, памятаеце, Бог казаў: «Той, хто верыць у мяне, будзе рабіць справы, якія і я раблю». Толькі вера ўратуе вас ад новых заган і грахоў. Бо дэманы якраз і паразітуюць на вашых грахах. Беражыце ж душы ад нечыстаты! Запаўняйце іх, прыбраныя і падмеценыя, чысцінёю і добрымі намерамі, каб не вярнуліся ў іх д'яблы. Бо калі яны вернуцца, іх будзе болей, чым было да гэтага. Бо калі д'яблы зноў апануюць вашы душы, адкуль іх выгналі, яны будуць яшчэ болей злыя і асатанелыя. Не пакідайце ж ні на хвіліну вашы душы пустымі!

І раптам Бездакорны заўважыў маладога чалавека — спакойнага, прыстойнага, уважлівага, які стаяў крыху зводдаль і насмешліва назіраў за ўсім, што адбывалася перад ім. Бездакорны падышоў да яго і ціхім, але ўпэўненым голасам запытаўся:

— Сын мой, а што адчуваеш ты?

— Нічога,— шчыра адказаў малады чалавек.

— Чаму ж тады ты смяешся, калі іншыя плачуць?

— Таму што смешна. І яшчэ таму, што плачуць не ўсе, каму варта плакаць.

— Сын мой, тваё нявер'е палохае. Яно ад таго, што ў цябе ўсяліўся самы хітры і самы каварны нячысцік, самы вераломны д'ябал. Ты, мусіць, самы грэшны між усіх! — закрычаў Бездакорны і яму, як нядаўна жанчыне, у самае вуха.— Прызнавайся!

Але чалавек быў надзіва спакойны.

— Мне няма ў чым прызнавацца,— адказаў ён.— А ведаеце, хто самы грэшны між намі? — І, не чакаючы адказу, выдыхнуў: — Вы!

Бездакорны збялеў, у яго пачалі нервова перасмыкацца правая шчака і вока.

— А самы галоўны нячысцік мучыць вас саміх! Дык скажыце, хіба ж можа дэман выганяць дэмана?!

Бездакорны неспадзявана сам забіўся ў канвульсіях, пачаў раптам непрыстойна рагатаць.

— Прызнавайся,— малады чалавек перайшоў на «ты» і ўжо крычаў з усяе сілы на таго, хто толькі што ўшчуваў іншых.— Прызнавайся, што менавіта ты знаешся з нячыстаю сілаю!

— Ой, знаюся! Ой, зна-ю-ся...— па-воўчы завыў Бездакорны.

— Выганяй жа з сябе нячысціка,— яшчэ галасней закрычаў малады чалавек.— Ачышчайся!

І Бездакорны нечакана як пераламаўся пасярод, упаў на падлогу, курчыўся і крычаў нешта, качаўся, стагнаў, як і ўсе іншыя, цёрся жыватом аб дошкі, нібы рыба, што ідзе на нераст,— быццам хацеў разадраць яго, каб хутчэй выпусціць з сябе нячыстую сілу. Енчыў і ўсё прамаўляў:

— Ой, вінаваты... Ой, вінаваты... Ой, гару...

Жыццё тваё, Божа, шырэйшае за звычайнае жыццё, калі ў ім і грэшнікі, і святыя могуць вось так лёгка паядноўвацца і ўжывацца ў адным чалавеку.

І калі самымі святымі часам аказваюцца не тыя, хто пра гэта гаворыць, а тыя, хто ў гэта верыць.

Вернікі часцей за ўсё бываюць святымі.

## Слабыя і моцныя

І была некалі краіна, у якой дружна жылі і добра сябравалі моцныя і слабыя. Слабыя спрадвеку кармілі моцных, а моцныя рабілі выгляд, што толькі дзякуючы менавіта ім жывуць і кормяцца слабыя.

Усім здавалася, што так яно заўсёды было і заўсёды так будзе.

Але па часе моцныя пазадзіралі насы і пачалі звысака, пагардліва пазіраць на слабых, а тыя, адно толькі ўкленчваючы перад імі, дзякавалі і дзякавалі за клопаты ды за хлеб-соль – ім і напраўду здавалася, што кормяць іх моцныя, хоць самі яны якраз і прыносілі ўсё, што тыя пілі і елі.

Моцныя вельмі ганарыліся сваім становішчам, паходжаннем, лёсам, велікаваннем. Праз нейкі час яны нават дадумаліся да таго, што слабыя толькі замінаюць жыць, што ім, абраным, даводзіцца ўтрымліваць такі гурт дармаедаў, якія адно тым і займаюцца, што ядуць ды плодзяцца.

– Госпадзі-людзі, што ж вы робіце?! – пачалі былі ўшчуваць дзівакоў Мудрацы, але зараз ужо іх ніхто не слухаў – у бязглуздыя дні слухаюць не Мудрацоў, а нягоднікаў і прайдзісветаў.

Пачаліся стыхійныя мітынгі, на якіх аж заходзіліся ад шалу моцныя:

– Слабыя – смецце нашай краіны! Дакуль мы будзем іх цярпець? Ачысцім айчыну ад слабых! Далоў!

– Далоў! – люцелі ў адказ разгневаныя натоўпы.

І што дзіўна: слабыя і напраўду верылі моцным, няёмка пераступалі з нагі на нагу, вінаваціліся, каяліся – канечне ж, яны смецце, яны толькі замінаюць моцным шчасліва жыць, блытаюцца ў іх пад нагамі...

Знайшліся і сярод слабых такія, што разам з моцнымі, нават грамчэй за іх, крычалі сваім суродзічам: «Далоў!» – за час таварышавання і дружбы з моцнымі яны шчыра паверылі, што і самі моцныя і што гэтае «далоў» іх ужо не датычыцца.

А моцныя вар'яцелі ўсё больш і больш.

— Яны ганьбяць нас! Яны — наш сорам! Прэч слабых! Во-о-о-н! Каб за дваццаць чатыры гадзіны ніводнага слабога не засталося ў нашай дзяржаве! Чуеце — за дваццаць чатыры гадзіны.

— Госпадзі-людзі, што вы робіце?! — зноў жахнуліся Мудрацы, але і на гэты раз ніхто іх не пачуў і ніхто на іх перасцярогу не звярнуў ніякай увагі.

Назаўтра ў краіне і праўда не засталося ніводнага слабога — каго засеклі розгамі, каго павесілі, каго выслалі ў суседнія дзяржавы — падвялі да мяжы і піхнулі ў каршэнь на той бок,— хто сам уцёк.

І засталіся ў краі адны толькі моцныя.

Радасці не было ніякіх межаў. Моцныя, шчаслівыя і задаволеныя, святочна апранутыя, хадзілі па вуліцах, махалі сцягамі, смяяліся, весяліліся, спявалі песні, абдымаліся, цалаваліся — радаваліся з выпадку такой вялікай перамогі.

— Ура! Нарэшце мы адны! Як хораша без іх, як цудоўна, што слабыя не мазоляць нам вачэй! Якія ж мы малайцы!

І зараз не было ўжо каму ў роспачы спытацца: «Госпадзі-людзі, што ж вы робіце?!» — і Мудрацоў, гэтак жа, як і слабых, не асталося ва ўсёй краіне: іх таксама каго выгналі, а каго зланцужылі і пасадзілі ў вязніцы.

Да абеду яны яшчэ радаваліся. А пасля — пачалі непакоіцца. Увечары ўжо зусім спалохаліся: есці, аказваецца, ніхто ім не прынёс, ніхто нічога не падаў на стол.

Ноч сяк-так перабылі, а раніцою пачалі бунтаваць:

— Чаму нам не нясуць есці? Як? Нас ніхто не будзе карміць? А дзе ж нашыя слабыя?

Пачалі шукаць, але гэтыя пошукі былі, зразумела, марныя — у краіне не асталося аніводнага слабога. Нават тым, хто грамчэй за ўсіх моцных крычаў: «Далоў!» і думаў, што гэтая лютасць абміне яго, не ўдалося ўратавацца — яны пайшлі ў катавальні адразу ж за сваімі суродзічамі.

І пацягнуліся, запылілі па ўсёй краіне натоўпы моцных — галодныя, яны шукалі слабых, каб тыя пакармілі іх. Сустракаліся на дарогах, пыталіся:

— Ты слабы?

— Не, я моцны.

— А ты?

— Я таксама моцны.

Падазрона, недаверліва прыглядаліся адзін да аднаго, незадаволена нешта бурчалі сабе пад нос і разыходзіліся ў розныя бакі — бач ты, усе моцнымі парабіліся...

Часам даходзіла нават да боек. Гэта было тады, калі моцным здавалася, што яны сустрэлі слабога, а той, ці чуеце, падманвае іх, не хоча, нягоднік, прызнавацца ў сваім ашуканстве.

Узніклі нават асацыяцыі, групы, камітэты па выяўленні і лоўлі слабых, але і яны нічога пэўнага не давалі і не маглі даць — слабых, як высвятлілася, знішчылі начыста. Бушавалі яшчэ настойлівей, як да гэтага, мітынгі. Хвалявала адно панічнае пытанне: «Хто ж нас будзе карміць?»

Але адказу на яго ніхто з моцных не ведаў.

І тады на краіну напаў нейкі незразумелы, яшчэ страшнейшы, чым СНІД, паморак. Людзі, якія толькі што былі зусім здаровыя, як кажуць, кроў з малаком, на вачах пачыналі худнець, твары іх выцягваліся, завастраліся, бляднелі, праз нейкі час яны ўжо ледзь перастаўлялі ногі і неўзабаве падалі, каб ніколі не падняцца.

Моцныя паміралі на вуліцах і плошчах, у хатах і агародах, на палявых дарогах і ў гарадскім транспарце.

Мор гэты быў бязлітасны і неадольны, ён нікога не шкадаваў і нікому не пакідаў надзеі.

Людзі паміралі ў чэргах ля хлебных магазінаў, цярпліва чакаючы тыднямі, што нехта спячэ і прывязе ім хлеб. Паміралі ў сталоўках, чынна седзячы за столікамі, задумліва, з надзеяй пазіраючы ў той бок, адкуль звычайна з поўнымі падносамі выходзілі слабыя. Паміралі дома, падалі галовамі пад самыя дзверцы перапоўненых халадзільнікаў, дзе пачынала псавацца ўжо ежа, а здагадацца, як іх адчыніць, не маглі — халадзільнікі заўсёды адчынялі і падавалі ім на стол толькі слабыя, таму ў моцных ніякага такога інстынкту за ўвесь час не з'явілася. Паміралі ў градах, упаўшы галовамі на крамяныя, мулкія агуркі ці ў куст памідораў — раздушаныя спелыя таматы вымазвалі чырвоным сокам мёртвыя твары, і гэты

сок, бы жывая кроў, сам сабою цёк па шчыльна сцятых вуснах – моцныя як усё роўна знарок не хацелі расціскаць ратоў, нібыта пакрыўджана грэбуючы ежаю.

Хлебапякарні былі забіты мукою, у магазінах псаваліся паўфабрыкаты, палі шумелі вялікімі даспелымі каласамі, у садах аж згіналіся галіны ад смакоўнага цяжару, грады радавалі вока шматкалёрнасцю ласункаў, але ў краіне ніхто не ведаў, як і што рабіць з усім гэтым багаццем: слабых, якія ўсё ведалі, ужо не было, а Мудрацы, што засталіся дзівам і маглі б сёе-тое падказаць, сядзелі па турмах. Праўда, нехта падаў быў нясмелую думку, што іх трэба вызваліць з цэляў, але яго абвінавацілі ў здрадзе і адразу ж пасадзілі ў турму да Мудрацоў – маўляў, сядзі і маўчы: як гэта мы, такія разумныя, будзем пытаць у некага парады?!

А самі моцныя ні да чаго іншага не змаглі дадумацца, як толькі сваю хваробу і смерць патлумачыць вялікім сусветным паморкам.

А паколькі паморак – трэба падпарадкавацца лёсу і волі Усявышняга. Моцныя перасталі шукаць слабых, перасталі думаць пра ежу і цярпліва, пакорліва пачалі чакаць сваёй долі. І паміралі гэтак жа цярпліва і пакорліва, з ціхаю, памірліваю ўсмешкаю на твары. Паміралі сем'ямі – старыя і малыя, бацькі і дзеці, дзяды і ўнукі.

І неўзабаве ў краіне стала ціха-ціха: у ёй не асталося, здаецца, ніводнага чалавека... Не чуваць было нідзе ні жаночай песні, ні мужчынскага голасу, ні дзіцячага смеху.

І ўсё ж адна сям'я асталася!

Гэта былі слабыя, якія так умела і шчыра прыкінуліся моцнымі.

А менавіта яны – толькі яны адны! – і ведалі, як і дзе дастаецца ежа.

Так слабыя вярнулі на зямлю племя моцных, заснавалі іх новыя паселішчы – якія ж яны слабыя, калі перахітрылі моцных!

Мусіць, слабых людзей у прыродзе не бывае.

Слабы – гэта ўсяго толькі недарэчны псеўданім, здзеклівая мянушка чалавека.

А сапраўднае яго імя было, ёсць і павінна быць заўсёды толькі адно – моцны.

Гэта добра, што слабыя сталі моцнымі.

Але кепска, што яны адразу ж пачалі шукаць сабе слабых...

Каб ужо тыя кармілі і даглядалі іх.

«Госпадзі-людзі, што вы робіце?!» – маглі б ускрыкнуць Мудрацы, але ніводнага з іх на той час не асталося нават у турмах...

А без іх хто дапаможа разабрацца, што лепей: слабыя моцныя ці моцныя слабыя?

## Перавернуты

Вярнуўся Бяляй дадому дужа позна, недзе апоўначы.

Вазіў на льнозавод трасту, а там такія чэргі, такія парадкі, што каб троху не паварушыўся сам, то хутчэй за ўсё давялося б неразгружанаму і начаваць у кабіне.

Спыніў перад сваімі варотамі машыну, зірнуў на вокны – яны былі цёмныя: значыць, жонка і дзеці ўжо спалі.

Звычайна, калі прыязджаў позна, Агнежка, захінуўшыся ў што-небудзь, выходзіла на ганак, каб сустрэць яго, але сёння ён такой ласкі ад яе не чакаў: раніцаю яны не вельмі каб сур'ёзна, але ўсё ж крыху пасварыліся, і жонка, канечне ж, не выйдзе, прынцыпова зробіць выгляд, што спіць.

Яму таксама не хацелася вылазіць з машыны і ісці дадому – уяўляў, як сонная Агнежка пачне нехаця адмыкаць замкі, адсоўваць запоры, здымаць крукі, а потым, зрабіўшы ўсё гэта, абыякава кінуўшы: «Вячэра на стале», незадаволена пойдзе ў спальню.

І яшчэ яму чамусьці здавалася, што сёння нешта абавязкова павінна здарыцца, і ён чакаў гэтага з трывогаю і нецярпеннем – хацелася, каб яно, калі мае адбыцца, адбылося як мага хутчэй.

Такое з ім здаралася і раней, а таму ні жуду, ні адчаю, якія міжволі сквалі яго ў першы раз, зараз ужо не было. Былі цікавасць і напружанасць, былі неспакой і чаканне.

Пасля цяжкой дарогі яго хіліла ў сон, але Бяляй разумеў, што не толькі дарога з'яўляецца прычынаю яго санлівасці. Паклаў галаву на рукі, што ўсё яшчэ былі на рулі, і пачаў прыслухоўвацца, як яно набліжаецца.

Усё цела яго трымцела, хвалявалася, вібрыравала, яму было балюча і прыемна, да горла падкочвалася млосць, ён адчуў, што траціць прытомнасць і некуды правальваецца. Добра, што ў самы апошні час паспеў яшчэ рукою адчыніць дзверцы кабіны, з якой ужо на ўсе чатыры лапы мякка выскачыў воўк.

Воўк тут жа ля кабіны атросся, нібыта ён доўга быў пад дажджом, пакруціў ва ўсе бакі галавою, наставіўшы вушы, панюхаў паветра і паволі, асабліва не спяшаючыся, пабег загуменнямі ў бок недалёкага лесу.

Сваю гайню ён сустрэў на самым узлеску: ваўкі якраз ішлі на паляванне. Ціха і спакойна далучыўся да іх, ды і яны, здаецца, не звярнулі на гэта ніякай увагі — ну, далучыўся, дык і далучыўся, хай сабе бяжыць.

Ваўкі якраз спяшаліся ў бок вёскі. Бяляй усё стараўся бегчы не з падветранага боку — амаль суткі правёўшы ў кабіне, ведаў, што пахне бензінам, і асцерагаўся, каб ваўкі не ўнюхалі гэты пах.

Пачаўся нудны восеньскі дождж. Ён імжэў на мокрую ўжо шэрсць, але ваўкам гэта, здаецца, падабалася: яны інстынктыўна адчувалі, што ў такую глухую поўнач, у такі шапатлівы дождж людзям дужа добра спіцца.

Ён бег між ваўкамі — як свой сярод сваіх — і думаў, на чый падворак заявіцца сёння гэтая ваўчыная гайня?

Гайня завярнула да ягоных хлявоў.

Важак ужо на Бяляевай пожні спыніўся, падняў галаву, уважліва, пільна ўгледзеўся ў машыну, якая стаяла каля хаты, насцярожана ўслухаўся ў начную цішыню і, нічога падазронага не пачуўшы — нідзе нішто не бразгала, нідзе ніхто не гаманіў,— супакоіўся, апусціў галаву і патрусіў да хлява, дзе былі авечкі,— быццам ён ведаў, быццам яму ўжо нехта сказаў, што яны менавіта там.

За ім пабеглі і ўсе астатнія.

Бяляй падсвядома, яшчэ па чалавечай звычцы, кінуўся важаку напярэймы – трэба ж абараняць сваё дабро,– але той так ашчэрыўся, што ваўкалак завіляў хвастом і саступіў з дарогі.

Ваўкі падышлі да сцяны з глухога, тыльнага боку, зноў услухаліся і агледзеліся, а затым дружна ўзяліся падкопвацца пад бёрны.

Пачуўшы іх дух, заварушыліся, забегалі па хляве авечкі.

Бяляй быў у роспачы, што ён сам, на сваім падворку, не можа нічым памагчы сваёй жа скаціне.

Убачыўшы, што ваўкі вельмі ж ужо шчыра пярэднімі лапамі выграбаюць зямлю з-пад сцяны, ён абабег свае хлявы, прашчаміўся праз згароду і пачаў знарок шумна, за ўсё чапляючыся, каб нарабіць грукату, бегаць па двары,– а раптам прачнецца жонка, выйдзе з хаты і дапаможа яму ратаваць авечак.

Ён нават станавіўся лапамі на сцяну і заглядаў у акно, нават узбягаў на ганак і шкробся, грукаўся ў сенечныя дзверы, але Агнежка так і не выйшла.

Тады ён зноў пабег да гайні, спадзеючыся, што, можа, хоць там яму ўдасца нешта выратаваць.

Ваўкі ўжо даволі-такі глыбока падкапаліся пад сцяну. Яны лёгка руйнавалі тое, што яму, гаспадару, здавалася вечным і непрыступным.

Гэтым хлеўчуком для авечак ён займаўся зусім нядаўна. Пабудаваў сабе новую лазеньку, а са старой зрабіў вось гэты катух для авечак.

Жонка, калі ён толькі збіраўся складаць будову па-новаму, прасіла зрабіць пад яе моцны цэментны падмурак, каб не падкапаліся ваўкі, і ён толькі адмахнуўся:

– Кінь ты! Якія ў нас ваўкі?! А калі хочаш, я для іх нешта іншае прыдумаю.

Бяляй выкапаў тады траншэю паўз адкрытую навонкі сцяну, накідаў туды камянёў, наўтыкаў вострых калоў, наламаў калючага дроту, наставіў дошчачак з панабіванымі ў іх цвікамі – і гэта рабіў на ўсякі выпадак, бо ваўкоў, ён ведаў, у іх лясах ужо ніхто даўно не сустракаў.

І зараз сам, на свае вочы бачыў, як лёгка паддаюцца ваўчынай настойлівасці яго ўмацаванні: ваўкі выграбалі каменне, выкідалі калючы дрот, і толькі калі калолі лапы цвікамі ў дошчачках, незадаволена, але ціха скуголілі — баяліся, каб не пабудзіць усю вёску.

Зрэшты, і дошчачкі з цвікамі неўзабаве асцярожна выграбаліся з падкопу.

Калі пралаз ужо быў гатовы, у яго, пластаючыся да самай зямлі, выгінаючыся пад ніжнім бервяном, палезлі першыя смелякі.

У хлеўчуку шум і валтузня павялічыліся. Авечкі, чуючы ваўкоў зусім блізка, асуджана мітусіліся, відаць, натыкаючыся адна на адну.

І вось тут і ім апанавала звычайнае пачуццё ваўчынай эйфарыі — ён і сам стрымгалоў кінуўся ў нару, каб як найхутчэй улезці ў свой жа хлеў і далучыцца да агульнага — нядаўна яшчэ чужога яму — азарту.

Ваўкі па ўсім хляве, з кута ў кут, ганялі авечак. Адна авечка міжволі трапілася яму пад лапы, і ён, здаецца, адразу ж, не задумваючыся, задушыў яе насмерць.

Зараз Бяляй быў такі ж, як і ўсе. Яму нават здавалася, што ўсё гэта адбываецца не з ім, што тут сапраўды разбойнічае, лютуе воўк, які ніколі не быў чалавекам. Бяляй разам з усімі ганяў па хляве сваіх авечак, пакуль не стала зусім ціха — відаць, не засталося ў катуху ніводнай жывой душы.

Па сваёй ваўчынай завядзёнцы, якой няўхільна пільнавалася гайня, кожны, хто што злавіў, задушыў, той і павінен несці набытак да логава. Спакойна, не шчэмячыся асабліва, яны, разабраўшы парэзаных авечак, вылезлі з хлява праз той жа самы пралаз. Выцягнуў і ён сваю ахвяру — праўда, здаецца, яму трапілася чужая: яна была цяжэйшая і яшчэ, мусіць, жывая, бо трапяталася і час ад часу ўздрыгвала.

Паўскідалі авечак на спіны і зноў жа, не спяшаючыся, патрухалі, парупіліся да лесу.

Ускінуў і ён сваю і, яшчэ ўзбуджаны ад палявання, разам з усімі шыбаваў з вёскі, авечка і праўда была жывая, бо яна колькі разоў спрабавала ссунуцца са спіны.

Ягоная авечка, хоць і прыдушаная, хацела ўратавацца! Яна была, відаць, не з даверлівых і цікаўных. А як дурацъ іх ваўкі, выкарыстоўваючы гэтыя авечыя слабасці! Ён сам, яшчэ чалавекам, бачыў, як падманваў аднаго разу воўк цэлы статак дурніц. Улез у нейкую яміну, а тады галаву высуне, пакажацца і зноў схаваецца, высуне – і схаваецца. Глядзелі авечкі, галовы пазадраўшы, на гэта дзіва, глядзелі, а тады ўсім статкам – выбірай любую! – і пайшлі ваўку ў лапы – цікава было паглядзець, што гэта там такое матляецца...

Недзе па дарозе ваўчыная эйфарыя ў яго пачала праходзіць. Ён міжволі, сам таго не чакаючы, па-чалавечы задумаўся: дык гэта ж я нясу сваю авечку ў лес ваўкам! Сам! На сваёй спіне! Трымаю яе сваімі ж зубамі і баюся, каб яна не звалілася!

Глупства нейкае!

Бяляй, як зацкаваны, азірнуўся па баках, крыху адстаў ад гайні, зваліў авечку пад куст – у надзеі, што прыйдзе потым, забярэ яе чалавекам, і ўлегцы дагнаў ваўкоў. І ў той жа час да яго падбег Важак, балюча схапіў клыкамі за шыю – ён адчуваў: да крыві,– Бяляй ведаў, за што, і таму, не супраціўляючыся, вярнуўся да авечкі, узваліў яе зноў на спіну і пацёгся да астатніх. Зараз ужо Важак пільна сачыў за ім – два цвічкі-вокі калюча, не міргаючы, увесь час глядзелі ў яго бок.

І калі ў лесе ваўкі смачна піравалі, аб'ядаючыся авечкамі, сам ён нічога не еў. Сядзеў убаку на хвасце і, выставіўшы наперад лапы, толькі абыякава назіраў, як бязлітасныя клыкі прагна разрываюць на кавалкі тое, што яшчэ нядаўна было ягонаю скацежаю.

Яму ж чамусьці вось зараз, гэтую хвіліну, заманулася ў вёску, захацелася паглядзець на свой зруйнаваны хлеў, і ён, бачачы, што ўсе заняты ежаю – нават Важак не сачыў за ім – і на яго знікненне ніхто не зверне ніякай увагі, паволі, нюхаючы зямлю, пабег з лесу.

Дарога аж да самага дому пахла авечкамі і ваўкамі. Прыбегшы на сваю пожню, ён, як і Важак, агледзеўся, услухаўся, правёў насцярожаным позіркам па машыне – ці няма ля яе каго? – і толькі пасля гэтага патрухаў да падкопу. Чамусьці здавалася, што ваўкі падушылі не ўсіх авечак, што хоць адно

якое ягнятка дзе-небудзь зашылася, захавалася, збераглося і засталося жывое. Каб убачыць гэта на свае вочы, ён нецярпліва палез у пралаз.

Але на гэты раз падкоп здаўся зусім вузкім – галава ў яго ўвайшла, а плечы не пралазілі. Колькі ён ні пластаваўся, колькі ні выгінаўся, улезці ў хлеў ніяк не ўдавалася.

Бяляй выцягнуў з нары галаву і падняўся на ногі. Памацаў рукамі плечы і зразумеў, чаму не пралез у падкоп.

Ён зноў перавярнуўся ў чалавека.

Абтросся ад зямлі, памацаў шыю: яна саднела – ці то ён садраў яе вось зараз, калі стараўся пралезці ў хлеў, ці то гэтая рана асталася ад клыкоў Важака...

Падышоў да машыны. Дзверцы ўсё яшчэ былі расчыненыя. Ён, моцна хляпнуўшы, зачыніў іх. І тут жа, як усё роўна яна чакала гэтага груку, выбегла на ганак жонка.

– Дзе гэта ты ходзіш?

– А што здарылася?

– Паглядзі вунь у хляве, што здарылася. Ваўкі ўсіх тваіх авечак павыцягвалі!

Ён паглядзеў – хлеў быў адамкнёны: значыць, яна ўжо бегала туды і ўсё бачыла.

Агнежка галасіла:

– Ды ўсіх-усіх падушылі, ірады. Нават ягнятак.

– А чаму ж ты не выскачыла?

– Я чула, што авечкі нешта тупацяць і хвалююцца, але думала, гэта ты ў хляве што робіш. І ў сенцы нехта шкробся, а я зноў жа чакала, што гэта ты клямку шукаеш.– Яна задумалася, відаць, успамінаючы ўсё, што было перад гэтым.– А ведаеш, і ў акно, здаецца, нейкі сабака глядзеў – пэўна, гэта воўк і быў...

Жонка раптам як асеклася ўсё роўна і падазрона прынюхалася.

– Слухай, а ты ў хляве з ваўкамі часам не быў? – спалохана спыталася яна.– Ты ж дужа нейкаю псінаю пахнеш...

Пры гэтых словах ён непрыемна скалануўся – аж зімна стала скуры: а можа, яна ўсё ведае?!

Але пераадолеў свой спалох, узяў сябе ў рукі і як можна спакайней сказаў:

— Выдумляеш ты абы-што...

— Не, не выдумляю. Ты і праўда пахнеш ваўкамі і авечкамі.

— Кінь, Агнежка, супакойся. Ты проста злякнулася, дык табе зараз усё ваўкамі пахне.

Яна крыху паспакайнела.

— Дык жа ягнятак шкада...

— Канечне, шкада. Але ж толькі шкадаваннем авечкам не паможаш. Новых завядзём.

— Дык яны ж, крывапіўцы, і новых выцягнуць.

— Не бойся. Зараз мы ўжо так умацуемся, што не выцягнуць,— і сам сабе падумаў, што цяпер ён ужо ведае, як абараніцца ад ваўкоў.

Жонка падышла да яго бліжэй, паклала галаву на плячо, прыхінулася. Убачыла, хоць ён і затуляўся, ранку на шыі, ласкава дакранулася да яе далонню:

— А што гэта ў цябе за кроў водзека?

— Мусіць, дзверцамі машыны садраў. Ідзі, Агнежка, спаць.

— І ты хадзі.

— Зараз і я прыйду.

Успомніў, што на льнозаводзе купіў дзецям цукерак, вярнуўся да машыны, забраў іх і вельмі павольна пайшоў услед за жонкаю.

Ад гэтага часу ён пачаў ужо думаць, як адпомсціць ваўкам, якія гэтак зняважылі і абразілі яго: прывялі чалавека на свой падворак і ў сваім жа хляве змусілі душыць сваіх жа авечак...

Толькі не ведаў, калі гэта лепей зрабіць. Цяпер, як ён стаў чалавекам, ці тады, калі зноў перавернецца ваўком.

## Тыя, што ідуць

Людзі ішлі неяк нязвычна – быццам плылі ў вадзе ці, наадварот, рухаліся ў беспаветранай прасторы, у бязважкасці. Яны асцярожна, як сляпыя, ставілі на зямлю ногі, кіраваліся па дарозе няспешна, абачліва, выстаўляючы перад сабою

рукі, сустракаліся імі, дакраналіся далонямі, пальцамі, разыходзіліся, каб неўзабаве зноў сустрэцца, толькі ўжо з іншымі далонямі і іншымі пальцамі.

Ішлі павольна, не спяшаючыся, але, нягледзячы на гэта, рух іхні быў вельмі ўпэўнены і перакананы.

Ён таксама выставіў перад сабою руку, і нібыта і сам нічога не бачыць, нібыта і сам шукае чужой далоні, пайшоў да іх у натоўп, пачаў гэтак жа, як і яны, мацаць перад сабою паветра. Але дзіва – ягоная рука ніяк не магла сустрэцца ні з якою іншаю: тыя далікатна абыходзілі яе, абміналі, ухіляліся ад дотыку, і яму нават здавалася, што нейкая невядомая сіла настойліва распіхвае, адштурхоўвае іх у розныя бакі. Самі людзі таксама рухаліся вельмі лёгка, суладна і акуратна – ні з кім ён не сутыкнуўся, ніхто не наступіў на ногі: у такім натоўпе людзі не заміналі яму, і ён ішоў, нібыта ў пустаце, нібыта быў адзін на ўсёй гэтай тлумнай дарозе.

Нечакана апынуўся побач з сівым, аж белым ад сівіны, дзедам, спрэс зарослым валасамі – яго пышныя вусы незаўважна пераходзілі ў густую бараду, якая звісала як не да самых каленяў. Гэты Барадзень, вельмі падобны на Белабога, быў моцны, дужы і, па ўсім відаць, не зважаючы на свае гады, хутчэй за ўсё на здароўе не скардзіўся. Белыя, пушыстыя валасы, якія атачвалі яго галаву, свяціліся і праменілі, нібы німб, асвятляючы натхнёны твар старога.

Чужому ў натоўпе падалося, што Белабог шукае менавіта ягоную руку. Той ласкава, нібы вывучаючы нешта, гладзіў каля яе паветра, пакуль незнаёмы сам не падсунуў яму нарэшце сваю далонь.

Рука старога даверліва адгукнулася на дотык, узрадавалася сустрэчы, неяк з надзеяю сціснула яму пальцы, і яны абодва дружна пайшлі поплеч, як усё роўна век-векам ведалі адзін аднаго.

Рука таксама, як і сам Барадзень, была моцная, верная, надзейная, яна, здавалася, струменіла, аддаючы яму нейкае спакойнае і той жа час неўтаймаванае святло.

Ісці са старым было лёгка, упэўнена і радасна,– нібыта ён кожнага, хто быў побач, зараджаў сваёй таямнічай энергіяй.

Незнаёмы доўга любаваўся яго мудрым, адухоўленым тварам, а калі захацеў убачыць раптам вочы старога,– жахнуўся: той быў сляпы! Шчыльна заплюснутыя павекі, калі глядзець толькі на іх, змушалі думаць, што Барадзень спіць.

З цікавасцю разглядаючы і іншых з натоўпу, тых, хто быў бліжэй, Незнаёмы спачатку ўзрадаваўся, што ва ўсіх іх блішчаць блакітныя вочы, і тут жа засмуціўся – вочы, як шкляныя, глядзелі, не міргаючы, і, канечне ж, таксама былі невідушчыя.

Дык вось чаму так нязвычна ідуць гэтыя людзі!

Трымаючы за руку Незнаёмага, лёгка знаходзячы дарогу ў такім шчыльным і цесным натоўпе, Белабог без асаблівых намаганняў вёў яго між сваімі. За свайго хутчэй за ўсё прымаў стары Незнаёмага і толькі, мусіць, дзівіўся, што чалавек паводзіць сябе крыху дзіўнавата, не так, як усе яны.

Сляпы вёў відушчага! Быццам бы якраз ён усё бачыў, а не той, хто меў чыстыя і жывыя вочы.

Відушчы, баючыся, каб не раскрылася яго таямніца, прыкідваўся, што ён такі ж, як і ўсе, і стараўся ўсё рабіць так, як рабілі іншыя – і ішоў, нібы ў вадзе, і нагамі абмацваў сцежку, і выстаўляў рукі наперад. Але ж ён бачыў! Бачыў і дарогу перад сабою, і кожную ямінку, якую трэба абыходзіць, і кожны каменьчык на ёй. Яму самому карцела весці старога, каб прасцей абмінаць перашкоды, лепш знаходзіць прасветы між людзей, але ён стрымліваў сябе – не хацеў яшчэ больш абуджаць падазрэнне, бо думаў, што яны і так адчуваюць ягоны падман.

А калі раптам Незнаёмы, добра бачачы дарогу, усё ж хацеў быў памагчы Белабогу абмінуць яміну са свайго боку, рука старога незадаволена тарганулася і настойліва павяла яго ў іншы бок – яны абышлі перашкоду менавіта так, як было зручней і як хацелася сляпому.

Па дарозе ім трапіўся вялікі, магутны, векавечны дуб – стары, нібы знарок, вёў чалавека якраз на яго. І калі ўжо дрэва было зусім блізка, калі здавалася, што вось-вось стукнешся лбом у яго шурпатую кару, Незнаёмы інстынктыўна страпянуўся, адхінуў галаву і хацеў саступіць убок. Барадзень тут жа ўмела, зноў па-свойму, абышоў дуб і абвёў каля яго

Незнаёмага, але пасля гэтага ягоная рука аслабла і зрабілася крыху абыякавай: Белабог, мусіць, здагадаўся, што той, хто ідзе побач, не іхні – ён усё бачыць!

Незнаёмы адчуваў, што з рукі старога, які пэўна быў у племі за Валадара, стукаецца штосьці ў яго руку, што Белабог пасылае яму гэткім чынам нейкія сігналы, падобныя на словы, нешта гаворыць, але што – не ведаў і таму не мог нічога адказаць. Ён проста, каб усё ж паказаць, што сёе-тое разумее, каб хоць неяк азвацца на размову, злёгку пацісну Валадарову руку. Аднак гэтым і зусім выдаў сябе – такое, мусіць, было дужа прымітыўным для рукі, якая гаворыць, і Незнаёмы адразу ж адчуў, як пачужэла шурпатая далонь старога.

Пасля гэтага зразумеў, што людзі, якія ідуць у гурце, не толькі сляпыя, але яшчэ і нямыя – яны гавораць між сабою адно пры дапамозе рук.

Шчырая і даверлівая зусім нядаўна рука Валадара зараз усё чужэла і чужэла – ён ужо нават адчуваў яе непрыязнасць,– пакуль, нарэшце, зусім не саслізгнула з ягоных пальцаў: Белабог, каб не замінаць, састу́піў крыху ўбок, а затым адзін пайшоў, як паплыў, наперад.

– Вазьміце і мяне з сабою! – забыўшыся, што ён тут не адзін, што вакол яго людзі, у роспачы закрычаў адрынуты ўслед Валадару, але той не звярнуў аніякай увагі на гэты крык – як ішоў, так і пайшоў далей.

І ніхто з усяго племя нават не павярнуў галавы на голас, які раскаціўся па ўсім наваколлі і вярнуўся рэхам, ніхто не зірнуў у яго бок, ніхто нічога не адказаў яму – усе, занятыя сваім клопатам, абыякава паплылі наперад, абмінуўшы яго з усіх бакоў і вышалушыўшы з гурту, як штосьці чужое і непатрэбнае.

І тады Незнаёмы зразумеў, што яны ў дадатак да ўсяго яшчэ і глухія.

Ён стаяў адзін на дарозе і незразумела – ці то зацікаўлена, ці то здзіўлена – глядзеў, як усё далей і далей адыходзяцца ад яго людзі...

Гэты натоўп ён убачыў выпадкова. Закінуўшы за спіну плячак, крочыў у іншы бок, на сваю дачу, калі наперадзе

заўважыў спачатку вялікі пыл, а пасля і людзей, якія ішлі насустрач яму па дарозе.

Грамада была бязмежная, яму здалося, што яна растопча яго, калі не збочыць, і ён саступіў убок, на траву.

Яны ішлі каля яго вельмі доўга.

Упэўнена, хоць і запаволена, ступалі ў дарожны пыл ногі, варушыліся, то з'ядноўваючыся, то раз'ядноўваючыся, рукі, праплывалі спакойныя і, здавалася, нежыццёвыя – ніводная жылка не зварухнецца! – твары.

І што было асабліва нечакана, дзіўна,– хоць пыл, у якім ішла грамада, вісеў густы і цёмны, стаяў непранікліваю сцяною, самі людзі заставаліся незапыленыя: іхнія твары і апраткі здзіўлялі сваёй белізною, чысцінёю і свежасцю: пыл, аказваецца, не прыставаў да іх!

Над імі лятаць самалёты, каля іх жыхалі грузавыя і легкавыя машыны, смуродна фыркалі матацыклы, ехалі на конях і веласіпедах паязджане, а яны не бачылі і не чулі гэтага: усе былі заняты дарогаю, ішлі павольна і спакойна, абы-якія да ўсяго, што адбываецца па-за імі,– не абураліся і не захапляліся нічым. І гэтае чужое жыццё таксама, як і пыл, не прыставала да іх – яны жылі нібы ў нейкім іншым вымярэнні.

Ён тады яшчэ не ведаў, што людзі, якія ішлі паўз яго,– не бачаць. Гэта пасля Незнаёмы здзівіўся такому жахліваму адкрыццю: усе яны сляпыя.

А яшчэ пазней зразумеў: яны і нямыя.

І ўрэшце здагадаўся: яны і глухія.

Але ж куды людзі ідуць – чаго хочуць і чаго так настойліва дамагаюцца дарогаю?

Здалося нават, што гэта ідзе нейкі цэлы народ – зняўся з даўно наседжанага месца і ўлегцы, нічога не ўзяўшы з сабою, пайшоў у свет.

Яму тады ж захацелася як мага хутчэй утачыцца ў гэты нязнаны народ, прыкінуцца сваім ці напраўду прыжыцца ў ім, пайсці поплеч, калі не да канца, то хоць бы прапыліць разам колькі дарог і перакрыжаванняў, каб даведацца, куды і навошта яны ідуць?

Тады ён і выставіў наперад рукі, рашуча ступіў у незнаёмы натоўп і, паправіўшы плячак за спіною, пайшоў з гуртам, хоць гэта і было яму не па дарозе.

А зараз вось той самы натоўп вышалушыў прыблуду, як штосьці непатрэбнае, абмінуў і далей пайшоў ужо сам сабою, без яго.

Незнаёмы бачыў, як Белабог, пагладзіўшы, памаліўшы, нібы экстрасенс, паветра перад сабою – лінія зямлі і лінія неба, лінія жыцця і лінія смерці, лінія цела і лінія душы,– лёгка знайшоў руку хлапчука, што бегаў побач, і яны, малы і стары, пайшлі разам, быццам самыя даўнія сябры. Гэтае яднанне рук – канечне ж, яны гаварылі між сабою, канечне ж, стары, карыстаючыся выпадкам, спрабаваў перадаць малому тое, што ведае сам, навучыць яго мудрасці жыцця – злавала Незнаёмага, і яму было зайздросна і крыўдна, што Барадзень не прыняў ягонай рукі, аддаўшы перавагу нейкаму падшыванцу.

Ён яшчэ крыху пастаяў, падумаў. Дык што, яго адрынулі, і ён так нічога і не даведаецца? Дык што, ён так і пойдзе сваёю дарогаю, на дачу, быццам і не было ў яго гэтай нечаканай сустрэчы? А раптам тут, у дзіўным, неверагодным натоўпе, хаваецца нейкая невядомая яму ісціна, дзеля якой варта жыць і варта ахвяраваць усім астатнім? А што, калі гэтая сустрэча важней за ўсё на свеце?! Якая мэта вяла яго па дарозе толькі што, перад сустрэчай з гэтымі людзьмі? Проста чалавек спяшаўся на сваю дачу, каб паліць агуркі – доўга не было дажджу, і ён трывожыўся, што пасохне агурочнік. Божа мой, якая гэта дробязь! У параўнанні вось з такім рухам, у якім ён адчуваў сілу, веліч, таямніцу і нешта яшчэ большае, пра што можна было толькі здагадвацца.

Ён махнуў рукою – бог з ім, з агурочнікам: няхай сохне! – паварушыў лапаткамі, зручней укладаючы на спіне плячак, і пайшоў у другі бок ад дачы – даганяць таямнічы натоўп.

Грамада адышлася яшчэ не дужа далёка, таму зрабіць гэта было зусім няцяжка.

Дагнаўшы, Незнаёмы паспрабаваў быў зноў неяк увайсці з людзьмі ў кантакт і, ужо ведаючы, што без рук гэта немагчыма,

што рукі тут – самае галоўнае, яны – і вочы, і вушы, і голас гэтых вандроўнікаў, пачаў набліжаць да іх свае далоні, але тыя, як і перад гэтым, не заўважалі ні яго самога, ні ягоных памкненняў – нібыта нікога ля іх не было. Праўда, дзяўчаты і маладыя жанчыны, якім ён таксама асцярожна спрабаваў падсунуць рукі, непрыемна шарахаліся, як ад нечага брыдкага, халоднага ці мокрага, адсланялі свае далікатныя далонькі і самі спяшаліся хутчэй адысціся куды-небудзь убок.

Зразумеўшы, што гэтыя людзі не прымуць яго у свой гурт, ён перастаў дамагацца іхняй увагі і пачаў уважліва разглядаць, вывучаць натоўп. Ужо ведаючы, што яны не бачаць, не чуюць і не гавораць, рабіў гэта спакойна і адкрыта, не тоячыся і не баючыся нікога.

Чым лепш пазнаваў гурт, тым больш разумеў, які гэта моцны народ, што кінуў свае звыклыя вёскі і гарады і вырашыў ісці нешта шукаць.

Народ гэты, на думку Незнаёмага, належаў да племя хлебаробаў. Мужчыны ўсе плячыстыя, дужыя, цягавітыя, з цяжкімі, жылістымі ад працы рукамі – канечне ж, за сяброў ім заўсёды былі ці то сякера, ці то каса, ці то плуг. Жанчыны – прыгожыя, зграбныя, вабныя, але спрацаваныя: і жаць яны, вядома, умеюць, і ткаць, і шыць, і палоць, і кароў даіць... І, безумоўна,– дзяцей раджаць: вунь колькі іх топчацца, таўчэцца пад нагамі ў племі і колькі ў матак на руках! А дзяўчаты! Прыгажуні! Іх хоць куды – хочаш на выстаўку, хочаш на конкурс прыгажосці пасылай, а хочаш – проста працы аддай: лён палоць ці сена варушыць. Усюды яны будуць прыгожыя, усюды ад іх не адвядзеш вачэй. Каралевы зямлі! Доўгія льняныя валасы і блакітныя-блакітныя, як роднае неба, вочы. І самі – такія ўжо беларусенькія! А дзеткі? І жвавенькія, і дапытлівенькія, і разумненькія. Толькі нейкі не дзіцячы, дужа дарослы сум у вачанятах стаіць – ці то ад пастаяннай дарогі, ці то, можа, ад якой іншай бяды.

Ён углядаўся ў кожнага чалавека і бачыў, што гэта ідзе сапраўдны, праўдзівы народ. Сярод яго не было калек і вырадкаў, не было, здаецца, і прайдзісветаў – ці то яны не пайшлі разам з іншымі, ці то па дарозе адышліся, зламаліся, зніклі.

Тут ішлі толькі гожыя і чыстыя душою вандроўнікі. Ішлі людзі розных прафесій: цеслі і трактарысты, муляры і касцы, настаўнікі і даяркі, інжынеры і мастакі, гарманісты і печнікі, спявачкі і цялятніцы, пчаляры і бондары, міністры і конюхі... Ён пазнаваў іхнія прафесіі па нейкім нязначным узмаху рукі, па кіўку галавою, па звычным характэрным руху, па паставе ці нават па паходцы. Гэта і праўда была дзяржава — спыняйся ў любым месцы, сяліся, будуйся, і яна адразу пачынае жыць і працаваць.

Сонца ўжо заходзіла. Адсюль, з пылу, узнятага столькімі нагамі, яно бачылася невыразна — нібы ў шчыльным засціле. Людзей не цікавіла, відаць, і гэта, бо яны ішлі спакойна, не зважаючы на блізкі вечар. Вось што значыць нічога не бачыць — калі б бачылі, ужо даўно б захваляваліся: а ці паспеем да вечара дайсці? Дзівак! А куды дайсці? Навошта спяшацца, калі яны ўвесь час ідуць?

Чакай, чакай, а можа, сам рух і ёсць іх жыццё, а канчатковы вынік — ніштo? Не, не можа такога быць — сэнс любой вандроўкі якраз у завяршэнні: куды і з чым ты прыйдзеш?

Калі сонца зайшло, людзі, нібы па якой камандзе, збочылі з дарогі. Усе, хто дзе спыніўся, там і асунуліся на зямлю.

Ноч умомант — так раптоўна бывае гэта толькі на поўдні, а не ў нас, на поўначы,— упала на зямлю і адразу ж прыціснула сабою ўсё, што апынулася пад ёю. Стала зусім цёмна. Праз якую хвіліну ўжо нічога нельга было разабраць, адрозніць, дзе зямля, а дзе неба, дзе трава, а дзе людзі, якія ўлегліся на ёй начаваць.

Прачнуўся ён ад яркага, сляпучага сонца. Яно біла проста ў вочы, і таму яму не хацелася адплюшчваць іх — ведаў, як балюча будзе зрэнкам. Доўга ляжаў не варушачыся, прыслухоўваючыся, успамінаючы дзіўнаваты ўчарашні дзень, дзіўнаватую грамаду, утомную дарогу, і яму здалося, што ўсё гэта ён бачыў у сне...

Навокал было ціха-ціха. Цішыня насцярожвала: столькі людзей спіць побач, аднак не чуваць ніводнага руху, ніводнага ўздыху, ніводнага шораху.

Таму, калі ў траве, ля самага вуха нечакана загуў чмель, ён аж здрыгануўся – такім прарэзлівым і гулкім здаўся ў цішыні гэты гуд: нібыта шум аўтамабіля, які вось-вось наедзе на цябе.

Ускочыў на ногі і, адвярнуўшыся ад сонца, расплюшчыў вочы. І неймаверна здзівіўся: каля яго нікога не было. Яшчэ не выпрасталася прымятая, улежаная трава, але людзей навокала не відаць. Яны падняліся і пайшлі, пэўна, да сонца – іх лежбішчы нават паспела прыцерушыць ранішняя раса.

Сярод поля і лугу ён стаяў адзін. Грамада і зараз абышла яго, абцякла, пакінула, выціснуўшы з сябе, як нешта чужароднае.

Чалавек азірнуўся. Дзіўна, учора ўвечары ён, стомлены, не заўважыў, што спыніліся яны начаваць каля нейкай вялікай вёскі. Вёска стаяла дыхтоўная, новая, нават крыху яшчэ не дабудаваная: у асобных вокнах не ставала шыбаў, дзе-нідзе не былі зашыты франтоны, не дароблены ганкі, веснічкі. Але вёска выглядала гатоваю – у яе можна было хоць сёння засяляцца і жыць. Праўда, дзівіла толькі тое, што нідзе не відаць ніводнага чалавека – ці то вёска сама па сабе і нараджалася ўжо такою мёртваю, нежылою, ці то яе пазней пакінулі людзі, якім яна чымсьці не спадабалася.

Ён яшчэ пастаяў, падумаў над гэтаю неспадзяванкаю, а тады ўзняў з зямлі плячак, дзе былі сякія-такія дачныя прычындалы,– ён уночы ляжаў пад галавою – і зноў пайшоў даганяць грамаду.

На дарозе, хоць па ёй і прайшло столькі людзей, не засталося ніякіх слядоў. Але Незнаёмы і без слядоў ведаў, у які бок падаліся вандроўнікі – яму як усё роўна нехта невідомы падказваў, як і куды трэба кіравацца.

Грамаду ён дагнаў, калі яна, выйшаўшы з лесу, абгінала вялікае, топкае і дрыгвяністае балота. Уяўляеце, як бы павінна была хлюпаць і цвякчэць твань пад столькімі нагамі, але ён, колькі ні ўслухоўваўся, нічога не чуў,– людзі ішлі ў поўнай цішыні, бясшумна пераскоквалі з купіны на купіну, без аніводнага гуку выцягвалі з багны ногі.

Усіх дзяцей, каб яны не паправальваліся ў прорвы, пабралі на рукі – і мужчыны, і жанчыны: ніводзін карапуз зараз не круціўся пад нагамі. Яны тузаліся на руках, мусіць, прасіліся далоўкі, спрабавалі злезці самі, але бацькі трымалі іх моцна – ніхто пакуль што не думаў нават ссаджваць дзяцей на зямлю. А да гэтага ж малечы няўтомна бегалі па траве і дарожным пыле, насіліся, як і ўсе дзеці на свеце – толькі бязгучна,– паміж дарослымі.

Мужчыны лагодна і ласкава апекаваліся жанчынамі, далікатна падавалі ім рукі, пераносілі з купіны на купіну, памагалі абысці небяспечныя, макрэйшыя імшарыны. Праўда, Незнаёмы паспеў заўважыць, што мужчыны і тут такія ж, як і ўсюды: яны завіхаюцца каля маладых і прыгожых жанчын, там збіраецца шмат – цэлы рой рук, і ўсе яны – сама ўвага і тактоўнасць, а каля старэйшых амаль нікога няма, і ім самім даводзіцца скакаць праз багну. Калі ўпадзе касынка ў маладой – усе мужчыны хутчэй кідаюцца дапамагчы прыгажуні, а хусцінку старой ніхто і не думае падымаць, каб зноў ускінуць яе на плечы. Успомніў жонку, якая асталася ў тым жыцці. Як яна ненавідзіць усіх мужчын! «Іхняя канстытуцыя, кажа, прымітыўная, яна не цікавая зусім і ніяк не можа зраўняцца з нашай, жаночай».

А самі жанчыны? Іхнія далонькі, іхнія пальчыкі, канечне ж, ахвотней і жаданей цягнуцца да тых, хто ім падабаецца, каму яны сімпатызуюць. І тут іншы мужчына стаіць, стаіць, высоўвае, высоўвае наперад рукі, спадзеючыся, што якая козачка скокне да яго ў абдымкі, а яны не проста бачаць тое – усё да прыгажэйшых ды паглядных далонькі свае працягваюць. Стаіць такі, стаіць, а тады махне рукою і пойдзе, унурыўшыся, пераносіць праз твань якую-небудзь старую ці непрыгожую.

Можа, і праўда ў мужчын нешта нейкае з канстытуцыяй?!

Незнаёмаму вельмі ж хацелася, каб і яго прынялі ў грамадзе за свайго. Ён таксама высоўваў наперад рукі, але ніхто зноў жа не дакрануўся да іх, ніхто ні з дзяўчат, ні са старых нават не зірнуў у той бок. Яго прысутнасці, здаецца, не заўважалі, яны існавалі нібы ў розных светах і вымярэннях,

і ён ужо сам сабе згадзіўся з думкаю, што ім ніколі не паразумецца, як, скажам, не паразумецца воблаку і матацыклу. Хто б з такіх што ні гаварыў, іншы ніколі не зразумее: усё ў іх рознае і нідзе нішто нават не перакрыжоўваецца.

Балота, якое трапілася на шляху грамадзе, было ёй за надзвычайнае становішча, дзе найлепей праяўляліся асаблівасці людзей і дзе іх вельмі добра было назіраць.

Незнаёмы зусім асмялеў. Ён, ведаючы, што людзі нічога не бачаць і не чуюць, смела хадзіў між імі, гучна смяяўся, гаварыў, па-свойму тлумачыў іхнія паводзіны і нават самаўпэўнена падказваў, што і як ім лепей рабіць. Гэта было дзіўна, недарэчна і смешна: ён гаворыць адно, а людзі робяць зусім іншае, не зважаючы на яго падказкі. Ад свае бездапаможнасці, ад немагчымасці што-небудзь змяніць ці паправіць у гэтай грамадзе, ён злаваўся яшчэ болей, а таму крычаў прарэзлівей і адчайней.

Калі ж выйшлі з балота на цупкую, утрамбаваную машынамі дарогу, людзі зноў паспакайнелі, пассаджвалі з рук дзяцей і ішлі зараз зноў як у нейкім несапраўдным, запаволеным сне.

Разам з імі паспакайнеў і ён сам.

Дасюль яму здавалася, што племя, між якога ён ішоў, усё на адзін твар — гэтак жа, як на першы погляд на адзін твар выглядае кожны народ: што ні аблічча — той жа самы чалавек.

А вось гэтае блуканне па балоце дапамагло яму ўбачыць у грамадзе прыгожых і непрыгожых, тонкіх і тоўстых, задумлівых і рассмяяных, спакойных і рухавых, пераканацца, якія яны ўсе розныя і непаўторныя.

Незнаёмы вылучыў нават самую прыгожую жанчыну, гэтакую Міс Грамада, і хутчэй за ўсё не памыліўся. Каля яе заўсёды ласкава і далікатна кружылася, як у танцы, мноства рук, а яму было чамусьці боязна, каб і яе, як, да прыкладу, нашых каралеў прыгажосці, не зняважылі якой-небудзь непрыстойнасцю.

Прыгажуня ж залётнікаў не баялася. Яна з усімі была вельмі роўнаю і нікому не аддавала перавагі.

За час блукання па балоце Незнаёмы заўважыў і зразумеў, хто каму сімпатызуе, хто каго любіць, хто каго раўнуе і хто

кага пабойваецца. Адчуў, што ў некаторых рэўнасць была адчайнай і выклікала нават шал. Вядома, тут, у дарозе, адзінаю, мусіць, прычынаю звадаў і злосці магла быць толькі жанчына.

Людзі нічога з сабою не неслі – ні ў руках, ні на плячах,– а таму галоўным скарбам, з-за якога пачыналіся ўсе разлады і непаразуменні, было, мусіць, каханне.

Зразумела, даўней, яшчэ да таго, як яны падняліся і пайшлі, у іх, канечне ж, былі і свае сваркі па іншых прычынах, і свае нелады, калатнеча – скажам, з-за зямлі, з-за каровы, з-за хаты. Але ж у дарозе сёе-тое загаілася, сёе-тое зусім забылася, бо, як ён зразумеў, у іх зараз з'явіўся самы, пэўна, галоўны і самы важны клопат – ісці.

У дарозе час яму не доўжыўся, не бавіўся.

Ён разглядаў людзей, між якімі ішоў, спрабуючы здагадацца, як хто жыў да гэтага паходу, чым займаўся, чым рупіўся; імкнуўся падзяліць, расчляніць натоўп на сем'і, на маладых і сталых, на мудрых і не зусім, на працавітых і ляных. Ніяк не мог разабрацца з дзецьмі – чые яны, хто іхнія маткі: уся малышня аднолькава ліпла да ўсіх жанчын, а тыя, кожная, як роднага, як свайго, лашчылі і песцілі ўсіх вісусаў.

У гэтым народзе, як звычайна бывае ў кожным мудрым і векавечным народзе, усе мужчыны былі мужныя і строгія, усе жанчыны – ласкавыя і пяшчотныя.

У цікавых назіраннях за незнаёмым народам выпадковы чалавек і не заўважыў, як мінуўся дзень. Колькі яны прайшлі, у які бок кіраваліся, ён не ведае і не помніць – спадарожны ішоў, нібы ў сне, сам рух для яго быў механічны – ён толькі перастаўляў ногі, і ўсё. Затое якая прастора была думаць, супастаўляць, разважаць!

І толькі тады, калі зайшло сонца і грамада, збочыўшы з дарогі, пачала атайбоўвацца на ноч, Выпадковы адчуў, як стаміўся. Вельмі хацелася спаць, аднак ён рабіў усё, каб не заснуць,– карцела пабачыць, як гэтыя людзі кладуцца і як яны потым раніцою ўстаюць: ці гэта ў іх атрымліваецца само сабою, інстынктыўна, ці, можа, нехта ўсё ж дае які знак альбо кліч. Але як, якім чынам можна даць той кліч, калі людзі не бачаць, не чуюць і не гавораць?!

Як можна, не бачачы, не гаворачы і не чуючы, згаварыцца, устаць усім адначасова і адначасова пайсці?

Таму ён трымаўся, як мог, адганяў санлівасць і, усё пазяхаючы, спрабаваў разглядзець у пракаветнай цемры, што робяць людзі, як яны засынаюць. Але ўбачыць гэта было немагчыма: цемра была непранікальная.

Мусіць, ад таго, што ён так пільна, напружваючыся, углядаўся ў яе, змагаўся са сном, яму яшчэ болей хацелася спаць. Выпадковы і сам не заўважыў, калі і як праваліўся ў гэтую вязкую чарнату і знік.

Прачнуўся ён зноў жа ад нейкага святла – як усё роўна хто паварушыў яго. Было ціха-ціха. Падумаў, што і на гэты раз усё праспаў,– пэўна, сонца ўжо ўзышло, а ён, як і перад гэтым, адзін ляжыць сярод лугу, у роснай, а таму і халаднаватай, траве. Аднак святло было не вельмі яркае, і гэта яго дзівіла. Ён паволі адплюшчыў вочы і здзівіўся яшчэ болей.

Усё наваколле было заліта матавым, нібыта месячным, святлом – здалося нават, што над лесам вісіць поўня. Святло струменіла, яно было спакойнае, няяркае, як прывіднае ўсё роўна, але ў ім усё дужа выразна бачылася.

На полі працавалі людзі. Тыя, з якімі ён ішоў. Поле было шырокае, і на ім хапала месца ўсім. Адны на сытых і дагледжаных конях аралі, уздымаючы аблогу, другія скарадзілі, трэція сеялі. Ён прыглядаўся ў надзеі ўбачыць дзе-небудзь які трактар, аўтамашыну ці сеялку, але нічога з гэтых прылад цывілізацыі на полі не было відаць. Людзі сеялі старым, даўнавечным спосабам, відаць, забыўшыся, што над светам ужо даўно шуміць такі позні, аж дваццаты, век.

Канечне, гэта быў народ, з якім ён ішоў і які хацеў зразумець. Спакойна, не спяшаючыся, але з ахвотаю людзі рабілі кожны сваю працу: сёй-той, каго ён ужо ведаў у твар, шморгаў лейцамі, падварушваючы коней, якія і так не засыналі ў баразне; іншыя, моцныя і цярплівыя, неслі на плячах, узяўшыся за хахлы, цяжкія мяхі з зернем – неслі да сявалак; а самыя вопытныя, набіраючы поўныя жмені зерня, з радасцю аддавалі яго зямлі.

Сярод сейбітаў, канечне ж, вылучаўся Белабог; і пастава яго змушала, абавязвала быць Галоўным Сейбітам, і жмені ў яго былі большыя, і зерне ляцела далей і клалася раўней – Прыгажуня, якая ляшыла яму, ледзь паспявала за спорнаю і размашыстаю хадою Валадара.

І ўсё гэта тым больш здавалася непраўдзівым, што на полі не чуваць было ніводнага гуку, ніводнага крыку, ніводнага шораху. Хоць бы хто на каня ўзлаваўся ды «нокнуў» як след, хоць бы якая пуга ляснула ці вылаяўся хто, хоць бы хто кракатнуў, скідваючы з плячэй цяжкі мяшок. Не, навокал было ціхаціха, і ад гэтай цішыні аж ламіла ў вушах. Калі Выпадковы заплюшчваў вочы, каб праверыць сябе, яму здавалася, што ўсю гэтую сяўбу ён проста прыдумаў,– не можа ж і напраўду працаваць столькі людзей, нічым не азваўшыся, нічым не выдаўшы сябе. Але як толькі адплюшчваў вочы зноў, відзежа паўтаралася і змушала паверыць у сваю праўдзівасць: працуюць! І поле асветлена, і людзі працуюць!

Ці не гэтая цішыня зусім неспадзявана зноў змарыла яго на сон. Ён не паспеў заўважыць, калі заснуў,– як усё роўна нехта закрыў яму павекі і сілаю не даваў іх расплюшчваць, пакуль не супакоіцца.

Прачнуўся, як заўсёды, адзін. Навокала зноў жа было ціхаціха.

І тое, што ён бачыў уночы, здалося яму такою лухтою, такою выдумкаю, што аж самому зрабілася няёмка за сваё блюзнерства. Прыдумаў: сяўба! Выдумаў: коні, сейбіты! Ды ўсё гэта табе самае большае магло толькі прысніцца. Якая ніва, якая сяўба? Вар'ят!

Выпадковы хуценька падхапіўся на ногі і аглядзеўся вакол сябе.

Была позняя раніца. Сонца ярчэла высока ў небе.

Ён стаяў пасярод палетка. Усё бяскрайняе поле, якое за адзін раз нельга згледзець вокам, было ўзарана, засеяна і праскароджана. Дзе-нідзе відаць яшчэ былі лехі – пучкі саломы, якія торкала ў зямлю Прыгажуня, каб Барадзень не сеяў у другі раз па сеяным, засталіся і пасля бараны.

Лапік жа, дзе ён спаў, абышлі. Абаралі і абскарадзілі з усіх бакоў. Быццам на гэтым месцы расло дрэва ці ляжаў камень, якому ніяк нельга было даць рады.

Значыць, і на гэты раз яго адрынулі і пакінулі аднаго пасярод незнаёмага, невядома навошта засеянага поля. Ён крыху пазлаваў на грамаду, пашкадаваў, што яны з ім абыходзяцца так няветліва, а тады паправіў загадзя ўскінуты на спіну плячак і пайшоў па сеяным у толькі аднаму яму вядомы бок – даганяць незразуметы народ.

Раптам побач з ім нехта выразна загаварыў. Спытаўся:

– А навошта яны сеюць?

– Мусіць, думаюць неўзабаве вярнуцца сюды,– не гледзячы, адказаў ён незнаёмаму.

– І што, яны спадзяюцца, вярнуўшыся, сабраць тут ураджай? Але калі нехта апярэдзіць іх?

– То і на здароўе. Ён жа і сам, пэўна, нешта недзе пасеяў. Падзеліцца.

– А іншай ты прычыны не бачыш?

– Пакуль што не. Хаця...

– Вось і мне часам здаецца, што яны гэта робяць адно для таго, каб не забыцца на сваё ўмельства, сваё майстэрства. Каб не развучыцца араць і сеяць. Столькі ж ідуць...

Незнаёмы, відаць, глыбока задумаўшыся, памаўчаў, а тады раптам нічога ні з якага спытаўся:

– А ты хто будзеш гэтаму народу?

Выпадковы ад нечаканасці аж спыніўся і, ужо шукаючы адказу на гэтае раптоўнае пытанне, зразумеў, што нікога побач з ім няма: і пытаецца, і адказвае на пытанні адзін і той жа чалавек – ён сам.

– Вар'ят! Вар'ят! – злосна вылаяў ён самога сябе.– То ж трэба – сам з сабою ўжо размаўляць пачынаю.

Хоць крыху і няёмячыся, што робіць такое, у злосці сплюнуў на чыстае, далікатна пасеянае і абскароджанае поле і пайшоў шпарчэй – калі ён цяпер дагоніць грамаду?!

Але дагнаў ён людзей яшчэ задоўга да абеду – ці то сам ішоў дужа шпарка, ці то яны падняліся і пайшлі пазней, чым ён думаў.

Выпадковы адразу ж увайшоў у густы пыл, узняты столькімі нагамі, увайшоў дужа смела, бо ўжо ведаў, што гэты пыл не прыстае і да яго таксама – колькі ўжо ідзе, а зусім не запылены ні сам, ні адзенне. Калі б такое было ў нейкім іншым, нармальным жыцці, адчувае, як бы ўжо рыпеў ён на зубах, як бы слязіліся ад яго запарушаныя вочы, як бы калоліся, нібы асцюкі, пад сарочкаю незлічоныя пылінкі. А так ён ішоў у самым пыле і не адчуваў яго.

Гэтак жа, як не адчуваў і не бачыў нічога, што адбывалася навакол. Як толькі ўступаў у гурт, усё для яго знікала, усё раствaралася ў цішыні, а на самога насоўвалася вялікае, нібыта хмара, маўчанне, ад якога аж закладала вушы,– у гэтай хмары, нібы ў вакууме, ужо не чуваць было ніводнага слова, ніводнага гуку, ніводнага шораху. Нават дрэвы там, дзе ішла грамада, здавалася, не шумелі, а калі і варушылі лістамі, то не чутна і не праўдзіва.

Шамацеў і не шамацеў вецер, булькатала і не булькатала рака, спявалі і не спявалі птушкі.

Навокал, канечне ж, абмінаючы гэты нескончоны гурт, злуючыся і лаючыся на перашкоды, на тое скопішча людзей, ехалі машыны і калёсы, але ён, як і ўсе іншыя ў натоўпе, не бачыў гэтага.

Навокал працавалі ў палях, гаманілі і перагаворваліся, плакалі і спявалі людзі, але Выпадковы не чуў іх. Усё гэта абыходзіла яго, быццам тое жыццё па-за грамадою і вось гэты настойлівы рух нідзе не сутыкаліся і былі размежаваны ў часе і прасторы.

А грамада была абыякавая і да яго. Колькі ён ні імкнуўся выдаць сябе, рассакрэціць сваю прысутнасць, даць людзям зразумець, што ён усё ж, нягледзячы на іх няўвагу і абыякавасць, ідзе з імі, яны не зважалі на гэта і вялі сябе так, быццам побач нікога няма – праходзілі каля чалавека, як каля нейкай невідзімкі ці як каля пустога месца.

Вось і зараз ён паспрабаваў павадзіць між людзьмі рукою, але ніводная далонь не адгукнулася яму, не заўважыла яго. Паспрабаваў загаварыць да бліжэйшых – знарок голасна і выразна,– але ніхто ні рухам, ні поглядам не паказаў, не выдаў,

што яго пачулі і зразумелі: безуважныя да чужака вандроўнікі зацята, маўкліва ішлі наперад.

І тады ён адчуў, як стаміла гэтае маўчанне, як яму захацелася з кім-небудзь пагаварыць – абы з кім, абы толькі бачыць, што цябе разумеюць, і чуць, як табе адказваюць, адклікаючыся на кожнае тваё слова. Жыць сярод маўчання, ісці сярод маўчання, маўчаць самому і ў адказ чуць тое самае маўчанне – гэта невыносна цяжка і недарэчна.

І ён раптам, нібыта не ідзе, а стаіць недзе за трыбунаю, загаварыў. Загаварыў гучна, выразна і з пафасам:

– Людзі! Я ведаю, што вы чуеце мяне, бачыце мяне, адчуваеце мяне. І толькі прыкідваецеся, што я тут лішні, чужы, выпадковы вам, і робіце выгляд, што не заўважаеце мяне. Проста вы не хочаце прыхадня пусціць да сябе ў душу, не хочаце, каб я зразумеў вас. Але ж мушу вас запэўніць, а можа, і засмуціць, што я і ў душу вашу залезу, і зразумею сэнс вашага руху і вашага жыцця. І калі яны мудрыя, я застануся з вамі назаўсёды – каб памагаць вам. Стану вашым слыхам, зрокам і словам. Я здагадваюся, што я ваш і некалі выпадкова не пайшоў з вамі, бо не паверыў вам, і астаўся відушчым...

Скончыў і пільна агледзеў усіх, што ішлі побач,– а раптам хто і напраўду слухае яго і выдасць хоць бы нейкай дробяззю сваю цікаўнасць?

Аднак усе як ішлі, так ішлі і далей – абыякавыя да ягоных слоў і прызнанняў: вольна, як і да гэтага, бегалі ля ног дарослых дзеці, узнёслыя і шчаслівыя, ведаючы сабе цану, з годнасцю плылі жанчыны, мудра і засяроджана тупалі між імі задумлівыя мужчыны. І нікому не было аніякай справы ні да ягонай усхваляванай прамовы, ні да яго самога.

Ён пераконваўся яшчэ раз, што яны і напраўду глухія, сляпыя і нямыя!

Побач з Выпадковым у натоўпе аказалася Прыгажуня – яна ішла абыякавая да яго, як і ўсе іншыя.

Дзяўчына вельмі падабалася яму, і ён, ведаючы, што ніхто гэтага не бачыць, не саромеючыся, шукаў яе ў натоўпе і потым доўга і ўважліва разглядаў, любаваўся ёю, лашчыў вачыма ўсё, што можа толькі захапляць у жанчыне мужчыну.

Часам яму нават здавалася, што ідзе ён з гэтым народам менавіта з-за Прыгажуні...

Выпадковы, убачыўшы, што іхнія рукі былі зараз амаль што побач, напружыўся, сабраў усю сваю волю і хацеў узяць яе пальчыкі ў далонь. Але рука, як і раней, нібыта натыкнулася на нейкую загадкавую перашкоду. Больш таго, якаясьці невядомая сіла адштурхоўвала яе з такою настойлівасцю, што Выпадковы, паспрабаваўшы пераадолець яе, зразумеў, што зрабіць гэта немагчыма, перастаў тузацца, рыўком, ледзь не стаптаўшы малога, які трапіўся пад ногі, адскочыў убок, далей ад Прыгажуні, і ўжо да самага вечара сцішана ішоў у натоўпе – раззлаваны, незадаволены і маўклівы, як і ўсе.

Заснуў ён адразу і моцна. На гэты раз у яго не было ніякага жадання падглядаць, як людзі кладуцца спаць.

Але сярод ночы яго нібы разбудзіў хто. Здаецца, што ён нават выразна пачуў, як нехта загадаў яму: «Уставай!» і, правёўшы далонню па вейках, дакрануўся да пляча.

Адплюшчыў вочы і здзівіўся – каля яго нікога не было. І яшчэ больш здзівіўся, што ўжо зусім выспаўся – стомы ён не адчуваў, быў бадзёры і свежы.

Над наваколлем, як і мінулую ноч, вісела ўсё тая ж дзіўнаватая поўня. Святло ад яе зноў жа ішло прывіднае і матавае, нібы ў пахмурны дзень, яно струменіла, пералівалася, было, здаецца, рухомае.

Адчуўшы ва ўсім целе сілу і энергію, ён пругка, адным рыўком ускочыў на ногі.

І адразу ж, нібыта запушчанае ім самім, усё заварушылася, захадзіла, зашастала. Шоргалі пілы, грукалі сякеры, ляскалі малаткі, вішчэла цыркулярка, хадзілі людзі – хто насіў дошкі, хто цясаў бёрны, хто заразаў вуглы, што імшыў хаты, хто ўстаўляў рамы, хто ставіў кроквы, хто складаў печы, а хто ўжо і спрабаваў паліць у іх,– каб праверыць, ці добрая атрымалася цяга.

Яму і напраўду здавалася, што ён сам уключае і выключае гэты рух: заплюшчыш вочы – робіцца ціха, адплюшчыш – зноў усё пачынае варушыцца, рухацца, хадзіць. Але ж Выпадковы разумеў, што думаць гэтак зусім наіўна – людзі, канечне ж,

працавалі тут і да таго, як ён прачнуўся: бачыш, колькі хат паспелі панаставіць яны за гэты час!

Успомніў, як аднойчы прачнуўся ля новай вёскі, якой увечары, калі клаўся спаць з грамадою, не бачыў. Дык вось якая гэта была вёска! Яе, як і гэтую, сённяшнюю, людзі, з якімі ён ішоў, пабудавалі талакою за адну ноч!

І тут жа, нібы падахвочаны кімсьці, Выпадковы рашуча пайшоў у гурт будаўнікоў, якія рупіліся на будоўлі.

Насіў з жылістымі мужчынамі дошкі, памагаў цеслям выбіраць шпары, заразаць вуглы, падымаць бёрны на зрубы, ставіў з Барадзенем кроквы, прыбіваў латы да іх і нават, убачыўшы, як Прыгажуня ў новай печы спрабуе распаліць агонь, назбіраў сухіх смаловых стружак, унёс у хату і высыпаў іх перад дзяўчынаю. Тады яму здалося, што рукі іхнія нібыта дакрануліся між сабою, але ён і сам не паверыў у гэта – канечне ж, прыдумаў тое, чаго жадаў.

А вось з рукамі Барадзеня яго рукі і напраўду сустрэліся – калі вяршылі страху. Белабогава далонь напачатку здрыганулася, а затым на нейкі момант прыціхла на чужых пальцах. Валадар, мусіць, здзівіўся – як гэта, выпадковы чалавек, якога яны адрынулі, усё яшчэ тут? Рукі спакойна паляжалі крыху, памаўчалі, як падумалі, а затым саслізгнулі на дранку: зноў узяліся за працу – нібыта нічога не здарылася, нібыта нічога яны і не зразумелі, і не заўважылі.

Людзі працавалі зладжана, вельмі дакладна рабілі любую работу, і яму ўжо не верылася, што яны не бачаць, не чуюць і не гавораць.

Ён сачыў за суладнаю працаю дойлідаў і рабіў любую работу, якая траплялася пад руку,– дзіва, усё ў яго таксама атрымлівалася, а сам думаў, думаў, думаў, спрабуючы хоць нешта зразумець.

Навошта і праўда яны рубяць дамы, ставяць гэтую вёску? Навошта выштукоўваюць хлявы, свірны, каморы, клеці, лазні, калодзежы? Для каго? Для сябе? Каб, вярнуўшыся ў гэтыя мясціны, ім калісьці не толькі было што есці – пасеялі ж ужо! – але было дзе і жыць?

Аднак калі тое будзе? Калі яны вернуцца? У хатах хутчэй за ўсё за гэты час парастуць бярозкі і таполі, яны праб'юць, уздымуць на сабе не толькі падлогу, але і столь і зашумяць над стрэхамі і камінамі, з якіх ніколі не ішоў дым, сваімі густымі кронамі.

Тады навошта гэта работа? Можа, і праўда – каб не страціць умельства? Але калі яно зноў-такі знадобіцца, тое ўмельства? Некалі? Гэта ж так доўга чакаць! Няхай сабе! Аднак калі ёсць «некалі», трэба каб было ўсё, што па часе спатрэбіцца яму.

Выпадковаму здавалася, што гэты народ запланаваны на будучыню. Быццам зараз у яго няма жыцця, а ён працуе і жыве толькі на заўтрашні дзень – як усё роўна продкі ахвяравалі сабою дзеля нашчадкаў.

Але ж недарэчна і нават жудасна пакідаць новую вёску, у якой ніхто ніколі не жыў, і ісці бог ведае куды і чорт ведае навошта. Пакідаць вось гэтыя дыхтоўныя хаты, у якіх бы толькі жыць ды радавацца...

Куды ісці? Навошта ісці?

Усё тое, што наперадзе, калі чалавек ідзе, абавязкова астанецца ззаду.

Дык што, тады, выходзіць, зусім не трэба нікуды ісці? Хто яго ведае! А раптам тое, што страціў ззаду, знойдзеш якраз наперадзе...

Ён зноў задумаўся пра рух, пра сэнс гэтага руху, у якім жадаў разабрацца, але тут нечакана пагасла святло, як усё роўна нехта выключыў электрычнасць, знікла поўня, зніклі падобныя на паўночнае ззянне сполахі, стала цёмна-цёмна, апраметная цемра пакрыла непранікліваю чарнатою ўжо гатовую вёску, закончаныя хаты і саміх будаўнікоў, якія хутчэй за ўсё тут жа апускаліся на зямлю альбо засыналі там, дзе працавалі. Яго цемра заспела на ганачку ля пабудаванай, як кажуць, пад ключ, хаты, і ён, дзе стаяў, апусціўся на прыступкі, адчуў нейчую спіну, прыхінуўся да яе і так заснуў – нібыта і сам міжволі адключыўся, забыўшыся, у чым толькі што хацеў разбірацца, што шукаць.

Гэтую раніцу ён прачнуўся ад нейкага лёгкага, ледзь улоўнага дотыку нейчай далоні да ягонай рукі. Адплюшчыў вочы і, здзіўлены, убачыў, што каля яго нікога няма. Але побач акуратненька, па парадку, нібы па чарзе прачыналіся і падымаліся іншыя людзі – як усё роўна іх таксама нехта будзіў.

Той, невідомы дзяжурны, быў вельмі ўважлівы і дакладны – ён імкнуўся пабудзіць усіх, не абмінуўшы нікога: ні тых, што, сонныя, сядзелі на лішніх, не скарыстаных бёрнах, ні тых, што соладка спалі на стружках, ні тых, што начавалі ў хатах, паклаўшы галовы на новыя, пахкія ад свежай смалы, сталы і падаконнікі.

Спадарожны зразумеў, што пабудца, якога не бачна, хутчэй за ўсё ў грамадзе за гадзіннік і ў яго абавязкі ўваходзіць не пакінуць ніводнага не папярэджанага, што яны пайшлі ўжо,– дык вось як племя дружна здымалася з месца і таямніча для Выпадковага знікала: чужая рука для невідомага не існавала, і ён абмінаў яе.

Вандроўніку нават здалося, што робіць усё гэта сам Белабог, скідваючыся на той час невідомым,– здаецца, Спадарожны пазнаў ягоную руку.

Ён лёгка ўскочыў на ногі – нібыта і не было для яго начной працы, начной будоўлі.

Грамада пачала ўжо свой рух. Тыя, што ўсталі раней, паспелі крыху адысціся ад пабудаванай уночы вёскі, а тыя, каго пабудзілі толькі што, хуценька прахопліваліся і, яшчэ сонныя, спяшаліся дагнаць гурт.

Наперадзе ўжо ішлі Белабог з Прыгажуняю, яны нібы вялі за сабою ўсіх, і Спадарожны, крыху зайздросцячы і раўнуючы, усё ж захапляўся імі. Зацікаўлена сочачы за Ім і Ёю, назіраючы за тым, як прыгожа яны ідуць, як даверліва размаўляюць іхнія рукі, ён міжволі думаў, што, мусіць, сімваламі гэтага народа і гэтай хады з'яўляюцца менавіта Мудрасць і Прыгажосць.

Яму самому ішлося лёгка, а думалася яшчэ лягчэй – галава была чыстая, і кожная цікавая думка імгненна, шчодра раскрывалася, як набухлы пялёсткамі бутон.

Зараз ужо шмат якія рукі размаўлялі і з ім. Яны дакраналіся да далоняў, да пальцаў, да тыльнага боку рукі, якім звычайна выціраюць пот з ілба, і нешта гаварылі, гаварылі, гаварылі... Ён злаваўся, бо ўсё яшчэ не разумеў мовы рук, а тыя супакойвалі, цярпліва, па некалькі разоў стараліся яму нешта растлумачыць. Мусіць, імкнуліся выспаведацца, расказаць, хто яны такія, адкуль, куды і, галоўнае, навошта ідуць, але Спадарожны не лавіў гэтага. Разбіраў толькі некаторыя незразумелыя, дзіўныя словы, кшталту «ладатрус», «радыяцыя», «зомбі», але яны былі для яго пустыя і зусім нічога не значылі. Спадарожны, хоць і не разумеў гэтых слоў, адчуваў, што яны няпростыя, абразлівыя, і таму тое, што стаяла за імі, здавалася яшчэ больш страшным, нават злавесным.

Адно толькі ён ведаў пэўна: там, дзе жыў гэты народ, здарылася нейкая жудасная бяда, нейкая жахлівая катастрофа, якая змусіла людзей пакінуць свае хаты і пайсці.

Пасля сумеснай начной працы яго, мусіць, прызналі за свайго і, нягледзячы на тое, што ён не разумеў іхняй мовы, падбадзёрвалі – маўляў, нічога, не перажывай вельмі, хутка навучышся.

Нават Белабог, які калісьці грэбліва адкінуў ягоную руку, зараз сам шукаў яе.

Неяк надвечар, калі сонца ўжо стаяла на самым небасхіле, Спадарожны заўважыў, што Барадзень, які ўвесь гэты час быў уперадзе руху, паволі слізгаючы па руках супляменнікаў, ідзе ў канец натоўпу – нібы шукае каго. І ўжо толькі тады, калі той быў зусім блізка, Спадарожны зразумеў, што шукае ён менавіта яго.

І праўда, калі Валадар дакрануўся да ягонай рукі, пазнаў яе, ён вельмі ўзрадаваўся і штосьці доўга гаварыў – Спадарожны адчуваў, як нейкія незразумелыя эмацыянальныя сігналы калоліся ў далонь, як нейкая цеплыня запаланяла ўсю руку і ўсё цела, нібы ад дотыку экстрасенса.

І хоць ён нічога не зразумеў з таго, што гаварылі яму Валадаровы рукі, усё ж адчуваў, што Белабог задаволены размовою. Яшчэ пабыўшы крыху каля Спадарожнага, ён зноў годна накіраваўся наперад, лёгка і вольна размінаючыся з людзьмі, ні з кім з іх не сутыкаючыся, усіх абыходзячы.

Гэтак жа лёгка знайшоў у натоўпе Прыгажуню, і тая даверліва сустрэла ягоную руку. Яны ішлі поплеч і пра нешта доўга і эмацыянальна гаварылі.

Спадарожны злавіў сябе на думцы, што гэта яму непрыемна, што ён раўнуе яе, гневаецца на яе, і раздражнёна адвярнуўся. Разглядаў іншых людзей, вывучаў іншых жанчын і мужчын, змушаў сябе непрымусна думаць таксама пра нешта іншае, стараўся не глядзець у іхні бок, але бачыў толькі іх, цікавіўся толькі імі.

Дзіўна ён кахаў яе! Кахаў гэты прывід, гэтую відму!

Калі Спадарожны, на хвіліну адвёўшы позірк, зноў зірнуў туды, дзе яны ішлі, ён не паверыў сваім вачам: Барадзень ішоў адзін! Пачаў вачыма шукаць яе, але Прыгажуні нідзе не было відаць. Ён захваляваўся, нецярпліва, выцягваючы шыю, круціў галавою, каб нарэшце ўбачыць яе, але ўсё дарэмна: Прыгажуня як скрозь зямлю праваліласся.

І калі ўжо Спадарожны зусім страціў надзею адшукаць яе ў натоўпе, нейчая пяшчотная далонька даверліва ўторкнулася ў яго далонь і, як напалоханае птушанятка, сцішылася ў ёй.

Нават не паварочваючы галавы, ён ведаў, што гэта была Яна.

Прыгажуня ўсім целам прыціснулася да яго. Ён павярнуў яе твар да сябе і зірнуў ёй у вочы. І здрыгануўся: яму здалося, што вочы былі жывыя, яны, ці чуеце, бачылі! Але разглядзець іх уважлівей Спадарожны не паспеў: апошні, нейкі дужа яркі прамень закотнага сонца ўкалоўся яму ў зрэнкі і адразу пагас, знік, той жа час стала цёмна-цёмна – і зараз як усё роўна нехта выключыў святло...

Цела яе было гарачае, а вусны – халодныя.

Ён грэў іх усё настойлівей і настойлівей і адчуваў, як яны ўвачавідкі цяплеюць, робяцца такімі ж гарачымі, як і цела,– неўзабаве ўжо ягоныя вусны былі халаднейшыя і самі грэліся аб дзявочыя.

У яго было толькі дзве рукі, яму ж самому здавалася, што іх сотні, але і соцень не хапала – хацелася мецъ яшчэ болей. Не памятае, як і калі ўсё на свеце знікла, а сам ён нібы праваліўся ў якое прадонне – памятае толькі, што падаць яму было радасна, прыемна, насалодна і крышачку боязна...

Назаўтра Прыгажуня ішла, як заўсёды. Гаварыла рукамі з усімі, падыходзіла да Белабога, і яны, нібы нічога і не здарылася, дружна і ласкава некаторы час крочылі побач, зацікаўлена, як і раней, размаўлялі.

Падыходзіла яна і да Спадарожнага, ласкава дакраналася да яго рук, нешта гаварыла яму, але ён, хоць і прабыў з ёю ўсю ноч, не зразумеў ніводнага слова.

Ішоў – сярод такой грамады і ў такой адзіноце! – і ўсё разважаў, думаў пра тое, што ўчора адбылося.

Чаму Валадар прыслаў да незнаёмага чалавека Прыгажуню? Чаму яна, да гэтага абыходзячы, грэбліва абмінаючы яго руку, падышла сама і сама ўторкнула ў далонь свае пальчыкі? Чаму?

Яны з Белабогам адчулі, што пачуццё Спадарожнага шчырае і моцнае, што жаданні яго светлыя і цнатлівыя? І вырашылі не абражаць каханне, не здзекавацца з яго? У яе таксама нешта нейкае нарадзілася да Выпадковага ці яна проста выканала загад мудраца? Ды і ўвогуле навошта Валадар ахвяраваў Прыгажуняю?

Чакай, чакай... А можа, тут нейкі іншы клопат? А можа, і ім самім захацелася пачуць, убачыць, загаварыць? А што ты думаеш! Белабог жа, канечне, разабраўся і зразумеў, што Спадарожны бачыць, чуе і гаворыць... І якая надзея з'яўляецца ў грамады – хай хоць, можа, дзеці шчаслівейшыя будуць... Хаця, хто яго ведае, ці шчасцем усё гэта скончыцца? А што, калі дзеці, якія ўбачаць, пачуюць і загавораць, пачнуць саромецца сваіх бацькоў, а то і смяяцца з іх? І замест таго, каб умацаваць грамаду, разбураць яе?

– І ўвогуле, куды яны ўсе ідуць? – роспачна і нечакана для самога сябе закрычаў Спадарожны і здзівіўся, калі нехта вельмі выразна адразу ж адказаў яму:

– А хіба ты не бачыш – куды? Яны ідуць наперад.

Выпадковы агледзеўся па баках, але нічога падазронага не заўважыў: нікога чужога побач не было, а свае, звыклыя ўжо спадарожнікі, як заўсёды, ішлі задумлівыя, маўклівыя.

Аднак жа нейчы голас ён і напраўду чуў! Хто ён і дзе хаваецца? Яму спадабалася, што нехта загаварыў з ім, і ён спытаўся зноў:

— А што яны шукаюць?

— Сябе.

— А навошта сеюць збожжа і рубяць хаты?

— Магчыма, яны вернуцца...

— Дык ты ж казаў, што ідуць толькі наперад.

— А хіба нельга, ідучы наперад, вяртацца назад? А можа, яны ідуць па крузе, падымаючыся па спіралі ўсё вышэй і вышэй.

— Раз у сто год вяртаючыся на свае сляды?

— А што ты гарэзуеш? Канечне, вяртаючыся. Праз сто ці, можа, праз дзвесце гадоў. А ты ведаеш, што і ты ўжо ішоў з імі.

— Ну, гэта ты мне кінь. Ні з кім я ніколі не ішоў.

— Ішоў. Проста забыўся. Успомні. І ў хаце, якую яны некалі пабудавалі, жыў.

— Я ў бацькавай хаце жыў.

— А бацьку хто зруб паставіў? Яны!

— Глупства!

— Можа, скажаш, глупства і тое, што прайшло ўжо сто гадоў, як ты і гэты раз ідзеш з імі?

— Сто гадоў?!

— І вы вярнуліся ў тыя мясціны, дзе ты сустрэў іх і адкуль пайшоў. Глядзі ж, нявернік!

Спадарожны зразумеў, што ён зноў гаворыць сам з сабою, але ўсё ж азірнуўся.

Нібы з нейкага засцілу, з пылу і смугі паступова выплывала знаёмая дарога, абрысы яе рабіліся ўсё больш і больш выразнымі.

Дарога гэтая вяла на яго дачу. Значыць, грамада вярнула Спадарожнага якраз туды, дзе і забрала.

Вунь ужо на лузе хтосьці стаіць з аброццю — сочыць каня. Вунь нехта вяртаецца з лесу, з ягад, трымаючы ў руках поўнае вядро аж сініх дурніц. Вунь нейкі гаспадар косіць траву.

Наперадзе, на дарозе, прыгледзеўшыся, ён убачыў чалавека з пехцяром за плячыма, які, не спяшаючыся, ішоў адзін. Вернуты прыгледзеўся, пазнаў у чалавеку суседа па дачы, які быў, як заўсёды, у тым самым спартыўным касцюме,— тут

час, мусіць, спыніўся – міжволі ступіў на цупкую сцяжынку і пайшоў даганяць яго...

– Здароў быў! – яшчэ з-за спіны павітаўся ён.– На дачу тэпаеш?

– Ага,– сусед павярнуўся на яго словы, узрадаваўся, кіўнуў галавою і пайшоў яшчэ павольней.– А дзе гэта ты столькі прападаў. Я ж цябе даўно нешта не бачыў.

– Гарэлку піў. Разумееш, запой,– зманіў Вернуты і нават не пачырванеў ад сораму, што маніць: а хіба можна каму ўсур'ёз растлумачыць, дзе ён быў?!

Было ціха, свяціла ранішняе сонца, спявалі птушкі.

– А ты бачыў, тут толькі што нейкі натоўп людзей праходзіў? – спытаўся Вернуты.

– Ты і сёння, відаць, яшчэ, галубок, не адаспаўся. Які натоўп, якія людзі?! Адзін я, акі перст, на гэтай дарозе. А цяпер во ўдвух будзем...

Вернуты зразумеў, што сусед не бачыў грамады, якая прывяла вандроўніка дадому.

Яму было прыемна чуць гэтую балбатню звычайнага чалавека, прыемна гаварыць і разумець, што цябе чуюць і заўсёды могуць адгукнуцца на твае пытанні, прыемна было пытацца самому і адказваць суседу. Толькі зараз ён адчуў, як засумаваў па звыклых чалавечых адносінах, па слову, якое і гаворыцца, і чуецца. Засумаваў па размове.

– Ну расказвай хутчэй, што тут у нас?

– А нічога асаблівага. Усё як было, так і ёсць.

– І нічога за мой запой не здарылася?

– Здаецца, не. Хаця... Вунь у мяне ўжо трускалкі чырванець пачынаюць. А памідораў будзе сёлета! Усе кусты ў яблыках.

– А бульбу не капаеш яшчэ?

– Не. Памацаў пад адным кустом – дробная пакуль. Але хутка ўжо можна будзе і ласавацца скараспелкаю.

– А маю дачу ніхто не разбурыў, не спаліў?

– Не, здаецца, стаіць. Толькі хтосьці як разварочваўся ля твае хаты на машыне, дык на граду з цыбуляю ўз'ехаў.

– Бог з ёй, з той цыбуляю. Перажывём.

– Глядзі ты, які абыякавы да сваіхградаў. А вунь Апанасік з Міхалкаю нават пабіліся. Міхалка таксама колам пярэднім нейкую морквіну прымяў, дык Апанасік як наскочыў на яго... Цэлага паўдня парожнімі вёдрамі біліся. Адзін – бух! А тады другі – бух! Во звон стаяў на ўвесь дачны пасёлак – невядома толькі, што гэта так звінела: ці то вёдры, ці то, можа, галовы.

Вандроўнік засмяяўся – і гэтая балбатня яму была даспадобы. Раней, калі выпадала ісці на дачу разам з суседам, ён рабіў усё, каб астацца на дарозе аднаму,– чалавек быў дужа гаваркі, і кожны, хто праходзіў з ім хоць кіламетр, клаўся на дачы з тупым галаўным болем ад беспярастанных размоў.

Зараз яму ўсё гэта падабалася, і ён сам распытваў суседа:

– Ну, а як нашы футбалісты? Выйграюць?

– Дзе там! І апошнюю гульню збаёдалі. Вахлакі! Казлы! Ні нападзення, ні абароны няма...

Зноў вярнуліся да сваіх дач.

– Слухай,– загаварыў сусед,– шкада, што цябе не было: тут добры гной прадавалі. Я сабе купіў.

– А што ты сёння на дачы рабіць збіраешся?

– Ведаеш, хачу згарбузаваць адну інтымную прыбудоўку. Камянёў назбіраў. А то ўсё да суседзяў прашуся. Надакучыла ўжо.

Незаўважна яны прыйшлі да дачы – дарога зусім не здоўжылася, і галава надзіва зусім не забалела: была свежая і ясная.

Калі ён убачыў свой зялёны лапік у чатыры соткі, сваю цесненькую хацінку, збітую з пашаляваных дошак, зашчымела ад хвалявання сэрца, перасела ў роце: ён так даўно тут не быў, а ўсё без яго цвіло і буяла.

Хоць прайшло ўжо столькі часу, агурочнік крыху пажоўкнуў, але не завяў: усё роўна быў крамяны і ядраны.

Вандроўнік яшчэ крыху пастаяў, палюбаваўся градамі, а пасля ўзяў вядро, набраў вады і паставіў на сонцы – няхай грэецца, бо халоднаю вадою агуркі паліваць нельга: загінуць.

Паправіў граду, якую прымяла машына, прапалоў клубніцы, падвязаў памідоры.

Пасля паліў агуркі. Фізічна адчуваў, як прагна ўбірае ваду зямля, як радуецца ёй агуручнік. Потым узяў шланг, адзеў яго на кранік і паліў усе грады.

А што далей?

І раптам зразумеў, што тут ужо яму зрабілася сумна і нецікава.

Сусед на сваім падворку грукаў дошкамі, а ён не знаходзіў сабе месца: Вандроўнік быў ужо сапсаваны, непрыдатны для ціхай і спакойнай дачнай мітусні.

Зараз ён суміўся па грамадзе, па яе маўчанні, па яе руху. Перад вачыма як жывая стаяла Прыгажуня, і яму нясцерпна хацелася да каханай. Вандроўнік яскрава ўяўляў, як зараз упэўнена і лёгка наперадзе грамады ідзе Белабог, і яму таксама рупіла яго ўбачыць – выгляд і розум Валадара напаўнялі спакоем і ціхамірнасцю кожнага, хто крочыў побач з ім. Ён смуткаваў і без іншых твараў, якія прымільгаліся і запомніліся яму ў дарозе і без якіх тут Вандроўніку ўсё чагосьці не хапала.

Асабліва ён тужыў па руках – даверлівы дотык гэтых людзей здымаў стому, на цэлы дзень зараджаў моцнаю жыццёваю энергіяй. І яшчэ яму чамусьці здавалася, што вось зараз ён ужо абавязкова зразумее гаворку чужых рук і навучыць свае адгукацца ім.

Божа мой, якія дробязі тут усур'ёз хвалююць людзей: «прывезлі гною», «стапталі граду», «прайгралі футбалісты»... Ну добра, выйграюць гэтыя няшчасныя футбалісты. А далей што?

Там, у грамадзе, ён адчуваў дарогу і вялікую ідэю, вялікую прагу велічы і жыцця. Хоць ён і не разумеў пакуль што гэтай ідэі, але здагадваўся, што яна праўдзівая і мудрая.

Ён абавязкова павінен яе зразумець!

Пасядзеў на ганачку, паглядзеў на грады, якія, палітыя, акрыялі і зазелянелі, устаў, са смакам напіўся з крана, ускінуў зноў за спіну плячак і пайшоў прэч са свайго падворка.

– Куды ты? – здзівіўся сусед па дачы.– А я думаў, што ты мне паможаш гмах узводзіць.

– Няма часу,– махнуў ён рукою і пайшоў яшчэ шпарчэй – даганяць грамаду.

Там быў разумны Белабог.

Там была Прыгажуня.

Там хутчэй за ўсё рос ужо і яго сын – можа, вось зараз ён ідзе якраз поплеч з Валадаром.

І яшчэ ён міжволі адчуваў, што там неўзабаве яму даверацъ нешта вельмі важнае і сур'ёзнае – магчыма, нават у бліжэйшую сяўбу яго зробяць Галоўным Сейбітам.

Зараз Падарожніку здавалася, што ён абраны, нават асуджаны кімсьці на гэты рух і на гэтую вандроўку.

## Ледавік і Джунгляня

Вада была бязмежная. Здаецца, і сонца, якое стаяла над самаю галавою, нідзе не бачыла яе берагоў – усюды толькі вада, вада, вада. Ціхая, спакойная, як шкло, паверхня.

А пасярод гэтай вады – вялізны, нібы авіяносец, карабель: на яго палубу можна было б прыняць адразу добрую тысячу цяжкіх самалётаў.

І на ўсю гэтую нямераную разлегласць, і на ўсю гэтую неабсяжную палубу – іх толькі двое: ён, велікан, які ў гэтых бяскрайніх прасторах таксама здаецца маленечкім-маленечкім, і пігмей, якога, асабліва не ўглядаючыся, можна і зусім не заўважыць.

Нікога няма ні на палубе, ні ў каютах, ні на капітанскім мосціку – карабель, здаецца, плыве сам сабою. А часам мроіцца, што ён і ўвогуле нікуды не плыве, стаіць на адным месцы пасярод вады – не чуваць, як працуюць машыны, няма за ім звычайнай пены і хваль, а пракаветная цішыня, што гусціцца навокал, быццам ватаю, закладае вушы.

Хоць бы якая птушка, хай сабе і здалёку, махнула дзе крылом.

Хоць бы якая рыбіна, хай сабе і невялікая, вынырнула дзе-кольвек побач, парушыўшы здзеклівы спакой вады.

Хоць бы які ветрык, хай сабе і ледзь улоўны, прашумеў над палубай, каб разрэдзіць гэтае даўкае маўчанне, якое невідома, але задушліва вісіць над караблём і вадою.

Аднак ужо які месяц навокал ні гуку, ні крыку, ні слова, ні шолаху.

Моўчкі ляжыць пігмей, маўчыць і ён, велікан. І дзіўна, пігмей, хоць ён і звязаны, нават і не паспрабаваў за гэты час паварушыцца, павярнуцца, вызваліцца – ляжыць і маўчыць.

Велікан, куды б ён ні адышоўся, усюды і адусюль бачыць адны толькі вочы пігмея – яны, вялікія-вялікія, здаецца, нават большыя за яго самога, усюды сочаць за ім – нібы ідуць следам. Адышоўшыся, пігмея ён не бачыць, а ягоныя вочы, якія быццам бы аддзяляюцца ад цела і даганяюць крыўдзіцеля, не даюць яму спакою.

У іх невыказны сум, журба, няўцешнасць, але і непрыхаваная нянавісць да велікана. А за што ж ахвяра будзе любіць свайго крыўдзіцеля?!

Вось ужо колькі месяцаў, як яны плывуць на гэтым караблі. Са спякотнага, задушлівага, пракаветнага лесу, дзе дрэвы падаюць адно на адно і гніюць самі сабою, дзе праз зараснікі няма як прадрацца, а паветра такое распаленае, гарачае, што ім няма як дыхнуць, плывуць у халодныя, ледзяныя айсбергі, дзе няма ніводнай травіны, а людзі жывуць у прасторных, гулкіх палацах, выдзеўбаных у льдзінах, і дзе яшчэ больш цяжка дыхаць: паветра замярзае перад самым ротам або нават у горле – не пракаўтнуць.

Велікан выконвае заданне вельмі вялікай дзяржаўнай важнасці. У звярынцы іхняй Лядовіі, а правільней – у людзінцы, бо ў клетках і вальерах там знаходзяцца не звяры, а людзі, не хапала якраз вось гэтага тыпу пігмеяў – дужа рэдкай, амаль зніклай папуляцыі. Гэта будзе апошні экспанат, і тады людзінец можа хваліцца сваёю калекцыяй перад усім светам.

Вось таму Ледавіка і паслалі па гэты экспанат. Канечне, заданне яму дасталося зусім лёгкае – што яму, велікану, могуць зрабіць прымітыўныя пігмеі са сваімі прымітыўнымі лукамі ды стрэламі?! У тым месцы, куды ўдзяўбнецца наканечнік, яму толькі засвярбіць...

Ён пры жаданні, пашукаўшы, памацаўшы рукамі пад дрэвамі, мог бы налавіць, нагрэбці колькі хочаш такіх экспанатаў,

але ж яму загадалі прывезці толькі аднаго, вось ён аднаго і вязе.

Пігмей ляжаў у той жа самай позе, у якой і паклаў яго Ледавік яшчэ ля самага берага родных джунгляў. І вочы Джунгляня ўсё яшчэ глядзелі велікану прама ў душу.

І хоць яму было гэта вельмі непрыемна, няёмка, ён усё ж нагнуўся над пігмеем і пільна ўгледзеўся ў чалавека, якому цяпер ужо наканавана да смерці жыць у звярынцы. Само сабою падумалася: а ён жа ні ў чым не вінаваты – проста трапіўся яму пад далонь, калі Ледавік вадзіў рукамі пад дрэвамі, пад галінамі, пад лісцём. Мог бы трапіцца хто-небудзь іншы, а ён вось зараз збіраўся б на паляванне ці, наадварот, ужо нёс бы дадому якую-небудзь упаляваную на абед змяю.

Нахіліўшыся зусім нізка над палубаю, разглядаючы пігмея зблізку, Ледавік заўважыў, што Джунгляня дрыжыць.

Канечне, будзеш дрыжаць! Пігмей жа ляжыць на палубе зусім голы, на ім усяго толькі адна набедраная павязка, але хіба можа сагрэць чалавека адзіны ліст нейкага джунглевага дрэва, хай сабе ён вялікі і лапушысты!

Хоць над галавою стаяла спякотнае сонца, хоць Ледавіку было ўсё яшчэ дужа горача, нават душна, для пігмея ж, выхапленага з трапічнай духаты, цеплыні ўжо не хапала – карабель вельмі далёка адплыўся ад джунгляў, і тут быў іншы, намнога халаднейшы клімат. Ледавік сам успомніў, як яму не было чым дыхаць у трапічным лесе, як ён задыхаўся ад парнасці, душыўся гарачым, бы жар, паветрам на невялікіх палянах. Як спяшаўся злавіць пігмея, каб хутчэй зноў узбегчы на палубу карабля, які стаяў пры самым беразе Пігмеяніі – там можна было крыху адысці, аддыхацца, бо вада, якая давала хоць і маленькую, але ўсё ж прахалоду, была яму як збавенне.

Успомніў, куды яны плывуць, і яму яшчэ болей стала шкада Джунгляня. Уявіў, як гэтаму дзіцяці тропікаў будзе холадна, пакуль прывыкне да сцюдзёных, лядовых пакояў, дзе зімнай сцюжаю павявае і ад сцен, і ад падлогі, і ад столі, і нават ад сонечных промняў, калі сонца хоць і рэдка, але ўсё ж прабіваецца праз хмары,– у іх жа і сонца таксама халоднае!

Канечне, і яго, як раней іншыя экспанаты, што ўжо даўно жывуць у звярынцы, адразу адзенуць у цёплае футравае апранне, у яго клетцы-вальеры пачнуць падтрымліваць высокую тэмпературу – аж сцены будуць плавіцца і сцякаць на падлогу вадою,– але ж яму ўсё роўна, нават пры такой увазе, будзе холадна – калі не целу, то душы.

Пігмей дрыжаў усёю сваёю істотаю. Гэта толькі здалёку не відно было ягоных дрыжыкаў, а зблізку кожны мог убачыць, як таго калоціць, як трасе, нібы ў ліхаманцы, яго лядашчае, кволае цела – яно аж грукала аб палубу.

І раптам яму чамусьці здалося, што не ён пігмея, а якраз пігмей яго выкраў у Лядовіі і вязе ў рабства.

І нейкае вялікае-вялікае шкадаванне ці то да сябе, ці то да Джунгляня нечакана агарнула велікана, і на яго найшла нейкая незразумелая замілаванасць да гэтага дзіцяці лесу, якое ні ў чым не вінаватае, а пакутуе толькі таму, што собіла яму якраз трапіць пад руку чужынцу.

Ледавік, спяшаючыся, зняў з сябе куртачку і накінуў яе на пігмея – куртачка для таго была ўжо завельмі вялікая, яна заняла ладную лапіну палубы, і цяпер нават яму, велікану, які толькі што ўважліва разглядаў Джунгляня, стала незразумела, дзе яно стаілася і заціхла – пад крысом, пад каўняром ці, можа, пад рукавом. Меркаваў, што пігмей, ужо накрыты, удзячны яму, сцішыцца зусім, надыхае пад куртачкаю паветра і пакрысе сагрэецца.

Але не паспеў ён так падумаць, як уся куртачка захадзіла раптам ходырам і з-пад яе той жа час выкаціўся пігмей.

Вочы глядзелі на Ледавіка злосна і грэбліва,– тое, што ён накінуў на Джунгляня куртачку, здаецца, раззлавала і абразіла яго: ахвяра не хацела ніякай дапамогі ад свайго крыўдзіцеля!

Але гэтая злосць яшчэ болей расчульвала велікана, выклікала яшчэ большы давер да пігмея. Хоць яму, канечне ж, і не падабалася, што той столькі часу маўчыць – хай бы крактаў, мычаў ці, на крайні выпадак, уздыхаў, а то ляжыць і маўчыць. І нават вось зараз, узлаваўшыся, не выпусціў з сябе ні гуку – адкаціўся і зноў ляжыць, глядзіць, маўчыць.

Веліканы, кажуць, усе даверлівыя. А гэты, здаецца, быў яшчэ больш даверлівы, чым усе яны, разам узятыя.

Хоць да пігмея можна было і не падыходзіць – яго, хоць ён і адкаціўся, лёгка дастаць рукою і адсюль,– Ледавік усё ж падышоў бліжэй, прысеў на ўсколенцы і пачаў паволі, не спяшаючыся развязваць вяроўкі, якімі, нібы сноп, было ўвязана Джунгляня. Спачатку развязаў ногі – пігмей нават і не паварушыў імі, ляжаў як нежывы.

Але калі развязаў і рукі, а той нават і не паспрабаваў падняць іх, каб размяць зацёклыя цяглiцы – яны ляжалі, як і да гэтага, прыціснутыя да бакоў,– велікан, уражаны, падумаў ужо, што, можа, і напраўду Джунгляня памерла ад няўцешнага смутку.

Аднак не, на яго з дакорам глядзелі ўсё тыя ж жывыя, поўныя смутку і нянавісці вочы.

Хоць у іх ужо і было нешта новае...

Пакуль Ледавік дзівіўся, раздумваў, спрабуючы ва ўсім разабрацца, раптам за спіною ў пігмея штосьці зашамацела, лопнула, шуганула, як стрэліла,– што гэта крылы, велікан здагадаўся толькі тады, калі Джунгляня, нібы птушка, узвілося ў неба, хапатліва замахала імі і паляцела ў той бок, дзе застаўся родны бераг.

Велікан ачомаўся толькі зараз. Ён пашкадаваў ужо, што позна ва ўсім разабраўся і не паспеў своечасова хоць за штонебудзь схапіць Джунгляня.

Пігмей ляцеў цяжка і, здавалася, зусім не аддаляўся ад карабля. Ён напінаўся, натужна махаў крыламі – як усё роўна цягнуў за сабою нейкі дужа груваскі груз...

І раптам Ледавік аж ускрыкнуў: ён здагадаўся, чаму так напінаецца і што цягне за сабою пігмей! Той, высільваючыся, спрабуе валачы за сабою карабель – сваю нядаўнюю турму! І вадаплаў, хоць і не вельмі паддаючыся яму, усё ж напачатку нібы нехаця запаволіў свой рух, потым спыніўся зусім, а пасля паціху пачаў сунуцца назад – якраз у той бок, куды ляцела і Джунгляня.

Больш таго, Ледавік заўважыў тоненькую, як павучынка, нітачку, якая нібыта злучала карабель з пігмеем. Хацеў адра-

зу ж бегчы туды, каб разарваць яе, адарваць ад палубы, але, уражаны, не змог зрабіць ніводнага кроку – ногі яго былі звязаныя. Паспрабаваў узняць руку – і таксама не змог: і рукі яго зноў жа былі звязаныя. Тымі ж вяроўкамі, што асталіся пасля вызвалення пігмея. Відаць, пакуль велікан думаў, што і да чаго, пігмей паспеў расквітацца з ім, адпомсціць яму.

Але ж зараз штосьці трэба было рабіць.

Крыху падумаўшы, велікан сам нязграбна паваліўся на дошкі і пакаціўся ў той бок, дзе да палубы была прымацавана таямнічая нітка. І якое ж было яго здзіўленне, што на тым месцы нічога не аказалася. Дакаціўшыся, ён, падымаючы галаву, колькі разоў спрабаваў учапіцца за нітку зубамі, каб перагрызці яе, але зубы ні на што не натыкаліся, ні за што не чапляліся – нітка была прывідная: яна ёсць і яе няма.

Але ж пігмей менавіта на ёй цягне такі карабель!

Каб лішні раз пераканацца, што гэта і праўда нейкі прывід, ён колькі разоў туды-сюды пракаціўся па палубе, там, дзе, як яму здавалася, павінна мацавацца нітка, але нічога пад сабою не адчуў, ніштто яму не замінала.

Толькі тады Ледавік зразумеў, што ніякая гэта не нітка, а ўсяго толькі нейкі таямнічы промень, якім пігмей прывязаў да сябе карабель і які вытрымлівае – не рвецца! – такую нагрузку.

І засаромеўся: чаго ён мітусіцца? Супакоіў сам сябе: навошта яму перагрызаць гэты промень? Пігмей жа цягне карабель назад у джунглі... Няхай цягне!

Яму ж усё роўна нельга вяртацца ў сваю Лядовію без экспаната. А там, у джунглях, ён зноў зловіць пігмея. І ўжо, навучаны вопытам, не аднаго, а добрую сотню, а то і тысячу джунглянят. Каб іх хапіла не на адзін вальер, а на цэлы звярынец! І тады ў іх будзе самая вялікая экспазіцыя пігмеяў.

Няхай, няхай валачэ ў свае джунглі і яго, і карабель!

І засмяяўся, як самы шчаслівы ў свеце чалавек, і нават задаволена пацягнуўся аж да хрусту, пацягнуўся ў думках, бо пацягнуцца напраўду ён, звязаны, не мог.

Велікан забыўся, што не пігмей, а ўжо ён сам зараз нявольнік. Ці, можа, спадзяваўся за доўгую дарогу развязацца...

І яшчэ ён пакуль што не ведаў, што ў джунглях таксама вырашылі стварыць свой звярынец – людзінец веліканаў, там ужо абсталёўвалі клеткі і вальеры, а пігмей, які толькі што вызваліўся, цягнуў туды першы экспанат.

## На Маналы́

Хочаш ці не хочаш, але яму абавязкова трэба ехаць на Маналы. Усё ў ім – і душа, і цела – супраціўляецца гэтай паездцы, усё шукае хоць маленечкую зачэпку, каб не ехаць, каб астацца дома. Аднак...

Яшчэ ўчора ён пачуваўся зусім хворым, у яго балела горла, была высокая тэмпература, і ён на гэта меў ціхую, прытоеную надзею – ніхто яго, хворага, нікуды не пашле.

Але сёння, колькі ні тыцкаў тэрмометр пад паху, той, нібыта сапсаваўшыся, быццам назло настойліва паказваў адно і тое ж: трыццаць шэсць і шэсць. Не паверыўшы яму, знайшоў новы тэрмометр, аднак і гэты быццам зашкаліла, быццам у ім загусла ртуць: трыццаць шэсць і шэсць!

Нічога не паробіш – трэба збірацца.

Збіраўся ён вельмі доўга, марудна, нібыта ўсё яшчэ на нешта спадзеючыся. Доўга шукаў плячак, доўга выбіваў яго ад пылу. Затым паволі, не спяшаючыся вайстрыў нож, правяраў вайстрыню і на вока, і водзячы пальцам па лязу. Пасля знайшоў вяроўку, паторгаў яе за канцы, спрабуючы, ці моцная, ці парвецца, а пераканаўшыся, што ўсё ў парадку, скруціў яе і разам з нажом паклаў у плячак – не разумее чаму, але яму сказалі, каб абавязкова ўзяў з сабою менавіта нож і вяроўку.

Узяўшы яшчэ сёе-тое, закінуў плячак за спіну, паклаў на руку плашч – дарога ж будзе далёкая, і хутчэй за ўсё ці то ад дажджу, ці, можа, ад холаду давядзецца неяк ратавацца – пайшоў, зноў жа вельмі павольна, на аўтобусны прыпынак.

Бачыў і разумеў, што спазняецца, але кроку не прыбаўляў: калі і не паспее на гэты апошні аўтобус, то ў яго будзе хоць нейкая адгаворка, чаму не прыехаў у той дзень, як загадалі.

На прыпынак прыйшоў пазнавата – аўтобус павінен быў ужо даўно пайсці. Але ён яшчэ не пайшоў. І нават пакуль што не прыйшоў. «Спазняецца»,– казалі людзі, нервова круцячы па баках галовамі. Пасажыры нерваваліся, а ён радаваўся: то ж добра, што аўтобус не пойдзе! Мусіць, сапсаваўся... Ага, на сёння такое не дзіва: няма запчастак, няма бензіну, няма таго, няма гэтага... Апошнім часам ён амаль што і не хадзіў.

А тут, як назло, хоць і са спазненнем, але ж прыйшоў. А правільней, прыкульгаў – ён быў такі дабіты, амаль увесь паламаны, так тарахцеў і бразгатаў, што ў яго боязна было лезці, але ён усё ж, сцяўшы зубы, пайшоў у расчыненыя дзверы.

Думалася, што аўтобус сапсуецца, разваліцца па дарозе і не даедзе да прыстані. Ён сядзеў і, моцна ўчапіўшыся за поручні, чакаў, калі гэта здарыцца.

Але аўтобус усё ж давёз яго да прыстані! Спыніўся і фанабэрыста адчыніў перад ім адным дзверы – сюды ён ехаў ужо толькі адзін: маўляў, вось я які!

Прыстань была амаль што пустая. На моры якраз разбушаваўся вялікі шторм, і ўсе караблі і караблікі, учапіўшыся за бераг, баяліся адыходзіцца ад яго.

Яму ж трэба на той бераг, на аэрадром, а дабрацца туды, ён ведаў, ніякім іншым транспартам, як толькі караблём, нельга.

Ужо ледзь не закрычаў ад радасці, удзячны шторму, як да яго падышоў чалавек у строгай марской форме і спытаўся:

– Вы не на Маналы?

– На Маналы,– яшчэ нічога не разумеючы, адказаў ён.

– Тады хадземце. Цеплаход на Маналы адпраўляецца праз пяць хвілін.

Толькі цяпер ён заўважыў, што ля прыстані стаіць гатовы да адплыцця цеплаход, таксама старэнькі і абшарпаны, і нецярпліва, упарта кідаецца грудзьмі на высокія хвалі.

Як толькі па хісткім трапе ён узышоў на палубу, цеплаход адразу ж даў развітальны гудок і адплыў ад берага.

Пасажыраў на палубе не было відаць – іх і плыло мала, і ўсе яны былі ў каютах, каб не рызыкаваць: у такі шторм можа змыць у адкрытае мора.

Карабель натужна ўзбіраўся з хвалі на хвалю. Часам у яго агаляўся вінт, і тады лопасці круціліся ў паветры ўхаластую, а часам носам нырaў у аграмадную хвалю, і тая накрывала цеплаход, як кажуць, з галавою – з мачтаю!

І ўсё ж, калі ўжо амаль усе пасажыры, змучаныя марскою хваробаю, сінія, зялёныя, бледныя, ляжалі на падлозе, карабель торкнуўся носам у супрацьлеглы бераг.

Ён не спяшаўся на аэрадром, хацеў проста пахадзіць па зямлі, каб крыху адпачыць ад шторму, ад карабля, але тут зноў жа да яго падышоў незнаёмы чалавек і спытаўся:

– Вам на Маналы?

Таксі давезла яго да аэрадрома імгненна.

Над аэрадромам, над лётным полем стаяў дужа густы туман, воблачнасць была вельмі нізкая – хмары, здаецца, чапляліся нават за самалёты, што, як мокрыя куры, моклі на зямлі,– ішоў праліўны дождж, і ён ужо напраўду паверыў, што самалёт не паляціць.

Але аэраплан, як толькі чалавек увайшоў у салон, адразу ж вырулiў на ўзлётную паласу.

Узляцеў ён, не зважаючы на туман, нізкую бачнасць, лёгка і проста. Ляцеў таксама смела, хоць вакол жыхалі маланкі, свяціліся яркія разрады, дзьмуў моцны бакавы вецер, ад чаго тонка вібрыравала і вагалася крылле.

Садзіцца было яшчэ цяжэй, чым узлятаць. Ужо колькі разоў самалёт зніжаўся як не да самай зямлі, але зноў узлятаў угору, бо ўнізе нічога не было відно – воблакі паўзлі па самай узлётнай паласе.

Ён ужо быў больш чым упэўнены, што самалёт вось зараз развернецца і паляціць назад, на свой аэрадром, але лётчыкі зноў і зноў заходзілі на пасадку, рабілі ўсё магчымае і немагчымае, каб пасадзіць лайнер.

І нарэшце ім гэта ўдалося – самалёт чыркнуў коламі па самым краі пасадачнай паласы. Каб ледзь-ледзь раней – быць бы бядзе: колы б угрузлі ў раскіслую ад дажджоў зямлю і ён бы перавярнуўся.

Спяшацца не хацелася і тут. Зайшоў у памяшканне аэрапорта, сеў на лаўку, каб пабыць аднаму, каб адцягнуць сустрэчу, якая, ён адчуваў, будзе яму непрыемнаю.

Але тут да яго зноў падышоў чалавек.

— Вы не на Маналы?

— На Маналы.

— Тады пойдзем. Я вас крыху падвязу. Бо пешкі ісці вам доўга давядзецца.

Праз нейкі час шафёр збочыў налева, на дарогу, якая бралася на гару, спыніўся і адчыніў дзверцы.

— Мне — сюды. А вам прама.

Ён ішоў па раскіслай ад дажджоў дарозе — здавалася, адзін на ўвесь свет — і думаў, што вось цяпер і напраўду адзін: хоча ісці — пойдзе, не хоча — зверне з дарогі пад елку, раскладзе агонь і будзе грэцца каля полымя колькі захоча.

Але яго даганялі ўсё новыя і новыя машыны, а шафёры зноў жа заклапочана пыталіся:

— Вы на Маналы?

І бралі яго ў кабіну, а калі яна была занятая — садзілі ў кузаў і везлі наперад. Ехалі разам, колькі маглі, а тады ссаджвалі зноў на дарогу, але яго праз нейкі час падбіралі іншыя машыны.

Калі адна машына засела, ён, бачачы, як яна ўсё глыбей і глыбей, па самую восць, закопваецца ў зямлю, ужо не хаваў сваёй радасці — гэта ж была ці не апошняя магчымасць не даехаць да Маналы.

Але шафёр па рацыі выклікаў цягач, і той, падчапіўшы машыну, лёгка вывалак яе з твані, а потым цягнуў да самага горада.

У Маналы яго ўжо чакалі.

— Вы мяне выклікалі? — спытаўся ён у чалавека, які хадзіў, заклаўшы рукі за спіну, па прасторным кабінеце.

— Выклікаў.

Верхавод яшчэ нейкі час моўчкі пахадзіў па кабінеце, а затым спытаўся сам:

— А нож вы ўзялі?

— Узяў. А навошта ён?

— Трэба зарэзаць вунь таго нягодніка,— і паказаў пальцам у кут, дзе на падлозе ляжаў звязаны чалавек.— Ідзіце і зарэжце.

– Я? Зарэзаць чалавека? Што вы! Не пайду! Не буду я нікога рэзаць!

– А я вам загадваю!

– А я не буду! – закрычаў ён.

– Вяроўку вы ўзялі? – ціха, спакойна, не павышаючы голасу, спытаўся Верхавод.

– Узяў,– паспакайнеў і выкліканы.

– Пакажыце.

Ён зняў плячак, пакапаўся там, дастаў вяроўку і падаў яе Верхаводу.

Тут жа аднекуль, як усё роўна яны выраслі з-пад зямлі, з'явілася трое малайцоў, яны яго ж вяроўкаю звязалі пакліканага і кінулі на падлогу побач з тым чалавекам, якога ён павінен быў зарэзаць.

– А што мне зараз рабіць? – ужо лежачы, наіўна спытаўся ён.

– Чакаць, калі знойдзецца нехта трэці, хто зарэжа вас абодвух.

Ён ляжаў і аж дрыжаў ад гневу, абурэння і адкрытай ісціны, пра якую, канечне ж, здагадваўся і раней: зла ў жыцці болей, чым дабрыні.

Яно часта так бывае: калі на нешта добрае, то і аўтобус паламаецца, і карабель не паплыве, і самалёт не паляціць, і чалавек ніколі не даедзе туды, дзе яго чакае радасць.

А як на што дрэннае – усё і едзе, і плыве, і ляціць... І абавязкова, насуперак яго жаданню, давядзе чалавека да болі.

Мусіць, каб паказаць яму, які ён слабы, бязвольны і безабаронны.

## Над прадоннем

Ногі яго былі ўжо ў прадонні. Яны, босыя, адчувалі холад спрасаванага, настылага за стагоддзі паветра, а розум ведаў: там, пад імі – нямераная глыбіня.

Рукі ўчэпіста, сутаргава трымаліся за стромую, скалістую сцяну – яны нібы абдымалі яе. Далоні знайшлі, намацалі

невялікія вострыя каменьчыкі, што вытыркаліся са скалы, за якія і ўчапіліся зацёклыя ад напругі пальцы.

Ён вісеў гэтак, нібы ўкрыжаваны на скале, і баяўся паварушыцца: ведаў, што выступы трымаюцца ненадзейна і варта толькі яму неасцярожна скрануцца, як каменьчыкі выпадуць і ён разам з імі паляціць уніз.

Ведаў, што ўверх яму ўжо не падняцца, а ўніз – можна зляцець, але гэта ўжо будзе звычайнае свабоднае падзенне цела...

А за ім гоніцца самалёт. А правільней – гнаўся: даганяў яго, ляцеў услед.

Ён таксама ляцеў. І самалёт, убачыўшы, як чалавек з усяго размаху выцяўся аб скалу, змяўшы, зламаўшы свае крылы,– як усё роўна разбіўся аб яе,– пачаў разварочвацца, каб паглядзець, што сталася з тым, хто ўцякаў, і што яшчэ трэба зрабіць, каб выканаць вынесены прысуд.

Укрыжаваны бачыў, як у блакіце над ім, заваліўшыся на крыло, разварочваецца самалёт, які так і не змог дагнаць яго ў небе.

Што рабіць? Выйсця няма. І так, і гэтак яго чакае смерць. Самалёт, які вось зараз вырулюе на ахвяру, канечне ж, расстраляе яе – ён і сам, нібы зводдаль, бачыў, як лёгка будзе самалёту распраўляцца з распнутым на скале.

Можна, не чакаючы гэтай расправы, самому проста расслабіць пальцы і адпусціць каменьчыкі... І ўсё вырашыцца само сабою... Але ж навошта спяшацца?

Ён паварушыў вялікім пальцам нагі, нібы спрабуючы на нешта абаперціся.

Пад ім скалыхнулася, пайшло, як вада, кругамі густое, адчутае на дотык паветра.

Але ж ён ведаў, што на яго не абапрэшся.

Пальцу стала боязна. Гэты страх, гэта вусціш пачала падымацца ўгору – праз нагу, калена, бок (недзе побач, ён адчуваў, часта-часта б'ецца сэрца), па руцэ дайшла да ўказальнага пальца і, убачыўшы, што далей шляху няма, вярнулася назад і праз шыю ўдарыла ў галаву.

Чамусьці ўвесь страх сабраўся цяпер у вачах. Вачам было жудасна, хоць ён і не глядзеў ужо ні ўгору, ні сабе пад ногі – яны ўперліся ў вострую гранітную сцяну перад сабою.

А самалёт усё яшчэ рабіў разварот – марудна, паволі, не спяшаючыся, нібыта знарок доўжачы насалоду, чаканне таго моманту, калі ён з задавальненнем, без аніякай перашкоды расквітаецца з тым, хто, распнуты, вісіць на скале.

Нарэшце самалёт развярнуўся і са спіны выруліў на чалавека. Распнуты пачуў ужо за сабою блізкі гул яго матораў. Ён азірнуўся і ўвачавідкі ўбачыў самалёт – ягоны твар быў перакошаны ад злосці. Самалёт паспешліва шукаў гашэтку...

«Што я яму зрабіў?! – у роспачы, у апошнія секунды свайго жыцця думаў распнуты.– За што ён хоча мяне забіць?»

Але ў гэтых сваіх думках чалавек быў няшчыры. Ён ведаў, за што хочуць пазбавіцца ад яго.

Найперш за тое, што ён – не самалёт. А яшчэ болей за тое, што хоць і не самалёт, а лятае... Хутчэй самалётаў лятае...

Самалёт націскае на гашэтку. Стрэлы роўным радком утыркаюцца ў граніт, паўзуць угору. Яны жалезныя, а таму, з каменю выкрасаючы іскры, выдзёўбваюць гранітныя аскепкі, ашчэпкі, асколкі, якія разлятаюцца ва ўсе бакі. Стрэлы набліжаюцца да распнутага. Дык якая ж ягоная? Вось гэта... вось гэта... вось гэта...

Страла ўдзяўбнулася ля самай ягонай рукі. Ён машынальна адсунуў руку і ўбачыў, што наступныя стрэлы ўтыркаюцца ўсё вышэй і вышэй – нібы ўзбіраюцца на вяршыню. Самалёт, і пераляцеўшы яго, усё яшчэ страчыў стрэламі.

Тады ён ухапіўся за стралу – тая і не варухнулася: сядзела ў скале моцна,– падцягнуўся, дастаў свабоднай рукою другую, пахітаў яе, ужо спрабуючы, ці не вырвецца яна, але ўбачыўшы, што і гэтая сядзіць моцна, хутка, спяшаючыся, на адных толькі руках палез па стрэлах на самую вяршыню.

Узлезшы на голую пляцоўку скалы, сеў над самым абрывам, спінаю да самалёта, які здаляўся, вачыма – на неабсяжнасць прасторы над прадоннем, сядзеў, звесіўшы ногі ў апраметную, і нічога не мог зразумець: тое, што павінна было стаць ягонаю смерцю, стала ягоным жыццём.

Ці то самалёт і на гэты раз не пацэліў у яго?

Ці то ён і не хацеў пацэліць, убачыўшы распластанага на скале чалавека і ягоныя памятыя, паламаныя крылы?

Ці то ён пашкадаваў уцекача і дапамог яму знарок выбрацца з ужо, здавалася б, непазбежнага прадоння?

Чалавек чамусьці не разумеў, што без крылаў ён ужо не супернік самалёту і цяпер не ўяўляў для яго ніякай цікавасці.

## Прымірэнне

Паляўнічы бачыў толькі дзюбу — настолькі вялікі быў той, каму яна належала. Дзюба засланяла сабою ўсё, і таму ўбачыць яшчэ што-небудзь — крылы, вочы, хвост драпежніка — было немагчыма.

У дзюбе бездапаможна выгінаўся, выкручваўся, спрабуючы нейкім чынам ўратавацца, маленечкі, тоненькі чарвячок — можа, ён і праўда быў такі дробненькі, а можа, гэта толькі здавалася на фоне такой вялізнай клюнкі дзюбатага.

Паляўнічы не спяшаўся падымаць дубальтоўку, прыцэльвацца і страляць. Хоць на гэта быў і пасланы сюды. Ён разумеў, што, мусіць, трэба ратаваць чарвяка, але не ведаў, куды страляць: не будзеш жа цэліцца ў дзюбу, а таго, каго трэба браць на мушку, ён не бачыць.

Таму паляўнічы толькі стаяў і адно глядзеў, што рабілася перад яго вачыма.

Чарвяк усё выгінаўся, усё спрабаваў вызваліцца з дзюбы, але і дзюба не спяшалася вельмі распраўляцца са сваёю ахвяраю: яна, здавалася, як кошка з мышкаю, гуляе з чарвячком — то адпусціць яго як не зусім, а потым схопіць, прышчыкнуўшы хвост, у самы апошні момант і пасуне на сярэдзіну, і той ужо зноў выгінаецца, роспачна б'ючы сваімі абодвума канцамі па баках дзюбы; то выпусціць чарвяка зусім, а потым падхопіць яго ля самае зямлі і падыме як мага вышэй — быццам паказвае ўсім, што ўсё ў парадку: чарвяк яшчэ жывы.

І настолькі шчырай здавалася збоку гэта гульня, што паляўнічы і напраўду паверыў, што дзюба і на самай справе

нічога кепскага не думае рабіць чарвяку: пагуляе, пагуляе ды і пакіне ў спакоі.

І раптам здарылася нешта неспадзяванае. Паляўнічы пільней угледзеўся ў гэтую гульню. Глядзеў і не мог паверыць сваім вачам: дзюба нечакана пачала змяншацца, а чарвячок, які кешкаўся ў ёй, узяўся раптам расці.

Калі яны зраўняліся, сталі аднолькавыя па велічыні, паляўнічы нарэшце ўбачыў і таго, хто меў такую, здавалася б, вялізную дзюбу — ім аказалася невялікая, непрыкметная птушачка, на якую ў звычайных умовах і не звернеш асаблівай увагі.

Паляўнічы зразумеў, што цяпер ужо ён павінен страляць, але зноў жа не ведаў, у каго — у птушку ці ў чарвяка.

І ўсё ж ён стрэліў. Аднак ні ў кога не пацэліў, бо ні ў кога і не цаляў.

А птушка ўсё змяншалася і змяншалася, а чарвяк — усё павялічваўся і павялічваўся. Неўзабаве ён стаў такім тоўстым, што дзюба не змагла ўжо яго ўтрымаць, хоць і разявілася на ўсю сваю шырыню.

Чарвяк зваліўся ў траву, а паляўнічы аж войкнуў ад нечаканасці: ён ужо быў намнога большы ад птушачкі. Птушачка — пясклёнак пясклёнкам! — спалохалася, узмахнула крыллейкам, паспрабавала ўцячы, але трава была завысокая ёй, лапкі блыталіся ў травінах, і чарвяку нічога не ставала дагнаць яе. Тым болей што ўцякала яна якраз туды, дзе быў ягоны рот.

А чарвяк ужо быў зараз тоўсты, як кракадзіл, доўгі, як удаў, гнуткі, мускулісты, як анаконда. Ён звіўся ў вялікае, бы гумовае кола ад «МАЗа», кальцо, і цяпер ужо сам меў асалоду назіраць, як бездапаможна бегала па крузе, у сярэдзіне кола, памагаючы сабе крыльцамі, маленькая напалоханая птушачка.

Чарвяк доўга забаўляўся з ёю, а потым дачакаўся, калі птушачка ў чарговы раз падбегла да яго рота, выставіў насустрач ёй сваю прысоску, узяў дзюбу ў круглыя губы, сціснуў так, што аж затрашчала рагавіца, і пакрысе, не спяшаючыся, пачаў уцягваць у сябе.

Птушачка і не супраціўлялася. Праўда, калі прысоска, рытмічна скарачаючыся, нібы жуючы, дакранулася да крылляў, птушачка, яшчэ жывая, замахала імі, але губы чарвяка змялі іх і схавалі ў сабе. Яшчэ праз нейкі час здрыгануліся лапкі, птушачка, нібы развітваючыся, памахала імі напаследак, і тыя, гэтак жа, як і крылы, неўзабаве зусім зніклі ў чарвяку.

Пасля гэтага губы прысоскі зусім закрыліся — нібы рота ў чарвяка ніколі і не было.

Паляўнічы, быццам зачараваны кім, глядзеў, як марудна, павольі сунецца, злёгку чырачы дзюбачкаю скуру, усярэдзіне чарвяка птушачка, і ў жаху думаў, што не выканаў свайго задання — не ўмяшаўся ў спрэчку і не стрэліў у другі раз.

Цяпер ужо страляць было позна, бо, стрэліўшы ў аднаго, абавязкова заб'еш абаіх.

Паляўнічы не ведаў, хто вінаваты, а таму не страляў. І яшчэ яму здавалася, што, стрэліўшы ў каго-небудзь, ён нешта ў нечым парушыць.

Ён — чалавек, а чалавек не павінен умешвацца ў гэткую спрэчку: няхай дзюба і чарвяк вырашаць яе самі.

Паляўнічы зноў зірнуў на чарвяка і ў каторы раз хмыкнуў ад нечаканасці — дзюба маленькай на гэты час птушачкі распалавініла жывот вялікага чарвяка і, выбеленая страўнікавымі сокамі, пераможна, як стрэмка, тырчала з яго.

## Лесавік

Навокал была цемра. Ды такая — хоць ты вока выкалі.

Лесавік стаяў, прыслухоўваўся да пошуму ветру ў вершалінах дрэў і баяўся ступіць нават адзін крок — ён не ведаў, куды ісці і навошта.

Але і стаяць вось так нерухома таксама было неразумна. Стаяць і чакаць? Але чаго чакаць і на што спадзявацца?!

Трэба было на нешта адважвацца.

Таму ён, як сляпы, выставіўшы перад сабою рукі, павольі пайшоў на цемру. Яна была такая густая і вільготная, што

ён далонямі, тварам, грудзямі адчуваў яе амаль фізічна – як ваду.

Не ступіў і колькі крокаў, як выцяўся лбом аб дрэва – яно якраз апынулася між выстаўленымі наперад рукамі. Каб такое болей не паўтарылася, ён пачаў вадзіць перад сабою далонямі, і гэта дапамагала абыходзіць елкі і сасонкі.

Аднак ногі, хоць Лесавік і сунуў іх па зямлі вельмі павольна і абачліва, усё ж зачапіліся за ўздыбленыя карані, і ён, не ўтрымаўшы раўнавагі, пляснуўся тварам у нейкую рыхлую сцяну зямлі, якая запарушыла яму вочы, насыпалася за каўнер. Пасля ўжо, абмацаўшы яе рукамі, зразумеў, што гэта ўсяго толькі вялікі яловы вываранень – елкі, карані якіх не лезуць углыбіню, а распаўзаюцца, быццам змеі, як не па самай паверхні, вываочваюцца звычайна з вялікім плоскім кавалкам зямлі.

Але ўсё гэта былі дробязі – устаў, абтросся і пайшоў далей. Аж пакуль не ўваліўся ў глыбокую, з слізкімі, нетрывалымі берагамі яму, запоўненую вадой, з якой ледзь выбраўся. Ён памятаў, ведаў пра гэтую ямку, але вось абысці яе не змог. Тут нейкія «бізнесмены» шукалі кабель – незразумелыя камунікацыі ішлі праз увесь лес – шукалі, каб выдраць з яго і прадаць медзь: нагналі шмат тэхнікі, раскоўзалі, раскалупалі вялікі і, здаецца, бяздонны кар’ер, які па часе сам запоўніўся вадою і ператварыўся ў сапраўднае возера.

Ледзь выбраўшыся з вады, Лесавік, мокры ўвесь і брудны, падумаў пра агонь, каб перасушыцца крыху, але ўспомніў тут жа, што ў яго ніколі не было запалак.

Паспрабаваў абыходзіць кар’ер з правага боку, але неўзабаве зноў упаў, зачапіўшыся за якуюсьці жалязяку: сюды звозілі адусюль markup розная жалезнае ламачча, і Лесавік якраз паляцеў тварам у гэтую кучу. Нешта параніў – ці то руку, ці то твар: адчуваў, выціраючыся, кроў, але не ведаў, адкуль яна.

Падняўшыся, размазваючы па твары кроў, Лесавік стаяў і ўвогуле ўжо не ведаў, што яму рабіць і ў які бок ісці. І раптам перад ім – далёка-далёка наперадзе! – бліснуў маленечкі, нібы выратаванне, агеньчык, і ён адразу ж пайшоў на яго.

Ісці чамусьці стала лягчэй, быццам гэтая кропля святла і напраўду свяціла пад ногі. Але колькі ён ні ішоў, крапка святла не павялічвалася – была ўсё той жа светлай мачынай. І нават калі падышоў зусім блізка, яна засталася маленечкаю кропляю.

Гэта была прыпаленая цыгарэта. Яна ляжала на драўлянай лаўцы, якая адзінока стаяла пасярод якойсьці паляны.

Паляна як усё роўна была асветлена яшчэ нечым – нават не верылася, што звычайная цыгарэта можа даць столькі святла.

Ён падышоў да лаўкі. Побач з крапкаю святла ўбачыў надарваны пачак з цыгарэтамі. Узяў яго ў рукі, агледзеў з усіх бакоў. Прыблізіў пачак да святла, прачытаў: «Міністэрства аховы здароўя папярэджвае: курэнне небяспечнае для жыцця».

Лесавіку тут жа захацелася чамусьці прыкурыць. Ён хапатліва, спяшаючыся дастаў з пачка цыгарэту, пакамячыў яе ў пальцах, каб размякчыць, каб лепей гарэла, і ўжо наблізіўся да агеньчыка на акурку, але тут цыгарэта раптам успыхнула, як уздыхнула ўсё роўна, апошнім святлом і звяла, пагасла.

На паляне стала гэтак жа цёмна, як і там, у глыбіні лесу, адкуль ён з такімі прыгодамі выбіраўся.

І было ціха-ціха – аж вусцішна. Калі гарэла цыгарэта, здавалася, што на паляне ідзе жыццё, чуюцца нейкія гукі – быццам і не была яна зусім бязлюднаю. А цяпер ад цішыні закладала вушы – хоць бы трэснуў які сучок, хоць бы зашумела хваінка, хоць бы ўздыхнула дрэва, як яно ўмее часам уздыхаць само сабою.

Яму зрабілася страшна. Зноў трэба думаць: куды ісці? Зноў трэба неяк выбірацца адсюль, ісці ў цемру, якой, здаецца, нідзе няма канца-краю.

І ў гэты час зноў жа недзе далёка-далёка наперадзе засвяцілася маленечкая крапка – як усё роўна нехта прыпаліў там новую цыгарэту. Абнадзееены, Лесавік ужо зноў хацеў падацца туды, на святло, але ўбачыў, што рабіць гэта не трэба – святло хоць і паволі, але ж само набліжаецца да яго.

Пасля хуткасць, з якой яно набліжалася, пачала павялічвацца, і неўзабаве стала зразумела: гэта нехта едзе, а не ідзе. І яшчэ стала зразумела, што гэта ніякая не цыгарэта, а нейкая больш магутная крыніца святла.

Праз нейкі час Лесавік пачуў характэрны шум, які не зблытаеш ні з чым – так шумяць толькі колы цягніка, які імкліва набліжаецца.

Прайшло яшчэ колькі хвілін, і тая маленечкая крапка святла ператварылася ў вялікую фару, якою цягнік праз нейкі час упёрся ў паляну, дзе стаяў ён.

Цягнік, раз-пораз чмыхаючы, стаяў і марудзіў – як усё роўна чакаў каго. Але з яго ніхто не выходзіў і ніхто туды не заходзіў.

І тады Лесавік адчуў, што цягнік чакае якраз яго.

Фара ярка асвятліла паляну, і на ёй ужо зараз было зусім не страшна, а наадварот – радасна і спакойна, як і раней, калі ён, шчаслівы, жыў у гэтым лесе.

Лесавік успомніў пра цыгарэту, зноў пакруціў яе ў пальцах і пайшоў да фары – быццам збіраючыся прыкурыць. Але на паўдарозе спыніўся – хто ж гэта прыкурвае ад такога халоднага агню?!

Усё яшчэ трымаючы ў пальцах цыгарэту, Лесавік глядзеў на фару, пад якою толькі цяпер убачыў зацёрты крыху надпіс: «Беражыце лес ад пажару!»

Ён ведаў, што цягнік прыйшоў з горада і вось зараз паедзе зноў у горад.

Лесавік не спяшаючыся падышоў да першага вагона і, узяўшыся за поручань, няўпэўнена паставіў нагу на прыступку. Перад тым як паставіць туды ж і другую нагу, ён азірнуўся.

Асветленая яркім святлом лясная паляна здалася яму зараз святочнаю, казачнаю – такімі прыгожымі выглядалі елкі і сосны, дубы і бярозы, малады падлесак, які аж зіхцеў у пражэктаравым святле.

Але ж ён ведаў, як толькі паедзе цягнік, тут зноў стане цёмна-цёмна.

З акна вагона нехта выкінуў парожнюю бутэльку ад гарэлкі. Яна ўпала ля ягонай нагі, не разбілася, а скацілася пад адхон, у канаўку. У вагоне нехта загарлапаніў п'яныя песні.

Лесавік перасмыкнуўся – як ад холаду. Ён не ведаў, што рабіць: заставацца тут, на паляне, ці ехаць туды, куды завязе яго вось гэты незнаёмы яму цягнік...

Яму не хацелася ні ехаць, ні вяртацца назад – туды, дзе можна ісці, толькі выставіўшы наперад рукі.

І раптам яго нагу сарвала з прыступкі – цягнік раззлавана, не набіраючы, як зазвычай, разгону, з месца рвануўся наперад: толькі што спакойна, нібы і не думаючы спяшацца, стаяў тут, а ўжо яго колы, ці чуеце, ляскочуць далёка ад паляны.

Цемра, цішыня і трывога зноў сціснулі з усіх бакоў Лесавіка.

І тады ў тым баку, адкуль ён нядаўна прыйшоў, нечакана ўспыхнула, нібы прыпаленая цыгарэта, маленечкая крапка святла.

Ідучы на гэтае святло, Лесавік толькі думаў, каб зноў не ўваліцца ў тую самую глыбокую яміну з вадою.

## Ідучы

Ён ідзе з месца А ў месца Б.

Нехта яго паслаў – паклаў руку на плячо і ціха, але настойліва загадаў: «Ідзі».

Чалавек хацеў нешта спытацца, нешта высветліць, але той, хто пасылаў, быў негаваркі – ён толькі паўтарыў сваё ранейшае «Ідзі!» і незадаволена дадаў: «Там, там табе ўсё раскажуць, растлумачаць, пакажуць».

І ён ідзе.

Дождж ліе яму на галаву, снег сыплецца за каўнер, а ён ідзе.

Улетку пыл слупам падымаецца з-пад ягоных ног, ды такі, што аж пяршыць у роце, босыя ногі тонуць у восеньскай твані, у якую ператварылі дарогу дажджы, а ён ідзе.

Лета змяняецца восенню, восень – зімою, зіма – вясною, а ён усё ідзе.

Тое, што было справа,– ужо становіцца злева, сонца ўжо заходзіць там, дзе яно раней узыходзіла, а ён ідзе.

Піхае перад сабою калёскі і ідзе. Калёскі вельмі лёгкія на хаду: толькі дакранешся – самі бягуць. Лёгкія, хоць і дужа цяжкія: на іх ляжыць усё, што трэба чалавеку ў такой доўгай, як ягоная, дарозе: і ежа, і пітво, і адзенне.

Дарога роўная, прамая, і нідзе нічога і нікога на ёй няма – ні дрэў, ні хат, ні людзей.

Ён не можа спыняцца – і есць, і п'е чалавек ідучы. Перад ім да калёскаў прыбіта дошка – як столік. Ён, не прыпыняючыся, ламае хлеб, хрумстае агурок, адразае кавалак сала. Есць і піхае калёскі. Піхае калёскі – піхае і ежу: увесь час даводзіцца яе даганяць, бо не дагоніш – будзеш галодны.

Вядома ж, яму ўсё гэта ўжо надакучыла. Кінуць бы ўсё к чортавай матары, збочыць і пайсці куды вочы глядзяць! Але як без калёскаў? Памрэш! А так усё звычна: захацеў есці – еш, захацеў напіцца – напіся.

Вядома, можна набраць з калёскаў яды з сабою, напіхаць яе ў кішэні. Але колькі ты яе возьмеш, колькі панясеш? Ды і потым колькі табе давядзецца шукаць новай ежы, калі з'ясі ўсё, што набраў? Бачыш, навокал жа нічога няма?

Ён памацаў, пашукаў пад столікам, знайшоў пад сурвэткаю пачак дарагіх цыгарэт у прыгожай упакоўцы з іншамоўнымі надпісамі, дастаў, прыкурыў цыгарэту і з асалодаю зацягнуўся: ад дабра дабра не шукаюць!

І, супакоены, пайшоў далей.

Зноў яму пад ногі слаліся то зялёная трава, то пажоўклыя, апалыя лісты, то калючыя, як дрот, завірухі.

Нарэшце, ужо зусім здарожаны, ён убачыў, што яго сустракаюць. Наперадзе іграў аркестр, мітусіліся людзі.

Калі чалавек дайшоў да слупа, што быў падобны да пагранічнага, да яго кінуліся людзі. Ён хацеў спыніцца, але яму не дазволілі: усе, хто сустракаў, ішлі за ім самі. Нават аркестр у поўным складзе, іграючы, тупаў услед. Некаторыя

сустракальнікі беглі за ім так, як бягуць за лыжнікамі трэнеры, каб даць ім важныя парады на лыжні.

— Віншуем вас з прыходам у месца А! — крычалі яму з усіх бакоў.

— Як гэта — у А? — здзівіўся той, каго сустракалі.— Я ж ішоў у месца Б. З месца А я выйшаў...

— Правільна,— супакойвалі яго.— Вы прыйшлі ў месца Б, аднак яно ў той жа час і месца А. Вы прыйшлі туды, адкуль выходзілі, бо ішлі па крузе.

Чалавек азірнуўся, пазнаў слуп — і праўда, ад яго ён адыходзіўся калісьці даўным-даўно, калі пачынаў свой шлях. На адным яго баку было напісана «Месца А», а на другім — «Месца Б».

Ён ужо ішоў па гэтай дарозе!

Чалавек хацеў прытармазіць, спыніць калёскі, але яго моцна, нават грубавата падпіхвалі ў спіну — маўляў, ідзі па другім крузе!

— Не пайду! — у адчаі закрычаў чалавек і ўхапіўся за прэнт, які злучаў павозку з нечым невідомым — другі канец жалезнага прута губляўся недзе на даляглядзе.

— Не пайду! — зноў застагнаў ён і яшчэ мацней сціснуў у руках прут, быццам хацеў зламаць яго.

Потым, кінуўшы і прут, і калёскі, адбегся ўбок. І адразу ж убачыў, што ягоная ўпартасць напалохала тых, хто яго сустракаў: яны пабялелі, разгубіліся і стаялі з параскрытымі ратамі — ён выпрагся!

Тут жа каля яго адразу ж села, як упала з неба, нейкая машына, падобная да ветралёта.

— Пайшлі з намі,— сказалі яму людзі, што выйшлі з машыны,— мы табе пакажам, што, спыніўшыся, ты нарабіў.

Яго завялі ў ветралёт, і той адразу ж увінціўся ў неба. Гэтак жа хутка ён і ўпаў на зямлю.

Яны апынуліся ў нейкім горадзе. Яго выпіхнулі з ветралёта, і ён жахнуўся: горад быў мёртвы! І хоць у ім, нібы зачумленыя, мітусіліся, крычалі, галасілі, плакалі, лаяліся, нават вылі людзі, горад быў нежывы — усё ў ім стаяла, ляжала, не рухалася.

— Знайсці яго! Злавіць яго! Пакараць яго! Адсячы яму галаву!

— Ну што? — іранічна спыталіся людзі, якія самі не выходзілі з ветралёта.— Сказаць ім, што ўсё гэта нарабіў ты?

Ён, нічога не адказваючы, кінуўся да ветралёта і ў адно імгненне схаваўся ў ім, як у схове,— уявіў, як гэтыя раз'юшаныя людзі зловяць яго і ўчыняць свой самасуд...

Дзверы мігам зачыніліся, і ветралёт зноў узвіўся ў неба. Там, высока-высока над зямлёю, ён завіс.

— Глядзі,— паказалі яму,— вунь тваё Вялікае Кола.

Ён зірнуў сабе пад ногі — падлога ветралёта была празрыстая, як шкляная, і праз яе ён убачыў вялізны-вялізны круг на зямлі, вытаптаны ў траве, і свае маленечкія-маленечкія калёскі, якія амаль невідомаю крапкаю стаялі на гэтым крузе.

— Ты не проста ішоў,— патлумачылі яму.— Ты круціў Вялікае Кола, якое давала жыццё і таму гораду, і тым людзям, якіх ты толькі што бачыў.

Ветралёт, праляцеўшы крыху наперад, скружыў якраз туды, дзе стаялі калёскі. Яны яму здаліся на гэты раз вялікімі, сапраўднымі калёсамі.

Цяпер ужо ён не супраціўляўся. Спакойна, не брыкаючыся, стаў у аглоблі — толькі ўжо не ззаду павозкі, а папераддзе яе.

На гэты раз ён ужо быў канём.

Конь фыркнуў, паправіў на сабе шлеі, збрую і звыкла пайшоў па знаёмай ужо дарозе.

## Яны

Паплечнікі ішлі да Вялікай Вады.

Рака, якую яны шукалі, і праўда, мусіць, была, як ім і казалі яшчэ дома, вялікаю і шырокаю — яе цяжка пераплысці, а перайсці і ўвогуле немагчыма.

Таму яны ўдвух неслі на ўсялякі выпадак цяжкі маток тонкай, аднак вельмі моцнай вяроўкі: адзін пранясе на плячы, пакуль стоміцца, а тады другі.

Вяроўку яны спадзяваліся нейкім чынам выкарыстаць, калі падыдуць да ракі. Можа, сплятуць з яе навясную лесвіцу і, калі ўдасца перакінуць цераз ваду, перабяруцца па ёй на той бераг. А можа, прывязаўшы адзін канец за што-небудзь на зямлі і ўзяўшыся за другі, пераплывуць раку без лесвіцы.

Вялікую Ваду яны шукалі доўга – схадзілі пустыню ўдоўж і ўпоперак, аднак ракі так і не знайшлі. Тады адзін з іх, маладзейшы, зняверыўшыся, закрычаў на старэйшага:

– Прыдумалі Вялікую Ваду! Выдумалі! Яе ў прыродзе няма! Я далей не пайду! Я вяртаюся назад!

– Пакажы мне, дружа, куды «назад» ты пойдзеш? У які бок? – спрабаваў яго адгаварыць старэйшы.– Мы закружыліся, і цяпер тваё «назад» можа якраз быць там, што называецца «наперад». «Назад», «наперад» у нашай сітуацыі ўжо нічога не значыць – пустыя словы.

Але маладзейшы не здаваўся:

– Мне ўжо хопіць. У труне я бачыў тваю Вялікую Ваду. І пустыні тваёй наеўся. Не хачу пустыні, не хачу вады!

Ён зняў з пляча маток вяроўкі і кінуў яго на пясок – пад ногі старэйшаму.

– Нясі сам!

Абтрос рукі, быццам забрудзіў іх гэтай вяроўкаю, і, не развітваючыся, пайшоў прэч – зусім у іншы, супрацьлеглы бок, а не ў той, куды яны ішлі.

– Не выдумляй, чуеш! Вярніся! – крычаў старэйшы, а маладзейшы, быццам і не чуў гэтага, ішоў і ішоў наперад.

Старэйшы няўцямна ўглядзеўся ў пясок. Трэба нешта прыдумаць, бо там, каля Вялікай Вады, калі ён і знойдзе яе, асабліва за ёю, яму, аднаму, няма чаго рабіць.

І раптам ён убачыў, што ў пяску нешта блішчыць. Капянуў нагою і, нагнуўшыся, падняў цяжкаватую бліскучую гайку. Яна, нагрэтая сонцам, была гарачаю, і ён нейкі час перакідаў яе з далоні на далонь, а потым кінуў зноў у пясок. Падняў маток вяроўкі і паспешліва пачаў раскручваць яго.

Вяроўка – гэта ж пуга! Яна дапаможа яму дагнаць паплечніка! Вось ён зараз разматае вяроўку, навяжа на яе канец знойдзеную гайку, раскруціць пугу, падыме яе над зямлёю,

дастане ёю ўцекача і спаўе яго. Потым старэйшы ўгаворыць маладзейшага, што справу трэба даводзіць да канца – пайшлі, маўляў, наперад...

Аднак пугу падняць было не так і проста. Цяжкавата раскручвалася вяроўка, гайка ніяк не адрывалася ад пяску і толькі чырыла па ім баразёнку. А ўцякач адыходзіўся ўсё далей і далей.

Урэшце старэйшы ўсё ж падняў пугу ў паветра, і гайка пачала няўмольна набліжацца да паплечніка.

Аднак той, мусіць, адчуў небяспеку, азірнуўся і тут жа ніцма ўпаў на пясок – пуга з гайкаю, паднятая высока, прасвістала над ім.

Старэйшы наноў раскручваў пугу – на гэты раз, думаў ён, удасца прыгнуць яе бліжэй да пяску.

Нешта замінала яго назе – штосьці знізу ўпіралася ў падэшву чаравіка. Прыняў нагу і ўбачыў: пад ёю прабіўся моцны парастак.

А паплечнік тым часам, як праляцела гайка, спакойна падняўся, абтросся і гэтак жа спакойна пайшоў далей.

Гайка выходзіла ўжо на другі віток.

Парастак каля ног старэйшага быў ужо велікаваты – ён даставаў чалавеку амаль да каленяў: дрэўца расло хутка – мусіць, гэта быў бамбук.

Калі пуга зноў набліжалася да ўцекача, той, не азіраючыся, лёгка скочыў наперад, і гайка толькі чыркнула яму па плячах.

Пуга выходзіла на новы віток, і старэйшы пачаў пакрысе папускаць вяроўку, каб яна ўсё ж змагла дагнаць паплечніка.

І тут адбылося нешта нечаканае: вяроўка нібы сарвалася з круга, моцна прыціснула старэйшага да дрэва, якое ўжо было ўровень з ім, і пачала абкручвацца вакол іх дваіх.

Ён паспрабаваў вызваліцца, паспрабаваў рукамі адціснуць вяроўку, каб вылезці з-пад яе, але пуга за гэты час зрабіла новы віток і яшчэ мацней прывязала яго да дрэва.

Цяпер ужо пуга кружылася вакол яго сама сабою. Калі ён паварушыў нагамі і з дапамогаю іх паспрабаваў выбрацца з-пад сіла, вяроўка прывязала да бамбука і яго ногі.

Пуга спавівала яго, усё тужэй і тужэй прывязвала да дрэва.

А бамбук усё рос увышкі, і неўзабаве старэйшы паплечнік адчуў, што яго дагі не дастаюць да зямлі – дрэва ўзняло яго над зямлёю.

Убачыўшы такое, жахнуўся і малодшы паплечнік. Ён кінуўся на дапамогу і прыбег якраз у час: раскручаная гайка, якая ўжо, як куля, вілася каля галавы старэйшага, вось-вось павінна была цюкнуць яго ў скронь – паплечнік перахапіў яе ў самы апошні момант.

А бамбук усё рос і рос, усё таўсцеў і таўсцеў. Вяроўка туга ўпівалася ў цела старэйшага паплечніка, і было відаць, што яшчэ крыху – і яна задушыць яго. Ён сіліўся нешта сказаць, нешта паказваў рукою за бархан, аднак маладзейшы нічога не разумеў.

Маладзейшы бачыў і разумеў толькі адно: паплечнік задыхаецца і нельга марудзіць ні хвіліны.

Ён хапатліва выхапіў з кішэні нож і, спяшаючыся, палез на дрэва. Караскаючыся ўсё вышэй і вышэй, уцякач перарэзаў вяроўкі, якія абвілі чалавека і дрэва, з'яднаўшы іх у адно. Калі яны абодва ўпалі з дрэва – старэйшы, як падаў, збіў і малодшага,– калі аддыхаліся, уцякач спытаўся:

– Слухай, а што ты хацеў сказаць, як вісеў? Што паказваў?

– Я хацеў сказаць, што бачу Вялікую Ваду. Яна вось тут, за барханам.

І яны абодва, не згаворваючыся, адначасова паглядзелі на парэзаную вяроўку, падхапіліся і таропка ўзяліся звязваць яе канцы.

Неўзабаве яны ўжо сядзелі на беразе Вялікай Вады. Аднак перабрацца праз яе на другі бераг не маглі: парэзаная і звязаная вяроўка стала вельмі кароткаю...

Дык хто ж з іх, траіх, найбольш вінаваты ў тым, што адбылося на шляху да Вялікай Вады?

Вядома ж, бамбук: ён стаў паміж людзьмі і так недарэчы ўмяшаўся ў іх звычайныя чалавечыя клопаты.

## Шукальнікі

Спачатку іх было шмат.

Пачулі, што недзе за несхадзімымі даламі, за непрыступнымі гарамі, за дрымучымі лясамі ёсць спакойны край Вялікае Хараство, і ўсе рынуліся шукаць яго.

У іх было ўсё – было што есці і было што піць, было дзе жыць і было ў што апранацца, а вось спакою і хараства ім якраз і не ставала.

Адны пабралі з сабою ўсё сваё багацце, везлі яго на машынах, на конях і на вазах, другія ўзялі ў дарогу толькі самае каштоўнае і неслі яго ў чамаданах і дыпламатах, а трэція, апрача грошай, нічога не ўзялі – навошта: усё тое, што вязуць дурні на вазах, яны заўсёды і ўсюды змогуць купіць за грошы.

Жабракі нікуды не паехалі. Хоць у іх не было чаго есці і піць, не было дзе жыць і не было ў што апрануцца, яны засталіся на месцы. У іх былі іншыя клопаты, а «хараства», як кажуць, ім і дома хапала.

Пасля таго як шукальнікі прайшлі і праехалі ўсе несхадзімыя долы, іх паменела напалову: у каго здох конь, у каго растросся воз, у каго зламалася машына.

За гарамі вандроўнікаў паменела яшчэ болей: з чамаданамі ды цяжкімі валізкамі не дужа набегаешся па гарах – з каменя на камень, з грэбеня на грэбень, са скалы на скалу.

Па лясах, па звярыных сцежках ды бураломах ішлі ўжо толькі тыя, у каго рукі былі вольныя,– грошы, якія былі напакаваныя ў кашалькі, не заміналі ім прабірацца праз гушчары, пералазіць з аднаго паваленага дрэва на другое. Аднак з лесу, нягледзячы на гэта, выйшлі зноў жа не ўсе шукальнікі.

А тыя, што выйшлі, здзівіліся – перад імі была новая перашкода: пад нагамі зыбалася дрыгва.

Яны пастаялі, патапталіся, памацалі наскамі чаравікаў балотную твань наперадзе сябе, а тады – нічога не зробіш: дарогі назад няма! – нясмела пачалі пасоўваць ногі па затравелай дрыгве. Яна зыбалася, як усё роўна дыхала, пад імі,

аднак ногі пакуль не правальваліся, і людзі ўсё далей і далей адыходзіліся ад берага.

Аднак, чым далей, дрыгва рабілася ўсё небяспечней — шукальнікам даводзілася паўзці па ёй. Цяпер правальваліся ўжо не толькі ногі, а і самі вандроўнікі, а праваліўшыся, кешкаліся ў твані па пояс.

Да зялёнага берага, які нечакана ўзнік за тваннню, дайшлі не ўсе. Многія шчоўкнулі, праваліліся пад зялёны покрыў ды так і не змаглі выкараскацца на паверхню — над імі зноў сышлася трава, быццам пад яе ніхто і ніколі не правальваўся. Іншыя, усе перапэцканыя ў бруд, паволі набліжаліся да берага, ішлі па шыю ў багне.

На беразе іх ужо чакалі людзі.

Тыя, што былі ў багне, палезлі ўжо самі на бераг, але іх спіхнулі назад у балота — маўляў, не спяшайцеся. Вандроўнікі сцішыліся і толькі, каб утрымацца на паверхні, каб не патануць, варушылі ў твані, як у вадзе, рукамі. Чакалі, што будзе далей.

Тады наперад выйшаў чалавек у белым-белым касцюме — відаць, самы галоўны тут — і сказаў:

— У каго ёсць кашалькі? Падыміце рукі.

І тыя, што прыйшлі, павесялелі, заварушыліся і пачалі, быццам дзеці, як мага вышэй падымаць рукі. Некаторыя нават падаставалі з кішэняў кашалькі і радасна размахвалі імі ў паветры. Кашалькі, як і рукі, былі брудныя, усе ў багне, з іх сцякала мутная вада і адвальваліся кавалкі калатушы і шлёпаліся назад у балота, аднак на гэта ніхто не звяртаў увагі.

— Цяпер апусціце. А ў каго кашалькоў няма?

Цяпер ужо рук ніхто не падымаў. Толькі ўдалечыні чалавек у белым касцюме заўважыў руку, якую нясмела, няёмячыся, падымаў толькі адзін вандроўнік: падыме і, каб не захлынуцца, апусціць, падыме і зноў апусціць. Галоўны сказаў яму:

— Падыдзіце да мяне.

Чалавек вельмі доўга ці то ішоў, ці то плыў па твані, а ўсе, хто сустракаў вандроўнікаў, цярпліва чакалі яго.

Галоўны падаў яму руку, усцягнуў на бераг і прытуліў да сябе, да свайго бялюткага-бялюткага касцюма.

Тыя, што сядзелі ў балотнай твані, разгубіліся.

— А мы? А нас? — занепакоена закрычалі яны.

— А вас нічым не магу суцешыць,— развёў рукамі Галоўны.— Справа ў тым, што ў нас, у Вялікім Харастве, зусім няма і ніколі не было грошай. А таму мы не можам вас прыняць з вашымі кашалькамі. Вы сваімі грашамі пасееце ў нас смуту, а потым разбурыце і само Вялікае Хараство.

— Дык а што рабіць нам?! — роспачна застагналі людзі.

— Ёсць выйсце,— параіў ім Галоўны.— Павыкідайце свае кашалькі ў багну, а самі выходзьце на бераг.

У балоце стала ціха — усе, хто кешкаўся ў твані, замоўклі.

Некаторыя паплылі ад берага адразу — не захацелі заставацца ў Вялікім Харастве без грошай. Іншыя, крыху падумаўшы, памарудзіўшы, паплылі ўслед за імі. Апошнія асобіны, як акулы, доўга кружылі па балоце, аднак і яны не адважыліся без кашалькоў узабрацца на бераг Вялікага Хараства.

— Хараство — добра,— плывучы назад, разважалі яны,— але ж якое можа быць хараство без кашалька?!

Вярнуліся з гэтай вандроўкі толькі адзінкі. Яны былі на сёмым небе ад радасці.

А жабракі, наадварот, засмуціліся: чаму ж яны, дурні, не пайшлі тады разам з усімі?!

Цяпер ужо яны ведалі, што тыя, хто вярнуўся, ніколі не адпусцяць іх у тое балота, якое перад самым Вялікім Хараством...

# ЗМЕСТ

## Вершы


«Адгукніся...» . . . 3
Ваўчыца ў звярынцы . . . 4
Недасланы ліст да маці . . . 4
Сонечны дождж . . . 5
Салаўіная бяссонніца . . . 6
На бацькавых руках . . . 7
Слёзы маці . . . 7
Далёкія сенажаці . . . 8
«Не баюся я цяжкай, далёкай хады...» . . . 8
Пачатак палёту . . . 9
«Ляжаць на далоні зерні...» . . . 9
Танец соснаў . . . 10
Спёка . . . 11
Мова . . . 12
«Пакліч...» . . . 12
Пехатою ў вырай . . . 13
Лінія гарызонту . . . 14
Сіняторыя . . . 15
«З разамлелых пупышак...» . . . 16
Карэнне расы . . . 16
Блакітная геаграфія . . . 17
Брацкая магіла . . . 19
«Спяць у снарадах...» . . . 19
«Сэрца – то спрасаваны стагоддзямі порах...» . . . 20
Пейзаж з чалавекам . . . 20
«Заходзіць яблык...» . . . 21
«Каб неба цябе не загушкала...» . . . 22
«Пасля расставанняў з ёю...» . . . 22
Коні на праспекце . . . 22
Хвіліна сустрэчы . . . 24
Вітаюцца кавалі . . . 25
Споведзь . . . 26
Зялёнае воблака на рынку . . . 28
Лірычны ўспамін . . . 29
Уваходзіны ў паэму . . . 31
«Мы стаім у зялёным маі...» . . . 32
Успомненая дарога . . . 34
«Ужо аб вайне не могуць...» . . . 35
Заканчэнне палёту . . . 35
Запрашэнне ў раніцу . . . 35
Пачатак . . . 36
Малітва над калыскаю . . . 37
Патоп . . . 37

«Пушчу турбуе клопат адзіны...» . . . 38
«Нібы бліскавіцы белыя...» . . . 40
Настраёвы эцюд . . . 40
Санет кахання . . . 40
Падарожжа вакол цябе . . . 41
Двое . . . 42
«Хоць продкі здаўна мае хрышчоныя...» . . . 43
Вечны пацалунак . . . 44
Галерэя вокнаў . . . 45
«Які чалавек вуглаваты!..» . . . 46
«Хаця ў аснежаных залужжах...» . . . 46
На выстаўцы дзіцячых малюнкаў . . . 47
Праліў сноў . . . 47
Пажар у старажытным Полацку . . . 49
Вечаровая песня лесаўчыка . . . 50
Пятля Кастуся Каліноўскага . . . 52
Тураўская элегія . . . 53
«Лягчэй вы паміралі, нашы прашчуры...» . . . 54
«Маці!..» . . . 55
Гарады, якіх няма . . . 56
Па вайне . . . 57
Ціхая мелодыя . . . 58
«Я выплываю з адзіноты...» . . . 58
Адзінец . . . 58
«Я ўночы прачнуўся...» . . . 59
Слова ў спрэчках . . . 60
Узнаўленне . . . 61
«Гады твае ў снег паўмярзалі...» . . . 61
«Ужо даўно на тым баку планеты...» . . . 62
«Вітанне, раніца!..» . . . 63
«Чысцінёй святліцца слова...» . . . 63
«Здараецца, наплыне дабрыня...» . . . 64
«Як жа хораша ўваліцца...» . . . 65
«Раніца. Сонца. Ралля...» . . . 66
«Чаго дамогся — не цікава...» . . . 67
«Мой агонь пастарэў на год...» . . . 68
«Сядзім, смяёмся за сталом...» . . . 69
«Я выходжу з раба пакрысе...» . . . 70
«Спатыкнешся аб чэрвень, бывае...» . . . 71
«І прыйдзе смутак нечакана...» . . . 71
«Кожны дзень прачынаешся з прагаю цуду...» . . . 72
«Пасівела душа, пасівела...» . . . 73
«Абнаўлення, хлопцы, абнаўлення...» . . . 74
«Зноў мяне прыручаюць дарогі...» . . . 74
Там, у дзяцінстве . . . 76
«Калі з выраю птушка вяртаецца ў свой небасхіл...» . . . 76

Пералёт дажджу . . . 76
«Не вернуцца годы — мая радня...» . . . 77
«Іду звычайнаю сцяжынай...» . . . 77
Уваходзячы ў мора . . . 78
Вада . . . 78
Малітва прашчура . . . 80
Ручай . . . 80
Мелодыя на званах . . . 81
«А мы з табой, бы ў рай, у гэткі...» . . . 82
Чаканне цябе . . . 83
Твае рукі . . . 84
Музыка для закаханых . . . 85
«Было тады...» . . . 86
«Сумую я па лыжным следзе...» . . . 87
Амаль буколіка . . . 88
Чыстае слова . . . 88
Жанчына спявае . . . 89
«Калі, ад шчасця захмялелы...» . . . 90
У гасцях . . . 91
Да біяграфіі майго народа. I . . . 92
Паранены партызан . . . 93
«Я люблю цябе да скону...» . . . 94
«Гэта дрэва шукае свайго бусла...» . . . 95
Роднае слова . . . 95
«Зразумець, што ты — народ...» . . . 96
Да біяграфіі майго народа. II . . . 97
Да біяграфіі майго народа. III . . . 98
«Ты кінуў слова ў мяне...» . . . 99
«Слухаю песню конікаў...» . . . 100
Малюнак . . . 100
Жанчына. *Вянок санетаў* . . . 101
Жыццё . . . 109
«Варта ў крылы паверыць свае...» . . . 110
«Як радасна, мой дружа, разумець...» . . . 111
«З роду я хлебасеяў...» . . . 111
Сялянскія рукі . . . 112
Прамова ў Ляўках . . . 113
Ялта, Максім, кіпарысы . . . 113
Дождж ля вёскі Шастакі . . . 114
Вечар паэзіі . . . 115
Сон, быццам ява . . . 117
Кветка . . . 119
Каханне . . . 120
З мінулага . . . 121
Жыццяпісы . . . 122
На завяршэнне кнігі . . . 125

**Балады**


Сяўба . . . 126
Мячык . . . 129
Базары . . . 132
Урок . . . 134
Еш! . . . 136
Вязень . . . 137
Пытанне . . . 139
Кветкі . . . 140
Зброя . . . 143
Шахматы . . . 144
Навальніца . . . 147
Ноч . . . 148
Пустэльнік . . . 151
Валы . . . 154
Шыбеніца . . . 155
Арыштант . . . 158
Клетка . . . 162
Ёлка . . . 166
Яношык . . . 168
Крылы . . . 172
Кмет . . . 173
Лазня . . . 176
Кукіш . . . 179
Песні . . . 182
Рэха . . . 184
Кузня . . . 186
Званні . . . 189
Чубы . . . 191
Булава . . . 192
Пагоня . . . 194
Будоўля . . . 197
Саранча . . . 199
Збуйніца . . . 201
Вырадак . . . 204
Акадэмія . . . 206
Вадзянік . . . 209
Каханне . . . 211
Розгі . . . 213
Кароль . . . 215
Падатак . . . 217
Кантрабанда . . . 218
Трызненне . . . 220
Літаўры . . . 222
Просьба . . . 226
Чаканне . . . 227
Вяселле . . . 231

Свае ........................................ 232
Змаганне ........................................ 234
Сакалар ........................................ 236
Касцёр ........................................ 238
Казакі ........................................ 241
Грунвальд ........................................ 245
Званы ........................................ 246
Свабода ........................................ 248
З'яўленне ........................................ 251
Пыл ........................................ 254
Птушка ........................................ 255
Івайла ........................................ 259
Руяне ........................................ 262
Пір ........................................ 263
Веча ........................................ 267
Ахвяраванні ........................................ 274
Здзек ........................................ 277
Вайна ........................................ 278
Чараты ........................................ 281
Сунільда ........................................ 283
Ідуць ........................................ 285
Навіна ........................................ 287
Вадаспад ........................................ 289
Пачатак ........................................ 291
Развітанне ........................................ 293

**Прытчы**

Клетка ........................................ 294
Як спакайней? ........................................ 303
Дарога ........................................ 309
Пластылінавыя людзі ........................................ 316
Выгнанне дэманаў ........................................ 321
Слабыя і моцныя ........................................ 328
Перавернуты ........................................ 332
Тыя, што ідуць ........................................ 338
Ледавік і Джунгляня ........................................ 366
На Манады ........................................ 372
Над прадоннем ........................................ 376
Прымірэнне ........................................ 379
Лесавік ........................................ 381
Ідучы ........................................ 385
Яны ........................................ 388
Шукальнікі ........................................ 392

**Сіпакоў, Я.**

С39 Вершы, балады, прытчы / Янка Сіпакоў ; уклад. Зоі Падліпскай і Віктара Шніпа. – Мінск : Маст. літ., 2010. – 399 с. – (Школьная бібліятэка).

ISBN 978-985-02-1212-2.

Кнігу вядомага беларускага пісьменніка, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі Янкі Сіпакова склалі вершы розных гадоў, балады, у якіх аўтар адлюстраваў старонкі гісторыі славянскіх народаў, а таксама прытчы.

**УДК 821.161.3-93**
**ББК 84(4Беи)**

Літаратурна-мастацкае выданне

ШКОЛЬНАЯ БІБЛІЯТЭКА

**СІПАКОЎ** Янка (Іван Данілавіч)

ВЕРШЫ, БАЛАДЫ, ПРЫТЧЫ

Рэдактар *І. М. Паланейчык*
Мастацкі рэдактар *Н. В. Барай*
Тэхнічны рэдактар *Л. І. Астрэйка*
Стылістычныя рэдактары *А. М. Анцытовіч, М. А. Паддубская, Я. А. Бебель, Л. Г. Ганчарэнка*

Падпісана да друку 22.06.2010. Фармат $60\times90^1/_{16}$. Папера афсетная.
Гарнітура NewBaskervilleC. Афсетны друк. Умоўн. друк. арк. 25,0.
Улік.-выд. арк. 18,31. Тыраж 17 119 экз. Заказ 226.

Выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Мастацкая літаратура»
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
ЛИ № 02330/0494049 ад 03.02.2009.
Праспект Пераможцаў, 11, 220004, Мінск.
www.mastlit.by; e-mail: mail@mastlit.by

Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Мінская фабрыка каляровага друку».
ЛП № 02330/0494156 ад 03.04.2009.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, Мінск.

Шк*О*льная бібліятэка



# Янка Сіпакоў

## *Вершы, балады, прытчы*

У творчасці Янкі Сіпакова мы знаходзім яскравы адказ на тое, хто мы такія, якім быў наш лёс у мінулым, што павінны рабіць далей, каб захаваць жыццё ў крынічнай чысціні, зрабіць святлейшым і прыгажэйшым для нашчадкаў.

*Мікола Мішчанчук*

ISBN 978-985-02-1212-2
9 789850 212122

*Школьная бібліятэка*



Янка Сіпакоў